# ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ



ГАЛАСЫ УТОПІІ

ДА 70-ГОДДЗЯ
СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ

Выдадзена
пры дапамозе
краўдфандынгу
Ulej.by

Паважаны чытач!

Гэтае унікальнае выданне стала магчымае дзякуючы супольным намаганням грамадскасці Беларусі, краўдфандынгавай платформы Ulej.by, «Белгазпрамбанка» і Цэнтра выяўленчага і медыямастацтва «Новая культурная ініцыятыва».

У найноўшым беларускім перакладзе апублікаваныя разам пяць кніг першай ў беларускай гісторыі лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Святланы Алексіевіч, аб'яднаных у цыкл «Галасы Утопіі».

З мэтай зрабіць кнігі Алексіевіч даступнымі для чытачоў нашай краіны «Белгазпрамбанк» падбаў, каб гэтае выданне можна было знайсці ва ўсіх беларускіх бібліятэках.

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ

# ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА

Хроніка будучыні

Пераклаў з рускай
Уладзімір Арлоў

Логвінаў

Дакументальна-мастацкая хроніка «Галасы Утопіі» — пяць кніг, у якіх «маленькі чалавек» сам апавядае пра свой лёс. Гэта адметны жанр — шматгалосыя раманы-споведзі, у якіх з малых падзеяў складваецца вялікая гісторыя.

Перад чытачом — апошняя аўтарская рэдакцыя цыкла ў найноўшым беларускім перакладзе. Пісьменніца паводле свайго творчага метаду дапрацавала хроніку: скасавала цэнзурныя праўкі, далучыла новыя эпізоды, а таксама старонкі з уласнага дзённіка.

«Чарнобыльская малітва» — чацвёртая кніга хронікі, прысвечаная галоўнай тэхнагеннай катастрофе XX стагоддзя. Кніга вельмі часта гаворыць галасамі нашых суайчыннікаў — ліквідатараў і іх сваякоў, журналістаў і навукоўцаў, настаўнікаў і жыхароў палескіх вёсак.

ISBN 978-609-8213-32-4

© Святлана Алексіевіч, 2018
© Уладзімір Арлоў, пераклад на беларускую мову, 2018
© Logvino literatūros namai, 2018

Часам мне здавалася, што я запісваю будучыню…

Зямля раптам выявілася такой маленькай, гэта не тая зямля, што была ў часы Калумба.

Мы ўжо не можам, як героі Чэхава, сказаць: праз сто гадоў чалавек будзе прыўкрасным!

Раз-пораз думаеш: што гэта — мінулае ці будучыня?
Часам мне здавалася, што я запісваю будучыню…

Мы паветра, мы не зямля…

*М. Мамардашвілі*

# ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

«Беларусь… Для свету мы terra incognito — невядомая, нязведаная зямля. “Белая Расія” — прыкладна так гучыць назва нашай краіны па-англійску. Пра Чарнобыль усе ведаюць, але толькі ў сувязі з Украінай і Расіяй. Мы яшчэ павінны расказаць пра сябе…»

*«Народная газета», 27 красавіка 1996 г.*

«26 красавіка 1986 г. у 1 гадзіну 23 хвіліны 58 секунд — серыя выбухаў разбурыла рэактар і будынак 4-га энергаблока Чарнобыльскай АЭС, размешчанай паблізу беларускай мяжы. Чарнобыльская катастрофа — самая буйная тэхналагічная катастрофа XX стагоддзя.

Для маленькай Беларусі з яе 10 млн жыхароў яна сталася нацыянальнай бядой, хоць самі беларусы не маюць ніводнай атамнай станцыі. Гэта па-ранейшаму аграрная краіна з пераважна вясковым насельніцтвам. У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецкія фашысты знішчылі на беларускай зямлі 619 вёсак разам з жыхарамі. Пасля Чарнобыля краіна страціла 485 вёсак і пасёлкаў: 70 з іх ужо назаўсёды пахаваныя ў зямлі. У вайну загінуў кожны чацвёрты беларус, сёння кожны пяты жыве на забруджанай тэрыторыі. Гэта 2,1 млн чалавек, з іх — 700 тыс. дзяцей. Сярод фактараў дэмаграфічнага зга-

сання радыяцыя займае галоўнае месца. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях, якія найбольш пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы, смяротнасць перавысіла нараджальнасць на 20%.

У выніку катастрофы ў атмасферу выкінута 50x106 Кu радыенуклідаў, з якіх 70% выпала на Беларусь: 23% яе тэрыторыі забруджаныя радыенуклідамі — больш за 1 Кu/км$^2$ па цэзіі-137. Дзеля параўнання: ва Украіне забруджаныя 4,8% тэрыторыі, у Расіі — 0,5%. Плошча сельгасугоддзяў са шчыльнасцю забруджвання ад 1 і больш Кu/км$^2$ складае звыш 1,8 млн гектараў, стронцыем-90 са шчыльнасцю 0,3 і больш Кu/км$^2$ — каля 0,5 млн гектараў. З сельгасвароту выведзеныя 264 тыс. гектараў зямлі. Беларусь — краіна лясоў. Але 26% лясоў і больш за палову лугоў у поймах рэк Прыпяць, Дняпро, Сож належаць да зоны радыеактыўнага забруджвання…

Як вынік безупыннага ўздзеяння малых дозаў радыяцыі кожны год у краіне павялічваецца колькасць анкалагічных захворванняў, дзяцей з разумовай адсталасцю, нервова-псіхічнымі адхіленнямі і генетычнымі мутацыямі…»

*Зб. «Чарнобыль». «Беларуская энцыклапедыя», 1996, с. 7, 24, 49, 101, 149*

«Паводле назіранняў, 29 красавіка 1986 года высокі радыяцыйны фон быў зарэгістраваны ў Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Румыніі, 30 красавіка — у Швейцарыі і паўночнай Італіі, 1–2 траўня — у Францыі, Бельгіі, Нідэрландах, Вялікабрытаніі, паўночнай Грэцыі, 3 траўня — у Ізраілі, Кувейце, Турцыі…

Закінутыя на вялікую вышыню газападобныя і лятучыя рэчывы пашыраліся глабальна: 2 траўня яны былі

зарэгістраваныя ў Японіі, 4 траўня — у Кітаі, 5-га — у Індыі, 5 і 6 траўня — у ЗША і Канадзе.

Менш за тыдзень спатрэбілася, каб Чарнобыль стаў праблемай для ўсяго свету...»

*Зб. «Наступствы Чарнобыльскай аварыі ў Беларусі».*
*Мінск: Міжнародны вышэйшы Сахараўскі каледж*
*па радыеэкалогіі, 1992, с. 82*

«Чацвёрты рэактар, так званы аб'ект "Укрытие", па-ранейшаму захоўвае ў сваім свінцова-жалезабетонным чэраве блізу 200 тон ядзерных матэрыялаў. Прычым паліва часткова перамешанае з графітам і бетонам. Што з імі адбываецца сёння, не ведае ніхто.

Саркафаг будавалі похапкам, канструкцыя ўнікальная, напэўна, інжынеры-праектанты з Піцера могуць ёю ганарыцца. Служыць яна павінна была трыццаць гадоў. Аднак збіралі саркафаг "дыстанцыйна", пліты стыкавалі з дапамогаю робатаў і верталётаў — адсюль і шчыліны. Сёння, згодна з некаторымі звесткамі, агульная плошча шчылін і расколін перавышае 200 квадратных метраў, і адтуль працягваюць вырывацца радыеактыўныя аэразолі. Калі вецер дзьме з поўначы, то на поўдні — зольная актыўнасць: з уранам, плутоніем, цэзіем. Апрача таго, у сонечны дзень пры выключаным святле ў рэактарнай зале відаць слупы святла, якія падаюць зверху. Што гэта такое? Трапляе ў сярэдзіну і дождж. А калі вільгаць трапляе ў масы з утрыманнем паліва, можа ўзнікнуць ланцуговая рэакцыя...

Саркафаг — гэта нябожчык, які дыхае. Дыхае смерцю. На колькі яго яшчэ хопіць? Адказу не ведае ніхто, дагэтуль немагчыма патрапіць да шматлікіх вузлоў і канструкцый, каб даведацца, які ў іх запас трываласці.

Затое ўсе разумеюць: разбурэнне “Укрытия” прыняло б да наступстваў нават страшнейшых, чым у 1986-м...»

*Часопіс «Огонёк», № 17, 5 красавіка 1996 г.*

«Да Чарнобыля... на 100 тысяч жыхароў Беларусі прыпадала 82 выпадкі анкалагічных захворванняў. Сёння статыстыка наступная: на 100 тысяч — 6 тысяч хворых. Павелічэнне амаль у 74 разы.

Смяротнасць за апошнія дзесяць гадоў павялічылася на 23,5%. Ад старасці памірае адзін чалавек з 14, пераважна працаздольныя — 46–50 гадоў. У найбольш забруджаных абласцях выяўлена: з 10 чалавек хворыя сем. Едзеш па вёсках, і цябе ўражвае тэрыторыя могілак, якія ўвачавідкі разрасліся...»

«Дагэтуль многія лічбы невядомыя... Яны настолькі жудасныя, што іх па-ранейшаму трымаюць у таямніцы. Савецкі Саюз накіраваў на месца катастрофы 800 тысяч салдат тэрміновай службы і выкліканых на службу ліквідатараў, сярэдні ўзрост якіх быў 33 гады. А хлапчукоў узялі служыць у войска адразу пасля школы...

Толькі ў Беларусі ў спісах ліквідатараў 115 493 чалавекі. Паводле дадзеных Міністэрства аховы здароўя, з 1990 да 2003 года 8 553 ліквідатары памерлі. Па два чалавекі на дзень...»

«Так пачыналася гісторыя...

1986 год... На першых старонках савецкіх і замежных газет рэпартажы пра суд над вінаватымі ў чарнобыльскай катастрофе...

А цяпер... Уявіце пусты пяціпавярховы дом. Дом без жыхароў, але з рэчамі, мэбляй, адзеннем, якія ніхто

і ніколі ўжо не зможа выкарыстаць. Бо дом гэты ў Чарнобылі… Але менавіта ў такім доме мёртвага горада давалі невялікую прэс-канферэнцыю для журналістаў тыя, каму было даручана вяршыць суд над вінаватымі ў атамнай аварыі. На самым высокім узроўні, у ЦК КПСС, вырашылі, што справа павінна разглядацца на месцы злачынства. У самім Чарнобылі. Суд адбыўся ў будынку мясцовага Дома культуры. На лаве падсудных шасцёра — дырэктар атамнай станцыі Віктар Бруханаў, галоўны інжынер Мікалай Фамін, намеснік галоўнага інжынера Анатоль Дзятлаў, начальнік змены Барыс Рагожкін, начальнік рэактарнага цэха Аляксандр Каваленка, інжынер Дзяржатамэнерганагляду СССР Юрый Лаушкін.

Месцы для гледачоў пустыя. Сядзяць адны журналісты. Зрэшты, людзей тут ужо і няма, горад "зачынілі" як "зону жорсткага радыяцыйнага кантролю". Ці не з гэтай прычыны яго і абралі месцам суда — чым меней сведкаў, тым меней розгаласу? Няма тэлеаператараў, няма заходніх журналістаў. Вядома, на лаве падсудных усе хацелі пабачыць дзясяткі адказных чыноўнікаў, у тым ліку і маскоўскіх. Сваю адказнасць павінна была несці і сучасная навука. Але пагадзіліся на "стрэлачнікаў".

Прысуд… Віктар Бруханаў, Мікалай Фамін і Анатоль Дзятлаў атрымалі па дзесяць гадоў. У іншых тэрміны былі меншыя. Анатоль Дзятлаў і Юрый Лаушкін у зняволенні памерлі ад вынікаў моцнага радыяцыйнага апраменьвання. Галоўны інжынер Мікалай Фамін звар'яцеў… А вось дырэктар станцыі Віктар Бруханаў адбыў тэрмін пакарання ад званка да званка — усе дзесяць гадоў. Сустракалі яго сваякі і некалькі журналістаў. Падзея прайшла незаўважанай.

Былы дырэктар жыве ў Кіеве, працуе звычайным клеркам у адной з фірмаў…

Так сканчваецца гісторыя…»

«Неўзабаве Украіна распачынае грандыёзнае будаўніцтва. Над саркафагам, які накрыў у 1986-м годзе разбураны чацвёрты блок Чарнобыльскай АЭС, з'явіцца новае збудаванне пад назваю "Арка". На гэты праект 28 краін-донараў выдзяляюць першапачатковыя капіталаўкладанні — звыш 768 мільёнаў долараў. Новы саркафаг мусіць існаваць ужо не трыццаць, а сто гадоў. І задуманы ён больш грандыёзным, бо павінен мець дастатковы аб'ём, каб перазахоўваць там адкіды. Неабходны масіўны падмурак: фактычна трэба вырабіць штучны скальны грунт з бетонных слупоў і плітаў. Затым будзе падрыхтаванае сховішча для радыеактыўных адкідаў з-пад старога саркафага. Новы саркафаг будзе выраблены са сталі высокай якасці, здольнай вытрымаць гама-выпраменьванне. Аднаго металу спатрэбіцца 18 тысяч тон…

"Арка" стане беспрэцэдэнтным у гісторыі чалавецтва збудаваннем. Па-першае, уражваюць яе памеры — гэта падвойная абалонка вышынёю 150 метраў. Сваёй эстэтыкай яна набліжаецца да Эйфелевай вежы…»

*Паводле матэрыялаў беларускіх інтэрнэт-газет за 2002–2005 гг.*

# САМОТНЫ ЧАЛАВЕЧЫ ГОЛАС

Я не ведаю, пра што расказваць… Пра смерць або пра каханне? А можа, гэта адно і тое ж… Пра што?

…Мы нядаўна пажаніліся. Хадзілі па вуліцы і трымаліся за рукі, нават калі ў краму ішлі. Заўсёды ўдваіх. Я казала яму: «Я цябе кахаю». Але я яшчэ не ведала, як я яго кахала. Не ўяўляла… Жылі мы ў інтэрнаце пажарнай часткі, дзе ён служыў. На другім паверсе. І яшчэ тры маладыя сям'і, на ўсіх адна кухня. А ўнізе, на першым паверсе, стаялі машыны. Чырвоныя пажарныя машыны. Гэта была ягоная служба. Я заўсёды ў курсе: дзе ён, што з ім. Сярод ночы чую нейкі шум. Крыкі. Глянула ў вакно. Ён убачыў мяне: «Зачыні форткі і кладзіся спаць. На станцыі пажар. Я хутка буду».

Самога выбуху не бачыла. Толькі полымя. Усё быццам свяцілася… Усё неба… Высокае полымя. Курадым. Гарачыня страшная. А яго ўсё няма і няма. Курадым ад таго, што бітум гарэў, дах у станцыі быў заліты бітумам. Хадзілі, потым успамінаў, як па смале. Збівалі агонь, а ён поўз. Падымаўся. Скідвалі вогненны графіт нагамі… Паехалі яны без брызентавых касцюмаў, як былі ў адных кашулях, так і паехалі. Іх не папярэдзілі, іх выклікалі на звычайны пажар…

Чатыры гадзіны… Пяць гадзін… Шэсць… У шэсць мы з ім збіраліся ехаць да ягоных бацькоў. Бульбу садзіць. Ад горада Прыпяць да вёскі Спярыжжа, дзе жылі ягоныя бацькі, сорак кіламетраў… Сеяць, за плугам хадзіць… Ён гэта любіць… Маці часта ўспамінала, як не хацелі яны з бацькам адпускаць яго ў горад, нават новы

дом паставілі. Забралі ў армію. Служыў у Маскве ў пажарных войсках і, калі вярнуўся, — толькі ў пажарнікі! Нічога іншага не прызнаваў. *(Маўчыць.)*

Часам нібы чую ягоны голас… Жывы… Нават фатаграфіі мяне так не кранаюць, як голас. Але ён ніколі мяне не кліча. І ў сне… Гэта я яго клічу…

Сем гадзін… А сёмай мне перадалі, што ён у бальніцы. Я пабегла, але вакол бальніцы ўжо стаяла кальцом міліцыя, нікога не пускалі. Адны машыны «хуткай дапамогі» заязджалі. Міліцыянеры крычалі: да машын не набліжацца, лічыльнікі зашкальваюць! Не толькі я, усе жонкі прыбеглі, усе, у каго мужы ў гэтую ноч апынуліся на станцыі. Я кінулася шукаць сваю знаёмую. Яна працавала доктарам у гэтай бальніцы. Схапіла яе за халат, калі яна выходзіла з машыны: «Прапусці мяне!» — «Не магу! Ён у цяжкім стане. Яны ўсе…» Трымаю яе: «Толькі паглядзець». — «Добра, — кажа, — тады пабеглі. На пятнаццаць-дваццаць хвілін». Я ўбачыла яго… Азызлы ўвесь, апухлы… Вачэй амаль няма… «Трэба малако. Шмат малака! — сказала мне знаёмая. — Каб яны выпілі хаця б па тры літры». — «Але ён не п’е малака». — «Цяпер будзе піць». Многія дактары, медсёстры, асабліва санітаркі з гэтай бальніцы ў хуткім часе захварэюць. Памруць. Але тады ніхто гэтага не ведаў…

У дзесяць раніцы памёр аператар Шышанок. Ён памёр першы… У першы дзень… Мы даведаліся, што пад развалінамі застаўся другі — Валера Хадзямчук. Яго так і не дасталі. Залілі бетонам. Але мы яшчэ не ведалі, што яны ўсе будуць першыя…

Пытаюся: «Васечка, што рабіць?» — «З’язджай адсюль. З’язджай! У цябе будзе дзіця». Я — цяжарная. Але як я яго пакіну? Просіць: «З’язджай! Ратуй дзіця!» — «Спачатку прынясу табе малака, а потым вырашым».

Прыбягае мая сяброўка Таня Кібянок... Яе муж у той самай палаце. З ёю бацька, ён на машыне. Сядаем і едзем у бліжэйшую вёску па малако, кіламетры тры за горад... Купляем шмат трохлітровых слоікаў з малаком... Шэсць — каб хапіла на ўсіх... Але ад малака іх страшэнна ванітавала... Увесь час страчвалі прытомнасць, ім ставілі кропельніцы. Дактары чамусьці паўтаралі, што яны атруціліся газамі, ніхто не казаў пра радыяцыю. А горад запоўніўся вайсковай тэхнікай, перакапалі ўсе дарогі. Паўсюль салдаты. Электрычкі, цягнікі ўжо не ходзяць. Мылі вуліцы нейкім белым парашком. Я хвалявалася, як мне заўтра дабрацца ў вёску, каб купіць яму сырадою. Ніхто не казаў пра радыяцыю. Адны вайскоўцы хадзілі ў рэспіратарах... Гараджане неслі з магазінаў хлеб, адкрытыя кулёчкі з цукеркамі. Піражныя ляжалі на прылаўках... Звычайнае жыццё. Толькі... Мылі вуліцы нейкім парашком...

Увечары ў бальніцу не пусцілі. Мора людзей навокал... Я стаяла насупраць яго вакна, ён падышоў і нешта мне крычаў. У такім адчаі! У натоўпе хтосьці пачуў: уначы іх павязуць у Маскву. Жонкі збіліся ўсе разам. Вырашылі: паедзем з імі. Пусціце нас да нашых мужоў! Не маеце права! Біліся, драпаліся. Салдаты — ужо стаяў ланцуг у два шэрагі — нас адштурхоўвалі. Тады выйшаў доктар і пацвердзіў, што яны паляцяць на самалёце ў Маскву, але нам трэба прынесці ім адзенне — тое, у якім яны былі на станцыі, згарэла. Аўтобусы ўжо не хадзілі, і мы бегма — праз увесь горад... Прыбеглі з сумкамі, а самалёт паляцеў ужо. Нас спецыяльна падманулі. Каб мы не крычалі, не плакалі...

Ноч... На адным баку вуліцы аўтобусы, сотні аўтобусаў (ужо рыхтавалі горад да эвакуацыі), на другім баку — сотні пажарных машын. Нагналі адусюль. Уся

вуліца — у белай пене. Мы па ёй ідзём... Лаемся і плачам...

Па радыё абвясцілі: эвакуацыя на тры-пяць дзён, вазьміце з сабой цёплыя рэчы і спартыўныя касцюмы. Будзеце жыць у лясах. У палатках. Людзі нават узрадаваліся — паедзем на прыроду! Сустрэнем там Першае мая. Незвычайна. Рыхтавалі ў дарогу мяса на шашлыкі, віно куплялі. Бралі з сабой гітары, магнітафоны. Усе любілі майскія святы! Плакалі толькі тыя, чые мужы пацярпелі.

Не памятаю, як даехала... Быццам прачнулася, калі ўбачыла ягоную маці: «Мама, Вася ў Маскве! Павезлі спецыяльным самалётам!» Але мы дасадзілі гарод — бульбу, капусту (а праз тыдзень — вёску на эвакуацыю!). Хто ведаў? Хто тады гэта ведаў? Адвячоркам мяне пачало ванітаваць. Я — на шостым месяцы цяжарнасці. Мне так дрэнна... Уначы сніцца, што ён мяне кліча. Пакуль быў жывы, клікаў мяне ў сне: «Люся! Люсечка!» А калі памёр, ні разу не паклікаў. Ні разу... *(Плача.)* Падымаюся я ўранні з думкаю, што паеду ў Маскву адна... «Куды ты такая паедзеш?» — плача маці. Сабралі ў дарогу бацьку: «Няхай давязе цябе». Знялі з ашчаднай кніжкі грошы, якія ў іх былі. Усе грошы знялі.

Дарогі я не памятаю... Дарога зноў выпала з памяці... У Маскве ў першага ж міліцыянера запытала, у якой бальніцы ляжаць чарнобыльскія пажарнікі, і ён нам сказаў, я нават здзівілася, бо нас палохалі: дзяржаўная таямніца, усё сакрэтна.

Шостая бальніца — на «Шчукінскай»...

У гэтую бальніцу, спецыяльная радыелагічная бальніца, без прапускоў не пускалі. Я дала грошай вахцёрцы, і тады яна кажа: «Ідзі». Сказала, які паверх. Камусьці я зноў прасіла, маліла... І вось сяджу ў кабінеце

ў загадчыцы радыелагічнага аддзялення — Ангеліны Васільеўны Гуськовай. Тады яшчэ не ведала, як яе завуць, нічога не запамінала. Ведала толькі, што павінна яго ўбачыць. Знайсці.

Яна адразу ў мяне пытаецца:

— Міленькая мая! Міленькая мая… Дзеці ёсць?

Ну як я прызнаюся?! І ўжо разумею, што трэба хаваць сваю цяжарнасць. Не пусціць да яго! Добра, што я худзенькая, нічога па мне і не заўважыш.

— Ёсць, — кажу.

— Колькі?

Думаю: «Трэба сказаць, што двое. Калі адно дзіця — усё роўна не пусціць».

— Хлопчык і дзяўчынка.

— Калі двое, нараджаць, відаць, больш не давядзецца. Цяпер слухай: цэнтральная нервовая сістэма пашкоджаная цалкам, касцявы мозг пашкоджаны цалкам…

«Няхай, — думаю, — будзе трошкі нервовым».

— Яшчэ слухай: калі заплачаш — я цябе адразу адсюль выpraўлю. Абдымацца і цалавацца нельга. Блізка не падыходзіць. Даю паўгадзіны.

Але я ведала, што ўжо адсюль не пайду. Калі пайду, то з ім. Паклялася сабе!

Заходжу… Яны сядзяць на ложку, гуляюць у карты і смяюцца.

— Вася! — крычаць яму.

Паварочваецца:

— Ну, братцы, я прапаў! І тут знайшла!

Смешны такі, піжама на ім сорак восьмага памеру, а ў яго — пяцьдзясят другі. Кароткія рукавы, кароткія штонікі. Але пухліна з твару ўжо сышла… Ім улівалі нейкі раствор…

— А чаму гэта ты раптам прапаў? — пытаюся.

І ён хоча мяне абняць.

— Сядзі-сядзі, — не пускае яго да мяне доктар. — Няма чаго тут абдымацца.

Неяк мы гэта ў жарт ператварылі. І тут ужо ўсе збегліся, з іншых палат таксама. Усе нашы. З Прыпяці. Іх жа дваццаць восем чалавек самалётам прывезлі. Што там? Што там у нас у горадзе? Я кажу, што пачалася эвакуацыя, увесь горад вывозяць на тры ці на пяць дзён. Хлопцы маўчаць… А там былі яшчэ дзве жанчыны, адна з іх на прахадной у дзень аварыі дзяжурыла, і яна заплакала:

— Божа мой! Там мае дзеці. Што з імі?

Мне хацелася пабыць з ім удваіх, няхай хоць адну хвіліначку. Хлопцы гэта адчулі, кожны прыдумаў нейкую прычыну, і яны выйшлі ў калідор. Тады я абняла яго і пацалавала. Ён адсунуўся.

— Не сядай побач. Вазьмі крэсла.

— Ды глупства гэта, — махнула я рукой. — А ты бачыў, дзе быў выбух? Што там? Вы ж першыя туды трапілі…

— Найхутчэй гэта шкодніцтва. Нехта спецыяльна зрабіў. Усе нашы хлопцы так думаюць.

Тады так казалі. Думалі.

На наступны дзень, калі я прыйшла, яны ўжо ляжалі па адным, кожны ў асобнай палаце. Ім катэгарычна забаранілі выходзіць у калідор. Сустракацца адзін з адным. Перастукваліся праз сценку: кропка-працяжнік, кропка-працяжнік… Кропка… Дактары растлумачылі гэта тым, што кожны арганізм па-рознаму рэагуе на дозы апраменьвання, і тое, што вытрымае адзін, іншы не адужае. Там, дзе яны ляжалі, «зашкальвалі» нават сцены. Злева, справа і паверх пад імі… Там усіх выселілі, ніводнага хворага… Пад імі і над імі нікога…

Тры дні я жыла ў сваіх маскоўскіх знаёмых. Яны мне казалі: бяры каструлю, бяры міску, бяры ўсё, што табе трэба, не саромейся. Гэта такія аказаліся людзі... Такія! Я варыла булён з індычкі, на шэсць чалавек. Шэсць нашых хлопцаў... Пажарнікаў... З адной змены... Яны ўсе дзяжурылі ў тую ноч: Вашчук, Кібянок, Ціцянок, Правік, Цішура. У краме купіла ім усім зубную пасту, шчоткі, мыла. Нічога гэтага ў бальніцы не было. Маленькія ручнікі купіла... Я дзіўлюся цяпер са сваіх знаёмых, яны, канешне, баяліся, не маглі не баяцца, ужо хадзілі розныя чуткі, але ўсё адно самі мне прапаноўвалі: бяры ўсё, што трэба. Бяры! Як ён? Як яны ўсе? Яны будуць жыць?.. *(Маўчыць.)* Сустрэла тады шмат добрых людзей, я не ўсіх запомніла... Свет звузіўся да адной кропкі. Ён... Толькі ён... Памятаю санітарку ў гадах, якая мяне вучыла: «Ёсць хваробы, якія не вылечваюцца. Трэба сядзець і гладзіць рукі».

Раннім ранкам еду на рынак, адтуль — да сваіх знаёмых, гатую булён. Усё працерці, накрышыць, разліць па порцыях. Хтосьці папрасіў: «Прывязі яблычак». З шасцю паўлітровымі слоічкамі... Заўсёды на шасцярых! У бальніцу... Сяджу да вечара. А ўвечары — зноў у іншы канец горада. На колькі б мяне так хапіла? Але праз тры дні сказалі, што можна жыць у гасцініцы для медработнікаў, на тэрыторыі самой бальніцы. Божа, якое шчасце!

— Але там няма кухні. Як я ім буду гатаваць?

— Вам ужо не трэба гатаваць. Іх страўнікі перастаюць успрымаць ежу.

Ён пачаў мяняцца — кожны дзень я сустракала ўжо іншага чалавека... Апёкі выходзілі наверх... У роце, на языку і шчоках спачатку з'явіліся маленькія язвачкі, потым яны разрасліся. Пластамі адыходзіла слізістая, плевачкамі белымі. Колер твару... Колер цела... Сіні...

Чырвоны… Шэра-буры… А яно такое ўсё маё, такое любімае! Гэта нельга расказаць ! Гэта нельга напісаць! І нават перажыць… Ратавала тое, што ўсё гэта адбывалася імгненна: не было калі думаць, не было калі плакаць.

Я кахала яго! Я яшчэ не ведала, як я яго кахала! Мы толькі пажаніліся, яшчэ не нарадаваліся адно адным… Ідзём па вуліцы. Падхопіць мяне на рукі і закружыцца. І цалуе, цалуе. Людзі ідуць міма, і ўсе ўсміхаюцца.

Клініка вострай прамянёвай хваробы — чатырнаццаць дзён… За чатырнаццаць дзён чалавек паміpae…

У гасцініцы ў першы ж дзень мяне замерылі. Адзенне, сумка, кашалёк, туфлі — усё «гарэла». І ўсё гэта ў мяне адразу забралі. Нават ніжнюю бялізну. Не кранулі толькі грошы. Узамен выдалі бальнічны халат пяцьдзясят шостага памеру на мой сорак чацвёрты, а тэпці — сорак трэцяга замест трыццаць сёмага. Адзенне, сказалі, магчыма, прывязём, а можа, і не, наўрад ці яго ўдасца «пачысціць». У такім выглядзе я і з'явілася перад ім. Спалохаўся: «Бацюхны мае, што з табой?» А я ўсё ж прымудралася варыць булён. Ставіла кіпяцільнік у шкляны слоік… Кідала туды кавалачкі курыцы… Маленькія-маленькія… Потым нехта даў мне сваю каструльку, здаецца, прыбіральніца або дзяжурная гасцініцы. Нехта — дошчачку, на якой я рэзала свежую пятрушку. У бальнічным халаце сама я не магла дабрацца да рынку, хтосьці мне гэтую зяляніну прыносіў. Але ўсё дарэмна, ён не мог нават піць… праглынуць сырое яйка… А мне хацелася здабыць што-небудзь смачненькае! Як быццам гэта магло дапамагчы. Дабегла да пошты: «Дзяўчаткі, — прашу, — мне трэба тэрмінова пазваніць бацькам у Івана-Франкоўск. У мяне тут муж паміpae». Чамусьці яны адразу здагадаліся, адкуль я і хто мой муж, імгненна злучылі. Мой тата, сястра

і брат у той самы дзень вылецелі да мяне ў Маскву. Прывезлі мае рэчы. Грошы.

Дзявятага мая… Ён заўсёды мне казаў: «Ты не ўяўляеш, якая прыгожая Масква! Асабліва на Дзень перамогі, калі салют. Я хачу, каб ты ўбачыла». Сяджу каля яго ў палаце, расплюшчыў вочы:

—Цяпер дзень або вечар?

—Дзевяць вечара.

—Адчыняй вакно! Пачынаецца салют!

Я адчыніла. Восьмы паверх, увесь горад перад намі! Вогненны букет узляцеў у неба.

—Якая прыгажосць!

—Я абяцаў табе, што пакажу Маскву. Я абяцаў, што па святах буду ўсё жыццё дарыць кветкі…

Азірнулася — дастае з-пад падушкі тры гваздзікі. Даў медсястры грошы — і яна купіла.

Падбегла да яго, цалую:

—Адзіны мой! Каханне маё!

Пачаў бурчэць:

—Што табе загадваюць дактары? Нельга мяне абдымаць! І цалаваць нельга!

Мне забаранялі яго абдымаць. Гладзіць… Але я… Я падымала і садзіла яго на ложак. Перасцілала пасцель, ставіла градуснік, прыносіла і выносіла судно… Выцірала… Усю ноч — побач. Вартавала кожны ягоны рух. Кожны ўздых.

Добра, што не ў палаце, а ў калідоры… У мяне закружылася галава, я схапілася за падвааконнік… Міма ішоў доктар, узяў мяне за руку. І нечакана:

—Вы цяжарная?

—Не-не! — Я так спалохалася, што нас хто-небудзь пачуе.

—Не трэба падманваць, — уздыхнуў ён.

Я так разгубілася, што не паспела яго ні пра што папрасіць.

Назаўтра мяне выклікаюць да загадчыцы:

—Чаму вы мяне падманулі?

—Не было выйсця. Каб сказала праўду — адправілі б дадому. Святая мана!

—Што вы нарабілі!

—Але я з ім…

—Міленькая ты мая! Міленькая мая…

Усё жыццё буду ўдзячная Ангеліне Васільеўне Гуськовай. Усё жыццё!

Іншыя жонкі таксама прыязджалі. Але іх ужо не пусцілі. Былі са мной іхнія мамы: мамам дазволілі… Мама Валодзі Правіка ўвесь час прасіла Бога: «Вазьмі лепей мяне».

Амерыканскі прафесар, доктар Гейл… Гэта ён рабіў аперацыю па перасадцы касцявога мозгу… Суцяшаў мяне: надзея ёсць, маленькая, але ёсць. Такі магутны арганізм, такі дужы хлопец! Выклікалі ўсіх яго сваякоў. Дзве сястры прыехалі з Беларусі, брат з Ленінграда — ён там служыў. Малодшая Наташа, ёй было чатырнаццаць, вельмі баялася і плакала. Але ейны касцявы мозг падышоў лепей за ўсіх… *(Замаўкае.)* Я ўжо магу пра гэта расказваць… Раней не магла. Я дзесяць гадоў маўчала. Дзесяць гадоў… *(Замаўкае.)*

Калі ён даведаўся, што касцявы мозг бяруць у ягонай малодшай сястрычкі, наадрэз адмовіўся: «Я лепей памру. Не чапайце яе. Яна маленькая». Старэйшай сястры Любе было дваццаць восем гадоў. Яна сама медсястра, разумела, на што ідзе. Яна казала: «Толькі б ён жыў». Я бачыла аперацыю. Яны ляжалі блізенька так на сталах… Там вялікае вакно ў аперацыйным зале. Аперацыя ішла дзве гадзіны… Калі закончылі, Людзе было

горш, чым яму, у яе на грудзях васямнаццаць праколаў, цяжка выходзіла з наркозу. І цяпер хварэе, на інваліднасці… Была прыгожая, моцная дзяўчынка. Замуж не выйшла… А я тады кідалася з адной палаты ў другую, ад яго — да яе. Ён ляжаў ужо не ў звычайнай палаце, а ў спецыяльнай баракамеры, за празрыстай плёнкай, туды заходзіць не дазвалялі. Там такія спецыяльныя прыстасаванні ёсць, каб, не заходзячы пад плёнку, рабіць уколы, ставіць катэтар… Усё на ліпучках, на замочках, і я навучылася імі карыстацца… Ціхенька плёнку адсуну і прабяруся да яго… Урэшце каля ягонага ложка мне паставілі маленькае крэсла. Яму стала так дрэнна, што я ўжо не магла адысці, ні на хвіліну. Клікаў мяне ўвесь час: «Люся, дзе ты? Люсенька!» Клікаў і клікаў… Іншыя баракамеры, дзе ляжалі нашы хлопцы, абслугоўвалі салдаты. Штатныя санітары адмовіліся, патрабавалі ахоўнае адзенне. Салдаты выносілі судно, працíралі падлогу, мянялі пасцельную бялізну… Цалкам абслугоўвалі. Адкуль там з'явіліся салдаты? Не пыталася… Толькі ён… Ён… А кожны дзень чую: памёр, памёр, памёр… Памёр Цішура. Памёр Ціцянок. Памёр… Як малатком па цемечку…

На судно дваццаць пяць — трыццаць разоў на суткі. З крывёю і сліззю. Скура пачала трэскацца на руках, нагах… Усё цела пакрылася вадырамі. Калі ён паварочваў галаву, на падушцы заставаліся пасмы валасоў… А ўсё такое роднае. Маё… Я спрабавала жартаваць: «Нават зручна. Не трэба насіць грабеньчык». Хутка іх усіх пастрыглі. Яго я стрыгла сама. Я ўсё хацела яму рабіць сама. Калі б магла вытрымаць фізічна, я ўсе б дваццаць чатыры гадзіны ад яго не адыходзіла. Мне кожнай хвілінкі было шкада… *(Закрывае твар рукамі і маўчыць.)* Прыехаў мой брат і спалохаўся: «Я цябе туды не

пушчу!» А бацька кажа яму: «Хіба такую не пусціш? Ды яна ў вакно залезе! Па пажарнай лесвіцы!»

Адлучылася… Вяртаюся — на століку ў яго апельсін… Вялікі, не жоўты, а ружовы. Усміхаецца: «Мяне пачаставалі. Вазьмі сабе». А медсястра праз плёначку махае, што нельга гэты апельсін есці. Калі ён побач з ім нейкі час паляжаў, яго не тое што есці, да яго дакранацца страшна. «Ну з'еш, — просіць. — Ты ж любіш апельсіны». Я бяру апельсін у рукі. А ён закрывае вочы і засынае. Яму ўвесь час давалі ўколы, каб спаў. Наркотыкі. Медсястра глядзіць на мяне ў жаху… А я? Я гатовая зрабіць усё, каб ён толькі не думаў пра смерць… І пра тое, што хвароба ягоная жахлівая, што я яго баюся… Абрывак нейкай размовы… Хтосьці мяне ўгаворвае: «Вы не павінны забываць, што перад вамі ўжо не муж, не каханы чалавек, а радыеактыўны аб'ект з высокай шчыльнасцю забруджання. Вы ж не самагубца. Вазьміце сябе ў рукі». А я быццам звар'яцелая: «Я яго кахаю! Я яго кахаю!» Ён спаў, а я шаптала: «Я цябе кахаю!» Ішла па бальнічным двары: «Я цябе кахаю!» Несла судно: «Я цябе кахаю!» Успамінала, як мы з ім раней жылі. У нашым інтэрнаце… Ён засынаў уначы толькі тады, калі возьме мяне за руку. У яго звычка такая была: у сне трымаць мяне за руку. Усю ноч.

А ў бальніцы я вазьму яго за руку і не адпускаю…

Ноч. Цішыня. Мы адны. Паглядзеў на мяне ўважліва-ўважліва і раптам кажа:

—Так хачу ўбачыць наша дзіця. Якое яно?

—А як мы яго назавем?

—Ну, гэта ты ўжо сама прыдумаеш…

—Чаму я, калі нас двое?

—Тады, калі народзіцца хлопчык, няхай будзе Вася, а калі дзяўчынка — Наташка.

—Як гэта Вася? У мяне ўжо ёсць адзін Вася. Ты! Мне іншага не трэба.

Я яшчэ не ведала, як я яго кахала! Ён... Толькі ён... Як сляпая! Нават не адчувала штуршкоў пад сэрцам... Хоць была ўжо на шостым месяцы... Я думала, што яна ўсярэдзіне мяне, мая маленькая, і яна абароненая. Мая маленькая...

Пра тое, што начую ў яго ў баракамеры, ніхто з дактароў не ведаў. Не здагадваўся. Пускалі мяне медсёстры. Спачатку таксама ўгаворвалі: «Ты маладая. Што ты надумала? Гэта ўжо не чалавек, а рэактар. Згарыце разам». Я, як сабачка, бегала за імі... Стаяла гадзінамі пад дзвярыма. Прасіла-маліла. І тады яны: «Чорт з табой! Ты — ненармальная!» Раніцой перад восьмай гадзінай, калі дактары пачыналі абход, паказваюць праз плёнку: «Бяжы!» На гадзінку збегаю ў гасцініцу. А з дзевяці раніцы да дзевяці вечара ў мяне пропуск. Ногі да каленяў пасінелі, распухлі, так я стамлялася. Мая душа была мацнейшая, чым цела. Маё каханне...

Пакуль я з ім... гэтага не рабілі... Але калі сыходзіла, яго фатаграфавалі... Адзення ніякага. Голы. Адна лёгкая прасцінначка зверху. Я кожны дзень мяняла гэтую прасцінначку, а пад вечар яна ўся ў крыві. Падымаю яго, і ў мяне на руках застаюцца кавалачкі скуры, прыліпаюць. Прашу: «Міленькі! Дапамажы мне! Абапрыся на руку, на локаць, колькі зможаш. Каб я табе пасцель разгладзіла, не пакінула ніводнага шва, ніводнай складачкі». Любы шоўчык — гэта ўжо рана на ім. Я зразала сабе пазногці да крыві, каб дзе-небудзь яго не зачапіць. Ніхто з медсёстраў не адважваўся падысці, дакрануцца, калі нешта трэба, клікалі мяне. І яны... Яны фатаграфавалі... Казалі, для навукі. А я іх усіх павыганяла б

адтуль! Крычала б і біла! Як яны могуць! Калі б я магла іх туды не пусціць… Калі б…

Выйду з палаты ў калідор… Іду проста на сценку, на канапу, бо нічога не бачу. Спыню дзяжурную медсястру: «Ён памірае». Яна мне адказвае: «А што ты хочаш? Ён атрымаў тысячу шэсцьсот рэнтгенаў. А смяротная доза чатырыста». Ёй таксама шкада, але па-іншаму. А яно ўсё маё… Усё роднае.

Калі яны ўсе памерлі, у бальніцы зрабілі рамонт… Сцены шкрэблі, паркет знялі і вынеслі… Сталярку.

Далей — апошняе… Памятаю ўрыўкамі. Усё адплывае…

Ноч сяджу каля яго на крэселку… А восьмай раніцы: «Васечка, я пайду. Адпачну трошачкі». Расплюшчыць і заплюшчыць вочы — адпусціў. Толькі дайду да гасцініцы, да свайго пакоя, лягу на падлогу, на ложку ляжаць не магла, так усё балела, як ужо санітарка стукае: «Ідзі! Бяжы да яго! Кліча бязлітасна!» А ў тую раніцу Таня Кібянок так мяне прасіла, клікала: «Паедзем са мной на могілкі. Без цябе не змагу». У тую раніцу хавалі Віцю Кібянка і Валодзю Правіка. З Віцем яны былі сябры, мы сябравалі сем'ямі. За дзень да выбуху разам фатаграфаваліся ў нас у інтэрнаце. Такія яны, нашы мужы, там прыгожыя! Вясёлыя! Апошні дзень нашага таго жыцця… Дачарнобыльскага… Такія мы шчаслівыя!

Вярнулася з могілак, хуценька званю на пост медсястры: «Як ён там?» — «Пятнаццаць хвілін як памёр». Як? Я ўсю ноч была ў яго, толькі на тры гадзіны адлучылася! Стала каля вакна і крычала: «Чаму? За што?» Глядзела на неба і крычала… На ўсю гасцініцу… Да мяне падысці баяліся… Апамяталася: напаследак яго ўбачу! Убачу! Скацілася з лесвіцы… Ён ляжаў

яшчэ ў баракамеры, не забралі. Апошнія словы ягоныя: «Люся! Люсенька!» — «Толькі адышлася. Зараз прыбяжыць», — супакоіла медсястра. Уздыхнуў і заціх.

Я ўжо ад яго не адарвалася… Ішла з ім да труны… Хоць запомніла не саму труну, а вялікі поліэтыленавы пакет… Гэты пакет… У моргу спыталі: «Хочаце, мы пакажам вам, у што яго адзенем?» Хачу! Адзелі ў парадную форму, фуражку на грудзі паклалі. Абутак не падабралі, бо ногі распухлі. Бомбы замест ног. Парадную форму таксама разрэзалі, нацягнуць не маглі, не было ўжо цэлага цела. Усё — крывавая рана. У бальніцы апошнія два дні… Падыму яму руку, а косць хістаецца, боўтаецца косць, цялесная тканка ад яе адышла. Кавалачкі лёгкіх, кавалачкі печані ішлі праз рот… Захлынаўся сваімі вантробамі… Абкручу руку бінтам, засуну яму ў рот і ўсё гэта з яго выграбаю… Гэта нельга напісаць! І нават перажыць… Гэта ўсё такое роднае… Такое… Ніводнага памеру абутку немагчыма было нацягнуць… Паклалі ў труну босага…

На маіх вачах… У параднай форме засунулі яго ў цэлафанавы мех і завязалі. І гэты мех паклалі ўжо ў драўляную труну… А труну яшчэ адным мяшком абвязалі. Цэлафан празрысты, але тоўсты, як цырата. І ўжо ўсё гэта змясцілі ў цынкавую труну, ледзьве ўцiснулі. Адна фуражка наверсе засталася.

З’ехаліся ўсе… Ягоныя бацькі, мае бацькі… Купілі ў Маскве чорныя хусткі… Нас прымала надзвычайная камісія. Усім казалі адно і тое самае. Што аддаць вам целы вашых мужоў, вашых сыноў мы не можам, яны вельмі радыеактыўныя і будуць пахаваныя на маскоўскіх могілках асаблівым спосабам. У запаяных цынкавых трунах, пад бетоннымі плітамі. І вы павінны гэты дакумент падпісаць. Трэба вашая згода. Калі нехта

абураўся, хацеў везці труну на радзіму, яго пераконвалі, што яны, маўляў, героі і цяпер сям'і ўжо не належаць. Яны ж дзяржаўныя людзі… Належаць дзяржаве.

Селі ў катафалк… Сваякі і нейкія вайскоўцы. Палкоўнік з рацыяй… Па рацыі перадаюць: «Чакайце нашых загадаў! Чакайце!» Дзве або тры гадзіны кружлялі па Маскве, па кальцавой дарозе. Зноў у Маскву вяртаемся… Па рацыі: «На могілкі заезд не дазваляем. Могілкі атакуюць замежныя карэспандэнты. Яшчэ пачакайце». Бацькі маўчаць… Хустка ў мамы чорная… Я адчуваю, што страчваю прытомнасць. У мяне істэрыка: «Чаму майго мужа трэба ад усіх хаваць? Ён — хто? Забойца? Злачынец? Крымінальнік?» Мама: «Цішэй, цішэй, дачушка». Гладзіць мяне па галаве, бярэ за руку. Палкоўнік перадае: «Дазвольце ехаць на могілкі. З жонкай істэрыка». На могілках нас абкружылі салдаты. Ішлі пад канвоем. І труну неслі пад канвоем. Нікога не пусцілі развітацца… Адны сваякі… Засыпалі імгненна. Афіцэр камандаваў: «Хутчэй! Хутчэй!» Нават не далі труну абняць.

І адразу — у аўтобусы…

Імгненна купілі і прынеслі білеты назад, дадому. На наступны дзень… Увесь час з намі быў нейкі чалавек у цывільным, з вайсковай выпраўкай, не дазволіў нават выйсці з нумара і купіць прадуктаў на дарогу. Крый божа, каб мы з кім-небудзь загаварылі, асабліва я. Як быццам я тады магла гаварыць, я ўжо нават плакаць не магла. Дзяжурная, калі мы сыходзілі, пералічыла ўсе ручнікі, усе прасціны… Складвала іх адразу ў поліэтыленавы мех. Напэўна, спалілі… За гасцініцу мы самі заплацілі. За чатырнаццаць сутак…

Клініка прамянёвай хваробы — чатырнаццаць сутак… За чатырнаццаць сутак чалавек памірае…

Дома я заснула. Зайшла ў дом і павалілася на ложак. Спала трое сутак. Мяне падняць не маглі... Прыехала «хуткая дапамога». «Не, — сказаў доктар, — яна не памерла. Яна прачнецца. Гэта такі страшны сон».

Мне было дваццаць тры гады...

Я памятаю сон... Прыходзіць да мяне мая памерлая бабуля, у тым адзенні, у якім мы яе пахавалі. І ўпрыгожвае ялінку. «Бабуля, чаму ў нас ялінка? Цяпер жа лета?» — «Так трэба. Хутка твой Васечка да мяне прыйдзе». А ён вырас сярод лесу. Я памятаю... Другі сон... Вася прыходзіць увесь у белым і кліча Наташу. Нашую дзяўчынку. Якую я яшчэ не нарадзіла. Яна ўжо вялікая, і я здзіўляюся: калі ж яна так вырасла? Ён падкідвае яе пад столь, і яны смяюцца... А я гляджу на іх і думаю, што шчасце — гэта так проста. Так проста! А потым мне прыснілася... Мы блукаем з ім па вадзе. Доўга-доўга ідзём... Прасіў, відаць, каб я не плакала. Даваў знак адтуль. Зверху. *(Надоўга заціхае.)*

Праз два месяцы я прыехала ў Маскву. З вакзала — на могілкі. Да яго! І там, на могілках, у мяне пачаліся схваткі. Толькі я з ім загаварыла... Выклікалі «хуткую». Я дала адрас. Нараджала я тамсама... У той жа Ангеліны Васільеўны Гуськовай... Яна мяне яшчэ тады папярэдзіла: «Нараджаць прыязджай да нас». А куды я такая яшчэ паеду? Нарадзіла я на два тыдні раней тэрміну...

Мне паказалі... Дзяўчынка... «Наташачка, — паклікала я. — Тата назваў цябе Наташачкай». На выгляд — здаровае дзіця. Ручкі, ножкі... А ў яе быў цыроз печані... У печані — дваццаць восем рэнтгенаў... Прыроджаны парок сэрца... Праз чатыры гадзіны сказалі, што дзяўчынка памерла. І зноў... мы яе вам не аддадзім! Як гэта не аддасцё?! Гэта я вам яе не аддам! Вы хочаце яе забраць для навукі, а я ненавіджу вашу навуку! Не-

навіджу! Яна забрала ў мяне спачатку яго, а цяпер зноў чакае... Не аддам! Я пахаваю яе сама. Побач з ім... *(Пераходзіць на шэпт.)*

Усё не тыя словы вам кажу... Не такія... Нельга мне крычаць пасля інсульту. І плакаць нельга. Але я хачу... Хачу, каб ведалі... Яшчэ нікому не прызнавалася... Калі я не аддала ім маю маленькую дзяўчынку. Нашу дзяўчынку... Тады яны прынеслі мне драўляную скрыначку: «Яна — там». Я паглядзела: яе спавілі. Яна ляжала ў пялюшачках. І тады я заплакала: «Пакладзіце яе ў Васі ў нагах. Скажыце, што гэта наша Наташачка».

Там, на магілцы, не напісана: Наташа Ігнаценка... Там толькі ягонае імя. Яна ж была яшчэ без імя, без нічога... Адна душа... Душу я там і пахавала...

Я прыходжу да іх заўсёды з двума букетамі: адзін — яму, другі — на краёчак кладу ёй. Поўзаю каля магілы на каленях. Заўсёды на каленях... *(Бязладна.)* Я яе забіла... Я... яна... выратавала... Мая дзяўчынка мяне выратавала, яна прыняла ўвесь радыеўдар на сябе, стала як быццам прыёмнікам гэтага ўдару. Такая маленькая. Крошачка. *(Задыхаючыся.)* Яна мяне зберагла. Але я любіла іх абаіх... Хіба... Хіба можна забіць любоўю? Такой любоўю! Чаму гэта побач? Каханне і смерць. Заўсёды яны разам. Хто мне растлумачыць? Хто падкажа? Поўзаю каля магілы на каленях... *(Надоўга заціхае.)*

...У Кіеве мне далі кватэру. У вялікім доме, дзе цяпер жывуць усе, хто з'ехаў з атамнай станцыі. Усе знаёмыя. Кватэра вялікая, двухпакаёвая, пра якую мы з Васем марылі. А я ў ёй проста вар'яцела! У кожным кутку, куды ні зірну, — паўсюль ён. Яго вочы... Пачала рамонт, толькі б не сядзець, забыцца... І так два гады... Сніцца мне сон... Мы ідзём з ім, а ён ідзе басанож. «Чаму ты заўсёды неабуты?» — «Ды таму, што ў мяне нічога няма». Пайшла

ў царкву... Бацюшка мяне навучыў: «Трэба купіць тэпці вялікага памеру і пакласці каму-небудзь у труну. Напісаць цыдулку, што гэта яму». Я так і зрабіла. Прыехала ў Маскву і адразу — у царкву. У Маскве я да яго бліжэй... Ён там ляжыць, на Міцінскіх могілках... Расказваю царкоўнаму служку, што так і так, мне трэба тэпці перадаць. Пытаецца: «А вядома табе, як гэта робіцца?» Яшчэ раз патлумачыў... Якраз заносяць у царкву адпяваць дзядулю старога. Я падыходжу да труны, падымаю накідку і кладу туды тэпці. «А цыдулку ты напісала?» — «Напісала, але не ўказала, на якіх ён могілках ляжыць». — «Там яны ўсе ў адным свеце. Знойдуць яго».

У мяне ніякага жадання жыць не было. Уначы стаю ля вакна, гляджу на неба: «Васечка, што мне рабіць? Я не хачу без цябе жыць». Удзень іду міма дзіцячага садка, стану і стаю... Глядзела б і глядзела на дзяцей... Я вар'яцела! І пачала ўначы прасіць: «Васечка, я нараджу дзіцятка. Я ўжо баюся быць адна. Не вытрымаю больш. Васечка!» А іншым разам так папрашу: «Васечка, мне не трэба мужчыны. Лепей за цябе для мяне няма нікога. Я хачу дзіцятка».

Мне было дваццаць пяць гадоў...

Я знайшла мужчыну... Усё яму расказала... Усю праўду: у мяне адно каханне, на ўсё жыццё. Я ўсё яму адкрыла... Мы сустракаліся, але я ніколі яго да сябе ў дом не клікала, у дом не магла. Там — Вася...

Працавала я кандытарам. Ляплю торт, а слёзы коцяцца. Я не плачу, а слёзы коцяцца. Адзінае, пра што дзяўчат прасіла: «Не шкадуйце мяне. Будзеце шкадаваць — я пайду». Не трэба мяне шкадаваць... Я калісьці была шчаслівая...

Прынеслі мне Васеў ордэн. Чырвонага колеру... Я глядзець на яго доўга не магла. Слёзы коцяцца...

Нарадзіла хлопчыка. Андрэй... Андрэйка... Сяброўкі ўгаворвалі: «Табе нараджаць нельга», і дактары палохалі: «Ваш арганізм не вытрымае». Потым... Потым яны сказалі, што ён будзе без ручкі... Без правай ручкі... Апарат паказваў... «Ну і што? — думала я. — Навучу яго левай ручкай пісаць». А нарадзіўся нармальны... прыгожы хлопчык... Вучыцца ўжо ў школе, на адны пяцёркі. Цяпер я маю кагосьці, кім я дыхаю і жыву. Святло ў маім жыцці. Ён цудоўна ўсё разумее: «Мамачка, калі я паеду да бабулі, на два дні, ты дыхаць зможаш?» Не змагу! Баюся на дзень з ім разлучыцца. Мы ішлі па вуліцы... І я адчуваю, падаю... Тады мяне разбіў першы інсульт... Там, на вуліцы... «Мамачка, табе вадзічкі даць?» — «Не, ты стой каля мяне. Нікуды не ідзі». І схапіла яго за руку. Далей не памятаю... Апрытомнела ў бальніцы... Я так Андрэйку за руку схапіла, што дактары ледзьве расціснулі мне пальцы. У яго рука доўга была сіняя. Цяпер выходзім з дому: «Мамачка, толькі не хапай мяне за руку. Я нікуды ад цябе не пайду». Ён таксама хварэе: два тыдні ў школе, два — дома з доктарам. Вось так і жывём. Баімся адно за аднаго. А ў кожным кутку Вася... Яго фатаграфіі... Уначы з ім размаўляю і размаўляю... Бывае, мяне ў сне папросіць: «Пакажы нашае дзіцятка». Мы з Андрэйкам прыходзім... А ён дачушку за руку прыводзіць. Заўсёды з дачкой. Гуляе толькі з ёй.

Так і жыву... Жыву адначасова ў рэальным і ў нерэальным свеце. Не ведаю, дзе мне лепей... *(Падымаецца, падыходзіць да вакна.)* Нас тут шмат. Цэлая вуліца, яе так і называюць — чарнобыльская. Усё сваё жыццё гэтыя людзі на станцыя адпрацавалі. Многія дагэтуль ездзяць туды на вахту, цяпер станцыю абслугоўваюць вахтавым метадам. Ніхто там ужо не жыве і жыць ніколі не будзе. У іх ува ўсіх цяжкія хваробы, інваліднасць, але

працу сваю не кідаюць, баяцца нават падумаць пра гэта. У іх няма жыцця без рэактара, рэактар — іхняе жыццё. Дзе і каму яны сёння патрэбныя ў іншым месцы? Часта паміраюць. Паміраюць імгненна. Яны паміраюць на хаду — ішоў і заваліўся, заснуў і не прачнуўся. Нёс медсястры кветкі і спынілася сэрца. Стаяў на аўтобусным прыпынку... Яны паміраюць, а іх ніхто па-сапраўднаму не распытаў. Пра тое, што яны перажылі... Што бачылі... Пра смерць людзі не хочуць слухаць. Пра страшнае...

Але я вам расказала пра каханне... Як я кахала...

*Людміла Ігнаценка,*
*жонка загінулага пажарніка Васіля Ігнаценкі*

# ІНТЭРВ'Ю АЎТАРКІ З САМОЙ САБОЙ АБ ПРАПУШЧАНАЙ ГІСТОРЫІ І АБ ТЫМ, ЧАМУ ЧАРНОБЫЛЬ СТАВІЦЬ ПАД СУМНЕЎ НАШУ КАРЦІНУ СВЕТУ

— Я — сведка Чарнобыля... Самай галоўнай падзеі дваццатага стагоддзя, нягледзячы на страшныя войны і рэвалюцыі, якімі гэтае стагоддзе запомніцца. Прамінула больш за дваццаць гадоў пасля катастрофы, але дагэтуль у мяне застаецца пытанне — пра што я сведчу: пра мінулае ці пра будучыню? Так лёгка саслізнуць у банальнасць... У банальнасць жаху... Але я гляджу на Чарнобыль як на пачатак новай гісторыі, ён — не толькі веды, але і папярэднік гэтых ведаў, бо чалавек уступіў у спрэчку з ранейшымі ўяўленнямі пра сябе і пра свет. Калі мы гаворым пра мінулае ці пра будучыню, то ўкладваем у гэтыя словы свае ўяўленні пра час, але Чарнобыль — гэта найперш катастрофа часу. Радыенукліды, раскіданыя па нашай зямлі, будуць жыць пяцьдзясят, сто, дзвесце тысяч гадоў... Нават больш... З пункту гледжання чалавечага жыцця, яны — вечныя. Што ж мы здольныя зразумець? Ці ў нашых сілах здабыць і распазнаць сэнс у гэтым, яшчэ незнаёмым нам жаху?

Пра што гэтая кніга? Чаму я яе напісала?

Гэтая кніга не пра Чарнобыль, а пра свет Чарнобыля. Пра саму падзею напісаныя ўжо тысячы старонак і знятыя сотні тысяч метраў кінастужкі. Я ж займаюся тым, што назвала б прапушчанай гісторыяй, бясследнымі слядамі нашага знаходжання на зямлі і ў часе. Пішу і збіраю паўсядзённасць пачуццяў, думак, слоў.

Намагаюся захапіць побыт душы. Жыццё звычайнага дня звычайных людзей. Тут жа ўсё незвычайнае: і падзея, і людзі, калі яны абжывалі новую прастору. Чарнобыль для іх — не метафара, не сімвал, ён — іх дом. Колькі разоў мастацтва праводзіла рэпетыцыі апакаліпсісу, прапаноўвала розныя тэхналагічныя версіі канца свету, але цяпер мы дакладна ведаем, што жыццё значна больш фантастычнае. Праз год пасля катастрофы мяне хтосьці запытаў: «Усе пішуць. А вы жывяце тут і не пішаце. Чаму?» А я не ведала, як пра гэта пісаць, з якім інструментам і адкуль падступіцца. Калі раней, пішучы свае кнігі, я ўглядалася ў пакуты іншых, то цяпер я і маё жыццё сталіся часткаю падзеі. Зляпіліся ў адно цэлае, не можаш адысці на нейкую адлегласць. Імя маёй маленькай, згубленай у Еўропе краіны, пра якую свет раней амаль нічога не чуў, загучала на ўсіх мовах, яна ператварылася ў д'ябальскую чарнобыльскую лабараторыю, а мы, беларусы, сталі чарнобыльскім народам. Дзе б я цяпер ні з'яўлялася, усе глядзелі з цікавасцю: «А, вы адтуль? Што там?» Вядома, можна было хутка напісаць такую кнігу, якія потым з'яўляліся адна за адной, — што здарылася ў тую ноч на станцыі, хто вінаваты, як хавалі аварыю ад свету і ад свайго народа, колькі тонаў пяску і бетону спатрэбілася, каб збудаваць саркафаг над рэактарам, які дыхаў смерцю, — але нешта мяне спыняла. Трымала за руку. Што? Адчуванне таямніцы. Гэтае адчуванне, што раптоўна пасялілася ў нашых розумах і сэрцах, лунала тады над усім: нашымі размовамі, дзеяннямі, страхамі. Яно ішло ўслед за падзеяй. Падзеяй-пачварай. Ва ўсіх з'явілася выказанае або нявыказанае пачуццё, што мы дакрануліся да невядомага. Чарнобыль — гэта таямніца, якую нам яшчэ трэба будзе разгадаць. Непрачытаны знак. Магчыма, загадка на ўсё дваццаць першае

стагоддзе. Выклік яму. Зрабілася ясна: апрача камуністычных, нацыянальных і новых рэвалюцыйных выклікаў, сярод якіх мы жывём і выжываем, наперадзе нас чакаюць іншыя выклікі, больш жорсткія і татальныя, але пакуль яшчэ схаваныя ад вачэй. Але штосьці пасля Чарнобыля ўжо прыадчынілася…

Ноч 26 красавіка 1986 года… За адну ноч мы патрапілі ў іншае месца гісторыі. Здзейснілі скачок у новую рэальнасць, і яна, гэтая рэальнасць, аказалася вышэйшай не толькі за нашы веды, але і за наша ўяўленне. Парвалася сувязь часоў… Мінулае раптам аказалася бездапаможным, у ім не было на што абаперціся, ва ўсюдыісным (як мы верылі) архіве чалавецтва не знайшлося ключоў, каб адчыніць гэтыя дзверы. У тыя дні я не раз чула: «такіх слоў не падбяру, каб перадаць тое, што бачыла і перажыла», «ніхто мне раней нічога падобнага не расказваў», «ні ў воднай кніжцы пра гэта не чытаў і ў кіно не бачыў». Паміж часам, калі здарылася катастрофа, і тым часам, калі пра яе пачалі расказваць, была паўза. Момант нематы… Ён запомніўся ўсім… Недзе наверсе прымалі нейкія пастановы, складалі сакрэтныя інструкцыі, падымалі ў неба верталёты, перасоўвалі па дарогах велізарную колькасць тэхнікі, унізе — чакалі паведамленняў і баяліся, жылі чуткамі, але ўсе маўчалі пра галоўнае — што ўсё ж здарылася? Не знаходзілі слоў для новых пачуццяў і не знаходзілі пачуццяў для новых слоў, не ўмелі яшчэ выказацца, але паступова пагружаліся ў атмасферу новага думання, так можна сёння вызначыць той наш стан. Проста фактаў ужо не хапала, цягнула зазірнуць за факт, увайсці ў сэнс таго, што адбываецца. Эфект узрушэння! І я шукала гэтага ўзрушанага чалавека… Ён прамаўляў новыя тэксты… Галасы часам прабіваліся як быццам скрозь сон або трызненне,

з паралельнага свету. Побач з Чарнобылем усе пачыналі філасофстваваць. Рабіліся філосафамі. Храмы зноў запоўніліся людзьмі... Вернікамі і нядаўнімі атэістамі... Шукалі адказаў, якіх не маглі даць фізіка і матэматыка. Трохмерны свет рассунуўся, і я не сустракала такіх адважных, якія зноў маглі б прысягнуць на бібліі матэрыялізму. Ярка ўспыхнула бясконцасць. Замаўчалі філосафы і пісьменнікі, выбітыя са знаёмай каляіны культуры і традыцыі. Найцікавей у тыя першыя дні было размаўляць не з вучонымі, не з чыноўнікамі ды вайскоўцамі з вялікімі зоркамі на пагонах, а са старымі сялянамі. Жывуць яны без Талстога і Дастаеўскага, без інтэрнэту, але іх свядомасць нейкім чынам змясціла ў сябе новую карціну свету. Іх свядомасць не разбурылася. Напэўна, мы ўсе хутчэй бы справіліся з ваеннай атамнай сітуацыяй, як у Хірасіме, бо да яе, уласна кажучы, і рыхталіся. Але катастрофа здарылася на неваенным атамным аб'екце, а мы былі людзьмі свайго часу і верылі, як нас вучылі, што савецкія атамныя станцыі самыя надзейныя ў свеце, іх можна будаваць нават на Чырвонай плошчы. Ваенны атам — гэта Хірасіма і Нагасакі, а мірны атам — гэта электрычная лямпачка ў кожным доме. Ніхто яшчэ не здагадваўся, што ваенны і мірны атамы — блізняты. Саўдзельнікі. Мы паразумнелі, увесь свет паразумнеў, але паразумнеў ён пасля Чарнобыля. Сёння беларусы, як жывыя «чорныя скрынкі», запісваюць інфармацыю для будучыні. Для ўсіх. Я доўга пісала гэтую кнігу... Амаль дваццаць гадоў... Сустракалася і размаўляла з былымі работнікамі станцыі, вучонымі, медыкамі, салдатамі, перасяленцамі, самасёламі... З тымі, для каго Чарнобыль — асноўны змест іхняга свету, усё навокал і ўнутры атручанае ім, а не толькі зямля і паветра. Яны расказвалі, шукалі адказы... Мы думалі

разам. Часта яны спяшаліся, баяліся не паспець, я яшчэ не ведала, што цана іх сведчанням — жыццё. «Запішыце, — паўтаралі яны, — мы не ўсё зразумелі, што бачылі, але няхай застанецца. Хтосьці прачытае і зразумее. Потым… Пасля нас…» Недарэмна яны спяшаліся, шмат каго ўжо няма. Але яны паспелі пасласць сігнал…

—Усё, што нам вядома пра жах і страхі, найбольш звязанае з вайной. Сталінскі ГУЛаг і Асвенцім — нядаўнія набыткі зла. Гісторыя заўсёды была гісторыяй войнаў і палкаводцаў, і вайна служыла, скажам так, мераю жаху. Таму людзі змешваюць паняцці вайны і катастрофы… У Чарнобылі мы бачым як быццам усе прыкметы вайны: шмат салдатаў, эвакуацыя, пакінутае жытло. Парушаная плынь жыцця. Чарнобыльская інфармацыя ў газетах спрэс складаецца з ваенных тэрмінаў: атам, выбух, героі… І гэта робіць больш цяжкім разуменне таго, што мы знаходзімся ў новай гісторыі… Пачалася гісторыя катастроф… Але чалавек не хоча пра гэта думаць, бо не задумваўся над гэтым ніколі, ён хаваецца за тое, што яму знаёмае. За мінулае. Нават помнікі героям Чарнобыля падобныя да ваенных…

—Мая першая паездка ў зону…

Цвілі сады, радасна блішчэла на сонцы маладая трава. Спявалі птушкі. Такі знаёмы… знаёмы… свет. Першая думка: усё на месцы і ўсё — як раней. Тая самая зямля, тая ж вада, тыя ж дрэвы. І колер, і форма, і пах у іх вечныя, ніхто не здатны тут нешта змяніць. Але ўжо ў першы дзень мне патлумачылі: кветкі рваць не трэба, на зямлі лепей не сядзець, ваду з крыніцы не піць. Адвячоркам назірала, як пастухі хацелі загнаць у раку стомлены статак, але каровы падыходзілі да вады і адразу паварочвалі назад. Нейкім чынам яны здагадваліся пра небяспеку. А каты, расказвалі мне, адмовіліся есці

здохлых мышэй, якія валяліся і ў полі, і на падворках. Смерць таілася паўсюль, аднак гэта была нейкая іншая смерць. Пад новымі маскамі. У незнаёмым абліччы. Чалавека заспелі знянацку, ён быў негатовы. Негатовы як біявід, не спрацоўваў увесь яго прыродны інструмент, які быў настроены, каб убачыць, пачуць, пакратаць. Гэта ўжо было немагчыма, вочы, вушы, пальцы былі непрыдатныя, не маглі паслужыць, бо радыяцыя нябачная, не мае гуку і паху. Яна бесцялесная. Усё жыццё мы ваявалі або рыхтаваліся да вайны, столькі пра яе ведаем — і раптам! Вобраз ворага змяніўся. У нас з'явіўся іншы вораг. Ворагі… Забівала скошаная трава. Злоўленая рыба, упаляваная дзічына. Яблык… Свет вакол нас, раней падатлівы і прыязны, цяпер унушаў страх. Старыя людзі, ад'язджаючы ў эвакуацыю і яшчэ не ўяўляючы, што назаўсёды, глядзелі на неба: «Сонца свеціць… Няма ні дыму, ні газу. Не страляюць. Ну хіба гэта вайна? А трэба рабіцца ўцекачамі…» Знаёмы… незнаёмы… свет.

Як зразумець, дзе мы знаходзімся? Што з намі адбываецца? Тут… Цяпер… Няма ў каго спытаць…

У зоне і вакол зоны… Уражвала бясконцая колькасць ваеннай тэхнікі. Маршыравалі салдаты з навюткімі аўтаматамі. З поўнай баявой выкладкай. Мне найбольш чамусьці запомніліся не верталёты і бронетранспарцёры, а гэтыя аўтаматы… Зброя… Чалавек са зброяй у зоне… У каго ён мог там страляць і ад каго абараняць? Ад фізікі? Ад нябачных часцінак? Расстраляць забруджаную зямлю або дрэва? На самой станцыя працаваў КДБ. Шукалі шпіёнаў і дыверсантаў, хадзілі чуткі, што аварыя — запланаваная акцыя заходніх спецслужбаў, каб узарваць лагер сацыялізму. Трэба быць пільнымі.

Гэтая карціна вайны… Гэтая культура вайны рухнула ў мяне на вачах. Мы ўвайшлі ў непразрысты свет, дзе зло не дае ніякіх тлумачэнняў, не раскрывае сябе і не ведае законаў.

Я бачыла, як дачарнобыльскі чалавек ператвараўся ў чарнобыльскага чалавека.

— Не аднойчы… І тут ёсць над чым падумаць. Я чула, што паводзіны пажарнікаў, якія тушылі ў першую ноч пажар на атамнай станцыі, нагадваюць самагубства. Калектыўнае самагубства. Ліквідатары часта працавалі без ахоўнай спецвопраткі, без пярэчанняў выпраўляліся туды, дзе «паміралі» робаты. Ад ліквідатараў утойвалі праўду пра атрыманыя высокія дозы, і яны з гэтым мірыліся, а потым яшчэ радаваліся граматам і медалям, якія ім уручалі перад смерцю… А шмат каму не паспявалі ўручыць… Дык усё ж хто яны: героі або самагубцы? Ахвяры савецкіх ідэй і выхавання? Чамусьці з часам забываецца, што яны выратавалі сваю краіну. Выратавалі Еўропу. Толькі на секунду ўявіце карціну, што выбухнулі астатнія тры рэактары…

— Яны героі. Героі новай гісторыі. Іх параўноўваюць з героямі Сталінградскай бітвы, з героямі баталіі пад Ватэрлоа, але яны ратавалі нешта большае, чым Айчыну, яны ратавалі само жыццё. Час жыцця. Жывы час. Чарнобылем чалавек замахнуўся на ўсё, на ўвесь боскі свет, дзе апрача чалавека жывуць тысячы іншых істот, жывёл і раслін. Калі я прыходзіла да ліквідатараў… Слухала іх аповеды, як яны (першыя і ўпершыню!) займаліся новай чалавечай нялюдскай справай — хавалі зямлю ў зямлі, гэта значыць закопвалі забруджаныя пласты ў спецыяльных бетонных бункерах разам з усім іхнім насельніцтвам — жукамі, павукамі, вусенямі. З разнастайнымі жамярыцамі, імёнаў якіх нават не ведалі.

Не памяталі. Яны мелі зусім іншае разуменне смерці, яно пашыралася на ўсё — ад птушкі да матылька. Іхні свет ужо быў іншым светам — з новым правам жыцця, з новай адказнасцю і новым пачуццём віны. У іхніх аповедах заўсёды прысутнічала тэма часу, яны казалі «ўпершыню», «ніколі больш», «назаўжды». Успаміналі, як ездзілі па апусцелых вёсках і сустракалі там адзінокіх старых, якія не захацелі з'ехаць разам з усімі або потым вярнуліся з чужых краёў: сядзелі тыя вечарамі пры лучыне, касілі касой, жалі сярпом, дрэвы валілі сякерай, звярталіся ў малітвах да звяроў і духаў. Да Бога. Усё, як і дзвесце гадоў таму, а недзе наверсе лёталі касмічныя караблі. Час укусіў свой хвост, пачатак і канец злучыліся. Чарнобыль для тых, хто там быў, не скончыўся ў Чарнобылі. Яны вярнуліся не з вайны, а нібыта з іншага свету. Я зразумела, што свае пакуты яны цалкам свядома ператваралі ў новыя веды, дарылі нам: глядзіце, вам трэба з гэтымі ведамі нешта рабіць, неяк іх выкарыстаць.

Помнік героям Чарнобыля… Гэта — створаны чалавечымі рукамі саркафаг, у якім яны ўтаймавалі ядзерны агонь. Піраміда дваццатага стагоддзя.

На чарнобыльскай зямлі шкада чалавека. А яшчэ больш шкада звера… Я не агаварылася. Зараз патлумачу… Што заставалася ў мёртвай зоне пасля таго, як сыходзілі людзі? Старыя пагосты і біямогільнікі, так называюць могілкі для жывёлы. Чалавек ратаваў толькі сябе, усім астатнім ён здрадзіў, пасля ягонага ад'езду ў вёскі заходзілі салдаты або паляўнічыя і расстрэльвалі жывёл. А сабакі беглі на чалавечы голас… і коткі… І коні таксама нічога не маглі зразумець… А яны ў чым вінаватыя — ні звяры, ні птушкі, і паміралі яны моўчкі, а гэта яшчэ страшней. Некалі індзейцы ў Мексіцы

і нават нашыя продкі ў дахрысціянскія часы прасілі даравання ў жывёлін, якіх забівалі сабе на пракорм. А ў старажытным Егіпце жывёліна мела права паскардзіцца на чалавека. У адным з папірусаў, адшуканых у пірамідах, напісана: «Не знойдзена ніводнай скаргі быка на N». Перад сыходам у царства мёртвых егіпцянін чытаў малітву, у якой былі і такія словы: «Я не крыўдзіў ніякае стварэнне. Я не адбіраў у жывёл ні зерня, ні травы».

Што даў чарнобыльскі досвед? Ці наблізіў ён нас да гэтага маўклівага таямнічага свету «іншых»?

Аднойчы бачыла, як салдаты ўвайшлі ў пакінутую людзьмі вёску і пачалі страляць…

Бездапаможныя крыкі жывёл… Яны крычалі на розных сваіх мовах… Пра гэта ўжо напісана ў Новым Запавеце. Ісус Хрыстос прыходзіць у Іерусалімскі храм і бачыць там жывёлін, падрыхтаваных да рытуальнай ахвяры: у іх перарэзаныя гарлякі, яны сплываюць крывёю. Ісус закрычаў: «Вы ператварылі дом малітвы ў прытон разбойнікаў». Ён мог бы дадаць — у бойню… Для мяне сотні пакінутых у зоне біямогільнікаў — тыя ж старажытныя капішчы. Толькі якому з багоў? Богу навукі і ведаў ці богу агню? У гэтым сэнсе Чарнобыль далей за Асвенцім і Калыму. Далей за Халакост. Ён прапануе заканчанасць. Упіраецца ў нішто.

Іншымі вачыма бачу свет навокал… Паўзе па зямлі маленькі мураш, і ён цяпер да мяне бліжэй. Птушка ляціць у небе, і яна бліжэй. Паміж мной ды імі адлегласць скарачаецца. Няма ранейшай бездані. Усе — жыццё.

Запомнілася і такое… Расказваў стары пчаляр (потым чула тое самае і ад іншых): «Выйшаў раніцой у сад, чагосьці не хапае, нейкага знаёмага гуку. Ніводнай пчалы… Не чуваць ніводнай пчалы! Ніводнай! Чаму? Што

такое? І назаўтра яны не вылецелі. І на трэці дзень… Потым нам паведамілі, што на атамнай — аварыя, а станцыя побач. Але мы доўга нічога не ведалі. Пчолы ведалі, а мы — не. Цяпер, калі што здарыцца, буду на іх глядзець. На іхняе жыццё». Яшчэ прыклад… Загаварыла з рыбакамі каля ракі, яны ўспомнілі: «Мы чакалі, калі нам па тэлевізары растлумачаць… Раскажуць, як ратавацца. А чарвякі… Простыя чарвякі. Яны сышлі глыбока ў зямлю, можа, на паўметра ці на метр. А мы ж не разумеем. Капалі-капалі. Так ніводнага чарвяка на рыбалку і не знайшлі…»

Хто ж з нас наперадзе, хто больш трывалы і вечны на зямлі — мы ці яны? Відаць, нам у іх вучыцца трэба, як выжыць. І як жыць.

Сышліся дзве катастрофы: сацыяльная — на нашых вачах разваліўся Савецкі Саюз, пайшоў пад ваду гіганцкі сацыялістычны мацярык, і касмічная — Чарнобыль. Два глабальныя выбухі. І першы — больш блізкі, больш зразумелы. Людзі заклапочаныя сённяшнім днём і побытам: за што купіць, куды паехаць? У што верыць? Пад якія сцягі зноў стаць? А можа, трэба вучыцца жыць для сябе, сваім уласным жыццём? Гэтае жыццё нам невядомае, не ўмеем, бо яшчэ ніколі так не жылі. Усе і кожны перажываюць гэта. А пра Чарнобыль хацелі б забыць, бо свядомасць перад ім капітулявала. Катастрофа свядомасці. Свет нашых уяўленняў і каштоўнасцяў падарваны. Калі б мы перамаглі Чарнобыль або зразумелі яго дарэшты, то думалі б і пісалі пра яго больш. А так атрымліваецца, што мы жывём у адным свеце, а свядомасць існуе ў іншым. Рэальнасць выслізгвае, не змяшчаецца ў чалавеку.

—Так… Не патрапляем гэтую рэальнасць здагнаць…

—Адзін прыклад... Дагэтуль карыстаемся старымі паняццямі: «далёка-блізка», «свае-чужыя»... Але што значыць далёка або блізка пасля Чарнобыля, калі ўжо на чацвёртыя суткі чарнобыльскія аблокі плылі над Афрыкай і Кітаем? Зямля раптам выявілася такой маленькай, гэта не тая зямля, што была ў часы Калумба. Бясконцая. Цяпер у нас з'явілася іншае адчуванне прасторы. Жывём у прасторы, якая збанкрутавала. Яшчэ... У апошнія сто гадоў чалавек пачаў жыць даўжэй, але ўсё адно ягоныя зямныя тэрміны побач з жыццём радыенуклідаў, што пасяліліся на нашай зямлі, — проста мізэрныя. Шмат якія з іх будуць жыць тысячагоддзямі. Нам і зазірнуць немагчыма ў такую далеч! Побач з імі перажываеш іншае пачуццё часу. І гэта ўсё — Чарнобыль. Ягоныя сляды. Тое самае адбываецца з нашым стаўленнем да мінулага, фантастыкі, ведаў... Мінулае выявілася бездапаможным, з ведаў ацалела толькі разуменне нашага няведання. Адбываецца пераналадка пачуццяў... Замест звычайных слоў суцяшэння доктар кажа жонцы пра мужа, які памірае: «Падыходзіць блізка нельга! Цалаваць нельга! Пагладзіць нельга! Гэта ўжо не каханы чалавек, а аб'ект, які падлягае дэзактывацыі». Тут і Шэкспір адступае. І сам Дантэ. Пытанне: падысці — не падысці? Цалаваць — не цалаваць? Адна з маіх гераінь (якраз на той час цяжарная) падыходзіла і цалавала. І не пакінула мужа да самай яго смерці. За гэта яна заплаціла сваім здароўем і жыццём іх маленькага дзіцяці. Ну а як было выбіраць паміж каханнем і смерцю? Паміж мінулым і незнаёмым сучасным днём? А хто насмеліцца асудзіць тых жонак і маці, што не сядзелі побач са сваімі мужамі і сынамі, якія паміралі? Побач з радыеактыўнымі аб'ектамі... У іх свеце і любоў змянілася. І смерць.

Змянілася ўсё, апрача нас.

—Каб падзея сталася гісторыяй, трэба хоць бы пяцьдзясят гадоў. А тут даводзіцца ісці па гарачых слядах…

—Зона… Асобны свет… Спачатку яго прыдумалі фантасты, але літаратура адступіла перад рэальнасцю. Мы ўжо не можам, як героі Чэхава, казаць: праз сто гадоў чалавек будзе прыўкрасным! Жыццё зробіцца цудоўным! Гэтую будучыню мы страцілі. Праз сто гадоў былі сталінскі ГУЛаг, Асвенцім, Чарнобыль… І верасень 2001-га ў Нью-Ёрку… Незразумела, як гэта змясцілася ў жыццё аднаго пакалення. Напрыклад, у жыццё майго бацькі, якому цяпер восемдзесят тры гады. Чалавек выжыў?

—Найбольш у Чарнобылі запамінаецца жыццё «пасля ўсяго»: рэчы без чалавека, краявіды без чалавека. Дарога ў нікуды. Раз-пораз думаеш: што гэта — мінулае ці будучыня?

—Часам мне здавалася, што я запісваю будучыню…

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

# ЗЯМЛЯ МЁРТВЫХ

## Маналог пра тое, навошта людзі ўспамінаюць

У мяне таксама ёсць пытанне. Сам я адказаць на яго не магу...

Але вы ўзяліся пра гэта пісаць... Пра гэта? А я не хацеў бы, каб пра мяне гэта ведалі. Што я там перажыў... З аднаго боку, ёсць жаданне адкрыцца, выгаварыцца, а з другога — адчуваю, як я агаляюся, а мне б гэтага не хацелася.

Памятаеце ў Талстога? П'ер Бязухаў настолькі ўражаны пасля вайны, што яму здаецца: ён і ўвесь свет змяніліся назаўсёды. Але прамінае час, і ён заўважае за сабой, што зноў гэтаксама лае рамізніка, гэтаксама бурчыць. Навошта тады людзі ўспамінаюць? Каб аднавіць ісціну? Справядлівасць? Вызваліцца і забыць? Разумеюць, што яны — удзельнікі грандыёзнай падзеі? Або шукаюць у мінулым абароны? І гэта пры тым, што ўспаміны — рэч крохкая, эфемерная, гэта не дакладныя веды, а здагадка чалавека пра самога сябе. Гэта яшчэ не веды, гэта толькі пачуцці.

Я пакутаваў, капаўся ў памяці і ўспомніў...

Самае страшнае са мной было ў дзяцінстве... Гэта — вайна...

Памятаю, як мы, хлапчукі, гулялі ў «таты і мамы»: распраналі малых і клалі іх адно на аднаго... Гэта былі першыя дзеці, якія нарадзіліся пасля вайны. Уся вёска ведала, якія словы яны ўжо гавораць, хто пачаў хадзіць, таму што за вайну дзяцей забылі. Мы чакалі з'яўлення жыцця. «Таты і мамы» — так называлася наша гульня.

Мы хацелі ўбачыць з'яўленне жыцця... А нам самім было па восем-дзесяць гадоў...

Я бачыў, як жанчына сама сябе забівала. У хмызняку каля ракі. Брала цагліну і біла сябе па галаве. Яна была цяжарная ад паліцая, якога ўся вёска ненавідзела. Яшчэ дзіцём я ведаў, як нараджаюцца кацяняты. Дапамагаў маці цягнуць цяля з каровы, вадзіў да кабана нашую свінню... Памятаю... Памятаю, як прывезлі забітага бацьку, на ім швэдар, мама сама яго вязала. Бацьку, відаць, расстралялі з кулямёта або аўтамата, і нешта крывавае проста кавалкамі лезла з гэтага швэдра. Ён ляжаў на нашым адзіным ложку, больш пакласці не было куды. Потым яго пахавалі перад домам. І зямля не пух, цяжкая гліна. З градаў пад буракі. Вакол ішлі баі. На вуліцы ляжалі забітыя коні і людзі...

Для мяне гэта настолькі забароненыя ўспаміны, што я не казаў пра іх уголас...

Тады я ўспрымаў смерць гэтаксама, як і нараджэнне. Я меў прыкладна аднолькавае пачуццё, калі з'яўлялася цяля з каровы... З'яўляліся кацяняты. І калі жанчына ў хмызняку забівала сябе... Бо гэта здавалася мне адным і тым самым, аднолькавым. Нараджэнне і смерць....

Я памятаю з дзяцінства, як пахне ў хаце, калі колюць кабана... Вы толькі кранулі мяне, і я падаю ўжо, падаю туды. У кашмар... У жах... Лячу...

Яшчэ памятаю, як нас, малых, жанчыны бралі з сабой у лазню. Шмат у каго з жанчын і ў маёй маці выпадалі маткі (мы гэта ўжо разумелі), яны падвязвалі іх анучамі. Я гэта бачыў... Маткі выходзілі ад цяжкой працы. Мужчын не было, іх на фронце, у партызанах пазабівалі, коней не было таксама, жанчыны цягалі плугі на сабе. Пераворвалі свае гароды, калгасныя палі. Калі

я вырас і ў мяне здарылася блізкасць з жанчынай, я гэта ўспомніў... Тое, што бачыў у лазні...

Хацеў забыць. Усё забыць... Забываў... Я думаў, што самае страшнае са мной ужо адбылося. Гэта вайна. І я абаронены, я цяпер абаронены. Сваімі ведамі, тым, што там... тады... перажыў. Але...

Я паехаў у чарнобыльскую зону... Шмат разоў ужо быў там... І там зразумеў, што я бездапаможны. І я разбураюся ад гэтай сваёй бездапаможнасці. Ад таго, што я не пазнаю свет, у якім усё змянілася. Нават зло іншае. Мінулае мяне ўжо не абараняе. Не супакойвае... У ім няма адказаў. А раней яны былі... *(Задумваецца.)*

Навошта людзі ўспамінаюць? Але я паразмаўляў з вамі, нешта прамовіў словамі... І нешта зразумеў. Я цяпер не такі адзінокі. А як гэта ў іншых?

*Пётр С., псіхолаг*

## Маналог пра тое, што можна паразмаўляць і з жывымі, і з мёртвымі

Уначы воўк на падворак зайшоў... У вакно зірнула — стаіць і свеціць вачыма. Фарамі...

Я да ўсяго прывыкла. Сем гадоў жыву адна, сем гадоў, як людзі з'ехалі. Уначы, бывала, сяджу, пакуль не разднее, і думаю, думаю. І сёння ўсю ноч на ложку крукам сядзела, а потым выйшла паглядзець, якое сонейка. Што я вам скажу? Самая справядлівая рэч на зямлі — смерць. Ніхто яшчэ не адкупіўся. Зямля ўсіх прымае: і добрых, і злых, і грэшнікаў. А больш справядлівасці на гэтым свеце няма. Я цяжка і сумленна ўсё жыццё працавала. Па сумленні жыла. А мне справядлівасці не выпадала. Бог недзе дзяліў, пакуль да мяне чарга дайшла —

у яго ўжо нічога не засталося, што мне даць. Малады можа памерці, а стары — мусіць… Ніхто не бессмяротны — ні цар, ні купец… Спачатку я людзей чакала, думала — усе вернуцца. Ніхто навекі не ад'язджаў, усе на нейкі час. А цяпер смерці чакаю. Памерці не цяжка, а страшна. Царквы няма, бацюшка не прыязджае. Няма да каго мне са сваімі грахамі прыйсці…

Першы раз сказалі, што ў нас радыяцыя, дык мы думалі, гэта хвароба нейкая, хто захварэе — адразу памірае. Не, кажуць, нешта такое, што на зямлі ляжыць і ў зямлю лезе, а ўбачыць нельга. Звер, можа, бачыць і чуе, а чалавек — не. А гэта няпраўда! Я бачыла… Той цэзій у мяне на гародзе валяўся, пакуль дождж яго не памачыў. Колер у яго такі чарнільны… Ляжыць і пераліваецца кавалачкамі… Прыбегла з калгаснага поля і пайшла на свой гарод. І такі кавалачак сіні… А праз дзвесце крокаў яшчэ адзін. Памерам з хустачку, што ў мяне на галаве. Крыкнула я суседцы, іншым бабам, мы ўсё ababeглі. Усе гароды, поле навокал… Гектары два… Можа, чатыры вялікія кавалачкі знайшлі. А адзін быў чырвонага колеру… Назаўтра дождж пасыпаў. Ад самага ранку. І да абеду яны прапалі. Прыехала міліцыя, а ўжо не было чаго паказаць. Толькі расказвалі… Кавалачкі вось такія… *(Паказвае рукамі.)* Як мая хустачка. Сінія ды чырвоныя.

Мы не дужа баяліся гэтай радыяцыі… Каб мы яе не бачылі, не ведалі, можа, і баяліся б, а калі паглядзелі, дык ужо не так страшна. Міліцыя з салдатамі трафарэты паставіла. У каго каля хаты, недзе на вуліцы — напісалі: семдзесят кюры, шэсцьдзясят кюры… Адвеку жылі на сваёй бульбачцы, а тут кажуць — нельга! І цыбульку не дазваляюць, і моркву. Каму гора, а каму смех… Працаваць на гародзе раілі ў марлевых павязках і гу-

мовых пальчатках. А попел з печы закопваць. Хаваць, як нябожчыка. О-о... А тады яшчэ адзін важны вучоны прыехаў і выступаў у клубе, што дровы трэба мыць... Дзіва! Ды каб мае вушы адсохлі! Загадалі перамыць накоўдранікі, прасціны, фіранкі... дык яны ж у хаце! У шафах і куфрах. А якая ў хаце радыяцыя? За шклом? За дзвярыма? Дзіва! Ты знайдзі яе ў лесе, у полі... Калодзежы пазачынялі на замкі, абгарнулі цэлафанам. Вада — «брудная»... Якая яна брудная, яна такая чыстая-чыстая! Нагаварылі торбу з верхам. Усе вы памрацé... Трэба з'язджаць... Эвакуацыя...

Напалохаліся людзі. Набраліся страху. Некаторыя па начах узяліся сваё дабро закопваць. І я сваю адзежу склала... Чырвоныя граматы за маю працу сумленную і капейчыну, якая ў мяне была, на чорны дзень адкладзеная. Такое гора! Такое гора сэрца есць! Каб я так памерла, як я вам праўду кажу! А тут чую, што ў адной вёсцы салдаты людзей у эвакуацыю звезлі, а дзед з бабкай засталіся. Перад тым днём, як людзей паднялі, нагналі аўтобусаў, яны ўзялі кароўку і падаліся ў лес. Перачакалі там. Як у вайну. Калі карнікі вёску палілі... Адкуль тая бяда бярэцца? *(Плача.)* Такое нашае жыццё крохкае. Радая была б не плакаць, ды слёзы цякуць.

Во! Зірніце ў вакно: сарока прыляцела. Я іх не ганю. Хоць бывае, што сарокі ў мяне яйкі з пуні цягаюць. Усё адно не ганю. У нас цяпер ува ўсіх адна бяда. Нікога не ганю! Учора заяц прыбягаў...

Вось калі б кожны дзень у хаце былі людзі. Тут недалёка, у іншай вёсцы, таксама старая адна жыве, я казала, каб да мяне пераходзіла. Што дапаможа, а што не, але хоць бы загаварыць да каго будзе. Паклікаць... Уначы ў мяне ўсё баліць. Ногі круціць, быццам мурашкі бегаюць, гэта па мне нервы ходзяць. Дык я вазьму

што-небудзь у рукі… Жменьку збожжа… І хруп, хруп. Нервы тады супакойваюцца. Напрацавалася я ўжо за сваё жыццё, нагаравалася. Усяго хапіла, і нічога не хачу. Каб памерла, дык і адпачыла б тады. Як там душа… а целу спакойна будзе. І дочкі ў мяне ёсць, і сыны. Усе ў горадзе. А я нікуды адсюль не хачу! Даў Бог гады, а не даў долі. Я ведаю, што стары чалавек дакучае, дзеці пацерпяць, пацерпяць ды і пакрыўдзяць. Радасць ад дзяцей, пакуль яны малыя. Нашы жанчыны, якія паехалі ў горад, усе плачуць. То нявестка крыўдзіць, то дачка. Вярнуцца хочуць. Мой гаспадар тут… Ляжыць на могілках… Калі б не ляжаў тут, то жыў бы ў іншым месцы. І я з ім. *(Раптам весела.)* А што ехаць? Тут добра! Усё расце, усё цвіце. Ад мошкі да звера — усё жывое.

Я вам усё ўспомню… Ляцяць самалёты і ляцяць. Кожны дзень. Нізка-нізка над галовамі. Ляцяць на рэактар. На станцыю. Адзін за адным. А ў нас — эвакуацыя. Перасяленне. Штурмуюць хаты. Людзі пазачыняліся, пахаваліся. Скаціна раве, дзеці плачуць. Вайна! А сонейка свеціць… Я села і не выходжу з хаты, праўда, на ключ не зачыняла. Пастукалі салдаты: «Што, гаспадынька, сабралася?» Пытаюся: «Сілай будзеце мне рукі і ногі звязваць?» Памаўчалі, памаўчалі і пайшлі. Маладзенькія-маладзенькія. Дзеці! Бабы на каленях перад хатамі поўзалі. Маліліся. Салдаты адну, другую пад рукі — і ў машыну. А я прыгразіла: каторы да мяне дакранецца, сілу сваю пакажа, той кія заробіць. Лаялася! Моцна лаялася! Не плакала. У той дзень я — ні слязінкі.

Сяджу ў хаце. То крык. Крык! А то зрабілася ціха… Заціхла. Я ў той дзень… У першы дзень я з хаты не выйшла…

Казалі потым: ішла калона людзей… І ішла калона скаціны. Вайна!

Мой гаспадар любіў казаць, што чалавек страляе, а Бог кулі носіць. Каму якая доля! Маладыя, што паехалі, некаторыя памерлі ўжо. На новым месцы. А я з кіёчкам — хаджу. Тупаю. Сумна стане — паплачу. Вёска пустая... А птушкі тут усякія... Лётаюць... І лось ідзе хоць бы што... *(Плача.)*

Я ўсё ўспомню... Людзі павыязджалі, а катоў і сабак пакінулі. Першыя дні я хадзіла і разлівала ўсім малако, а кожнаму сабаку давала кавалак хлеба. Яны стаялі каля сваіх двароў і чакалі гаспадароў. Доўга людзей чакалі. Галодныя каты елі гуркі... Памідоры елі... Да восені я ў суседкі перад весніцамі траву касіла. Плот паваліўся, плот ёй прыбіла. Чакала людзей... Жыў у суседкі сабачка, звалі Жучок. «Жучок, — прашу, — калі першым людзей сустрэнеш — крыкні мне».

Уначы сніцца, што мяне ў эвакуацыю вывозяць... Афіцэр крычыць: «Гаспадыня, мы хутка ўсё будзем паліць і закопваць. Выходзь!» І вязуць у нейкае незнаёмае месца. Незразумелае такое. І не горад, і не вёска. І не зямля...

Здарылася гісторыя... Быў у мяне добры коцік. Звалі Васька. Узімку галодныя пацукі напалі, няма паратунку. Пад коўдру лезлі. Збожжа ў бочцы — дзірку прагрызлі. Васька ўратаваў. Без Ваські капцы б мне былі... Мы з ім пагаворым, папалуднуем. А тады прапаў Васька... Можа, галодныя сабакі дзе напалі і з'елі? Яны ўсе бегалі галодныя, пакуль не паўміралі, каты былі такія галодныя, што кацянятаў елі, улетку не елі, а зімой. Крый божа! А адну бабу пацукі загрызлі... У сваёй хаце. Рыжыя пацукі... Праўда ці не, але кажуць. Гойсаюць тут бамжы... Першыя гады дабра хапала: кашулі, кофты, футры. Бяры і вязі на барахолку. Вось яны нап'юцца, песні пяюць. Маць-перамаць. Адзін зваліўся з веласіпеда і заснуў на

вуліцы. Уранні дзве костачкі знайшлі і веласіпед. Праўда ці не? Не ведаю. Кажуць людзі...

Тут усё жыве. Ну ўсё-ўсё! Яшчарка жыве, жаба квакае. І чарвяк поўзае. І мышы ёсць! Усё ёсць! Асабліва ўвесну добра. Я люблю, калі бэз цвіце. Чаромха пахне. Пакуль ногі моцна трымалі, сама па хлеб хадзіла, у адзін толькі бок пятнаццаць кіламетраў. Маладая бегма б праскочыла. Прывычная. Пасля вайны мы хадзілі па насенне на Украіну. За трыццаць, за пяцьдзясят кіламетраў. Людзі па пуду насілі, а я — па тры. А цяпер па хаце, бывае, не перайду. Старой бабе і ўлетку на печцы халодна. Міліцыянеры едуць сюды, правяраюць вёску, дык мне хлеба вязуць. Толькі што яны тут правяраюць? Жыву я ды коцік. Гэта ўжо другі коцік у мяне. Міліцыя пасігналіць, мы з ім узрадуемся. Бяжым. Яму прывязуць костачак. А ў мяне будуць пытацца: «А калі бандыты наскочаць?» — «Дык чым яны ў мяне разжывуцца? Што возьмуць? Душу? У мяне адно душа». Добрыя хлопчыкі. Смяюцца. Батарэйкі да прыёмніка прывезлі, я цяпер радыё слухаю. Людмілу Зыкіну люблю, ды нешта яна рэдка цяпер пяе. Відаць, пастарэла, як і я. Мой гаспадар любіў сказаць... Так яшчэ казаў: баль скончаны — і скрыпкі ў торбу!

Раскажу, як коціка сабе знайшла. Прапаў мой Васька... Дзень чакаю, два... Месяц... Ну зусім была я адна засталася. Няма да каго і загаварыць. Пайшла па вёсцы, па чужых садах клічу: Васька, Мурка... Васька! Мурка! Першы час шмат іх бегала, а потым недзе папрападалі. Зніштожыліся. Смерць не разбіраецца... Усіх зямелька прымае... Хаджу я, хаджу. Два дні клікала. На трэці — сядзіць пад магазінам. Мы пераглянуліся... Ён рады, і я радая. Адно што ён слова не скажа. «Ну, пайшлі, — прашу, — пайшлі дадому». Сядзіць... Мяў... Я давай яго

прасіць-маліць: «Што ты тут адзін будзеш? Ваўкі з'ядуць. Разарвуць. Пайшлі. У мяне яйкі ёсць, сала». Як яму растлумачыць? Кот чалавечае мовы не разумее, але ж ён тады мяне зразумеў. Я іду наперадзе, а ён ззаду бяжыць. Мяў... «Адрэжу табе сала». Мяў... «Будзем жыць удваіх». Мяў... «Назаву цябе Васькам». Мяў... І вось мы з ім ужо дзве зімы пэразімавалі...

Уначы прысніцца — нехта кліча... Голас суседчын: «Зіна!» Памаўчыць... І зноў: «Зіна!»

Сумна мне зробіцца, я паплачу...

Зайду на могілкі. Мама там ляжыць... Дачушка малая... У вайну ад тыфу згарэла. Толькі мы занеслі яе на могілкі, закапалі, як сонейка з-за хмараў выйшла. І свеціць-свеціць. Хоць ты вярніся і адкапай. Гаспадар мой там... Федзя... Пасяджу каля ўсіх. Паўздыхаю. А паразмаўляць можна і з жывымі, і з мёртвымі. Мне розніцы няма. Я і адных, і другіх чую. Калі ты адна... І калі горка так... Такі сум моцны...

Каля самых могілак настаўнік Іван Прохаравіч Гаўрыленка жыў, ён да сына ў Крым паехаў. За ім — Пятро Іванавіч Міускі. Трактарыст. Стаханавец, некалі ўсе ў стаханаўцы выбіваліся. Залатыя рукі. З дрэва карункі рабіў. Дом — на ўсю вёску дом. Лялька! Ой, мяне і жаль браў, кроў паднялася, калі яго бурылі. Закопвалі. Афіцэр крычаў: «Не тужы, маці. Дом на "пляме" стаіць». А сам — п'яны. Падыходжу — а ён гэта, плача: «Ты, маці, ідзі! Ідзі!» Прагнаў. А там далей сядзіба Мішы Міхалёва, ён пры катлах на ферме працаваў. Міша хутка памёр. Паехаў — і адразу не стала чалавека. За ім — дом заатэхніка Сцяпана Быхава стаяў... Згарэў! Уначы ліхія людзі падпалілі. Прышлыя. І Сцяпан доўга не пажыў. Пад Магілёвам, дзе дзеці жывуць, пахаваны. Другая вайна... Столькі мы людзей страцілі! Кавалёў Васіль Макаравіч,

Ганна Кацура, Максім Нікіфарэнка... Некалі весела жылі. На святы — песні, танцы. Гармонік. А цяпер — як у турме. Я, бывае, заплюшчу вочы і хаджу па вёсцы... Ну якая, кажу ім, тут радыяцыя, калі і матылёк лётае, і чмель гудзіць. І мой Васька мышэй ловіць. *(Плача.)*

А мая ты любачка, ці зразумела ты гора маё? Панясеш людзям, а мяне мо і на свеце ўжо не будзе. Знойдуць у зямельцы... Пад карэннем...

*Зінаіда Еўдакімаўна Каваленка, самасёл*

## Маналог пра цэлае жыццё, напісаны на дзвярах

Я хачу засведчыць...

Гэта было тады, дзесяць гадоў таму, і кожны дзень адбываецца са мной зараз. Цяпер... Гэта заўсёды са мной.

Мы жылі ў горадзе Прыпяць. У самым гэтым горадзе, які цяпер ведае цэлы свет. Я не пісьменнік. Але я сведка. Вось як гэта было... Ад самага пачатку...

Ты жывеш... Звычайны чалавек. Маленькі. Такі, як усе навокал, — ідзеш на працу і прыходзіш з працы. Атрымліваеш сярэднюю зарплату. Раз на год ездзіш у адпачынак. У цябе — жонка. Дзеці. Нармальны чалавек! І ў адзін дзень ты раптам ператвараешся ў чарнобыльскага чалавека. У дзіва! У нешта такое, што ўсіх цікавіць і нікому не вядома. Ты хочаш быць як усе, а ўжо нельга. Ты не можаш, ты ўжо ў ранейшы свет не вернешся. На цябе глядзяць іншымі вачыма. Табе задаюць пытанні: там было страшна? Як гарэла станцыя? Што ты бачыў? І наогул, ці могуць у цябе быць дзеці? Жонка ад цябе не сышла? Першым часам усе мы ператварыліся ў рэдкіх экспанатаў. Само слова «чарнобылец» дагэтуль — як

гукавы сігнал. Усе паварочваюць галаву ў твой бок… Адтуль!

Гэта былі пачуцці першых дзён. Мы страцілі не горад, а цэлае жыццё.

Выехалі з дому на трэці дзень… Рэактар гарэў… Запомнілася, што нехта са знаёмых сказаў: «Пахне рэактарам». Неверагодны пах. Але пра гэта ўсе чыталі ў газетах.Ператварылі Чарнобыль у фабрыку жахаў, а насамрэч у мульцік. А яго зразумець трэба, таму што нам з ім жыць. Я раскажу толькі сваё…

Было так… Абвясцілі па радыё: катоў браць нельга! Дачка — у слёзы, ад страху страціць сваю ўлюбёную котачку пачала заікацца. Котку ў чамадан! А яна ў чамадан не хоча, вырываецца. Падрапала ўсіх. Рэчы браць нельга! Я ўсе рэчы не вазьму, я вазьму адну рэч. Толькі адну! Я павінен зняць дзверы з кватэры і забраць з сабой, дзверы пакінуць не магу. А ўваход заб'ю дошкамі.

Нашы дзверы… Наш талісман! Сямейная рэліквія. На гэтых дзвярах ляжаў мой бацька. Не ведаю, па якім звычаі, не паўсюль так, але ў нас, сказала мне мама, нябожчыка трэба пакласці на дзверы ад ягонага дома. Ён так ляжыць, пакуль не прывязуць труну. Я сядзеў каля бацькі ўсю ноч, ён ляжаў на гэтых дзвярах… Дом быў адчынены. Усю ноч. І на гэтых жа дзвярах да самага верху зазубіны… Як я рос… Адзначана: першы клас, другі. Сёмы. Перад войскам… А побач — як рос ужо мой сын… Мая дачка… На гэтых дзвярах усё нашае жыццё запісана, як на старажытных папірусах. Як я іх пакіну?

Папрасіў суседа, у яго была машына: «Дапамажы!» Той мне на галаву паказаў, маўляў, ты, браце, з глузду з'ехаў. Але я іх вывез. Дзверы. Уначы. На матацыкле. Лясной дарогай… Вывез праз два гады, калі нашую кватэру ўжо разрабавалі. Абчысцілі. За мной гналася

міліцыя: «Будзем страляць! Будзем страляць!» Вядома, яны мяне за марадзёра прынялі. Дзверы з уласнага дома я быццам украў...

Выправіў дачку з жонкай у бальніцу. У іх па целе распаўзліся чорныя плямы. То з'явяцца, то знікнуць. Памерам з пятак... А нічога не баліць... Іх абследавалі. Я запытаўся: «Скажыце, якія вынікі?» — «Не для вас». — «А для каго ж тады?»

Вакол мяне ўсе казалі: памром, памром... Да дзвюхтысячнага года беларусы знікнуць. Дачцэ споўнілася шэсць гадоў. Роўна ў дзень аварыі. Укладваю яе спаць, яна мне шэпча на вуха: «Тата, я хачу жыць, я яшчэ маленькая». Я думаў, яна нічога не разумее... А яна ўбачыць у дзіцячым садку няню ў белым халаце або ў сталоўцы кухара — з ёю істэрыка: «Не хачу ў бальніцу! Не хачу паміраць!» Белы колер не магла трываць. Мы нават у новым доме белыя фіранкі памянялі.

Вы здольныя ўявіць адразу сем лысых дзяўчынак? Іх у палаце было сем... Не, хопіць! Яканчаю! Калі я расказваю, у мяне пачуццё... вось сэрца падказку дае: ты здраджваеш. Бо я павінен апісваць яе, як чужую... Яе пакуты... Жонка прыйшла з бальніцы. Не вытрымала: «Лепей бы яна памерла, чым так мучыцца. Або мне памерці, каб больш не глядзець». Не, хопіць! Я канчаю! Я не магу. Не!

Паклалі яе на дзверы... На дзверы, на якіх калісьці ляжаў мой бацька. Пакуль не прывезлі маленькую труну... Яна была маленькая, як скрыначка з-пад вялікай лялькі. Як скрыначка...

Я хачу засведчыць: мая дачка памерла ад Чарнобыля. Ад нас жа хочуць, каб мы маўчалі. Навука, маўляў, яшчэ не даказала, няма банка дадзеных. Трэба чакаць сотні гадоў. Але маё чалавечае жыццё... Яно ж мен-

шае… Я не дачакаюся. Запішыце. Хоць вы запішыце: дачку звалі Каця… Кацюшачка… Памерла ў сем гадоў…

*Мікалай Фаміч Калугін, бацька*

## Маналог адной вёскі пра тое, як клічуць душы з неба, каб з імі паплакаць і паабедаць

Вёска Белы Бераг Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці.

*Гавораць: Ганна Паўлаўна Арцюшэнка, Ева Адамаўна Арцюшэнка, Васіль Мікалаевіч Арцюшэнка, Соф'я Мікалаеўна Мароз, Надзея Барысаўна Нікалаенка, Аляксандр Фёдаравіч Нікалаенка, Міхаіл Мартынавіч Ліс.*

—Госцейкі да нас… Добрыя людзі… Не варажылася на сустрэчу, ніякага знаку. Бывае, далонь свярбіць — паздароўкаешся. А сёння ніяк не варажылася. Адно салавейка ўсю ноч спяваў — на сонечны дзень. Ой! Нашы бабы ўмомант збягуцца. Вунь Надзя ўжо ляціць…

—І пеpажылі ўсё, перацярпелі…

—Ой, не хачу ўспамінаць. Страшна. Выганялі нас, салдаты выганялі. Вайсковая тэхніка панаехала. Самаходкі. Адзін дзед стары… Ужо ляжаў. Паміраў. Куды ехаць? «Я вось устану, — плакаў, — і пайду на могілкі. Сваімі нагамі». Што нам за хаты заплацілі? Што? Паглядзіце, якая тут прыгажосць! Хто нам за гэтую прыгажосць заплаціць? Курортная зона!

—Самалёты, верталёты — гул стаяў. КамАЗы з прычэпамі… Салдаты. Ну, думаю, вайна пачалася. З кітайцамі або з амерыканцамі.

—Гаспадар прыйшоў з калгаснага сходу і кажа: «Заўтра эвакуацыя». А я: «А як жа бульба? Не выкапалі». У дзверы сусед стукае, селі яны з маім выпіваць. Выпілі

і давай лаяць старшыню: «Не паедзем — і ўсё. Вайну перажылі, а тут радыяцыя». Хоць ты лезь у гэтую зямлю. Не паедзем!

—Спачатку думалі, памром усе праз два-тры месяцы. Так яны нас пужалі. Агітавалі ехаць. Дзякаваць богу — жывыя!

—Дзякуй богу! Дзякуй богу!

—Ніхто не ведае, што на тым свеце. Тут лепей… Больш знаёмае ўсё. Як мая мама прыгаворвала: красуешся, радуешся і самавольнічаеш.

—Пойдзем у царкву, памолімся.

—Ад'язджалі… Узяла зямлі з мамінай магілкі ў торбачку. Пастаяла на каленях: «Даруй, што мы цябе пакідаем». Уначы пайшла да яе і не баялася. Людзі свае прозвішчы пісалі на хатах. На бярвёнах, на плоце. На асфальце.

—Сабак салдаты забівалі. Стралялі. Бах-бах! Пасля гэтага не магу чуць, як жывое крычыць.

—Я тут брыгадзірстваваў. Сорак пяць гадоў… Шкадаваў людзей. У Маскву на выстаўку мы свой лён вазілі, калгас пасылаў. Значок адтуль прывёз і чырвоную грамату. Тут да мяне з павагаю: «Васіль Мікалаевіч… Наш Мікалаевіч…» А хто я там, на новым месцы? Стары дзед… Тут буду паміраць, жанчынкі мне вады прынясуць, у хаце нацепляць. Шкадаваў я людзей… Увечары ідуць бабы з поля і пяюць, а я ведаю, што нічога яны не атрымаюць. Адны палачкі на працадні. А яны пяюць.

—У вёсцы ў нас людзі жывуць разам. Адным мірам.

—Сніцца мне сон, гэта я ўжо ў горадзе ў сына жыла. Сон… Што чакаю смерці, прычэкваю. І сынам наказваю: «Як павязеце мяне на нашыя могілкі, хоць пяць хвілінак пастойце са мной каля роднай хаты». І зверху бачу, як сыны мяне туды вязуць…

—Няхай яна атручаная, з радыяцыяй, але гэта мая радзіма. Нідзе мы больш не трэба. Нават птушцы сваё гняздо дарагое.

—Даскажу... Жыла ў сына на сёмым паверсе, падыду да вакна, гляну ўніз і хрышчуся. Здаецца, што каня чую. Пеўня... І такі жаль... А то свой двор сасніцца: карову даіць прывязваю і даю, даю... Прачынаюся... Не хачу ўставаць. Я яшчэ там. Я то тут, то там.

—Удзень мы жылі на новым месцы, а ўначы на радзіме. У сне.

—Узімку ночы доўгія, сядзім, бывае, і лічым: хто памёр? У горадзе ад нерваў і расстройства многа паміралa, па сорак-пяцьдзясят гадкоў — хіба ж гэта час паміраць? А мы жывём. Молімся кожны дзень Богу, просім адно — здароўе.

—Як той казаў, дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся.

—Мой гаспадар два месяцы ляжаў... Маўчаў, не адказваў мне. Быццам пакрыўдзіўся. Хаджу па двары, вярнуся: «Бацька, як ты?» Вочы толькі на мяне падыме, і мне ўжо лягчэй. Няхай бы ляжаў, маўчаў, а быў у хаце. Калі чалавек памірае, плакаць нельга. Пераб'еш яму смерць — будзе доўга мучыцца. Я ў шафе свечку ўзяла і ў рукі яму ўставіла. Ён узяў і дыхае... Вочы, бачу, мутныя... Не плакала... Пра адно прасіла: «Перадай там прывітанне нашай дачушцы і маёй дарагой мамачцы». Малілася, каб нам разам... Некаторыя ў Бога і вымаляць, а мне ён смерці не даў. Жыву.

—А я паміраць не баюся. Ніхто два разы не жыве. І ліст злятае, і дрэва падае.

—Бабанькі! Не плачце. У перадавіках усе гады хадзілі. Стаханаўкі. Сталіна перажылі. Вайну! Каб не смяяліся і не цешыліся, дык даўно б павесіліся. Значыцца, размаўляюць дзве чарнобыльскія жанчыны. Адна:

«Ці чула, у нас ва ўсіх цяпер белакроўе?» Другая: «Глупства! Я ўчора палец парэзала — кроў бегла чырвоная».

—У родным краі, як у раі. А на чужыне і сонца не так свеціць.

—А мая мама мяне некалі навучыла: вазьмі іконку і перавярні яе, каб яна так тры дні павісела. Дзе б ты ні была, абавязкова дадому вернешся. У мяне было дзве каровы і дзве цёлкі, пяць свіней, гусі, куры. Сабака. Рукамі галаву абхаплю і хаджу па садзе. А яблыкаў, яблыкаў колькі! Прапала ўсё, цьфу, прапала!

—Памыла хату, печ пабяліла… Трэба пакінуць хлеб на стале і соль, міску ды тры лыжачкі… Лыжак столькі, колькі душ у хаце. Усё каб вярнуцца…

—А грабеньчыкі ў курэй былі чорныя, а не чырвоныя, — радыяцыя. І сыр не атрымліваўся. Месяц жылі без тварагу і сыру. Малако не кісла, яно ў парашок згортвалася, белы парашок. Радыяцыя…

—Гэтая радыяцыя ў мяне на гародзе была. Гарод увесь пабялеў, бялюткі-бялюткі, быццам нечым пасыпаны. Нейкімі кавалачкамі… Я думала, можа, нешта з лесу прынесла. Вецер насыпаў.

—Не хацелі мы ад'язджаць. Ой, не хацелі! Мужыкі выпілі… пад колы кідаліся. Начальства хадзіла па хатах і ўсіх угаворвала. Наказ: «Маёмасць не браць!»

—Скаціна тры дні не поеная. Не кормленая. На забой! Прыехаў карэспандэнт з газеты: «Як настрой? Як справы?» П'яныя даяркі ледзь яго не забілі.

—Старшыня з салдатамі ўсё кружляе вакол маёй хаты. Палохаюць: «Выходзь або падпалім! Давайце сюды каністру з бензінам!» Забегала — то ручнік схаплю, то падушку…

—Вось вы скажыце па навуцы, як тая радыяцыя дзейнічае? Кажыце праўду, нам усё адно хутка паміраць.

—А што вы думаеце, у Мінску яе няма, калі яна нябачная?

—Прывёз унук сабачку… Назвалі Радый, бо жывём у радыяцыі. І дзе мой Радый падзеўся? Заўсёды каля ног… Баюся, пабяжыць за вёску — ваўкі з'ядуць. Буду адна.

—А ў вайну ўсю ноч гарматы грукаюць-грукаюць. Сякуць-сякуць. Мы зямляначку ў лесе выкапалі. Бамбяць і бамбяць. Усё спалілі, сказаць бы, што хаты, дык жа і гарод, і вішанькі пагарэлі.

—Толькі б не было вайны… Як я яе баюся!

—У армянскага радыё пытаюцца: «Ці можна есці чарнобыльскія яблыкі?» Адказ: «Можна, толькі агрызкі трэба глыбока ў зямлю закопваць». Другое пытанне: «Колькі будзе сем памножыць на сем?» Адказ: «Ды табе любы чарнобылец на пальцах палічыць». Ха-ха-ха…

—Далі нам новы дамок. Каменны. Дык ведаеце, за сем гадоў ніводнага цвіка не забілі. Чужына! Усё чужое. Мой гаспадар плакаў і плакаў. Тыдзень працуе ў калгасе на трактары, чакае нядзелі, а ў нядзелю ляжа каля сцяны і плача.

—Больш нас ніхто не падмане, нікуды мы са свайго месца не кранемся. Магазіна няма, бальніцы няма. Святла няма. Сядзім пры газавай лямпе ды пры лучыне. А нам добра! Мы — дома.

—У горадзе нявестка хадзіла за мной па кватэры з анучкай і ўсё выцірала: ручку на дзвярах, крэсла… А ўсё за мае грошы куплёнае, уся мэбля і машына «Жыгулі». Грошы скончыліся — і мама не трэба.

—Нашыя грошы дзеці забралі. А што засталося, інфляцыя з'ела. Тое, што нам аддалі за гаспадарку, за хаты. За яблынькі.

—У армянскага радыё пытаюцца: «Што такое радыёнянька?» — «Гэта бабуля з Чарнобыля». Ха-ха-ха…

—Два тыдні я ішла пешкі... І кароўку сваю вяла... Людзі не пускалі ў хаты. У лесе начавала.

—Баяцца нас. Заразныя, кажуць. За што Бог пакараў? Раззлаваўся? Жывём не па-людску, не па боскіх законах. Мучым адзін аднаго. За гэта.

—Мае ўнукі ўлетку прыязджалі... Першыя гады не ехалі, таксама баяліся. А цяпер праведваюць, прадукты ўжо бяруць, усё пакуюць, што дасі. «Бабуля, — пытаюцца, — а ты чытала кнігу пра Рабінзона?» Жыў адзін — так, як і мы. Без людзей. Я з сабой паўторбы запалак прывезла. Сякеру ды рыдлёўку. А цяпер у мяне сала, яйкі, малако — усё сваё. Адно што — цукар не пасееш. Зямлі тут колькі хочаш! Хоць сто гектараў завервай. А ўлады ніякай. Тут чалавеку ніхто не замінае. Начальства няма. Мы — свабодныя.

—З намі і каты вярнуліся. І сабакі. Вярталіся разам. Салдаты нас не пускалі. Амонаўцы. Дык мы ўначы... Ляснымі сцежкамі. Партызанскімі.

—Нічога ад дзяржавы нам не трэба. Усё самі вырабляем. Не чапайце нас толькі! Ні магазіна не трэба, ні аўтобуса. Па хлеб і соль ходзім пешкі за дваццаць кіламетраў. Мы — самі сабе.

—Табарам вярнуліся. Тры сям'і... А тут усё разрабаванае: печ разбілі, вокны, дзверы знялі. Падлогу. Лямпачкі, выключальнікі, разеткі — усё павыкручвалі. Нічога жывога. Вось гэтымі рукамі ўсё зноўку, вось гэтымі рукамі. А як жа!

—Дзікія гусі крычаць — вясна надышла. Сеяць пара. А мы ў пустых хатах... Адно што дахі цэлыя...

—Міліцыя крычала. Прыедуць на машынах, а мы — у лес. Як ад немцаў. Аднаго разу напалі на нас з пракурорам. Дык ён пагражаў, што будуць судзіць. Я кажу: «Няхай мне дадуць год турмы, я адбуду і сюды вярнуся».

Іхняя справа пакрычаць, а нашая — памаўчаць. Я ордэн маю — як перадавы камбайнёр, а ён мне пагражае: па дзясятым артыкуле пойдзеш… Быццам я злачынец.

—Кожны дзень мне мая хата снілася. Я вярталася: то гарод капаю, то пасцель прыбіраю… І заўсёды нешта знайду: то чаравік, то куранятаў… Да дабра ўсё, да радасці. На вяртанне.

—Ночкаю Бога просім, а ўдзень — міліцыянераў. Спытайце вы ў мяне: «Чаго ты плачаш?» А я не ведаю, чаго я плачу. Я радая, што ў сваім двары жыву.

—І пеpажылі ўсё, перацярпелі…

—Я вам анекдот раскажу… Указ пра льготы чарнобыльцам… Тым, хто жыве за дваццаць кіламетраў ад станцыі, да прозвішча дадаецца прыстаўка «фон». Тыя, хто за дзесяць кіламетраў, яны ўжо — Ваша светласць. А тыя, хто каля станцыі выжыў, — Ваша сіяцельства. Ну, вось так і жывём, Ваша светласць… Ха-ха-ха…

—Дабілася я да доктара: «Міленькі, ножкі не ходзяць. Костачкі баляць». — «Кароўку трэба здаць, бабуля. Малако атручанае». — «Ой, не, — плачу, — ножкі баляць, калені баляць, а кароўку не аддам. Мая карміцелька».

—У мяне сямёра дзяцей. Усе ў гарадах жывуць. Я тут адна. Засумую, сяду пад іхнімі фатаграфіямі. Паразмаўляю. Усюды адна. Хату адна пафарбавала, шэсць бляшанак фарбы ўклала. Так вось і жыву. Выгадавала чатырох сыноў і тры дачкі. А муж рана памёр. Адна.

—Я з ваўком сустракаўся вось так: ён стаіць, і я стаю. Паглядзелі адзін на аднаго, і ён убок адскочыў. Паімчаўся. Дык у мяне ад страху шапка паднялася.

—Любы звер баіцца чалавека. Ты звера не чапай, і ён цябе абыдзе. Раней ходзіш па лесе, пачуеш галасы — бяжыш да людзей, а цяпер чалавек ад чалавека хаваецца. Не дай бог у лесе чалавека сустрэць!

—Усё, што ў Бібліі напісана, усё збываецца. Там і пра наш калгас напісана… І пра Гарбачова… Што будзе вялікі начальнік з кляймом на лобе і вялікая дзяржава рассыплецца. А потым надыдзе Божы суд. Хто ў гарадах жыве, усе загінуць, а ў вёсцы адзін чалавек застанецца. Чалавек будзе рады чалавечаму следу! Не чалавеку, а толькі следу ягонаму…

—А святло ў нас — лямпа. Газніца. А-а… Бабы ўжо даклалі вам. Заб’ем кабана, дык у пограб нясем або ў зямлю закопваем. У зямлі мяса тры дні ляжыць. Самагонка ў нас са свайго жыта. З варэння.

—У мяне два мяхі солі. Не прападзем без дзяржавы! Дроваў поўна — вакол лес. Хата цёплая. Лямпа гарыць. Гожа! Казу трымаю, козліка, трое свіней, чатырнаццаць курэй. Зямлі — досыць, травы — досыць. Вада ёсць у калодзежы. Воля! Нам добра! У нас тут не калгас, а камуна. Камунізм! Яшчэ аднаго коніка купім. І тады ніхто нам больш не трэба. Аднаго коніка…

—Мы не дамоў вярнуліся, як тут адзін карэспандэнт быў ды здзіўляўся, а на сто гадоў назад. Сярпом жнем, касой косім. Малоцім цапамі проста на асфальце. Гаспадар кошыкі пляце. А я ўзімку вышываю. Тку.

—У вайну ў нашым родзе загінула сямнаццаць чалавек. Двух маіх братоў забілі. Мама плача і плача. А хадзіла бабулька па вёсках, жабравала. «Смуткуеш? — кажа маме. — Не смуткуй. Хто аддаў жыццё за іншых, той святы чалавек». І я ўсё за Радзіму магу… Толькі забіваць не магу… Я — настаўніца, я вучыла: любіце чалавека. Заўсёды перамагае дабро. Дзеці, яны маленькія, душой чыстыя.

—Чарнобыль… Над войнамі вайна. Няма чалавеку нідзе паратунку. Ні на зямлі, ні ў вадзе, ні на небе.

—Радыё адразу адключылі. Ніякіх навінаў не ведаем, затое нам спакойна жыць. Не пераймаемся. Пры-

язджаюць людзі, пераказваюць: паўсюль вайна. І нібыта сацыялізм скончыўся, жывём пры капіталізме. Цар вернецца. Праўда?

—То дзік з лесу ў сад зойдзе, то ласіха... Людзі рэдка. Адны міліцыянеры...

—А вы ў маю хату зайдзіце.

—І ў маю. Так даўно ў мяне ў хаце госці не сядзелі.

—І хрышчуся, і малюся... Божачка! Два разы міліцыя мне печ бурыла. На трактары мяне вывозілі. А я — назад! Пусцілі б людзей — яны ўсе на каленках дадому б папаўзлі. Разнеслі па свеце наша гора. Толькі мёртвым дазваляюць вярнуцца. Іх прывозяць. А жывыя — уначы. Лесам...

—На Радаўніцу ўсе сюды рвуцца. Усе чыста. Кожны хоча свайго памянуць. Міліцыя па спісах прапускае, а дзецям да васямнаццаці гадоў нельга. Прыедуць — і такія радыя, калі пры сваёй хаце пастаяць... У сваім садзе каля яблыні... Спачатку на могілках плачуць, потым разыходзяцца па сваіх дварах. І там таксама плачуць і моляцца. Ставяць свечкі. Вісяць на сваіх згародах, на агароджы вакол магілак. Здараецца, што і вяночак пакладуць каля хаты. Завяжуць белы ручнік на весніцах... Бацюшка малітву чытае: «Братья и сестры! Будьте терпеливыми!»

—На могілкі бяруць і яйкі, і булкі... Шмат хто бліны бярэ замест хлеба. У каго што ёсць... Кожны сядае каля сваёй радні. Клічуць: «Сястрыца, прыйшла цябе пераведаць. Хадзі да нас абедаць». Або: «Мамачка ты наша... Татачка ты наш... Татуля...» Клічуць душы з неба... У каго ў гэты год памерлі, тыя плачуць, а ў каго раней, тыя не плачуць. Пагамоняць, успомняць. Усе моляцца. Хто не ўмее, таксама моліцца.

—А ўначы па мёртвых плакаць нельга. Сонца сядзе — і ўжо нельга. Памяні, Божа, душы іхнія. І царства ім нябеснае!

—Хто не скача, той плача... Вось хахлушка прадае на рынку вялікія чырвоныя яблыкі. Заваблівае: «Купляйце яблычкі! Яблычкі чарнобыльскія!» Хтосьці ёй раіць: «Не прызнавайся, цётка, што яны чарнобыльскія. Ніхто не купіць». — «Не кажыце! Бяруць! Каму трэба для цешчы, каму для начальніка!»

—Тут адзін з турмы вярнуўся. Па амністыі. У суседняй вёсцы жыў. Маці памерла, хату закапалі. Прыбіўся да нас. «Цётка, дайце кавалак хлеба і сала. Я вам дроваў накалю». Жабруе.

—Бардак у краіне — і сюды людзі бягуць. Ад людзей бягуць. Ад закону. І жывуць адны. Чужыя людзі... Суровыя, няма прыязнасці ў вачах. Нап'юцца — падпаляць. Уначы спім, а пад ложкам — вілы, сякеры. На кухні каля дзвярэй — сякера.

—Увесну шалёная лісіца бегала, калі яна шалёная, дык ласкавая-ласкавая. Не можа на ваду глядзець. Пастаўце на падворку вядро вады — і не бойцеся! Пойдзе.

—Прыязджаюць... Фільмы пра нас здымаюць, а мы іх ніколі не ўбачым. У нас ні тэлевізараў, ні электрычнасці няма. Адно — у вакно глядзець. Ну і маліцца, канешне. То камуністы замест Бога былі, а цяпер застаўся адзін Бог.

—Мы людзі заслужаныя. Я — партызан, год быў у партызанах. А калі нашы немцаў адбілі, на фронт патрапіў. На рэйхстагу сваё прозвішча напісаў: Арцюшэнка. Зняў шынялёк, камунізм будаваў. А дзе той камунізм?

—У нас тут камунізм. Жывём — браты і сёстры.

—Калі вайна пачалася, не было ў той год ні грыбоў, ні ягад. Дайце веры. Сама зямля біду чула... Сорак першы год... Ой, успамінаю! Я вайну не забыла. Праляцела чутка, што прыгналі нашых палонных, хто пазнае свай-

го, можа забіраць. Падняліся, пабеглі нашыя бабы! Увечары хто свайго, хто чужога прывёў. Ды знайшоўся такі гад… Жыў як усе, жанаты, двое дзяцей. Заявіў у камендатуру, што мы ўкраінцаў узялі. Васько, Сашко… Назаўтра немцы на матацыклах прыязджаюць… Просім, на калені падаем… А яны вывелі іх за вёску і паклалі з аўтаматаў Дзесяць чалавек. Яны ж маладыя-маладыя, прыгожыя! Васько, Сашко…

—Толькі б не было вайны. Як я яе баюся!

—Начальства прыедзе, пакрычыць-пакрычыць, а мы глухія і нямыя. І перажылі ўсё, перацярпелі…

—А я пра сваё… Пра сваё думаю і думаю… На могілках… Хто галосіць, а хто ціха плача. А бывае, нехта скажа: «Расхініся, жоўты пясочак. Расхініся, цёмная ночка». З лесу дачакаешся, а з пяску ніколі. Буду ласкава да яго гаварыць: «Іван… Іван, як мне жыць?» А ён нічога не скажа мне, ні добрага, ні кепскага.

—А я… Я нікога не баюся: ні нябожчыкаў, ні звяроў, нікога. Сын прыедзе з горада і сварыцца: «Што сядзіш адна? А калі нехта задушыць?» А што ён возьме ў мяне? Адны падушкі… У простай хаце ўсё багацце — падушкі. Як пачне бандыт лезці, ён жа галаву ў вакно ўсуне, а я сякеркай яе — і прэч. Па-нашаму, сякеркай… Можа, і няма Бога, можа, іншы хто, але там, высока, нехта ёсць… І я жыву.

—Узімку дзед павесіў на двары цяля разабранае. А тут іншаземцаў якраз прывезлі: «Дзядуля, што ты робіш?» — «Радыяцыю выганяю».

—Было і такое… Людзі казалі… Пахаваў муж жонку, а хлопчык маленькі ў яго застаўся. Мужчына адзін… Запіў ад гора… Здыме з дзіцёнка ўсё мокрае і — пад падушку. А жонка — ці то яна сама, ці то толькі душа яе — прыйдзе ўначы, памые, пасушыць і складзе ў адным

месцы. Неяк ён яе ўбачыў... Паклікаў — яна адразу быццам растала. Паветрам зрабілася. Тады суседзі яму параілі: як цень мільгане — дзверы на ключ, дык, можа, хутка не ўцячэ. А яна і зусім не прыйшла. Што там такое было? Хто там такі прыходзіў?

—Не верыце? А тады скажыце, адкуль казкі ўзяліся? Гэта ж, можа, некалі праўда была? Вось вы пісьменныя...

—Чаму той Чарнобыль сарваўся? Адны кажуць — вучоныя вінаваты. Хапаюць Бога за бараду, а ён смяецца. А нам тут цярпі!

—Добра мы ніколі не жылі. Спакойна. Перад самай вайной людзей забіралі. Хапалі... У нас трох мужчын... Прыехалі на чорных машынах і з поля забралі, дагэтуль яны не вярнуліся. Заўсёды мы баяліся.

—Я плакаць не люблю... Я люблю анекдот новы паслухаць... У чарнобыльскай зоне табаку вырасцілі. На фабрыцы з гэтай табакі цыгарэты зрабілі. На кожным пачку «Мінздраў апо-о-о-шні раз папярэджвае: курэнне небяспечнае для здароўя». Ха-ха-ха... А нашыя дзяды кураць...

—Адно што маю — кароўку. Я пайшла б і аддала, толькі б не было вайны. Як я яе баюся!

—І зязюля кувае, сарокі сакочуць. Казулі бегаюць. А ці будуць яны потым весціся, ніхто не скажа. Уранні глянула ў сад — дзікі ўсё пакапалі. Людзей можна перасяліць, а лася і дзіка — не. І вада межаў не ведае, ідзе сабе па зямлі, пад зямлёй...

Дом не можа без чалавека. І зверу чалавек патрэбны. Усе чалавека шукаюць. Бусел прыляцеў. Жучок вылез. Усяму радая.

—Баліць, бабанькі... Ой, як мне баліць! Трэба ціха... Труну нясуць ціха... Асцярожна. Няможна ні аб дзверы стукнуць, ні аб ложак, ні да чаго няможна дакра-

нуцца. Барані божа, ударыць аб што. Тады бяда — чакай другога нябожчыка. Памяні, Госпадзе, душачку іхнюю. І царства ім нябеснае! А дзе хаваюць, там і галосяць. Тут у нас паўсюль — могілкі. Вакол могілкі… Самазвалы гудуць. Бульдозеры. Хаты падаюць… Пахавальныя каманды працуюць і працуюць… Закапалі школу, сельсавет, лазню… Свет той самы, ды людзі ўжо не тыя. Адно не ведаю, ці ёсць у чалавека душа? Якая яна? І дзе яны ўсе на тым свеце змяшчаюцца?

Два дні дзед паміраў, за печчу затаюся і вартую: як яна з яго вылятаць будзе? Пайшла карову даіць… Ускочыла ў хату. Ляжыць з расплюшчанымі вачыма… Душа адляцела… А мо нічога і не было? Як жа тады пабачымся?

—Кажа бацюшка, што мы — неўміручыя. Молімся. «Господи, дай нам силы перенести утомления нашей жизни…»

## Маналог пра тое, што знойдзецца дажджавы чарвяк — і курыца радуецца. А тое, што ў чыгунку кіпіць, таксама не вечнае

Першы страх…

Першы страх з неба зваліўся. Вадой плыў. А некаторыя людзі, і многа такіх, былі спакойныя, як камяні. Крыжам пабажуся! Мужчыны, якія старэйшыя, вып'юць: «Мы да Берліна дайшлі з перамогай». Скажуць, як да сцяны прыклеяць. Пераможцы! З медалямі.

Першы страх быў… Уранні ў садзе і на гародзе мы задушаных кратоў знаходзілі. Хто іх душыў? Звычайна яны на святло з-пад зямлі не вылазяць. Нешта іх гнала. Крыжам пабажуся!

Сын звоніць з Гомеля:

—А хрушчы лётаюць?

—Няма хрушчоў, нават лічынак нідзе не відаць. Пахаваліся.

—А дажджавыя чэрві ёсць?

—Знойдзецца дажджавы чарвяк — курыца радуецца. І чарвей няма.

—Першая прыкмета: дзе хрушчоў і чарвякоў няма — там моцная радыяцыя.

—Што такое радыяцыя?

—Мама, гэта смерць такая. Угаворвайце тату з'язджаць. У нас перабудзеце.

—Дык мы ж гарод не пасадзілі…

Былі б усе разумныя, дык хто б за дурня застаўся? Гарыць, ну гарыць. Пажар — ён не вечны, ніхто тады не баяўся. Атаму не ведалі. Крыжам пабажуся! А жылі пад бокам у атамнай станцыі, напрасткі — трыццаць кіламетраў, а калі шашою — сорак. Задаволеныя былі вельмі. Купіў білет і паехаў. Забеспячэнне ў іх маскоўскае — каўбаса танная, заўсёды мяса ў крамах. На выбар. Добры быў час!

А цяпер адзін страх… Мелюць языкамі, што жабы і мошкі застануцца, а людзі — не. Жыццё застанецца без людзей. Мелюць казку з прыказкай. Адны дурні іх любяць! Ды не бывае байкі без праўды… Старая ўжо гэтая песня…

Радыё ўключу. Пужаюць і пужаюць нас радыяцыяй. А нам пры радыяцыі жыць стала лепей. Крыжам пабажуся! Ты паглядзі: завезлі апельсіны, тры гатункі каўбасы, калі ласка! У вёсцы! Мае ўнукі паўсвету аб'ехалі. Меншая дзяўчынка з Францыі вярнулася, гэта ж некалі Напалеон адтуль наступаў… «Бабуля, я ананас бачыла!» Другога ўнука… Браціка ейнага ў Берлін на

лячэнне бралі… Гэта туды, адкуль на нас Гітлер пёр… На танках… Новы свет цяпер… Усё па-новаму… Радыяцыя гэта вінаватая ці хто? А якая яна? Можа, у кіно дзе паказвалі? Вы бачылі? Белая яна ці якая? Якога колеру? Адны кажуць, што без колеру і паху, а другія — што яна чорная. Як зямля! А калі без колеру, то як Бог. Бог паўсюль, а ніхто не бачыць. Пужаюць! А яблыкі ў садзе вісяць, і лісце на дрэвах, бульба ў полі… Я думаю, ніякага Чарнобыля няма, прыдумалі. Падманулі людзей. Сястра мая са сваім мужыком з'ехалі. Недалёка тут, за дваццаць кіламетраў. Два месяцы там пажылі, бяжыць да іх суседка: «Ад вашай каровы радыяцыя да маёй пералезла. Карова падае». — «А як яна пералезе?» — «Яна па паветры лётае, як пыл. Лятучая». Казкі! Казкі з прыказкамі… А гэта быль… У дзеда майго пчолы, стаяла пяць вуллёў. Дык яны тры дні не выляталі, ніводная. Сядзелі ў вуллях. Перачэквалі. Дзед па двары носіцца: што за насланнё такое? Што за халера? Нешта ў прыродзе прычынілася. А іхняя сістэма, як потым растлумачыў нам сусед-настаўнік, лепшая за нашу, разумнейшая, бо яны адразу пачулі. Радыё, газеты яшчэ маўчалі, а пчолы ўжо ведалі. На чацвёрты дзень толькі вылецелі. Восы… Былі ў нас восы, асінае гняздо над ганкам, ніхто не чапаў, і тут іх ураннi не стала, ні жывых, ні мёртвых. Вярнуліся праз шэсць гадоў. Радыяцыя… Яна і людзей пужае, і звяроў… І птушак… Нават дрэву страшна, адно што яно нямое. Не скажа. А каларадскія жукі поўзаюць, як і поўзалі, жаруць нашую бульбачку, з'ядаюць да лісточка, яны да атруты прывычныя. Вось так і мы.

Але як падумаю — у кожнай хаце нехта памёр… Другая вуліца, на тым баку рэчкі… Там усе жанчыны цяпер без мужыкоў, няма мужчын, мужчыны памерлі. На нашай вуліцы мой дзед жыве, і там яшчэ адзін. Мужчын

Бог забірае раней. Чаму так? Ніхто нам не патлумачыць, ніхто гэтага сакрэту не ведае. А калі падумаеш: каб засталіся адны мужчыны, без баб — таксама дрэнна. П'юць, мілая мая, п'юць. Ад тугі п'юць. Каму паміраць ахвота? Калі чалавек памірае — такая туга! Ніякай суцехі няма. Ніхто не можа, і няма чым яго суцешыць. П'юць і гамоняць... Разважаюць... Выпіць, смяяцца і бац! — няма. Усе пра такую лёгкую смерць мараць. Як яе заслужыць? Душа — адзіная жывая істота. Мая ты мілая... А жанчыны нашы ўсе пустыя, жаночае ў іх выразанае. Лічы, у кожнай трэцяй. І ў маладой, і ў старой... Не ўсе паспелі нарадзіць... Як падумаю... Прайшло, як не было...

А што я дадам? Трэба жыць. Больш нічога... А то вось яшчэ... Раней мы самі білі масла, тварог ставілі, сыр, смятану. Варылі малочную зацірку. Такое ў горадзе ці ядуць? Заліваеш муку вадой і памешваеш, атрымліваюцца такія кавалачкі цеста, тады ты іх у каструлю, дзе вада кіпіць. Паварыш і забельваеш малаком. Наша мама паказвала і вучыла: «І вы, дзеці, так навучыцеся. А я ад сваёй мамы навучылася». Пілі мы бярозавік і кляновік. Фасолю ў стручках парылі ў чыгунах у вялікай печы. Варылі кісель з журавінаў... А ў вайну крапіву збіралі, лебяду ды іншыя травы. З голаду пухлі, але не паміралі. Ягады ў лесе, грыбы... А цяпер такое жыццё, што ўсё гэта парушылася. Думалася нам, што гэта непарушнае, заўсёды было і будзе так. І тое, што ў чыгунку кіпіць, вечнае. Ніколі б не паверыла, што яно памяняецца. Ды яно ж так... Малако — няможна, бабовыя — няможна. Грыбы, ягады забараняюць. Мяса наказваюць вымочваць тры гадзіны. І з бульбы два разы ваду зліваць, калі варыш. Ды з Богам біцца не будзеш... Трэба жыць...

Пужаюць, што і ваду нашую няможна піць. А як ты без вады? У кожным чалавеку вада ёсць. Нікога няма

без вады. Ваду і ў камені знойдзеш. Ну, гэта ж вада, можа, яна вечная? Усё жыццё з яе… У каго папытацца? Ніхто не скажа. А Богу моляцца, у яго не пытаюць. Дык трэба жыць…

Вось і жыта ўзышло. Добрае жыта.

*Ганна Пятроўна Бадаева, самасёл*

## Маналог пра песню без слоў

Я вам у ножкі пакланюся… Папрашу…

Знайдзіце нам Ганну Сушко. Яна жыла ў нашай вёсцы. У вёсцы Кажушкі. Клічуць Ганна Сушко… Я вам скажу ўсе прыкметы, а вы надрукуйце. У яе горб, з маленства нямая. Жыла адна. Шэсцьдзясят гадоў… Калі перасялялі, забралі яе на машыне «хуткай дапамогі» і вывезлі невядома куды. Грамаце яна не вучылася, таму ніякага пісьма ад яе мы не атрымалі. Адзінокіх і хворых везлі ў прытулкі. Хавалі ад вачэй падалей. Ніхто не ведае адраса. Надрукуйце…

Шкадавалі мы яе ўсёй вёскай. Выходжвалі, як малое дзіця. Хто дроў наколе, хто малака прынясе. Хто пасядзіць увечары ў хаце… У печы падпаляць… Два гады, як мы, патуляўшыся па чужых кутах, вярнуліся ў родныя хаты. І ёй перадайце, што хата ейная цэлая. Дах ёсць, вокны. Што пабітае ды пакрадзенае, разам адновім. Дайце нам толькі адрас, дзе яна жыве, пакутніца наша, паедзем і забяром. Прывязем назад. Каб яна не памерла ад тугі. Я вам у ножкі пакланюся. Нявінная душа ў чужым свеце пакутуе…

Ёсць яшчэ адна прыкмета… Я забылася… Калі ў яе нешта баліць, яна песню цягне. Без слоў. Адзін голас.

А размаўляць яна не можа… Калі баліць, цягне голасам: а-а-а… Жаліцца…

А… а… а…

*Марыя Ваўчок, суседка*

## Тры маналогі пра старажытны страх і пра тое, чаму адзін мужчына маўчаў, калі жанчыны гаварылі

*Сям'я К-вых. Маці і дачка. І мужчына (доччын муж), які не сказаў ні слова.*

*Дачка:*

— Я напачатку дзень і ноч плакала. Хацелася плакаць і гаварыць… Мы з Таджыкістана, з Душанбэ. Там — вайна…

Мне пра гэта нельга… Я дзіцятка чакаю, я — цяжарная. Але я вам раскажу… Заходзяць удзень у аўтобус з праверкай пашпартоў. Звычайныя людзі, толькі з аўтаматамі. Паглядзяць дакументы і мужчын з аўтобуса выштурхоўваюць. І тут жа са́ма, каля дзвярэй… страляюць. Нават убок не адводзяць. Я ніколі б не паверыла. А я гэта сама бачыла. Бачыла, як вывелі двух мужчын, адзін зусім малады, прыгожы, ён ім нешта крычаў. Па-таджыкску, па-руску… Крычаў, што ў яго жонка нядаўна нарадзіла, што трое маленькіх дзяцей дома. А яны толькі смяяліся, таксама маладыя, зусім маладыя. Звычайныя людзі, толькі з аўтаматамі. Ён упаў… Ён ім красоўкі цалаваў… Усе маўчалі, увесь аўтобус. Толькі ад'ехалі — та-та-та… Баялася азірнуцца… *(Плача.)*

Мне пра гэта нельга… Я дзіцятка чакаю. Але я вам раскажу… Пра адно прашу: не называйце маё прозвішча, а імя — Святлана. У нас там сваякі засталіся. Іх за-

б'юць… Я раней думала, у нас ужо ніколі вайны не будзе. Вялікая краіна, любімая. Самая моцная! Раней нам казалі, у савецкай краіне, што мы бедна жывём, сціпла, таму што прайшла вялікая вайна, народ пацярпеў, затое цяпер у нас магутная армія, нас ніхто не кране. Не пераможа! А мы пачалі страляць адзін у аднаго… Цяпер не такая вайна, як раней. Тую вайну наш дзед успамінаў, ён да Германіі дайшоў. Да Берліна. Цяпер сусед страляе ў суседа, хлопчыкі разам у школе вучыліся, і яны забіваюць адзін аднаго, гвалцяць дзяўчынак, з якімі ў школе побач сядзелі. Усе звар'яцелі…

Нашы мужы маўчаць. Мужчыны маўчаць, яны вам нічога не скажуць. Ім крычалі ўслед, што яны як жанчыны — уцякаюць. Баязліўцы! Радзіме здраджваюць. А ў чым іх віна? Хіба гэта віна, што не можаш страляць? Не хочаш. У мяне муж — таджык, яму трэба было ісці на вайну і забіваць. А ён: «Паедзем-паедзем. Я не хачу на вайну. Мне не трэба аўтамат». Ён любіць цяслярыць, коней даглядаць. Ён не хоча страляць. У яго душа такая… Паляванне таксама не любіць. Там ягоная зямля, гавораць на яго мове, а ён з'ехаў. Бо не хоча забіваць іншага таджыка, такога, як сам. Незнаёмага яму чалавека, чалавека, які яго нічым не пакрыўдзіў… Там ён нават тэлевізар не слухаў. Закрываў вушы… Але яму тут самотна, там родныя браты ваююць, аднаго ўжо забілі. Там яго маці жыве. Сёстры. Ехалі мы сюды ў душанбінскім цягніку, вокны выбітыя, халадэча, не ацяпляюць, страляць не стралялі, але па дарозе камяні ў вокны кідалі: «Рускія, прэч! Акупанты! Хопіць нас рабаваць!» А ён жа таджык, і ён усё гэта чуў. І дзеці нашы чулі. Дзяўчынка ў нас вучылася ў першым класе, яна была закаханая ў хлопчыка. Таджыка. Прыходзіць са школы: «Мама, а хто я — таджычка ці руская?» Як ёй растлумачыць…

Мне пра гэта нельга, але я вам раскажу… У іх памірскія таджыкі ваююць з кулябскімі таджыкамі. Яны ўсе — таджыкі, у іх адзін Каран, адна вера, але кулябцы забіваюць памірцаў, а памірцы забіваюць кулябцаў. Спачатку яны на плошчы збіраліся, крычалі, маліліся. Я хацела зразумець, я таксама туды пайшла. Спытала ў старых: «Супраць каго вы выступаеце?» Яны адказалі: «Супраць парламента. Нам сказалі, што гэта вельмі дрэнны чалавек — Парламент». Потым плошча апусцела і пачалі страляць. Неяк адразу стала іншая краіна, незнаёмая. Усход! А да гэтага нам здавалася, што жывём на сваёй зямлі. Па савецкіх законах. Там столькі рускіх магіл засталося, а на іх няма каму плакаць… Жывёлу пасуць на рускіх могілках… Козаў… Рускія старыя па памыйках ходзяць, падбіраюць…

Працавала я ў раддоме, медсястрой. Начное дзяжурства. Жанчына нараджае, цяжка нараджае, крычыць… Забягае санітарка… У нестэрыльных пальчатках, у нестэрыльным халаце… Што здарылася? Што? Каб у такім выглядзе ў радзільную залу?! «Дзяўчаткі, бандыты!» А яны ў чорных масках, са зброяй. І адразу да нас: «Дай наркотыкі! Дай спірт!» — «Няма наркотыкаў, няма спірту». Доктара да сценкі — давай! І тут жанчына, якая нараджала, з палёгкаю закрычала. Радасна. І дзіцятка заплакала, яно толькі з'явілася… Я над ім нахілілася, я нават не запомніла, хто гэта быў: хлопчык ці дзяўчынка? У яго яшчэ імя няма. Нічога няма. І гэтыя бандыты да нас: хто яна — кулябка ці памірка? Мы — маўчым… А гэтыя крычаць: «Хто яна?!» Мы — маўчым. Тады яны хапаюць гэтае дзіцятка, яно, можа, хвілін дзесяць усяго і пабыло на гэтым свеце, і — у вакно… Я медсястра, я не раз бачыла, як дзеці паміраюць. А тут… Ледзь сэрца не вылецела з грудзей… Мне такое нельга ўспамінаць…

*(Зноў пачынае плакаць.)* Пасля таго выпадку… У мяне экзэма на руках высыпала. Вены ўзбухлі. І такая абыякавасць да ўсяго, не хацелася ўставаць з ложка. Падыду да бальніцы і назад паварочваю. А я ўжо сама дзіцятка чакала… Як жыць? Як там нараджаць? Прыехалі сюды, у Беларусь… Нароўля — ціхі гарадок, маленькі. І больш не пытайцеся… Не чапайце мяне… *(Замаўкае.)* Пачакайце… Хачу, каб вы ведалі… Я Бога не баюся… Напачатку мы тут пыталіся: «Дзе ў вас радыяцыя?» — «Дзе стаіце, там і радыяцыя». Дык гэта ж уся зямля?! *(Выцірае слёзы.)* Людзі павыязджалі. Ім страшна.

А мне тут не так страшна, як там. Мы засталіся без радзімы, мы — нічые. Немцы паехалі ў Германію, татары, калі ім дазволілі, — у Крым, а рускія нікому не трэба. На што спадзявацца? Чаго чакаць? Расія ніколі сваіх людзей не ратавала, таму што вялікая, бясконцая. Шчыра кажучы, я не адчуваю, што мая радзіма — Расія, мы выхоўваліся па-іншаму: наша радзіма — Савецкі Саюз. Вось і не ведаеш цяпер, як душу ўратаваць? Ніхто не пстрыкае тут затворам — ужо добра. Нам тут дом далі, мужу — працу. Напісала ліст сваім знаёмым, яны ўчора таксама прыехалі. Назусім. Прыехалі ўвечары і баяліся выйсці з вакзала, дзяцей не пускалі, сядзелі на сваіх чамаданах. Чакалі раніцы. А потым бачаць: людзі ходзяць па вуліцах, смяюцца, кураць… Ім паказалі нашую вуліцу, правялі да самага нашага дома. Яны не маглі апамятацца, бо мы там адвыклі ад нармальнага жыцця, ад мірнага. Ад таго, што ўвечары можна па вуліцах хадзіць. Можна смяяцца… А раніцой яны схадзілі ў гастраном, убачылі масла, вяршкі, і там, у магазіне, — гэта ўсё яны самі нам расказвалі — купілі пяць бутэлек вяршкоў і адразу ж іх выпілі. На іх глядзелі, як на вар'ятаў. А яны ні вяршкоў, ні масла два гады не бачылі. Там

хлеба не купіш. Там — вайна… Гэта нельга растлумачыць чалавеку, які вайны не ведае… Толькі з кіно…

У мяне там душа была мёртвая… Каго б я там нарадзіла з мёртвай душой? Тут людзей мала… Дамы пустыя… Жывём пры лесе… Я баюся, калі шмат людзей, як на вакзале… У час вайны… *(Заплакала наўзрыд і замаўчала.)*

*Маці:*

—Толькі пра вайну… Толькі пра вайну магу гаварыць… Чаму сюды прыехалі? На чарнобыльскую зямлю? Таму што адсюль нас ужо не выганяць. З гэтай зямлі. Яна ўжо нічыя, Бог яе забраў. Людзі яе пакінулі.

У Душанбэ працавала я намеснікам начальніка вакзала, і быў яшчэ адзін намеснік, таджык… Нашы дзеці разам раслі, вучыліся, мы сядзелі за адным святочным сталом: Новы год, Першамай… Дзень Перамогі… Разам пілі віно, плоў елі. Ён да мяне звяртаўся: «Сястра. Сястрычка. Мая руская сястра». І вось ён прыходзіць, а мы сядзелі ў адным кабінеце, спыняецца перад маім сталом і крычыць:

—Калі ты, нарэшце, у сваю Расію зваліш? Гэта — наша зямля!

У тую хвіліну я думала, што мой розум не вытрымае. Падскочыла да яго:

—Куртка на табе адкуль?

—Ленінградская, — адказаў ён ад нечаканасці.

—Здымай рускую куртку, гад! — здзіраю з яго куртку. — Адкуль шапка? Хваліўся, што з Сібіры прыслалі! Здымай шапку, гад! Кашулю давай! Штаны! Іх на маскоўскай фабрыцы шылі! Яны таксама рускія!

Да трусоў бы распранула. Здаравенны мужчына, я яму па плячо, а тут — адкуль сіла ўзялася — усё б з яго здзерла. Вакол ужо людзі сабраліся. Ён крычыць:

— Адыдзі ад мяне, шалёная!

— Не, аддавай усё маё, рускае! Я ўсё сваё забяру! — Ледзь я не звар'яцела. — Шкарпэткі здымай! Чаравікі!

Працавалі мы ўдзень і ўначы... Цягнікі ідуць перапоўненыя — уцякаюць людзі... Шмат рускіх людзей скранулася з месца... Тысячы! Дзясяткі тысяч! Сотні! Яшчэ адна Расія. Адправіла я ў дзве гадзіны ночы маскоўскі цягнік, засталіся ў зале дзеці з горада Курган-Цюбэ, не паспелі на маскоўскі. Я іх зачыніла, схавала. Падыходзяць да мяне двое. З аўтаматамі.

— Ой, хлопцы, што вы тут робіце? — А ў самой сэрца дрыжыць.

— Сама вінаватая, у цябе ва ўсіх дзвярах вецер гуляе.

— Я цягнік адпраўляла. Не паспела зачыніць.

— Што там за дзеці?

— Гэта нашы, душанбінскія.

— А можа, яны з Кургана? Кулябскія?

— Не-не. Нашы.

Пайшлі. А калі б адчынілі залу? Яны б усіх... І мне заадно — кулю ў лоб! Там адна ўлада — чалавек з аўтаматам. Пасадзіла я дзяцей уранні на Астрахань, загадала, каб іх везлі, як кавуны, дзвярэй не адчынялі. *(Спачатку маўчыць. Потым доўга плача.)* Хіба ёсць што-небудзь страшнейшае за чалавека? *(Зноў замаўкае.)*

Ужо тут, калі ішла па вуліцы, праз кожную хвіліну азіралася, мне здавалася, што нехта за спінай напагатове... Чакае. Дня там не праміналa, каб я пра смерць не думала... Заўсёды з дому ва ўсім чыстым выходзіла — у памытай блузцы, спадніцы, у чыстай бялізне. А раптам заб'юць! Цяпер па лесе хаджу адна і нікога не баюся. Людзей у лесе няма, ніводнага чалавека. Іду, успамінаю: ці было гэта ўсё са мной, ці не? Іншым разам паляўнічых сустрэнеш: са стрэльбай, сабакам і дазіметрам. Гэта

таксама людзі са зброяй, але не такія, яны за чалавекам не ганяюцца. Страляніну пачую — ведаю, што па варонах страляюць або зайца гоняць. *(Маўчыць.)* Таму мне тут не страшна… Я не баюся зямлі, вады… Я чалавека баюся… Там ён за сто долараў на базары купляе аўтамат…

Успамінаю хлопца. Таджыка… Ён гнаўся за іншым хлопцам… За чалавекам гнаўся! Як ён бег, як дыхаў, я адразу зразумела, што ён хоча забіць… Але той схаваўся… уцёк… І вось гэты вяртаецца, ідзе міма мяне і кажа: «Маці, дзе тут можна вады папіць?» Звычайна так пытае, як нічога ніякага. У нас на вакзале бачок з вадой стаяў, я яму паказала. І вось гляджу яму ў вочы і кажу-кажу: «Навошта вы адзін за адным ганяецеся? Навошта забіваеце?» І яму нібыта нават сорамна стала. «Ну, маці, ты давай цішэй». А калі яны разам, яны іншыя. Каб былі ўдвух ці ўтрох, паставілі б мяне да сценкі. З адным чалавекам яшчэ можна гаварыць…

З Душанбэ прыехалі ў Ташкент, а далей трэба — у Мінск. Няма білетаў — і ўсё! У іх хітра гэта наладжана, пакуль хабар не дасі, у самалёт не сядзеш, бясконцыя прыдзіркі — то да вагі, то да памераў: гэта нельга, тое прыбяры. Два разы на вагі ганялі, ледзь скеміла. Грошы ўсунула… «Вось так бы даўно, а то спрачаецца тут». Як усё проста! А да гэтага… Кантэйнер у нас — дзве тоны, прымусілі разгрузіць. «Вы едзеце з гарачай кропкі, можа, зброю везяце? Анашу?» Я пайшла да начальніка і ў яго ў прыёмнай пазнаёмілася з добрай жанчынай, яна мне першая параіла: «Нічога вы тут не даб'ецеся, а будзеце патрабаваць справядлівасці, ваш кантэйнер выкінуць у поле і разрабуюць усё, што вы прывезлі». Ну што рабіць? Ноч не спалі, разгрузіліся, што там у нас: шмоткі, матрацы, старая мэбля і стары халадзільнік,

два мяхі кніг. «Вы, напэўна, каштоўныя кнігі везяце?» Паглядзелі — «Што рабіць?» Чарнышэўскага, «Узнятая цаліна» Шолахава… Пасмяяліся. «А колькі ў вас халадзільнікаў?» — «Адзін, ды і той нам разбілі». — «Чаму не ўзялі дэкларацыі?» — «Ну адкуль мы ведаць маглі? Першы раз з вайны едзем». Мы страцілі адразу дзве радзімы — свой Таджыкістан і Савецкі Саюз…

Хаджу па лесе, думаю. Нашы ўсе каля тэлевізара сядзяць: як там? Што там? А я не хачу.

Было жыццё… Іншае жыццё… Я там лічылася вялікім чалавекам, у мяне званне ёсць — падпалкоўнік чыгуначных войскаў. Тут сядзела беспрацоўная, пакуль не ўладкавалася прыбіральніцай у гарсавеце. Падлогу мыю… Прайшло жыццё… А на другое ў мяне ўжо сіл няма… Адны нас тут шкадуюць, другія незадаволеныя: «Бежанцы бульбу крадуць. Па начах выкопваюць». У тую вайну, мая мама ўспамінала, людзі больш адно аднаго шкадавалі. Нядаўна каля лесу каня здзічэлага знайшлі. Мёртвага. У іншым месцы — зайца. Яны не забітыя былі, а мёртвыя. Пасля гэтага ўсе захваляваліся. А знайшлі мёртвага бамжа, неяк непрыкметна прайшло.

Да мёртвага чалавека людзі паўсюль прывыклі…

*Лена М. з Кіргізіі. На парозе дома, як для фатаграфіі, побач з ёй сядзелі яе пяцёра дзяцей і кот Мяцеліца, якога яны прывезлі з сабой.*

Мы ехалі — як з вайны…

Схапілі рэчы, кот з намі ішоў да вакзала след у след, ката забралі. Ехалі цягніком дванаццаць сутак, апошнія два дні ў нас заставалася толькі кіслая капуста ў слоіках і кіпень. Хто з ломам, хто з сякерай, хто з малатком — дзяжурылі каля дзвярэй. Скажу вам так… Аднойчы

ўначы напалі на нас бандыты. Ледзь не забілі. За тэлевізар, за халадзільнік цяпер могуць забіць. Мы ехалі — як з вайны, хоць у Кіргізіі, дзе мы жылі, пакуль не страляюць. Была разня ў горадзе Ош… кіргізаў з узбекамі… Неяк яно хутка заціхла. Затаілася. Але нешта ў паветры носіцца. На вуліцах… Скажу вам… Добра мы, рускія, але і самі кіргізы баяцца… У іх чэргі па хлеб, вось яны і крычаць: «Рускія — дадому, пакуль цэлыя! Кіргізія — для кіргізаў!» — і выштурхоўваюць з чаргі. І яшчэ штосьці па-кіргізску, ну, такое, што, маўляў, ім самі хлеба не хапае, а трэба нас карміць. Я іх мову дрэнна разумею, вывучыла некалькі слоў, каб на рынку патаргавацца…

У нас была Радзіма, цяпер яе няма. Хто я? Мама — украінка, тата — рускі. Нарадзілася і вырасла ў Кіргізіі, выйшла замуж за татарына. Хто мае дзеці? Якая ў іх нацыянальнасць? Мы ўсе перамяшаліся, наша кроў перамяшалася. У пашпарце ў мяне і ў дзяцей запісана — рускія, а мы — не рускія. Мы — савецкія! Але той краіны, дзе я нарадзілася, няма. Няма ні таго месца, што мы называлі радзімай, ні таго часу, які таксама быў нашай радзімай. Мы цяпер — як кажаны. У мяне пяцёра дзяцей: старэйшы сын — у восьмым класе, малодшая дзяўчынка — у дзіцячым садку. Я іх сюды прывезла. Нашай краіны няма, а мы — ёсць.

Я там нарадзілася, вырасла. Будавала завод, працавала на заводзе. «Едзь туды, дзе твая зямля, а тут усё нашае». А дзе маё? Бягуць людзі. Едуць. Усе рускія людзі. Савецкія. Яны нідзе не патрэбныя, іх ніхто не чакае.

А я калісьці шчаслівая была. Усе мае дзеці ад кахання… Я іх так нараджала: хлопчык, хлопчык, хлопчык, потым — дзяўчынка, дзяўчынка. Больш гаварыць не буду… Заплачу… *(Але дадае яшчэ некалькі слоў.)* Мы бу-

дзем жыць тут. Цяпер тут — наш дом. Чарнобыль — наш дом. Наша радзіма... *(Раптам усміхаецца.)* А птушкі тут такія, як і ў нас. І помнік Леніну стаіць... *(І каля вясніц, ужо развітваючыся.)* Неяк раннім ранкам у суседнім доме стукаюць малаткамі. Дошкі з вокнаў здымаюць. Сустракаю жанчыну: «Адкуль вы?» — «З Чачні». Нічога не кажа. Ходзіць у чорнай хустцы.

Мяне людзі сустракаюць... Здзіўляюцца... Не разумеюць. Што ты, маўляў, робіш са сваімі дзецьмі, ты іх забіваеш. Ты — самагубца. Я не забіваю, я іх ратую. Вось, у сорак гадоў уся сівая... У сорак гадоў! Аднойчы нямецкага журналіста ў дом прывялі, і ён пытаецца: «Прывезлі б вы дзяцей туды, дзе чума або халера?» Дык тое ж чума і халера... А гэтага страху, які тут, я не адчуваю. Не бачу. Няма яго ў маёй памяці...

Я людзей баюся... Чалавека са зброяй...

## Маналог пра тое, што толькі ў зле чалавек вынаходлівы і хітры, але ён адкрыты і даступны ў простых словах любові

Бег я... Уцякаў ад свету... Спачатку па вакзалах бадзяўся, вакзалы падабаліся, бо людзей шмат, а ты адзін. Потым у газетах прачытаў — і сюды. Тут вольна. Я сказаў бы — рай. Людзей няма, адны звяры ходзяць. Жыву сярод звяроў і птушак. Хіба я адзінокі?

Сваё жыццё забыў... Не распытвайце... Што чытаў у кніжках — памятаю, і пра што іншыя людзі расказвалі — памятаю, а сваё жыццё забыў. Малады быў... Грэх на мне... Няма граху такога, які б Госпад не дараваў за шчырасць пакаяння. Вось так... Людзі несправядлівыя, а Госпад шматцярплівы і шматлітасцевы...

Чаму? Няма адказу… Чалавек не можа быць шчаслівы. Не павінен. Убачыў Госпад адзінокага Адама і даў яму Еву. Для шчасця, а не для граху. А ў чалавека не атрымліваецца быць шчаслівым. Я вось не люблю змяркання. Вось гэты пераход, як зараз… Ад святла да ночы… Падумаю — і не магу зразумець, дзе я быў раней… Дзе маё жыццё? Вось так… Мне ўсё адно: магу жыць і магу не жыць. Жыццё чалавека, які трава, расцвітае, сохне і ў полымя кідаецца. Я палюбіў памысліць… Тут можна аднолькава загінуць і ад звера, і ад холаду. І ад думак. На дзясяткі кіламетраў ніводнага чалавека. Д'ябла выганяюць пастом і малітвай. Пост — для плоці, малітва — для душы. Але я ніколі не бываю адзінокі, чалавек, які веруе, не можа быць адзінокі. Вось так… Езджу па вёсках… Раней знаходзіў макарону, муку. Алей і кансервы. Цяпер на могілках жывлюся. Нябожчыкам пакідаюць паесці, папіць. А ім гэта не трэба… І яны на мяне не крыўдуюць… На полі — дзікае жыта. У лесе — грыбы, ягады. Тут вольна. Шмат чытаю.

Разгорнем святыя старонкі… Адкрыццё Іаана Багаслова: «…і ўпала з неба вялікая зорка, палаючы, нібы светач, і ўпала на трацiну рэк і крыніцы водаў. Імя гэтай зорцы “палын”. І трацiна ўсіх водаў зрабілася палыном, і многія людзі памерлі ад водаў, бо яны прагорклі…»

Спасцігаю гэтае прароцтва… Усё ўжо прадказана, напісана ў святых кнігах, але мы чытаць не ўмеем. Не цямім. Палын па-ўкраінску «чарнобыль». У словах нам быў дадзены знак. Але чалавек мітуслівы. Пыхлівы. І малы.

Знайшоў у айца Сяргея Булгакава: «…паколькі Бог стварыў свет беспамылкова, то свет не можа зусім не атрымацца» і трэба «мужна і да канцаператрываць гісторыю». Вось так… І ў кагосьці іншага… Імя не памя-

таю... Памятаю думку: «Зло ўласна не ёсць субстанцыя, але — пазбаўленне дабра, падобна як змрок не штосьці іншае, а адсутнасць святла». Кніжкі тут знайсці проста, лёгка знойдзеш. Пустога збана не адшукаеш, лыжкі або відэльца, а кніжкі ляжаць. Нядаўна знайшоў томік Пушкіна... «И смерти мысль мила душе моей». Гэта запомніў. Вось так... «И смерти мысль»... Я тут адзін. Пра смерць думаю, палюбіў памысліць. Цішыня спрые, каб падрыхтавацца... Чалавек жыве сярод смерці, але, што такое смерць, не разумее. А я тут адзін... Учора ваўчыцу з ваўчанятамі выгнаў са школы, жылі яны там.

Пытанне: ці сапраўдны свет, адлюстраваны ў слове? Слова, яно стаіць паміж чалавекам і душой. Вось так...

А то яшчэ скажу: птушкі, дрэвы, мурашкі — яны сталі блізкія мне. Раней такіх пачуццяў не ведаў. І не ўяўляў нават. Таксама ў кагосьці прачытаў: «Сусвет над намі і сусвет пад намі». Я пра ўсіх думаю. Чалавек — страшны... І незвычайны... Але тут забіваць нікога не хочацца. Рыбу лаўлю, вуда ёсць. Вось так... А ў звера не страляю... І пастак не стаўлю... Мой улюбёны герой князь Мышкін казаў: «Хіба можна бачыць дрэва і не быць шчаслівым». Вось так... Я люблю памысліць. А чалавек найчасцей скардзіцца, а не мысліць...

Дзеля чаго разглядваць зло? Яно, вядома, хвалюе... Грэх — гэта таксама не фізіка... Трэба прызнаць няіснае. Сказана ў Бібліі: «Для пасвечанага — іначай, для астатніх прыпавесць». Вось, напрыклад, птушка... Або жывёліна... Нам іх зразумець немагчыма, бо яны жывуць для сябе, а не для іншых. Вось так... Навокал усё цячэ, калі адным словам сказаць...

Усё жывое — на чатырох нагах, глядзіць у зямлю і да зямлі цягнецца. Адзін толькі чалавек на зямлі стаіць, а рукамі і галавой да неба падымаецца. Да малітвы...

Да Бога… Бабуля ў царкве моліцца: «Усім нам паводле грахоў нашых». Але ні вучоны, ні інжынер і ні вайсковец у тым не прызнаюцца. Яны думаюць: «Мне няма ў чым каяцца. Чаму я павінен каяцца?» Вось так…

Малюся я проста… Чытаю сам сабе… «Господи, *воззвах* к тебе, услыши мя!..» Пачуй! Толькі ў зле чалавек вынаходлівы і хітры, але ён адкрыты і даступны ў простых словах любові. Слова нават у філосафаў толькі набліжаецца да той думкі, якую яны адчулі. Слова абсалютна адпавядае таму, што ў душы, — толькі ў малітве, у думцы малітоўнай. Я фізічна гэта адчуваю. «Господи, *воззвах* к тебе, услыши мя!..» Пачуй!

І чалавек таксама…

Я баюся чалавека. І заўсёды хачу яго сустрэць. Добрага чалавека. Вось так… Тут або бандыты жывуць, хаваюцца, або такі чалавек, як я. Пакутнік.

Якое прозвішча? Пашпарта ў мяне няма. Забрала міліцыя… Біла: «Чаго бадзяешся?» — «Я не бадзяюся — я каюся». Яшчэ мацней білі. Білі па галаве… Так што напішыце: раб Божы Мікалай…

Цяпер — свабодны чалавек.

# САЛДАЦКІ ХОР

*Арцём Бахціяраў, радавы; Алег Лявонцьевіч Верабей, ліквідатар; Васіль Іосіфавіч Гусіновіч, вадзіцель-разведчык; Генадзь Віктаравіч Дземенеў, міліцыянер; Віталь Барысавіч Карбалевіч, ліквідатар; Валянцін Камкоў, вадзіцель, радавы; Эдуард Барысавіч Караткоў, верталётчык; Ігар Літвін, ліквідатар; Іван Аляксандравіч Лукашук, радавы; Аляксандр Іванавіч Міхалевіч, дазіметрыст; Алег Леанідавіч Паўлаў, маёр, верталётчык; Анатоль Барысавіч Рыбак, камандзір узвода аховы; Віктар Санько, радавы; Рыгор Мікалаевіч Хвораст, ліквідатар; Аляксандр Васільевіч Шынкевіч, міліцыянер; Уладзімір Пятровіч Швед, капітан; Аляксандр Міхайлавіч Ясінскі, міліцыянер.*

«Наш полк узнялі па трывозе… Доўга ехалі. Нічога канкрэтнага ніхто не казаў. Толькі ў Маскве на Беларускім вакзале аб’явілі, куды нас вязуць. Адзін хлопец, здаецца, з Ленінграда, запратэставаў: “Я хачу жыць”. Яму прыгразілі трыбуналам. Камандзір так і сказаў перад шарэнгай: “У турму або пад расстрэл пойдзеш”. У мяне былі іншыя пачуцці. Усё наадварот. Хацелася нечага гераічнага. Выпрабаваць свой характар. Можа быць, дзіцячы такі імпэт? У нас служылі хлопцы з усяго Савецкага Саюза. Рускія, украінцы, казахі, армяне… Было трывожна і чамусьці весела.

Ну, прывезлі нас… Прывезлі на саму станцыю. Далі белы халат і белую шапачку. Марлевую павязку. Чысцілі

тэрыторыю. Дзень выграбалі, шкрэблі ўнізе, дзень — наверсе, на даху рэактара. Паўсюль з рыдлёўкай. Тых, хто падымаўся наверх, звалі "бусламі". Робаты не вытрымлівалі, тэхніка вар'яцела. А мы працавалі. Здаралася — кроў з вушэй ішла, з носа. У горле дзерла. Рэзала ў вачах. Увесь час у вушах чуваць быў манатонны гук. Хацелася піць. Але апетыту не было. Фіззарадка забаранялася, каб радыяцыяй дарэмна не дыхаць. А ездзілі на працу ў кузавах адкрытых машын.

Аднак добра працавалі. І вельмі гэтым ганарыліся...»

«Мы заехалі... Стаяў знак "забароненая зона". Я не быў на вайне, але адчуванне чагосьці знаёмага... Аднекуль з памяці... Адкуль? Нешта звязанае са смерцю...

На дарогах сустракалі здзічэлых сабак, катоў. Часам яны паводзілі сябе дзіўна, не пазнавалі людзей, уцякалі ад нас. Я не разумеў, што з імі, пакуль нам не загадалі іх адстрэльваць... Дамы апячатаныя, калгасная тэхніка кінутая... Цікава было паглядзець. Нікога няма, толькі мы, міліцыя, патрулюем. Заходзіш у дом — фатаграфіі вісяць, а людзей няма. Дакументы валяюцца: камсамольскія білеты, пасведчанні, пахвальныя граматы... У адным доме ўзялі тэлевізар на нейкі час, напракат, але каб хтосьці нешта браў дадому, я не заўважаў. Па-першае, было адчуванне, што людзі вось-вось вернуцца... Па-другое, гэта... нешта звязанае са смерцю...

Ездзілі да блока, да самага рэактара. Фатаграфавацца... Хацелася дома пахваліцца... Страх быў і ў той самы час цікавасць неадольная: што ж гэта такое? Я, напрыклад, адмовіўся, у мяне жонка маладая, не рызыкнуў, а хлопцы выпівалі па дзвесце грамаў і ехалі... Так... *(Памаўчаўшы.)* Вярнуліся жывыя — значыць усё нармальна.

Заступаю ў начное дзяжурства. Патрулюем... Ясны месяц. Ліхтар такі вісіць.

Вясковая вуліца... Ніводнага чалавека... Спачатку яшчэ гарэла ў дамах святло, потым адключылі. Едзем — з дзвярэй школы нясецца нам напярэймы дзік. Або лісіца. Звяры жылі ў дамах, школах, клубах. А там віселі плакаты: “Наша мэта — шчасце ўсяго чалавецтва”, “Пераможа сусветны пралетарыят”, “Ідэі Леніна будуць жыць вечна”. У калгасных канторах сцягі, навюткія вымпелы, стосы ціснёных грамат з профілямі правадыроў. На сценах — партрэты правадыроў, на сталах — гіпсавыя правадыры. Усюды ваенныя помнікі... Іншых помнікаў я не сустракаў. Нашармака зьлепленыя дамы, шэрыя бетонныя кароўнікі, іржавыя сянажныя вежы... І зноў — маленькія і вялікія Курганы славы... “І гэта нашае жыццё? — пытаўся я ў сябе, паглядзеўшы на ўсё іншымі вачыма. — Гэта мы так жывём?” Нібыта нейкае ваяўнічае племя знялося з часовай стаянкі... Некуды панеслася...

Чарнобыль узарваў мае мазгі. Я пачаў думаць».

«Пакінуты дом... Зачынены. Кацяня на вакне. Думаў, што яно — глінянае. Падыходжу: жывое. Аб’ела ўсе кветкі ў вазонах. Пеларгоніі. Як яно туды трапіла? Ці яго забылі?

На дзвярах цыдулка: “Мілы прахожы, не шукай дарагіх рэчаў, іх у нас не было. Карыстайся ўсім, але не марадзёрствуй. Мы вернемся”. На іншых дамах бачыў надпісы рознай фарбай: “Даруй нам, родны дом!”. З домам развітваліся, як з чалавекам. Пісалі: “ад’язджаем раніцой” або “ад’язджаем увечары”, ставілі дату і нават гадзіны і хвіліны. Цыдулкі дзіцячым почыркам на аркушыках з вучнёўскіх сшыткаў: “Не бі кошку. Пацукі

з'ядуць усё". Або: "Не забівай нашу Жульку. Яна — добрая". *(Заплюшчвае вочы.)* Я ўсё забыў... Памятаю толькі, што туды паехаў, а больш нічога не памятаю. Я ўсё забыў... На трэці год пасля дэмбелю нешта з памяццю здарылася... нават дактары не разумеюць... Грошы палічыць не магу — збіваюся. Блукаю па бальніцах...

Я ўжо расказваў ці не? Падыходзіш і думаеш — дом пусты. Адчыніш — кот сядзіць... Але і гэтыя цыдулкі дзіцячыя...»

«Прызвалі на службу...

А служба такая: не прапускаць у выселеныя вёскі мясцовых жыхароў. Стаялі заслонамі паблізу дарог, капалі зямлянкі, будавалі назіральныя вышкі. Называлі нас чамусьці "партызанамі". Мірнае жыццё. А мы стаім... Апранутыя па-вайсковаму. Сяляне не разумелі, чаму, напрыклад, нельга забраць са свайго падворка вядро, гарлач, пілу або сякеру. Сабраць ураджай. Як гэта ім растлумачыць? І праўда: на адным баку дарогі салдаты стаяць, а на другім кароў пасуць, гудуць камбайны і малоцяць збожжа. Збяруцца жанчыны і плачуць: "Хлопчыкі, пусціце! Гэта ж наша зямля... нашы хаты..." Яйкі, сала нясуць, самагонку. Пусціце... Плакалі па атручанай зямлі. Па мэблі... па рэчах...

А ў нас служба такая: не пускаць. Бабуля нясе кошык яек — канфіскаваць і закапаць. Падаіла карову, нясе вядро малака. З ёю салдат. Пахаваць малако... Выкапалі яны ўпотай сваю бульбачку — забраць. І буракі, і цыбулю, і гарбузы. Закапаць... Па інструкцыі... А ўсё так урадзіла, пазайздросціць можна. І прыгажосць навокал. Залатая восень. Ува ўсіх былі твары вар'ятаў. І ў іх, і ў нас.

А ў газетах трубілі пра наш гераізм... Якія мы гераічныя хлопцы... Камсамольцы-добраахвотнікі!

А хто мы былі насамрэч? Што мы рабілі? Я хацеў бы пра гэта даведацца. Прачытаць. Хоць я сам там быў…».

«Я — чалавек вайсковы, мне загадаюць — я павінен… Я даў прысягу…

Але гэта яшчэ не ўсё… Гераічны імпэт, ён таксама быў. Яго выхоўвалі… Яго нам унушалі яшчэ са школы. Ад бацькоў. І там палітработнікі выступалі. Радыё, тэлебачанне. Розныя людзі рэагавалі па-рознаму: адны хацелі, каб у іх узялі інтэрв'ю, надрукавалі ў газеце, другія глядзелі на ўсё, як на працу, трэція… Я іх сустракаў, яны жылі з пачуццём, што здзяйсняюць гераічны ўчынак. Бяруць удзел у гісторыі. Нам добра плацілі, але праблемы грошай быццам і не было. Зарплата мая — чатырыста рублёў, а там я атрымліваў тысячу, у тых, савецкіх рублях. Па тым часе вялікія грошы. Нас потым папракалі: "Грошы нямераныя заграбалі, а вярнуліся — давай ім машыны, гарнітуры мэблевыя без чаргі". Крыўдна, вядома. Таму што быў і гераічны імпэт…

Перад тым як ехаць туды, з'явіўся страх. На кароткі час. А там страх знікаў. Калі б я мог убачыць — гэты страх… Загад. Праца. Заданне. Мне хацелася паглядзець на рэактар зверху, з верталёта: што там здарылася, як яно выглядае? Але рабіць гэта забаранялася. У картку мне запісалі дваццаць адзін рэнтген, але я не ўпэўнены, што сапраўды столькі. Прынцып быў самы просты: прылятаеш у райцэнтр Чарнобыль (гэта, дарэчы, маленькі раённы гарадок, а не нешта такое грандыёзнае, як мне ўяўлялася), там сядзіць дазіметрыст, за дзесяць-пятнаццаць кіламетраў ад станцыі ён мераў фон. Гэтыя замеры потым памнажаліся на

колькасць гадзін, якія мы налётвалі за дзень. Але я падняўся на верталёце і паляцеў на рэактар: туды — назад, праход у двух кірунках, сёння там — восемдзесят рэнтгенаў, заўтра — сто дваццаць... Уначы кружляю над рэактарам — дзве гадзіны. Рабілі здымкі ў інфрачырвоных промнях, кавалкі раскіданага графіту на стужцы як быццам "засвечваліся"... Удзень іх нельга было ўбачыць...

Размаўляў з вучонымі. Адзін: "Я магу гэты ваш верталёт языком вылізаць, і са мной нічога не здарыцца". А другі: "Хлопцы, чаму вы без ахоўных сродкаў лётаеце? Жыццё сабе скарачаеце? Абшывайцеся! Абклёпвайцеся!" Выратаванне тапельцаў — клопат саміх тапельцаў. Паклалі на сядзенні свінцовыя лісты, выразалі нагрудныя камізэлькі... З тонкага ліставога свінцу... Але выяўляецца: ад адных промняў яны бароняць, а ад іншых — не. Твары ва ўсіх зрабіліся чырвоныя, абпаленыя, не маглі пагаліцца. Лёталі ад ранку да ночы. Фантастычнага нічога не было. Праца. Цяжкая праца. Уначы сядзелі каля тэлевізара, якраз ішоў чэмпіянат свету па футболе. Размовы, канешне, і пра футбол.

Задумвацца мы пачалі... Як бы вам не схлусіць... Напэўна, гады праз тры-чатыры... Калі адзін захварэў, другі... Хтосьці памёр... Звар'яцеў... Рукі на сябе наклаў... Тады пачалі задумвацца. А зразумеем штонебудзь, я думаю, гадоў праз дваццаць-трыццаць. У мяне Афган (я там два гады быў) і Чарнобыль (там быў тры месяцы) — самыя яркія моманты жыцця...

Бацькам не паведамляў, што накіравалі ў Чарнобыль. Брат выпадкова купіў газету "Известия" і ўбачыў мой партрэт. Прыносіць да маці: "На, глядзі — герой!" Маці заплакала...»

«Мы рухаліся да станцыі...

А насустрач нам ішлі калоны з людзьмі. Эвакуацыя. Гналі тэхніку. Жывёлу. Удзень і ўначы. Сярод мірнага жыцця...

Ехалі... І я ведаеце што ўбачыў? На ўзбочынах дарогі. Пад сонечнымі промнямі... Найтанчэйшы такі бляск... Нешта крышталічнае блішчэла... Найдрабнейшыя часцінкі... Ехалі ў бок Калінкавічаў, праз Мазыр. Нешта пераліваласся... Паразмаўлялі мы між сабой. Здзівіліся. У вёсках, дзе працавалі, на лістоце адразу заўважылі прапаленыя дзірачкі, асабліва на вішнях. Збіралі гуркі, памідоры — і там на лісці чорныя дзірачкі... Восень. Пунсовыя ад ягад кусты парэчак, ад яблыкаў галіны да зямлі гнуцца — вядома, не ўтрымаешся. З'ясі. Тлумачылі нам, што нельга. А мы лаяліся і елі.

Паехаў... Хоць мог не ехаць. Добраахвотнікам папрасіўся. У першыя дні абыякавых там не сустракаў, гэта потым вакуум у вачах з'явіўся, калі папрывыкалі. Ордэн адхапіць? Прывілеі розныя? Лухта! Мне асабіста нічога не трэба было. Кватэра, машына... Што яшчэ? А, дача... Усё меў. Спрацоўваў мужчынскі азарт... Едуць сапраўдныя мужыкі на сапраўдную справу. А астатнія? Няхай сядзяць пад жаночымі спадніцамі... У аднаго — прынёс даведку — жонка нараджае, у другога — дзіця маленькае... Так, рызыкоўна. Так, небяспечна — радыяцыя, але рабіць камусьці трэба. А як нашы бацькі ў вайну?

Вярнуліся дадому. Усё з сябе зняў, усё адзенне, у якім там быў, і выкінуў у смеццеправод. А пілотку падараваў маленькаму сыну. Вельмі ж ён прасіў. Насіў не здымаючы. Праз два гады яму паставілі дыягназ: пухліна мозгу...

Далей дапішыце самі... Я не хачу далей гаварыць...»

«Я толькі вярнуўся з Афганістана... Жыць хацеў. Ажаніцца. Адразу хацеў ажаніцца....

А тут позва з чырвонай паласой "Спецзборы" — цягам гадзіны з'явіцца на пазначаны адрас. Маці адразу — плакаць. Вырашыла, што мяне зноў на вайну забіраюць

Куды вязуць? Навошта? Інфармацыі амаль няма. Ну, выбухнуў рэактар... І што? У Слуцку пераапранулі, абмундзіравалі, і тут адкрылася, што едзем у райцэнтр Хойнікі. Прыбылі ў Хойнікі, там людзі яшчэ нічога не ведалі. Яны, як і мы, упершыню бачылі дазіметр. Павезлі далей, у вёску... А там вяселле гуляюць: маладыя цалуюцца, музыка, самагонку п'юць. Вяселле як вяселле. А нам загад: зрэзаць грунт на глыбіню штыка... Высякаць дрэвы...

Спачатку выдалі зброю. Аўтаматы. На выпадак нападу амерыканцаў... На палітзанятках чыталі лекцыі пра дыверсіі заходніх спецслужбаў, іх падрыўную дзейнасць. Увечары мы складалі аўтаматы ў асобнай палатцы. Пасярод лагера. Праз месяц зброю забралі і кудысьці павезлі. Ніякіх дыверсантаў. Рэнтгены... Кюры...

Дзявятага мая — на Дзень Перамогі — прыехаў генерал. Пашыхтавалі нас, павіншавалі са святам. Адзін з шарэнгі насмеліўся і запытаў: "Чаму ад нас хаваюць, які радыефон? Якія атрымліваем дозы?" Адзін такі знайшоўся. Дык яго, калі генерал з'ехаў, выклікаў камандзір часткі і зрабіў прачуханку: "Правакацыямі займаешся! Панікёр!" Праз пару дзён нейкія супрацьгазы выдалі, але ніхто імі не карыстаўся. Дазіметры два разы паказвалі, але ў рукі нікому не далі. Раз на тры месяцы адпускалі дадому на пару дзён. Наказ адзін: купіць гарэлкі. Я прыцягнуў на сабе два заплечнікі з бутэлькамі. На руках падкідвалі.

Перад адпраўкай дадому ўсіх выклікаў кадэбэшнік і пераканаўча раіў нідзе і нікому не расказваць пра тое, што мы бачылі. З Афгана я вярнуўся, ведаў — буду жыць! А пасля Чарнобыля ўсё наадварот: заб'е якраз тады, калі ты — ужо дома.

Вярнуўся… А ўсё толькі пачынаецца…»

«Што запомнілася… Урэзалася ў памяць…

Цэлы дзень матаюся па вёсках… З дазіметрыстамі… І ніводная з жанчын не прапануе яблыка… У мужчын страху меней, прынясуць самагонкі, сала: "Давай паабедаем". І адмовіцца няёмка, і паабедаць чыстым цэзіем — мала радасці. Вып'еш. Без закускі. Баравікі пад коламі машын храбусцелі. Хіба гэта нармальна? У рацэ плавалі тоўстыя і млявыя самы, разоў у пяць-сем большыя, чым звычайна. Хіба гэта нармальна?..

У адной вёсцы ўсё ж пасадзілі за стол… смажаная бараніна… Гаспадар падпіў і прызнаўся: "Малады баранчык. Зарэзаў, бо не мог на яго глядзець. Такая пачварына! Нават есці неахвота". Я шклянку самагонкі — хлабысь. Пасля гэтых слоў… Гаспадар смяецца: "Мы тут адаптаваліся, як каларадскія жукі".

Паднеслі дазіметр да сцяны — зашкальвае…»

«Дзесяць гадоў прамінула… Ужо як быццам і не было гэтага, каб не захварэў — забыўся б…

Трэба Радзіме служыць! Радзіме служыць — святая справа. Атрымаў: нацельную бялізну, анучы, боты, пагоны, пілотку, штаны, гімнасцёрку, рэмень, заплечнік. Наперад! Далі самазвал. Вазіў бетон. Сяджу ў кабіне і веру, што жалеза і шкло мяне ахоўваюць. Ці пан, ці прапаў… Абыдзецца! Маладыя хлопцы. Нежанатыя. Рэспіратараў з сабой не бралі… Не, аднаго памятаю…

Немалады вадзіцель... Вось ён — заўсёды ў масцы. А мы — не. Даішнікі стаялі на дарогах без масак. Мы — у кабіне, а яны — у радыеактыўным пыле стаялі па восем гадзін. Усім добра плацілі: тры зарплаты плюс камандзіровачныя. Ужывалі, вядома... ну, вы разумееце. Гарэлка, ведаеце, дапамагае. Найпершы сродак для аднаўлення ахоўных уласцівасцяў арганізма пасля радыеактыўнага апраменьвання. І здымае стрэс. Невыпадкова ў вайну давалі знакамітыя наркамаўскія сто грамаў. Звычайная карціна: п'яны міліцыянер штрафуе п'янага вадзіцеля...

Не пішыце пра дзівосы савецкага гераізму. Яны былі... Дзівосы! Але спачатку — нядбайнасць, бязладдзе, а потым дзівосы. Закрыць амбразуру... Грудзьмі на кулямёт... А што ў прынцыпе не павінна быць такога загаду, пра гэта ніхто не піша. Шпурлялі нас туды, як пясок на рэактар... Як мяхі з пяском. Кожны дзень вывешвалі новы "Баявы лісток": "працуюць мужна і самааддана", "выстаім і пераможам". Называлі прыгожа — "салдатамі агню".

Далі мне за подзвіг грамату і тысячу рублёў...»

«Спачатку неўразуменне... Адчуванне, што вайсковыя вучэнні... Гульня...

Але гэта была сапраўдная вайна. Атамная вайна... Нам не вядомая. Што страшна, а што не страшна, чаго баяцца, а чаго не баяцца? Ніхто не ведаў, і запытацца не было ў каго. Сапраўдная эвакуацыя... На вакзалах... Што рабілася на вакзалах!.. Мы дапамагалі запіхваць дзяцей у вокны вагонаў... Наводзілі парадак у чэргах... Чэргі па білеты ў касах, па ёд — каля аптэк. У чэргах лаяліся матам і біліся. Ламалі дзверы ў вінных крамах. Разбівалі, выломвалі ў вокнах чыгунныя краты. Тысячы

перасяленцаў... Яны жылі ў клубах, школах, дзіцячых садах. Хадзілі паўгалодныя. Грошы ўва ўсіх хутка сканчваліся. У крамах усё паскуплялі...

Я не забуду жанчын, якія мылі нашу бялізну. Пральных машын не было, пра іх не падумалі, не завезлі. Мылі ўручную. Усе жанчыны — немаладыя. Рукі ў іх — у вадырах, струпах. Бялізна не проста брудная, там дзясяткі рэнтгенаў... "Хлопчыкі, паешце", "хлопчыкі, паспіце", "хлопчыкі, вы ж маладыя. Беражыцеся". Шкадавалі нас і плакалі.

Ці жывыя яны цяпер?

Дваццаць шостага красавіка кожны год мы збіраемся — тыя, хто там быў. Тыя, хто цяпер яшчэ застаўся. Успамінаем той час. Ты быў салдатам на вайне, ты быў патрэбны. Кепскае забылася, а гэта засталося. Засталося тое, што без цябе не маглі абысціся... Ты быў запатрабаваны... Наша сістэма, ваенная, наогул, яна выдатна спрацоўвае ў надзвычайных абставінах. Ты нарэшце там свабодны і неабходны. Свабода! І рускі чалавек у такія моманты паказвае, які ён вялікі! Унікальны! Галандцамі або немцамі ніколі не будзем. І не будзе ў нас даўгавечнага асфальту і дагледжаных газонаў. А героі заўсёды знойдуцца!..»

«Мая гісторыя...

Заклікáлі ісці — і я пайшоў. Трэба! Быў членам партыі. Камуністы, наперад! Такая абстаноўка. Я ў міліцыі працаваў. Старшы сяржант. Паабяцалі мне зорачку на пагоны. Гэта быў чэрвень восемдзесят сёмага года... Трэба медкамісію абавязкова прайсці, але мяне адправілі без праверкі. Нехта там, як кажуць, адмазаўся, прынёс даведку, што ў яго язва страўніка, і мяне замест яго. Тэрмінова. Такая абстаноўка... *(Смяецца.)*

Анекдоты ўжо да таго часу з'явіліся. Умомант... Прыходзіць муж з працы і скардзіцца жонцы: "Сказалі: заўтра або ў Чарнобыль, або партбілет на стол". — "Дык ты ж беспартыйны!" — "Вось я і думаю: дзе я ім да раніцы партбілет знайду?"

Ехалі — як вайскоўцы, а з нас напачатку арганізавалі брыгаду муляраў. Будавалі аптэку. У мяне адразу слабасць, санлівасць нейкая. Па начах — кашаль. Я — да доктара: "Усё нармальна. Спёка". У сталоўку прывозілі з калгаса мяса, малако, смятану, мы елі. Доктар ні да чога не дакранаўся. Згатуюць ежу, ён у журнале адзначыць, што ўсё ў норме, але пробу сам не здымае. Мы гэта заўважалі. Такая абстаноўка. Адчайныя былі. Пачаліся трускалкі. Поўныя вуллі мёду...

Пачыналі ўжо лазіць марадзёры. Цягнулі ўсё. Мы забівалі вокны, дзверы. Апячатвалі ў калгасных канторах сейфы, вясковыя бібліятэкі. Затым адключалі інжынерныя камунікацыі, электрычнасць на выпадак пажару.

Крамы разрабаваныя, краты на вокнах павыдзіраныя. Мука, цукар пад нагамі, растаптаныя цукеркі... Разбітыя слоікі... З адной вёскі людзей выселілі, а праз пяць-дзесяць кіламетраў людзі жывуць. Рэчы з пакінутай вёскі перавандравалі да іх. Такая абстаноўка... Мы ахоўваем... Прыязджае былы старшыня калгаса з мясцовымі людзьмі, іх ужо недзе пасялілі, далі дамы, а яны вяртаюцца сюды жыта жаць, сеяць. Вывозілі сена ў цюках. У гэтых цюках мы знаходзілі схаваныя швейныя машынкі, матацыклы, тэлевізары. А выпраменьванне такое ішло, што тэлевізары не працавалі... Бартар: яны табе бутэльку самагонкі — ты ім дазвол на правоз дзіцячага вазка. Прадавалі, выменьвалі трактары, сеялкі. Адна бутэлька... Дзесяць бутэлек... Грошы нікога не

цікавілі... *(Смяецца.)* Як пры камунізме... На ўсё існаваў цэннік: каністра бензіну — паўлітра самагонкі, каракулевае футра — два літры, матацыкл — як старгуешся... Я паўгода адбыў, згодна са штатным раскладам, тэрмін быў паўгода. Потым прысылалі замену. Нас трошкі затрымалі, бо з Прыбалтыкі адмовіліся ехаць. Такая абстаноўка... Але я ведаю, што раскралі, вывезлі ўсё, што можна было падняць і звезці. Прабіркі са школьных хімічных лабараторый цягнулі. Зону перавезлі сюды... Шукайце на рынках, у камісійных крамах, на дачах...

Засталася за дротам толькі зямля... І магілы... Наша мінулае — наша вялікая краіна...»

«Прыбылі на месца... Абмундзіраваліся...

Пытанне: куды мы трапілі? “Аварыя, — супакойвае нас капітан, — здарылася даўно. Тры месяцы назад. Ужо не страшна”. Сяржант: “Усё добра, толькі мыйце рукі перад ядой”.

Служыў дазіметрыстам. Як пацямнее, да нашага вахтавага вагончыка пад'язджаюць хлопцы на машынах. Грошы, цыгарэты, гарэлка... Дай толькі ў канфіскаваным барахле пакапацца. Пакавалі сумкі. Куды везлі? Напэўна, у Кіеў... У Мінск... На барахолкі... Тое, што заставалася, мы закопвалі. Сукенкі, боты, крэслы, гармонікі, швейныя машынкі... Закопвалі ў ямы, якія называлі “брацкімі магіламі”.

Дадому прыехаў. Іду на танцы. Спадабалася дзяўчо:

—Давай сябраваць.

—Навошта? Ты цяпер чарнобыльскі. Хто за цябе замуж пойдзе?

З іншай пазнаёміўся. Цалуемся. Абдымаемся. Справа да загса даходзіць.

—Давай пажэнімся, — прапанаваў.

І пытанне тыпу таго: а ты хіба можаш? Здольны?..

Я з'ехаў бы некуды… І, напэўна, з'еду. Ды вось бацькоў шкада…»

«У мяне свая памяць…

Афіцыйная мая пасада там — камандзір узвода аховы… Нешта накшталт дырэктара зоны апакаліпсісу. *(Смяецца.)* Так і напішыце.

Затрымліваем машыну з Прыпяці. Ужо ў горадзе прайшла эвакуацыя, людзей няма… "Калі ласка, дакументы". Дакументаў няма. Кузаў накрыты брызентам. Падымаем брызент: дваццаць чайных сервізаў, як цяпер памятаю, мэблевая сценка, мяккі куток, тэлевізар, дываны, ровары…

Складаю пратакол.

Прывозяць мяса, каб закапаць у могільніках. У ялавічных тушах няма сцёгнаў. Выразка.

Складаю пратакол.

Прыйшло данясенне: у пакінутай вёсцы разбіраюць дом. Нумаруюць і складаюць бярвёны на трактар з прычэпам. Тэрмінова выязджаем на названы адрас. "Налётчыкі" затрыманыя. Хацелі вывезці будынак і прадаць пад дачу. Ужо і аванс ад будучых гаспадароў атрымалі.

Складаю пратакол.

У пустых вёсках бегалі здзічэлыя свінні. А сабакі і коткі чакалі людзей каля весніц. Вартавалі пустыя дамы.

Пастаіш каля брацкай магілы… Трэснуты камень з прозвішчамі: капітан Барадзін, старшы лейтэнант… Даўгія слупкі, як вершы, — прозвішчы радавых… Дзядоўнік, крапіва, лопух…

Раптам дагледжаны гарод. За плугам ідзе гаспадар, убачыў нас:

—Хлопцы, не крычыце. Мы падпіску ўжо далі: увесну з'едзем.

—А навошта тады гарод пераворваеце?

—Дык гэта ж восеньскія работы...

Я разумею, але я павінен скласці пратакол...»

«Ды пайшлі вы ўсе...

У мяне жонка забрала дзіця і сышла. Сука! Але я ў пятлю не палезу, як Ванька Котаў... І з сёмага паверха не скінуся. Сука! Калі я адтуль прыехаў з чамаданам грошай... Машыну купілі, ёй — футра норкавае... Яна, сука, жыла са мной. Не баялася. *(Спявае.)*

Даже тысяча рентген
Не положит русский член...

Добрая прыпеўка. Адтуль. Хочаце анекдот? *(Адразу пачынае расказваць.)* Муж вяртаецца дадому... З-пад рэактара... Жонка пытаецца ў доктара: "Што рабіць з мужам?" — "Памыць, абняць, дэзактываваць". Сука! Яна мяне баіцца... Забрала дзіця... *(Нечакана сур'ёзна.)* Салдаты працавалі... Каля рэактара... Я іх вадзіў на змену і са змены: "Хлопцы, лічу да ста. Усё! Наперад!" У мяне, як і ўва ўсіх, вісеў на шыі лічыльнік-накапляльнік. Пасля змены я іх збіраў і здаваў у першы аддзел... Сакрэтны... Там здымалі паказанні, запісвалі быццам бы нешта ў нашыя карткі, але колькі рэнтгенаў кожны адхапіў — ваенная таямніца. Сукі! Бл... Мінае нейкі час, табе кажуць: "Стоп! Больш нельга!" Уся медыцынская інфармацыя... Нават пры ад'ездзе не сказалі — колькі? Сукі! Бл... Цяпер яны б'юцца за ўладу... За партфелі... У іх — выбары... Яшчэ хочаце анекдот? Пасля Чарнобыля можна есці ўсё, але сваё г... — хаваць

у свінцы. Ха-ха-ха… Жыццё цудоўнае, падла, але такое кароткае…

Як нас лячыць? Ніякіх дакументаў мы не прывезлі. Я шукаў… Запытваў па інстанцыях… Атрымаў і захоўваю тры адказы. Адказ першы: дакументы знішчаныя ў сувязі з тым, што тэрмін іх захавання — тры гады; другі — дакументы знішчаныя ў час постперабудовачнага скарачэння арміі і расфармавання вайсковых частак; трэці — дакументы знішчаныя, таму што былі радыеактыўныя. А можа, іх знішчылі, каб ніхто не даведаўся праўды? Мы — сведкі. Але мы хутка памром… Чым дапамагчы нашым дактарам? Мне б цяпер даведачку атрымаць: колькі? Чаго я там назбіраў? Я сваёй сучцы паказаў бы… Я ёй яшчэ дакажу, што мы выжывем у любых умовах і будзем жаніцца і нараджаць.

А вось… Малітва ліквідатара: “Госпадзе, калі ты зрабіў так, што я не магу, дык зрабі так, каб я не хацеў”. Пайшлі вы ўсе ў ср..!»

«Пачыналася… Усё пачыналася, як дэтэктыў…

Падчас абеду — званок на завод: радавому запасу такому і такому… з’явіцца ў гарадскі ваенкамат, каб нешта ўдакладніць у дакументах. Прычым — тэрмінова. А ў ваенкамаце… Такіх, як я, было шмат, нас сустракаў капітан і кожнаму паўтараў: “Заўтра паедзеце ў пасёлак Краснае, дзе будуць праходзіць вайсковыя зборы”. Раніцой наступнага дня ўсе сабраліся каля ваенкамата. Забралі ў нас цывільныя дакументы, вайсковыя білеты і пасадзілі ў аўтобусы. І павезлі ў невядомым кірунку. Пра вайсковыя зборы ўжо ніхто не ўспамінаў. Афіцэры з суправаджэння на ўсе пытанні адказвалі маўчаннем. “Братцы! А калі ў Чарнобыль?!” — здагадаўся нехта. Каманда: “Маўчаць! За панікёрскія настроі — вайсковы

трыбунал па законах ваеннага часу". Неўзабаве тлумачэнне: "Мы знаходзімся на ваенным становішчы. Ніякіх лішніх размоў! Хто пакіне Радзіму ў бядзе — той здраднік!"

У першы дзень убачылі атамную станцыю здалёк. Назаўтра ўжо збіралі вакол яе смецце... Цягалі вёдрамі... Зграбалі звычайнымі рыдлёўкамі, зачышчалі мётламі, з якімі дворнікі працуюць. Скрабкамі. А вядома ж — рыдлёўка прыстасаваная для пяску і друзу. Але не для смецця, у якім знаходзілі ўсё: кавалкі плёнкі, арматуры, дрэва і бетону. Як той казаў, на атам з рыдлёўкай. Дваццатае стагоддзе... Трактары і бульдозеры, якія там выкарыстоўвалі, былі з радыёкіраваннем, а мы ішлі за імі і падграбалі рэшткі. Дыхалі гэтым пылам. Мянялі за змену па трыццаць "пялёсткаў Істракова", у народзе іх называлі "намордпікамі". Нязручная рэч і недасканалая. Часта іх зрывалі... Дыхаць немагчыма, асабліва ў спёку. Пад сонцам.

Пасля ўсяго... Яшчэ тры месяцы праходзілі вайсковыя зборы... Стралялі па мішэнях. Вывучалі новы аўтамат. На выпадак ядзернай вайны... *(З іроніяй.)* Я так разумею... Нас нават не пераапранулі. Хадзілі ў тых самых гімнасцёрках, у ботах, у якіх былі каля рэактара.

Ну і далі падпісаць паперу... Пра неразгалошванне... Я маўчаў... А калі б далі гаварыць, каму я мог расказаць? Адразу пасля тых збораў стаў інвалідам другой групы. У дваццаць два гады. Працаваў на заводзе. Начальнік цэха: "Кідай хварэць, а то скароцім". Скарацілі. Пайшоў да дырэктара: "Не маеце права. Я — чарнобылец. Я вас ратаваў. Абараняў!" — "Мы цябе туды не пасылалі".

Начамі прачынаюся ад мамінага голасу: "Сыночак, чаму ты маўчыш? Ты ж не спіш, ляжыш з адкрытымі

вачыма. І святло ў цябе гарыць". Я маўчу... Хто гатовы мяне выслухаць? Загаварыць са мной так, каб я адказаў... На маёй мове...

Я адзінокі...»

«Ужо не баюся смерці. Самой смерці...

Але незразумела, як буду паміраць... Сябар паміраў... Павялічыўся, раздзьмуўся... Зрабіўся як бочка... А сусед... Таксама там быў, кранаўшчык. Ён стаў чорны як вугаль, высах да дзіцячага памеру. Незразумела, як буду паміраць... Калі б прасіў смерці, то звычайнай. Не чарнобыльскай. Адно дакладна ведаю: з маім дыягназам доўга не працягнеш. Адчуць бы момант — і кулю ў лоб. Я быў і ў Афгане... Там з гэтым лягчэй... З куляй...

У Афганістан я паехаў добраахвотнікам. І ў Чарнобыль таксама. Сам папрасіўся. Працаваў у горадзе Прыпяць. Горад быў абведзены двума радамі калючага дроту, як на дзяржаўнай мяжы. Чысцюткія шматпавярховыя дамы і вуліцы, пакрытыя тоўстым слоем пяску, высечаныя дрэвы... Кадры з фантастычнага фільма... Мы выконвалі загад — "памыць" горад і замяніць верхнія дваццаць сантыметраў глебы такім самым слоем пяску. Выхадных дзён не было. Як на вайне. Захоўваю газетную выразку... Пра аператара Леаніда Таптунова, гэта ён у тую ноч дзяжурыў на станцыі і націснуў на чырвоную кнопку аварыйнай аховы за некалькі хвілін да выбуху. Яна не спрацавала... Яго лячылі ў Маскве. "Каб уратаваць, трэба цела", — разводзілі рукамі дактары. А ў яго засталася адна-адзіная чыстая, неапрамененая плямка на спіне. Пахавалі на Міцінскіх могілках. Труну ўсярэдзіне заслалі фольгай... Над ім паўтара метра бетонных плітаў, са свінцовай пракладкай. Прыедзе бацька... Стаіць, плача... Ідуць міма людзі: "Твой сукін сын

падарваў!" Быў ён усяго толькі аператар. А пахавалі — як іншапланетніка з космасу.

Лепей бы я загінуў у Афгане! Шчыра скажу, навальваюцца такія думкі. Там смерць была справай звычайнай... Зразумелай...»

«З верталёта...

Ішоў нізка над зямлёй, назіраў... Казулі, дзікі... Худыя, сонныя. Як на запаволеных здымках рухаюцца... Яны харчаваліся травой, што там расла, і пілі ваду. Не разумелі — ім таксама трэба было сысці. Разам з людзьмі...

Ехаць — не ехаць? Ляцець — не ляцець? Я — камуніст, як я мог не ляцець? Двое штурманаў адмовіліся, маўляў, жонкі маладыя ў іх, дзяцей яшчэ няма. Іх прысаромілі. Кар'ера скончылася! Быў яшчэ мужчынскі суд. Суд гонару! Гэта, разумееце, азарт — ён не змог, а я пайду. Цяпер я думаю іначай... Пасля дзевяці аперацый і двух інфарктаў... Цяпер я нікога не асуджаю, я іх разумею. Маладыя хлопцы. Але сам усё адно паляцеў бы... Гэта дакладна. Ён — не змог, а я — пайду. Гэта мужчынскае такое!

Зверху... З вышыні... Уражвала колькасць тэхнікі: цяжкія верталёты, сярэднія верталёты... МІ-24 — гэта баявы верталёт... Што можна было рабіць на баявым верталёце ў Чарнобылі? Лётчыкі. Маладыя хлопцы... Стаяць у лесе каля рэактара, хапаюць рэнтгены. Загад! Ваенны загад! Але навошта было пасылаць туды такую колькасць людзей, апраменьваць? Навошта?! *(Зрываецца на крык.)* Патрабаваліся спецыялісты, а не чалавечы матэрыял. Зверху відаць... Разбураны будынак, горы смецця... І гіганцкая колькасць маленькіх чалавечых фігурак. Стаяў нейкі фээргэшаўскі кран, але мёртвы,

крыху па даху прайшоў і памёр. Робаты паміралі… Нашы робаты, створаныя акадэмікам Лукачовым для даследаванняў на Марсе… Японскі робат, знешне падобны да чалавека… Але… У іх, відаць, ад высокай радыяцыі згарала ўся начынка. Салдацікі ў гумовых касцюмах, у гумовых пальчатках бегалі… Такія маленькія, калі глядзець з неба…

Я ўсё запамінаў… Я думаў, што раскажу сыну… А прыехаў: "Тата, што там?" — "Вайна". Я не знайшоў іншых словаў…»

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# ВЯНЕЦ СТВАРЭННЯ

## Маналог пра старыя прароцтвы

Мая дзяўчынка... Яна не такая, як усе... Вось яна падрасце і запытаецца ў мяне: «Чаму я не такая?»

Калі яна нарадзілася... Гэта было не дзіця, а жывы мяшэчак, зашыты з усіх бакоў, ніводнай шчылінкі, толькі вочкі расплюшчаныя. У медыцынскай картцы запісана: «дзяўчынка, народжаная з множнай комплекснай паталогіяй: аплазія ануса, аплазія похвы, аплазія левай ныркі»... Так гэта гучыць на навуковай мове, а на звычайнай: ні пісі, ні попкі, адна нырка... Я несла яе на другі дзень на аперацыю, на другі дзень яе жыцця... Яна расплюшчыла вочкі, нібыта і ўсміхнулася, а я спачатку падумала, што хоча заплакаць... О божа, яна ўсміхнулася! Такія, як яна, не жывуць, такія адразу паміраюць. Яна не памерла, таму што я яе люблю. За чатыры гады — чатыры аперацыі. Гэта адзінае ў Беларусі дзіця, якое выжыла з такой комплекснай паталогіяй. Я яе вельмі люблю. *(Спыняецца.)* Я нікога больш не змагу нарадзіць. Не насмелюся. Вярнулася з раддома: муж пацалуе ўначы, я ўся дрыжу — нам нельга... Грэх... Страх... Чула, як дактары паміж сабой гаварылі: «Дзяўчынка не ў кашулі нарадзілася, а ў панцыры. Калі паказаць па тэлевізары, ніводная маці не нараджала б». Гэта яны пра нашу дзяўчынку... Як нам пасля гэтага любіць адно аднаго?!

Хадзіла ў царкву. Расказала бацюшку. Ён кажа, што трэба адмольваць грахі свае. Але ў нашым родзе ніхто нікога не забіў... У чым я вінаватая? Спачатку наш пасёлак хацелі вывезці ў эвакуацыю, а потым выкраслілі са

спісаў: не хапіла ў дзяржавы грошай. А я ў гэты час пакахала. Выйшла замуж. Я не ведала, што нам тут нельга любіць... Шмат гадоў таму мая бабуля чытала ў Бібліі, што надыдзе на зямлі час, калі ўсяго будзе ў дастатку, усё будзе цвісці і даваць плады, у рэках будзе поўна рыбы, а ў лясах — звяроў, але скарыстацца гэтым чалавек не зможа. Ён не зможа і нарадзіць сабе падобнага, працягнуць бессмяротнасць. Я слухала старыя прароцтвы, як страшную казку. Не верыла.

Раскажыце ўсім пра маю дзяўчынку. Напішыце. У чатыры гады яна спявае, танцуе, чытае на памяць вершы. У яе нармальнае разумовае развіццё, яна нічым не адрозніваецца ад іншых дзяцей, у яе толькі іншыя гульні. Яна не гуляе ў «магазін», у «школу», яна гуляе з лялькамі ў «бальніцу»: робіць ім уколы, ставіць тэрмометры, прызначае кропельніцу, лялька памірае — накрывае яе белай прасцінай. Чатыры гады мы жывём з ёю ў бальніцы, яе нельга пакінуць там адну, і яна не ведае, што жыць трэба дома. Калі забіраю яе на месяц дадому, пытаецца: «А мы хутка вернемся ў бальніцу?» Там у яе сябры, яны там жывуць, растуць. Ёй зрабілі попку... Робяць похву... Пасля апошняй аперацыі цалкам спынілася мочаспусканне, катэтар уставіць не ўдалося — трэба яшчэ некалькі аперацый. Але далей раяць рабіць аперацыі за мяжой. А дзе нам узяць дзясяткі тысяч долараў, калі муж атрымлівае сто дваццаць долараў у месяц? Адзін прафесар па сакрэце параіў: «З такой паталогіяй ваша дзіця ўяўляе вялікую цікавасць для навукі. Пішыце ў замежныя клінікі...» І я пішу... *(Стараецца не заплакаць.)* Я пішу, што кожныя паўгадзіны даводзіцца выціскаць мачу рукамі, мача адыходзіць праз кропкавыя адтулінкі каля похвы. Калі гэтага не рабіць, адмовіцца працаваць адзіная нырка. Дзе яшчэ ў свеце ёсць дзіця,

якому кожныя паўгадзіны трэба выціскаць мачу рукамі? І колькі гэта можна вытрымаць? *(Плача.)* Я не дазваляю сабе плакаць... Мне нельга плакаць... Стукаюся ва ўсе дзверы. Пішу. Вазьміце маю дзяўчынку, няхай сабе для доследаў... Для навуковых даследаванняў... Я згодная, каб яна стала паддоследным жабяняткам, толькі б яна выжыла. *(Плача.)* Дзясяткі лістоў напісала... О божа!

Пакуль яна не разумее, але калі-небудзь у нас запытаецца, чаму яна не такая, як усе? Чаму яе не зможа пакахаць мужчына? Чаму ёй нельга нарадзіць дзіця? Чаму ў яе ніколі не адбудзецца таго, што адбываецца ў матылька... у птушкі... ува ўсіх, але толькі не ў яе... Я хацела... Я павінна была даказаць... Каб... Я хацела атрымаць дакументы... Каб яна вырасла і даведалася: гэта не мы з мужам вінаватыя... Не нашае каханне... *(Зноў намагаецца не заплакаць.)* Чатыры гады ваявала... З дактарамі, чыноўнікамі... Дабівалася прыёму ў высокіх кабінетах... Толькі праз чатыры гады мне выдалі даведку, якая пацвярджае сувязь малых дозаў радыяцыі, якая іанізуе, з яе страшнай паталогіяй. Мне адмаўлялі чатыры гады, мне паўтаралі: «Ваша дзяўчынка — інвалід дзяцінства». Які ж яна інвалід дзяцінства? Яна — інвалід Чарнобыля. Я вывучыла сваё радаводнае дрэва: не здаралася ў нас уродзе такога, да васьмідзесяці-дзевяноста гадоў усе жылі, мой дзядуля — да дзевяноста чатырох. Дактары апраўдваліся: «У нас — інструкцыя. Такія выпадкі мы пакуль што мусім ацэньваць як агульнае захворванне. Вось праз дваццаць-трыццаць гадоў, калі збярэцца банк дадзеных, пачнём звязваць хваробы з гэтай самай радыяцыяй, якая іанізуе. З малымі дозамі... З тым, што мы ямо і п'ём на нашай зямлі... А пакуль медыцыне і навуцы пра гэта мала што вядома». Але я не магу чакаць дваццаць-трыццаць гадоў.

Паўжыцця! Хацела падаць на іх у суд… На дзяржаву… Мяне называлі вар'яткай, смяяліся, маўляў, такія дзеці нараджаліся і ў Старажытнай Грэцыі. І ў старым Кітаі. Адзін чыноўнік крычаў: «Чарнобыльскіх прывілеяў захацела! Чарнобыльскіх грошай!» Як я не страціла прытомнасць у ягоным кабінеце, як не памерла там ад разрыву сэрца… Але мне нельга…

Яны не маглі зразумець аднаго… Не хацелі… Мне трэба было ведаць, што гэта не мы з мужам вінаватыя… Не нашае каханне… *(Павярнулася да вакна і ціха плача.)*

Гэтая дзяўчынка расце… Усё роўна дзяўчынка… Не хачу, каб называлі прозвішча… Нават суседзі з нашай лесвічнай пляцоўкі… усяго не ведаюць. Надзену ёй сукеначку, запляту коску: «Кацечка вашая такая прыгожая», — гавораць яны мне. А сама я так дзіўна гляджу на цяжарных жанчын… Як быццам здалёк… З-за вугла… Не гляджу, а падглядваю… Ува мне сумесь розных пачуццяў: здзіўлення і жаху, зайздрасці і радасці, нейкай нават помслівасці. Аднойчы злавіла сябе на думцы, што з тым самым пачуццём гляджу на цяжарную суседскую суку… На бусліху ў гняздзе…

Мая дзяўчынка…

*Ларыса З., маці*

## Маналог пра месяцавы краявід

Я раптам пачаў сумнявацца, што лепей: памятаць або забыць?

Распытаў знаёмых… Адны забылі, другія не хочуць успамінаць, бо мы нічога не можам змяніць, нават з'ехаць адсюль не можам. Нават гэтага…

Што я запомніў... У першыя ж дні пасля аварыі з бібліятэк зніклі кнігі пра радыяцыю, пра Хірасіму і Нагасакі, нават пра рэнтген. Праляцела чутка, што гэта загад начальства, каб не сеяць панікі. Дзеля нашага ж спакою. З'явіўся нават жарт такі, што — калі б Чарнобыль выбухнуў у папуасаў — увесь свет бы спалохаўся, апрача саміх папуасаў. Ніякіх медыцынскіх рэкамендацый... Ніякай інфармацыі... Хто мог, здабываў таблеткі ёдзістага калію (у аптэках нашага горада ў продажы іх не было, даставалі недзе па вялікім блаце). Здаралася, што з'ядалі жменю гэтых таблетак і запівалі шклянкаю спірту. «Хуткая дапамога» ратавала.

Прыехалі першыя замежныя журналісты... Першая кінагрупа... Яны былі ў пластыкавых камбінезонах, касках, гумовых бахілах, пальчатках, нават камера ў спецыяльным чахле. А суправаджала іх наша дзяўчына, перакладчыца. У летняй сукенцы і басаножках...

Людзі верылі кожнаму друкаванаму слову, хоць ніхто праўды не друкаваў. Не гаварыў. З аднаго боку, праўду хавалі, з другога — не ўсё разумелі. Ад генсека да дворніка. Потым з'явіліся прыкметы, усе за імі сачылі: пакуль у горадзе або ў вёсцы ёсць вераб'і і галубы, там можна жыць і чалавеку. Пчала працуе — таксама чыста. Ехаў у таксі, вадзіцель быў у непаразуменні, чаму птушкі, як сляпыя, падаюць на шкло, разбіваюцца. Як ненармальныя... Сонныя... Нешта падобнае да самагубства... Пасля змены, каб забыць пра гэта, ён сядзеў і выпіваў з сябрамі.

Запомніў, як вяртаўся з камандзіроўкі... Паабапал дарогі — сапраўдны месяцавы краявід... Да самага далягляду цягнуліся засыпаныя белым даламітам палі... Верхні забруджаны слой зямлі знялі і пахавалі, замест яго насыпалі даламітавага пяску. Быццам і не

Зямля… Не на Зямлі… Доўга пакутаваў ад гэтага відовішча і паспрабаваў напісаць апавяданне. Уявіў, што тут будзе праз сто гадоў: ці то чалавек, ці то яшчэ нешта скача на карачках, выкідваючы доўгія заднія ногі каленямі назад. Уначы ён бачыць усё трэцім вокам, а адзінае вуха — яно на макаўцы — чуе нават, як бегаюць мурашкі. Засталіся толькі мурашкі, усё астатняе на зямлі і ў небе загінула…

Паслаў апавяданне ў часопіс. Прыслалі адказ, што гэта не літаратурны твор, а пераказ жаху. Вядома, у мяне не хапіла таленту. Але тут, падазраю, яшчэ адна прычына. Я задумаўся: чаму пра Чарнобыль мала пішуць? Нашы пісьменнікі працягваюць пісаць пра вайну, пра сталінскія лагеры, а тут маўчаць. Кніг — раз, два і ўсё. Думаеце, выпадковасць? Падзея дагэтуль яшчэ па-за культурай. Траўма культуры. І адзіны наш адказ — маўчанне. Заплюшчваем вочы, як маленькія дзеці, і думаем: «Мы схаваліся». З будучыні выглядвае нешта, і яно несувымернае нашым пачуццям. Нашым здольнасцям перажываць. Разгаворышся з чалавекам — ён пачынае расказваць і ўдзячны табе за тое, што ты яго выслухаў. Не зразумеў, а хоць выслухаў. Таму што ён сам не зразумеў… Як і ты… Я разлюбіў чытаць фантастыку…

Дык што ж лепей: памятаць або забыць?

*Яўген Аляксандравіч Броўкін,*
*выкладчык Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта*

## Маналог сведкі, у якога балеў зуб, калі ён бачыў, як Хрыстос упаў і пачаў крычаць

Тады я думаў пра іншае… Вам будзе здавацца дзіўным… Якраз у той час я разводзіўся з жонкай…

Раптам прыходзяць, уручаюць позву і кажуць, што ўнізе ўжо чакае машына. Такі «варанок» спецыяльны. Як у трыццаць сёмым годзе… Бралі па начах. З пасцелі, цёпленькіх. Потым гэтая схема перастала працаваць: жонкі не адчынялі дзвярэй або хлусілі, што мужы ў камандзіроўцы, на курорце, у вёсцы ў бацькоў. Ім спрабавалі ўручыць позвы, яны не бралі. Пачалі хапаць людзей на працы, на вуліцы, у час абедзеннага перапынку ў заводскіх сталоўках. Як у трыццаць сёмым… А я быў тады амаль вар'ят… Мне здрадзіла жонка, усё астатняе здавалася лухтой. Сеў у той «варанок»… Вялі мяне двое ў цывільным, але з вайсковай выпраўкай, ішлі па баках, відаць, баяліся, што збягу. Калі сеў у машыну, чамусьці ўспомніў амерыканскіх касманаўтаў, якія лёталі на Месяц, і адзін з іх пазней стаў святаром, а другі нібыта страціў розум. Чытаў, што ім здалося… Быццам яны там убачылі рэшткі гарадоў, нейкія чалавечыя сляды. Мільганулі ў памяці абрыўкі з газет: нашы атамныя станцыі абсалютна бяспечныя, можна будаваць на Чырвонай плошчы. Каля Крамля. Бяспечнейшыя за самавар. Што яны падобныя да зорак і мы «засеем» імі ўсю зямлю. Але ад мяне сышла жонка… Я здольны быў думаць толькі пра гэта… Некалькі разоў спрабаваў скончыць самагубствам, глытаў таблеткі і марыў не прачнуцца. Мы хадзілі ў адзін дзіцячы сад, вучыліся ў адной школе… У адным інстытуце… *(Закурвае цыгарэту і маўчыць.)*

Я вас папярэджваў… Нічога гераічнага для пісьменніцкага пяра. Былі думкі, што быццам бы не ваенны час, чаму я павінен рызыкаваць, калі нехта будзе спаць з маёй жонкай. Чаму зноў я, а не ён? Шчыра кажучы, не бачыў я там герояў. Вар'ятаў бачыў, якім начхаць на сваё жыццё, і смеласці дурной хапала, але патрэбы ў ёй

не было. У мяне таксама ёсць граматы і падзякі… Але гэта таму, што мне не страшна было паміраць. Напляваць! Гэта было нават выйсце. Пахавалі б з пашанай… І за казённыя грошы…

Там ты адразу трапляў у фантастычны свет, дзе злучыліся канец свету і каменны век. А ўва мне ўсё яшчэ абвостранае… Аголенае… Жылі ў лесе. У палатках. За дваццаць кіламетраў ад рэактара. «Партызанілі». «Партызаны» — гэта тыя, каго бяруць на вайсковыя зборы. Узрост — ад дваццаці пяці да сарака гадоў, шмат хто — з вышэйшай адукацыяй, сярэднетэхнічнай, я, напрыклад, настаўнік гісторыі. Замест аўтаматаў выдалі нам рыдлёўкі. Перакопвалі смеццевыя звалкі, гароды. Жанчыны ў вёсках глядзелі і хрысціліся. Мы ў пальчатках, рэспіратарах, маскхалатах… Сонца пячэ… З'яўляемся на іхніх гародах, як чэрці. Іншапланетнікі нейкія. Яны не разумелі, чаму мы перакопваем іхнія грады, вырываем іхні часнок, капусту, калі часнок — як часнок, капуста — як капуста. Бабулі хрысцяцца і галосяць: «Салдацікі, гэта што — канец свету?»

У хаце печ паляць, сала смажыцца. Дазіметр прыставіш: не печ, а маленькі рэактар. «Сядайце, хлопчыкі, да стала», — клічуць. Шануюць. Адмаўляемся. Просяць: «Сто грамаў знойдзем. Сядайце. Раскажыце». А што расказваць? На самім рэактары пажарнікі таптали мяккае паліва, яно свяцілася, а яны не ведалі, што гэта такое. Дзе ж нам ведаць?

Ідзём аддзяленнем. На ўсіх — адзін дазіметр. А ў розных месцах — розны ўзровень: адзін з нас працуе там, дзе два рэнтгены, а другі там, дзе дзесяць рэнтгенаў. З аднаго боку, бяспраўе, як у зэкаў, з другога — страх. І загадка. Але ў мяне страху не было. Глядзеў на ўсё нібыта зводдаль…

На верталёце прыляцела група вучоных. У гумовай спецвопратцы, высокіх ботах, ахоўных акулярах... Касманаўты... Падыходзіць да аднаго бабуля: «Ты хто?» — «Я — вучоны». — «Ах, ты вучоны! Паглядзіце на яго, як прыбраўся прыгожа. Замаскіраваўся. А мы?» І за ім — з палкай. У мяне не раз мільгала думка, што калі-небудзь вучоных будуць вылоўліваць, як у сярэднія вякі лавілі і тапілі лекараў. Палілі на вогнішчах.

Я бачыў чалавека, на вачах у якога закопвалі ягоны дом... *(Падымаецца і адыходзіць да вакна.)* Засталася свежавыкапаная магіла... Вялікі прастакутнік. Пахавалі калодзеж, сад... *(Маўчыць.)* Мы хавалі зямлю. Зразалі, скручвалі гэтыя вялікія пласты... Я вас папярэджваў... Нічога гераічнага...

Вяртаемся позна ўвечары, бо працавалі па дванаццаць гадзін у суткі. Без выхадных. На адпачынак толькі ноч. Значыцца, едзем на бэтээры. Ідзе па пустой вёсцы чалавек. Бліжэй: малады хлопец з дыванам на плячах... Недалёка «Жыгулі»... Тармазім. Багажнік забіты тэлевізарамі і абрэзанымі тэлефонамі. Бэтээр разварочваецца — і таранам: «Жыгулі» ў гармонік, як кансервавую бляшанку. Ніхто і слова не прамовіў...

Хавалі ў зямлю лес... Дрэвы пілавалі на кавалкі па паўтара метра, запакоўвалі ў цэлафан і звальвалі ў могільнік. Уначы не мог заснуць. Заплюшчу вочы: нешта чорнае варушыцца, пераварочваецца... Як жывое... Жывыя пласты зямлі... З жукамі, павукамі, чарвякамі... Я нікога з іх не ведаў, не ведаў, як іх завуць... Проста жукі, павукі. Мурашкі. А яны маленькія і вялікія, жоўтыя і чорныя. Такія рознакаляровыя. У кагосьці з паэтаў чытаў, што жывёлы — гэта асобны народ. Я забіваў іх дзясяткамі, сотнямі, тысячамі, не ведаючы нават, як іх завуць. Разбураў іхнія дамы. Іхнія таямніцы. Хаваў... Хаваў...

У Леаніда Андрэева, якога я вельмі люблю, ёсць прыпавесць пра Лазара, які зазірнуў за мяжу забароненага. Ён ужо ніколі не будзе сваім сярод людзей, хоць Хрыстос яго і ўваскрасіў…

Можа, хопіць? Вам, я разумею, цікава, тым, хто там не пабыў, заўсёды цікава. Адзін Чарнобыль у Мінску, другі — у самой зоне. Недзе ў Еўропе — трэці. У самой зоне ўражвала абыякавасць, з якой казалі пра катастрофу. У мёртвай вёсцы сустрэлі старога. Жыве адзін. Пытаемся ў яго: «А не страшна?» А ён у адказ: «Чаму страшна?» Нельга ўвесь час жыць у страху, чалавек не можа, праміпае крыху часу — і пачынаецца звычайнае чалавечае жыццё. Звычайнае… Нармальнае… Мужчыны пілі гарэлку. Гулялі ў карты. Заляцаліся да жанчын. Шмат казалі пра грошы. Але не за грошы там працавалі, мала хто толькі за грошы. Працавалі, бо трэба працаваць. Сказалі — працаваць. І не задавалі пытанняў. Марылі пра павышэнне па службе. Хітравалі, кралі. Спадзяваліся на абяцаныя прывілеі: атрымаць кватэру па-за чаргой і пераехаць нарэшце з барака, уладкаваць дзіця ў дзіцячы садок, купіць машыну. Адзін у нас выявіўся баязліўцам, баяўся вылазіць з палаткі, у гумовым самаробным касцюме спаў. Баягуз! Яго выключылі з партыі. Ён крычаў: «Я хачу жыць!» Усё перамяшалася… Сустракаў там жанчын, якія добраахвотна прыехалі. Ірваліся. Ім адмаўлялі, тлумачылі, што трэба шафёры, слесары, пажарнікі, але яны прыехалі. Усё перамяшалася… Тысячы добраахвотнікаў… Добраахвотныя студэнцкія атрады і спецыяльны «варанок», што па начах падпільноўваў нас, запаснікоў… Збор рэчаў… Грашовыя пераводы ў фонд пацярпелых, сотні людзей, якія бязвыплатна прапаноўвалі кроў і касцявы мозг… І ў той самы момант усё можна было купіць за бутэльку гарэлкі. Ганаровую

грамату, адпачынак з паездкай дахаты... Адзін старшыня калгаса прывязе ў атрад дазіметрыстаў скрынку гарэлкі, каб ягоную вёску не запісалі на эвакуацыю, другі аддасць тую самую скрынку гарэлкі, каб ягоны калгас выселілі. Яму ўжо трохпакаёвую кватэру ў Мінску паабяцалі. Радыезамеры ніхто не правяраў. Нармальны рускі хаос. Мы так жывём... Нешта спісвалі, прадавалі... З аднаго боку, агідна, з другога — ідзіце вы ўсе да д'ябла!

Прыслалі студэнтаў. Яны вырывалі на палях лебяду. Зграбалі сена. Некалькі параў — зусім маладзенькія. Муж і жонка. Яны яшчэ за руку хадзілі. Гэта было немагчыма бачыць. А мясціны такія прыгожыя! Такая раскоша! Жах быў яшчэ больш жахлівы, бо прыгожа. І чалавеку трэба адтуль сыходзіць. Уцякаць, як злодзею. Як злачынцу.

Кожны дзень прывозілі газеты. Я чытаў толькі загалоўкі: «Чарнобыль — месца подзвігу», «Рэактар пераможаны», «А жыццё працягваецца...». Былі ў нас замаліты, праводзілі палітгутаркі. Нам казалі, што мы павінны перамагчы. Каго? Атам? Фізіку? Космас? Перамога ў нас не падзея, а працэс. Жыццё — барацьба. Адсюль такая любоў да паводак, пажараў... Землятрусаў... Трэба месца дзеяння, каб «праявіць мужнасць і гераізм». І ўзняць сцяг. Замаліт чытаў нататкі ў газетах пра «высокую свядомасць і дакладную арганізацыю», пра тое, што праз некалькі дзён пасля катастрофы над чацвёртым рэактарам ужо лунаў чырвоны сцяг. Полымем гарэў. Праз некалькі месяцаў яго зжэрла высокая радыяцыя. Сцяг зноў паднялі. Потым новы... А стары рвалі сабе на памяць, запіхвалі кавалкі пад бушлат каля сэрца. Потым везлі дадому... Паказвалі з гонарам дзецям... Захоўвалі... Гераічнае вар'яцтва! Але я таксама з іх... Зусім не лепшы. Я ў думках спрабаваў уявіць, як салдаты падымаюцца

на дах... Смяротнікі. Але яны поўныя пачуццяў... Першае — пачуццё абавязку, другое — пачуццё радзімы. Скажаце: савецкае язычніцтва? Але рэч у тым, што далі б мне тады ў рукі сцяг, я таксама б туды палез. Чаму? Не адкажу. Вядома, не апошняя рэч, што тады мне не страшна было памерці... Жонка нават ніводнага ліста не прыслала. За паўгода ніводнага... *(Спыняецца.)*

Хочаце анекдот? Уцёк з турмы зняволены. Схаваўся ў трыццацікіламетровай зоне. Злавілі. Прывялі да дазіметрыстаў. Так «свеціцца», што яго ні ў турму пасадзіць нельга, ні ў бальніцу адправіць, ні да людзей. *(Смяецца.)* Анекдоты мы там любілі. Чорны гумар.

Прыбыў я туды, калі птушкі сядзелі ў гнёздах, ад'язджаў — яблыкі на снезе ляжалі. Не ўсё мы паспелі закапаць... Хавалі зямлю ў зямлі... З жукамі, павукамі, лічынкамі... З гэтым асобным народам. Светам. Самае моцнае ўражанне адтуль... Пра іх...

Нічога я вам не расказаў... Абрыўкі... У таго самага Леаніда Андрэева ёсць апавяданне: адзін жыхар Ерусаліма, паўз дом якога вялі Хрыста, усё бачыў і ўсё чуў, але ў яго ў гэты час балеў зуб. У яго на вачах Хрыстос упаў, калі нёс крыж, упаў і пачаў крычаць, ён усё гэта бачыў, але ў яго балеў зуб, і ён не выбег на вуліцу. Праз два дні, калі зуб перастаў балець, яму расказалі, як Хрыстос уваскрос, тады ён падумаў: «Я ж мог быць сведкам гэтага, але ў мяне балеў зуб».

Няўжо так заўсёды? Ніколі чалавек не роўны вялікай падзеі. Заўсёды яна за яго вышэй. Мой бацька абараняў Маскву ў сорак другім. Тое, што ён браў удзел у гісторыі, ён зразумеў праз дзясяткі гадоў. З кніг, з фільмаў. А сам успамінаў: «Сядзеў у акопе. Страляў. Выбухам засыпала. Паўмёртвага санітары выцягнулі». І ўсё.

А мяне тады кінула жонка...

*Аркадзь Філін, ліквідатар*

## Тры маналогі аб «праху хадзячым» і «зямлі гаварушчай»

*Старшыня Хойніцкага добраахвотнага таварыства паляўнічых і рыбакоў Віктар Іосіфавіч Вержыкоўскі і два паляўнічыя — Андрэй і Уладзімір, якія не захацелі назваць прозвішчы.*

—Упершыню я забіў лісіцу… У дзяцінстве… Другі раз ласіху… Ласіх пакляўся ніколі не забіваць. У іх такія вочы выразныя…

—Гэта мы, людзі, нешта разумеем, а жывёлы проста жывуць. І птушкі.

—Увосень казуля вельмі чуйная. Калі яшчэ вецер дзьме ад чалавека, то ўжо ўсё — не падпусціць. А лісіца хітрая.

—Тут бадзяецца адзін… Вып'е, лекцыі ўсім чытае. Вучыўся на філасофскім факультэце, потым у турме сядзеў. У зоне сустрэнеш чалавека — ён ніколі праўду пра сябе не раскажа. Рэдка. А гэты разумны мужык… «Чарнобыль, — кажа, — для таго, каб даць філосафаў». Жывёлу называў «прахам хадзячым», а чалавека — «зямлёй гаварушчай». А «зямля гаварушчая», бо мы з зямлі зробленыя…

—Зона цягне… Як магніт, скажу я вам. Эх, пані-спадарыня! Хто там пабыў… Той душой будзе цягнуцца…

—Я кніжку чытаў… Былі святыя, якія размаўлялі з птушкамі і звярамі. А мы думаем, што яны чалавека не разумеюць.

—Ну, хлопцы, трэба па парадку…

—Давай-давай, старшыня. А мы пакурым.

—Значыцца, такая справа… Выклікаюць мяне ў райвыканкам: «Слухай, галоўны паляўнічы: у зоне

засталося шмат свойскай жывёлы — каты, сабакі, каб пазбегнуць эпідэміі, іх трэба адстраляць. Дзейнічай!» На наступны дзень я ўсіх склікаў, усіх паляўнічых. Абвяшчаю, што так і так… Ніхто не хоча ехаць, таму што не выдалі ніякіх ахоўных сродкаў. Я звярнуўся ў грамадзянскую абарону — у іх нічога няма. Ніводнага рэспіратара. Мусіў ехаць на цэментны завод і браць там маскі. Такая танюткая плёначка… Ад цэментавага пылу… А рэспіратараў не далі.

—Там салдатаў сустракалі. У масках, у пальчатках, на бронетранспарцёрах, а мы — у кашулях, павязачка на носе. У гэтых кашулях і ботах дахаты вярталіся. У сем'і.

—Сабраў усё ж дзве брыгады… І ахвотнікі знайшліся. Дзве брыгады… Па дваццаць чалавек. Да кожнай прымацавалі ветдоктара і чалавека з санэпідстанцыі. Быў яшчэ трактар з каўшом і самазвал. Крыўдна, што не далі ахоўных сродкаў, пра людзей не падумалі…

—Затое прэміі давалі — па трыццаць рублёў. А бутэлька гарэлкі ў тыя часы каштавала тры рублі. Дэзактывацыя такая… Аднекуль рэцэпты з'явіліся: лыжка гусінага памёту на бутэльку гарэлкі. Два дні настаяць і піць. Каб гэта самае… ну, мужчынскае наша багацце не пацярпела… Прыпеўкі былі, памятаеце? Безліч. ««Запарожац» — не машына, кіяўлянін — не мужчына. Калі хочаш быць айцом, абкруці яйцо свінцом». Ха-ха…

—Ездзілі мы па зоне два месяцы, у нашым раёне палова вёсак пад эвакуацыю пайшла. Дзясяткі вёсак: Бабчын, Тульгавічы… Першы раз прыехалі — сабакі бегаюць каля сваіх дамоў. Вартуюць. Людзей чакаюць. Узрадаваліся, што мы прыехалі, бягуць на чалавечы голас… Сустракаюць… Стралялі ў дамах, у хлявах. У гародах. Выцягвалі на вуліцу і грузілі ў самазвалы. Яно, канешне, непрыемна. Яны не маглі зразумець: чаму мы

іх забіваем? Забіваць было лёгка. Свойскія жывёліны… У іх няма страху ад зброі, страху ад чалавека…. Бягуць на чалавечы голас…

—Паўзла чарапаха… Госпадзе! Міма пустога дома. Акварыумы ў кватэрах стаялі… З рыбкамі…

—Чарапах не забівалі. Пярэднім колам «уазіка» наязджаеш на чарапаху — панцыр вытрымлівае. Не трэскаецца. Па п'янцы, канешне, пярэднім колам. У дварах клеткі паадчыняныя… Трусікі бегаюць… Нутрыі былі зачыненыя, іх мы выпускалі, калі побач якая вада была: возера, рэчка — яны сплывалі. Усё кінута ў хапошчах. Не назусім. Яно ж як было? Загад пра эвакуацыю: «На тры дні». Жанчыны галосяць, дзеці плачуць, жывёла крычыць. Маленькіх дзяцей падманвалі: «Паедзем у цырк». Людзі думалі вяртацца… Такога слова не было — «назаўсёды». Эх, пані-спадарыня! Скажу я вам, ваенная абстаноўка… Кошкі зазіралі ў вочы, сабакі вылі, прарываліся ў аўтобусы. Дварнякі, аўчаркі… Салдаты іх выкідалі. Штурхалі нагамі. Яны доўга беглі за машынамі… Эвакуацыя… Крый божа!

—Значыцца, такая справа... Вунь у японцаў была Хірасіма, дык яны цяпер наперадзе ўсіх. На першым месцы ў свеце. Значыцца…

—Ёсць магчымасць пастраляць, ды яшчэ ў жывое, у тое, што бяжыць. Паляўнічы азарт. Выпілі — і паехалі. На працы мне ставілі працоўны дзень. Налічвалі заробак. Маглі, канешне, за такую працу і больш накінуць. Прэмія — трыццаць рублёў, але ўжо грошы не тыя былі, што пры камуністах. Усё памянялася ўжо.

—Справа такая… Спачатку дамы стаялі апячатаныя, з пломбамі. Пломбы мы не зрывалі. Сядзіць за вакном котка, як ты яе дастанеш? Не чапалі. Потым марадзёры палезлі — дзверы павыломвалі, вокны

павыбівалі, усё разрабавалі. Найперш зніклі магнітафоны, тэлевізары… Футравыя вырабы… А потым вывезлі ўсё дарэшты. Валяюцца на падлозе адны алюмініевыя лыжкі… І ацалелыя сабакі перасяліліся ў дамы… Заходзіш — яны на цябе кідаюцца… Яны ўжо людзям не верылі… Я зайшоў — сука пасярод пакоя ляжыць і шчанюкі вакол. Шкада? Яно, канешне, непрыемна… Я параўноўваў… Па сутнасці, мы дзейнічалі, як карнікі. Як у вайну. Па той самай схеме… Ваенная аперацыя… Мы таксама прыязджаем, бярэм вёску ў кальцо, і сабакі, як пачуюць першы стрэл, ужо ўцякаюць. У лес бягуць. Каты хітрэйшыя, ды ім і схавацца лягчэй. Кацяня ў гліняны гаршчок залезла… Я яго вытрасаў… З-пад печкі выцягвалі… Непрыемнае пачуццё… Ты ў дом, а котка міма ботаў — куляй, бегаеш за ёю са стрэльбай. Худыя яны, брудныя. Поўсць клоччам. Напачатку было шмат яек, куры пазаставаліся. Сабакі і каты елі яйкі, закончыліся яйкі — з'елі курэй. І лісіцы курэй елі, лісіцы ўжо жылі ў вёсках разам з сабакамі. Значыцца, курэй не стала, сабакі паелі катоў. Бывалі выпадкі, што мы свіней у хлявах знаходзілі… Выпускалі… У паграбах — закаткі розныя: гуркі, памідоры… Мы паадчыняем і ў карыта ім кідаем. Свіней не забівалі…

Бабку сустрэлі… Зачынілася ў хаце: пяць катоў у яе і два сабакі… «Не забівай сабаку, і ён чалавекам быў», — не давала… Праклінала нас. Мы сілай забралі, але аднаго ката і аднаго сабаку пакінулі. Абзывала: «Бандыты! Турэмнікі!»

—Ха-ха… «Под горою пашет трактор, на горе горит реактор. Если б шведы не сказали, до сих пор ещё б пахали». Ха-ха…

—Пустыя вёскі… Адны печы стаяць. Хатынь! Жывуць дзед з бабай. Як у казцы. Ім не страшна. А нехта б

розумам кранусся! Уначы старыя пні паляць. Ваўкі агню баяцца.

—Значыцца, такая справа... Пахі... Я ўсё не мог зразумець, адкуль такі пах у вёсцы? Вёска Масаны... Як у рэнтген-кабінеце. Пахла ёдам... Нейкай кіслатой... А кажуць, радыяцыя не пахне. Не ведаю... А страляць даводзілася ва ўпор... Значыцца, ляжыць сука пасярод пакоя, і шчанюкі вакол... Накінулася на мяне — кулю адразу... Шчанюкі рукі ліжуць, ласцяцца. Дурэюць. Страляць даводзілася ва ўпор... Эх, пані-спадарыня! Аднаго сабачку... Пудзельчык чорненькі... Мне яго дагэтуль шкада. Нагрузілі іх поўны самазвал, з верхам. Вязём да «могільніка»... Шчыра кажучы, гэта звычайная глыбокая яма, хоць належыць капаць так, каб не даходзіць да грунтовых вод і засцілаць дно цэлафанам. Знайсці высокае месца... Але гэтае правіла, самі разумееце, паўсюль парушалася: цэлафану не было, месца доўга не шукалі. Яны, калі недабітыя, а толькі параненыя, пішчаць... Плачуць... Высыпалі іх з самазвала ў яму, а гэты пудзельчык караскаецца наверх. Вылазіць. Ні ў кога патронаў не засталося. Няма чым дабіць... Ніводнага патрона... Яго назад у яму спіхнулі і зямлёй завалілі. Дагэтуль шкада.

А катоў было нашмат меней, чым сабак. Можа, яны разам з людзьмі сышлі? Або пахаваліся? Пудзельчык хатні... Распешчаны...

—Забіваць лепей здалёк, каб не сустрэцца вачыма.

—Ты вучыся трапна страляць, каб не дабіваць.

—Гэта мы, людзі, нешта разумеем, а яны проста жывуць. «Прах хадзячы»...

—Коні... Іх вялі на забой... Яны плакалі...

—І я дадам... Душа ёсць у кожнай жывой тварыны. Мяне з дзяцінства бацька да палявання прывучыў.

Казуля параненая... Ляжыць... Яна хоча, каб яе пашкадавалі, а ты дабіваеш. У астатнюю хвіліну ў яе цалкам асэнсаваны, амаль чалавечы позірк. Яна цябе ненавідзіць. Або моліць: я таксама жыць хачу! Хачу жыць!

— Вучыся! Скажу я вам, дабіваць больш непрыемна, чым забіваць. Паляванне — гэта спорт, від спорту. Чамусьці ніхто не лае рыбакоў, а паляўнічых усе лаюць. Несправядліва!

— Паляванне і вайна — галоўныя заняткі мужчыны. Адвеку так было.

— Я не мог прызнацца сыну... дзіцяці... Дзе я быў? Што рабіў? Ён дагэтуль думае, што тата там некага абараняў. Стаяў на баявым пасту! Па тэлевізары паказвалі: вайсковая тэхніка, салдаты. Шмат салдатаў. Сын пытаецца: «Тата, ты быў як салдат?»

— З намі паехаў аператар з тэлебачання... Памятаеце? З камерай. Плакаў. Мужык, а плакаў... Усё хацеў убачыць трохгаловага дзіка...

— Ха-ха... Лісіца бачыць: коціцца па лесе Калабок. «Калабок, куды ты коцішся?» — «Я не Калабок, я вожык чарнобыльскі». Ха-ха... Як той казаў, мірны атам — у кожны дом!

— Чалавек, скажу я вам, памірае, як жывёла. Я сам бачыў... Шмат разоў... У Афганістане... Мяне паранілі ў жывот, ляжу на сонцы. Спёка нясцерпная. Піць! Ну, думаю, здохну, як скаціна. Скажу я вам, і кроў аднолькава цячэ. Як і ў іх. І баліць.

— Міліцыянер, што з намі быў, таго... Звіхнуўся з розуму. У шпіталі ляжаў... Усё сіямскіх катоў шкадаваў, дарагія, маўляў, яны на рынку. Прыгожыя. Звіхнуўся хлопец...

— Ідзе карова з цялём. Не стралялі. І коней не стралялі. Яны баяліся ваўкоў, чалавека не баяліся. Але конь

лепей можа сябе абараніць. Першыя гінулі ад ваўкоў каровы. Закон джунгляў.

—З Беларусі скаціну везлі і прадавалі ў Расію. А цёлкі лейкозныя. Але затое збывалі іх за бесцань.

—Найбольш старых шкада... Яны падыходзяць да нашых машын: «Паглядзі ты там, хлопчык, на маю хату». Ключ у рукі ўсунуць: «Забяры касцюм. Шапку». Грошы даюць... «Як там мой сабака?» Сабаку прыстрэлілі, дом разрабаваны. А яны ніколі туды не вернуцца. Як гэта сказаць? Я ключы не браў. Не хацеў хлусіць. Іншыя бралі: «Дзе самагонку схаваў? У якім месцы?» Дзед і кажа... Знаходзілі цэлы бідоны, вялікія бідоны з-пад малака.

—Папрасілі на вяселле забіць дзіка. Заказ! Пячонка ў руках распаўзаецца... Усё адно заказваюць... На вяселле, на хрэсьбіны.

—Страляем і для навукі. Адзін раз у квартал: два зайцы, дзве лісіцы, дзве казулі. Усе забруджаныя. Але ўсё адно і сабе б'ём, ямо. Спярша баяліся, а цяпер прывыклі. Нешта есці трэба, на Месяц усе не пераселімся. На іншую планету.

—Нехта шапку на рынку купіў — валасы павыпадалі. Армянін купіў за бесцань аўтамат з «могільніка» — памёр. Палохалі адзін аднаго.

—А ў мяне там нічога ні ў душы, ні ў галаве не адбывалася... Муркі ды Шарыкі... Эх, пані-спадарыня! Страляў. Праца такая.

—Я размаўляў з вадзіцелем, які дамы адтуль вывозіў. Зону рабуюць. Прадаюць. Хоць гэта ўжо не школа, не дом і не дзіцячы садок, а нумарныя аб'екты дэзактывацыі. Вывозяць! Мы сустрэліся з ім ці то ў лазні, ці то каля піўной бочкі. Не памятаю дакладна. Дык вось, ён расказваў: пад'язджаюць на КамАЗе, за тры гадзіны дом

разбіраюць, а каля горада іх ужо дачнікі перахоплiваюць. Ірвуць на часткі. Зону раскупілі на дачы.

—Сярод нашай братвы ёсць драпежнікі… Паляўнічыя-драпежнікі… А нехта проста любіць пахадзіць па лесе. Палююць на дробнага звера. На птушку.

—Скажу я вам… Столькі людзей пацярпела, а ніхто за гэта не адказаў. Пасадзілі кіраўніцтва атамнай станцыі, і ўсё. У той сістэме… Сказаць, хто быў вінаваты, — вельмі цяжка. Калі вам загадалі зверху, што вы павінны былі рабіць? Адно — выконваць. Яны нешта там выпрабоўвалі. Чытаў у газетах, што вайскоўцы плутоній збіралі, напрацоўвалі… Для атамных бомбаў… Таму і выбухнула… Калі груба, то пытанне стаіць так: чаму Чарнобыль у нас, а не ў французаў або ў немцаў?

—Засела ў памяці… Такая справа… Шкада, што ні ў кога не засталося тады ніводнага патрона, не было чым пудзельчыка прыстрэліць. Таго пудзельчыка… Дваццаць чалавек… Ніводнага патрона пад канец дня…

## Маналог пра тое, чаму мы не ўмеем жыць без Чэхава і Талстога

Пра што я малюся? Спытайце ў мяне: пра што я малюся? Я не ў царкве малюся. Дома… Уранні або ўвечары. Калі ўсе спяць.

Я хачу кахаць. Я кахаю! Я малюся за сваё каханне. А мне… *(Абрывае фразу. Бачу, што гаварыць не хоча.)* Успамінаць? Можа, трэба на ўсялякі выпадак адштурхнуць ад сябе… Адсунуць… Я такіх кніг не чытала… У кіно не бачыла… У кіно бачыла вайну. Мае бабуля і дзядуля ўспамінаюць, што ў іх не было дзяцінства, была вайна. Іхняе дзяцінства — вайна, а маё — Чар-

нобыль. Я адтуль... Вось вы пішаце, але ніводная кніга не дапамагла мне, не растлумачыла. Ні тэатр, ні кіно. Я разбіраюся ў гэтым без іх. Сама. Мы ўсе перажываем самі, мы не ведаем, што з гэтым рабіць. Розумам я гэта спасцігнуць не магу. Асабліва разгубілася мая мама, яна выкладае ў школе рускую мову і літаратуру, заўсёды вучыла мяне жыць па кніжках. І раптам такіх кніжак няма... Мама разгубілася... Без кніжак жыць яна не ўмее. Без Чэхава і Талстога...

Успамінаць? Я хачу і не хачу ўспамінаць... *(Ці то прыслухоўваецца да сябе, ці то спрачаецца сама з сабой.)* Калі вучоныя нічога не ведаюць, калі пісьменнікі нічога не ведаюць, тады мы ім дапаможам сваім жыццём і сваёй смерцю. Так лічыць мая мама... А я хацела б пра гэта не думаць, я хачу быць шчаслівай. Чаму я не магу быць шчаслівай?

Жылі мы ў Прыпяці, побач з атамнай станцыяй, я там нарадзілася і вырасла. У вялікім панэльным доме, на пятым паверсе. Вокны — на станцыю. Дваццаць шостага красавіка... Многія потым расказвалі, што яны дакладна чулі выбух... Не ведаю, у нашай сям'і ніхто яго не заўважыў. Раніцой я прачнулася як звычайна — у школу. Пачула гудзенне. З вакна ўбачыла, як над дахам нашага дома павіс верталёт. Цудоўна! Будзе што расказаць у класе! Хіба ж я ведала... Што засталося ўсяго два дні... Нашага ранейшага жыцця... Былі яшчэ два дні — апошнія два дні ў нашым горадзе. Яго ўжо няма. Тое, што засталося, ужо не наш горад. Запомнілася, як сусед з біноклем сядзеў на балконе, назіраў за пажарам. Наўпрост, напэўна, кіламетры тры. А мы... Дзяўчаткі ды хлапчукі... Мы ўдзень на роварах зганялі на станцыю, у каго ровараў не было, тыя нам зайздросцілі. Ніхто не сварыўся. Ніхто! Ні бацькі, ні настаўнікі.

Недзе пад абед на беразе ракі не стала рыбакоў, яны вярнуліся чорныя, так за месяц у Сочы не загарыш. Ядзерны загар! Дым над станцыяй стаяў не чорны, не жоўты, а блакітны. З блакітным адлівам. Але на нас ніхто не сварыўся… выхаванне, відаць, такое… Мы прызвычаіліся, што небяспека магла быць толькі ваенная: выбух злева, выбух справа… А тут — звычайны пажар, тушаць яго звычайныя пажарнікі… Хлапчукі жартавалі: «Станавіцеся доўгімі радамі — на могілкі. Хто вышэйшы — памрэ першы». Я — маленькая, я не памятаю страху, але я памятаю шмат дзіўнага. Ну, незвычайнага… Сяброўка расказвала, як яны са сваёй мамай уначы закопвалі ў двары грошы і залатыя рэчы, баяліся забыць гэтае месца. Маёй бабулі, калі яе праводзілі на пенсію, падаравалі тульскі самавар, яна чамусьці больш за ўсё турбавалася пра гэты самавар і дзядулевы медалі. І пра старую швейную машынку «Зінгер». Дзе мы іх схаваем? Неўзабаве мы трапілі пад эвакуацыю… Гэтае слова прынёс з працы тата: «Мы ад'язджаем у эвакуацыю». Як у кніжках пра вайну… Ужо селі ў аўтобус, тата ўспамінае, што ён нешта забыў. Бяжыць дахаты. Вяртаецца з дзвюма сваімі новымі кашулямі… На вешалцы… Гэта было дзіўна… Да таты не падобна… У аўтобусе ўсе сядзелі моўчкі, глядзелі ў вакно. У салдатаў незямны выгляд, яны хадзілі па вуліцах у белых маскхалатах і масках. «Што з намі будзе?» — ішлі да іх людзі. «Чаму вы ў нас пытаецеся? — злаваліся яны. — Вунь белыя «Волгі» стаяць, там начальства».

Ад'язджаем… А неба блакітнае-блакітнае. Куды мы едзем? У сумках і сетках — велікодныя булкі, фарбаваныя яйкі. Калі гэта вайна, дык я яе па кніжках уяўляла іначай. Выбух злева, выбух справа… Бомбы… Рухаліся мы павольна, перашкаджала жывёла. Па дарогах гналі

кароў, коней... Пахла пылам і малаком... Вадзіцелі лаяліся матам, крычалі на пастухоў: «Чаму па дарозе гоніце, маць вашу так?! Пыл радыеактыўны падымаеце! Ішлі б па полі, па лузе». Тыя ў адказ таксама матам, апраўдваліся, што шкада таптаць зялёнае жыта, траву. Ніхто не верыў, што назад мы ўжо не вернемся. Такога ж ніколі не было, каб людзі не вярталіся дадому. Крыху кружылася галава і дзерла ў горле. Старыя жанчыны не плакалі, плакалі маладыя. Плакала мая мама...

Прыехалі ў Мінск... Месца ў цягніку мы купілі ў праваднiцы за трайны кошт. Яна ўсім прынесла чай, а нам сказала: «Давайце свае кубкі або шклянкі». Мы не адразу ўцямілі... Шклянак, ці што, не хапае? Не! Нас баяцца... «Адкуль?» — «З Чарнобыля». І чалавек бокам-бокам ад нашага купэ, дзяцей не пускаюць, каб бегалі міма. Прыехалі ў Мінск да мамінай сяброўкі. Маме маёй дагэтуль сорамна, што мы ў сваім «брудным» адзенні ўваліліся ўначы ў чужую кватэру. Але нас прынялі, накармілі. Шкадавалі. А зайшлі суседзі: «У вас госці? Адкуль?» — «З Чарнобыля». І яны таксама бокам-бокам...

Праз месяц бацькам дазволілі з'ездзіць і паглядзець кватэру. Забралі яны цёплую коўдру, маё восеньскае паліто і поўны збор лістоў Чэхава, маміна самае ўлюбёнае. Здаецца, сем тамоў. Бабуля... Наша бабуля... Яна зразумець не магла. Чаму не ўзялі пару слоікаў клубнічнага варэння, якое я любіла, яно ж у слоіках, пад накрыўкамі... Жалезнымі накрыўкамі... На коўдры мы знайшлі «пляму»... Мама мыла, чысціла пыласосам, нічога не дапамагло. Здалі ў хімчыстку... А яно ўсё адно «свяцілася»... Гэтая «пляма»... Пакуль не выразалі нажніцамі. Усё знаёмае, звыклае: коўдра, паліто... А я не магла ўжо спаць пад гэтай коўдрай... Апрануць гэтае паліто... У нас не было грошай купіць мне новае, а я не

магла… Я ненавідзела гэтыя рэчы! Гэтае паліто! Не баялася, а, зразумейце, ненавідзела! Усё гэта можа мяне забіць! І маю маму забіць! Пачуццё варожасці… Не магла спасцігнуць гэта розумам… Паўсюль размаўлялі пра аварыю: дома, у школе, у аўтобусе, на вуліцы. Параўноўвалі з Хірасімай. Але ніхто не верыў. Як паверыць, калі незразумела? Як ты ні намагаешся, ні імкнешся зразумець, усё роўна незразумела. Я памятаю: мы ад'язджаем з нашага горада — неба блакітнае-блакітнае…

Бабуля… На новым месцы яна не прыжылася. Маркоцілася. Перад смерцю прасіла: «Хачу шчаўя!» Шчаўе некалькі гадоў есці не дазвалялі, яно больш за ўсё набірае радыяцыю. Хаваць мы павезлі яе ў родную вёску Дуброўнікі… Там ужо была зона, абгароджаная дротам. Стаялі салдаты з аўтаматамі. За дрот пусцілі толькі дарослых… Тату, маму… Сваякоў… А мне не дазволілі: «Дзецям нельга». Я зразумела, што ніколі не змагу наведаць бабулю… Зразумела… Дзе пра гэта можна прачытаць? Дзе гэта калі-небудзь было? Мама прызналася: «Ты ведаеш, я ненавіджу кветкі і дрэвы». Сказала так і спалохалася самой сябе, бо яна вырасла ў вёсцы і ўсё гэта ведала і любіла… Раней… Калі мы гулялі з ёй за горадам, яна магла назваць кожную кветку і любую травінку. Падбел, зуброўка… На могілках… На траве… Паслалі абрус, паставілі закуску, гарэлку… А салдаты памералі дазіметрам і ўсё выкінулі. Закапалі. Трава, кветкі — усё «пстрыкала». Куды мы завезлі нашу бабулю?

Прашу пра каханне… Але я баюся… Я баюся кахаць… У мяне ёсць жаніх, мы аднеслі заяву ў загс. Вы чулі калі-небудзь пра хірасімскіх «хібакусі»? Тых, хто выжыў пасля Хірасімы… Яны могуць разлічваць толькі на шлюбы адно з адным. У нас пра гэта не пішуць, не га-

ворачь. А мы ёсць… Чарнобыльскія «хібакусі». Ён прывёў мяне ў дом, пазнаёміў са сваёй мамай… У яго добрая мама… Працуе на заводзе эканамістам. Неабыякавая. Ходзіць на ўсе антыкамуністычныя мітынгі, чытае Салжаніцына. Вось гэтая добрая мама, калі даведалася, што я з чарнобыльскай сям'і, з перасяленцаў, здзівілася: «Мілачка, а вы хіба зможаце нарадзіць?» У нас — заява ў загсе… Ён проста моліць: «Я пайду з дому. Ноймем кватэру». А ў мяне ў вушах: «Мілачка, для некаторых існуе грэх дзетанараджэння». Грэх кахаць…

А да яго ў мяне быў іншы хлопчык. Мастак. Мы таксама хацелі пажаніцца. Усё было добра да аднаго выпадку. Я зайшла да яго ў майстэрню і пачула, як ён крычаў у тэлефон: «Як табе пашанцавала! Ты не ўяўляеш, як табе пашанцавала!» Звычайна такі спакойны, нават флегматычны, ніводнага клічніка ў гаворцы. І раптам! Што высвятляецца? Ягоны сябар жыве ў студэнцкім інтэрнаце. Зазірнуў у суседні пакой, а там дзяўчо вісіць. Зачапілася за фортку… І на панчосе… Ягоны сябар здымаў яе… выклікаў «хуткую»… А гэты захлынаўся, трымцеў: «Ты ўявіць сабе не можаш, што ён убачыў! Што перажыў! Ён яе на руках нёс… У яе белая пена на вуснах…» Пра мёртвую дзяўчынку ён не гаварыў, не пашкадаваў яе. Яму б толькі бачыць і запомніць… А потым намаляваць… Я адразу ўспомніла, як ён мяне распытваў, якога колеру быў пажар на станцыі, ці бачыла я расстраляных катоў і сабак, як яны ляжалі на вуліцах? Як плакалі людзі? Ці бачыла, як яны паміраюць?

Пасля таго выпадку… Я не магла больш з ім быць… Адказваць на ягоныя пытанні… *(Пасля маўчання.)* Не ведаю, ці захацела б я з вамі яшчэ раз сустрэцца. Мне здаецца, вы разглядваеце мяне, як і ён. Проста назіраеце. Запамінаеце. Ідзе нейкі эксперымент над намі. Усім

цікава. Не магу вызваліцца ад гэтага пачуцця… А вы не ведаеце, за што падае гэты грэх? Грэх дзетанараджэння… Я ж ні ў чым не вінаватая.

Ці ж я вінаватая ў тым, што хачу быць шчаслівай…

*Кацbackground П.*

## Маналог пра тое, што святы Францыск прапаведаваў птушкам

Гэта — мая таямніца. Пра гэта ніхто больш не ведае. Я размаўляю пра гэта толькі са сваім сябрам…

Я — кінааператар. Ехаў туды, памятаючы, што нас вучылі: сапраўдным пісьменнікам робяцца на вайне і ўсё такое. Улюбёны пісьменнік — Хэмінгуэй, улюбёная кніга — «Бывай, зброя!». Прыехаў. Людзі корпаюцца на гародах — трактары, сеялкі. Што здымаць — незразумела. Нідзе нічога не выбухае, не ўзлятае ў паветра…

Першыя здымкі. У вясковым клубе. На сцэне паставілі тэлевізар, сабралі народ. Слухалі Гарбачова: усё добра, усё пад кантролем. У той вёсцы, дзе мы здымалі, ішла дэзактывацыя. Мылі дахі, прывозілі новую зямлю. А як памыць дах, калі ён у бабулі цячэ? Зямлю трэба было зрэзаць на штык рыдлёўкі, зрэзаць увесь урадлівы слой. Далей у нас жоўты пясочак. Вось бабуля, выконваючы загад сельсавета, рыдлёўкай зямлю адкідае, а гной з яе зграбае. Шкада, я не зняў гэтага… Куды ні прыедзеш: «А, кіношнікі! Зараз знойдзем вам герояў». Героі — дзед з унукам, два дні гналі з-пад самага Чарнобыля калгасных кароў. Пасля здымкаў заатэхнік завёў мяне да гіганцкай траншэі, там бульдозерам гэтых кароў закопвалі. Але зняць гэта ў галаву не прыйшло. Я стаў спінай да траншэі і зняў эпізод у найлепшых традыцыях

айчыннай кінадакументалістыкі: бульдазерысты чытаюць газету «Правда», загаловак — аршыннымі літарамі: «Краіна ў бядзе не кіне». Ды яшчэ пашанцавала: гляджу — бусел на поле садзіцца. Сімвал! Якое б няшчасце ні прыйшло — мы пераможам! Жыццё працягваецца...

Вясковыя дарогі. Пыл. Я ўжо разумеў, што гэта не проста пыл, а радыеактыўны пыл. Кінакамеру хаваў, каб не пылілася, усё ж такі оптыка. Быў сухі-сухі май. Колькі самі наглыталіся, не ведаю. Праз тыдзень запаліліся лімфавузлы. Але стужку эканомілі, як патроны, бо павінен быў туды прыехаць першы сакратар цэка Слюнькоў. У якім менавіта месцы ён з'явіцца, ніхто загадзя не абвяшчаў, але мы самі здагадаліся. Учора, напрыклад, ехалі па дарозе — слупы пылу, а сёння асфальт кладуць, ды які асфальт — два-тры слаі! Ну, зразумела: вось дзе высокае начальства чакаюць! Потым я гэтае начальства здымаў, хадзілі яны раўнютка па свежым асфальце. Ні сантыметра ўбок! У мяне гэта таксама было ў кадры, але ў сюжэт не паставіў...

Ніхто нічога не разумеў, гэта было самае страшнае. Дазіметрысты называюць адны лічбы, а ў газетах чытаем іншыя. Тут пачынае нешта паволі даходзіць. А-а-а... У мяне дома засталося маленькае дзіця, каханая жонка... Які ж я быў дурань, што апынуўся тут! Ну, узнагародзяць медалём... А жонка пойдзе... Паратунак — у гумары. Анекдоты расказвалі. У пакінутай вёсцы атабарыўся бомж, і чатыры бабкі там засталіся. Пытаюцца ў іх: «Як там ваш мужык?» — «Гэты кабель яшчэ ў іншую вёску бегае». Калі паспрабаваць быць шчырым дарэшты... Ты — ужо тут. І ты ўжо разумееш: Чарнобыль... Але бяжыць пад колы дарога... Цурчыць ручай, проста цурчыць ручай. А гэта здарылася. Матылькі лётаюць... Прыгожая жанчына стаіць каля ракі... А гэта здарылася.

Я нешта падобнае адчуваў, калі памёр блізкі мне чалавек. Сонца… У некага за сцяной музыка… Ластаўкі ўюцца пад дахам… А ён памёр. Разумееце? Я хачу злавіць словам свае пачуцці, перадаць, як гэта ўсё ўва мне было ў той час. Патрапіць у іншае вымярэнне…

Убачыў і пачаў здымаць яблыню ў квецені… Гудуць чмялі, белая, вясельная квецень… Зноў жа — людзі працуюць, сады цвітуць… Трымаю ў руках камеру, але не магу зразумець… Штосьці не так! Экспазіцыя нармалёвая, карцінка прыгожая, а чагосьці няма. І раптам працінае: не адчуваю паху! Сад цвіце, а паху няма! Гэта толькі потым я даведаўся, што існуе такая рэакцыя арганізма пры высокай радыяцыі, блакуюцца некаторыя органы. Маме маёй семдзесят чатыры гады, і яна, успамінаю, скардзіцца, што не чуе пахаў. Ну, думаю, цяпер гэта са мной здарылася. Пытаюся ў сваіх у групе, а нас было трое: «Пахне яблыня?» — «Ды ніяк не пахне». Штосьці з намі адбывалася… Бэз не пах… Бэз! І ў мяне з'явілася пачуццё: усё, што навокал, няпраўда. Я — сярод дэкарацый… І што мая свядомасць гэта не можа засвоіць, ёй няма на што абаперціся. Схемы няма!

З дзяцінства… Суседка, былая партызанка, расказвала, як у час вайны іхні атрад выбіраўся з акружэння. У яе на руках маленькае дзіця, месяц яму, ішлі па балоце, вакол карнікі… Дзіця плакала… Яно магло іх выдаць, іх знайшлі б, увесь атрад. І яна яго задушыла. Гаварыла пра гэта адлучана. Як быццам гэта не яна, а нейкая іншая жанчына зрабіла, і дзіця было чужое. Чаму яна тое ўспомніла, я ўжо не памятаю. Памятаю выразна іншае, свой жах: што ж гэта яна такое ўчыніла? Як змагла? Мне здавалася, што ўвесь партызанскі атрад выходзіў з акружэння дзеля гэтага дзіцяці, каб яго вырataваць. А тут, каб засталіся жыць здаровыя моцныя

мужчыны, задушылі дзіця. У чым тады сэнс жыцця? Мне не хацелася пасля таго жыць. Мне, хлапчуку, няёмка было глядзець на тую жанчыну, бо я даведаўся пра яе такое… І наогул пра чалавека нешта жахлівае даведаўся. А як яна на мяне магла глядзець? *(Нейкі час маўчыць.)* Вось чаму я не хачу ўспамінаць… Пра тыя дні ў зоне… Прыдумваю сабе розныя тлумачэнні. Мне не хочацца адчыняць тыя дзверы… Я там хацеў зразумець, дзе я сапраўдны і дзе несапраўдны. У мяне ўжо былі дзеці. Першы — сын. Калі ў мяне нарадзіўся сын, я больш не баяўся смерці. Сэнс майго жыцця адкрыўся…

Уначы ў гасцініцы… Прачынаюся — манатонны шум за вакном, незразумелыя сінія бліскавіцы. Адсоўваю шторы: па вуліцы ідуць дзясяткі «ўазікаў» з чырвонымі крыжамі і мігалкамі. У поўнай цішыні. Перажыў нешта накшталт шоку. Усплылі ў памяці кадры з фільма… Адразу патрапіў у дзяцінства… Пасляваенныя дзеці, мы любілі ваенныя фільмы. Ну і такія кадры… І дзіцячы страх… З горада сышлі ўсе свае, ты застаўся адзін і павінен прымаць рашэнне. А што самае правільнае? Прыкінуцца, што ты нежывы? Або яшчэ нешта? А калі ты штосьці павінен здзейсніць, то што?

У Хойніках у цэнтры горада вісела Дошка гонару. Лепшыя людзі раёна. Але паехаў у забруджаную зону і вывез дзяцей з дзіцячага сада шафёр-п'яніца, а не той, з Дошкі гонару. Усе зрабіліся самі сабой. А вось яшчэ — эвакуацыя. Першымі вывозяць дзяцей. Пагрузілі ў вялікія аўтобусы «Ікарусы». Я лаўлю сябе на тым, што здымаю так, як гэта бачыў у ваенных фільмах. І адразу заўважаю, што не я адзін, але і людзі, якія ўдзельнічаюць ва ўсім гэтым дзеянні, паводзяць сябе гэтаксама. Яны трымаюцца так, як калісьці, памятаеце, у любімым усімі намі фільме «Ляцяць жураўлі»: рэдкая слязінка

на вачах, кароткія словы развітання... Узмах рукі... Атрымлівалася, што мы ўсе намагаліся знайсці форму паводзін, якая нам ужо была знаёмая. Імкнуліся нечаму адпавядаць. Дзяўчынка махае маме рукой, што, маўляў, усё ў парадку, яна мужная. Мы пераможам! Мы... Мы — такія...

Я падумаў, што прыеду ў Мінск, а там таксама эвакуацыя. Як я буду развітвацца са сваімі — з жонкай, сынам? У тым ліку ўяўляў і гэты жэст: мы пераможам! Мы — ваяры. Мой бацька, колькі я сябе памятаю, насіў вайсковае адзенне, хоць вайскоўцам не быў. Думаць пра грошы — мяшчанства, пра сваё ўласнае жыццё — непатрыятычна. Нармальны стан — галодныя. Яны, нашы бацькі, перажылі разруху, і мы павінны яе перажыць. Іначай не станеш сапраўдным чалавекам. Нас вучылі ваяваць і выжываць у любых умовах. Мне самому пасля тэрміновай службы ў арміі цывільнае жыццё здалося прэсным. Уначы хадзілі кампаніяй па вуліцах, шукаючы вострых адчуванняў. У дзяцінстве чытаў цудоўную кнігу «Чысцільнікі», аўтара забыў, там лавілі дыверсантаў, шпіёнаў. Азарт! Паляванне! Так мы ўладкаваныя. Калі кожны дзень праца і добрая ежа — нясцерпна, некамфортна!

Жылі мы ў інтэрнаце нейкага пэтэвэ разам з ліквідатарамі. Маладыя хлопцы. Гарэлкі выдалі чамадан — выводзіць радыяцыю. Раптам высвятляецца, што ў гэтым самым інтэрнаце месціцца атрад медслужбы. Адны дзяўчаты. «Ну, зараз пагуляем!» — кажуць мужыкі. Пайшлі двое і адразу ж вяртаюцца во-о-сь з такімі вачыма... Клічуць нас... Карцінка: ідуць па калідоры дзяўчаты... Пад гімнасцёрку выдаюць штаны і кальсоны з завязачкамі, яны ў іх па падлозе цягнуцца, матляюцца, ніхто не саромеецца. Усё старое, ужо карыстанае, не пад

рост. Вісіць, як на вешалках. Хто ў тэпціках, хто ў ботах стаптаных. А паўзверх гімнасцёркі яшчэ прагумаванае спецадзенне нацягнута, нейкім хімічным прэпаратам прапітанае… Па-а-х, я вам скажу… Некаторыя і нанач не здымаюць. Жудасна глядзець… І ніякія яны не медсёстры, узялі іх з інстытута, з вайсковай кафедры. Паабяцалі, што на два дні, а калі мы туды прыехалі, яны ўжо месяц там былі. Расказвалі, што іх вазілі на рэактар, яны там нагледзеліся на апёкі, але пра апёкі я толькі ад іх і чуў. Вось і зараз іх бачу — блукаюць па інтэрнаце, як у сне…

У газетах пісалі, што, на шчасце, вецер дзьмуў не ў той бок… Не на горад… Не на Кіеў… Яшчэ ніхто не ведаў… Не здагадваўся, што ён дзьмуў на Беларусь… На мяне і на майго Юрку. Мы з ім у той дзень гулялі па лесе, шчыпалі заечую капусту. Госпадзе, чаму ж мяне ніхто не папярэдзіў!

Вярнуўся з экспедыцыі ў Мінск… Еду ў тралейбусе на працу. Далятаюць абрыўкі размовы: здымалі фільм пра Чарнобыль, і адзін аператар проста там і памёр. Згарэў. Ну, думаю, хто ж такі? Далей слухаю: малады, двое дзяцей. Імя называюць — Віця Гурэвіч. Ёсць у нас такі аператар, зусім малады хлопец. Двое дзяцей? Што ж таіўся? Пад'язджаем да кінастудыі, нехта ўдакладняе: не Гурэвіч, а Гурын, завуць Сяргей. Госпадзе, ды гэта ж я! Смешна цяпер, але тады я ішоў ад метро да кінастудыі і баяўся, што адчыню дзверы і… найнедарэчнейшая думка: «А дзе ж яны фатаграфію маю ўзялі? У аддзеле кадраў?» Адкуль такая чутка нарадзілася? Несупадзенне маштабаў падзей з колькасцю ахвяраў. Напрыклад, Курская бітва. Тысячы палеглых… Гэта зразумела. А тут — у першыя дні нібыта ўсяго сем пажарнікаў… Потым яшчэ некалькі чалавек… А далей вельмі абстрактныя

для нашай свядомасць вызначэнні: «праз некалькі пакаленняў», «вечнасць», «нішто». Пачыналіся чуткі: лётаюць трохгаловыя птушкі, куры задзёўбваюць лісіц, лысыя вожыкі…

Ну а далей… Далей трэба зноў камусьці ў зону ехаць. Адзін аператар прынёс даведку, што ў яго язва страўніка, другі — у адпачынак зматаўся… Выклікаюць мяне: «Трэба!» — «Дык я ж толькі вярнуўся». — «Разумееш, ты ўжо там быў. Табе ўсё роўна. І потым: у цябе ўжо ёсць дзеці. А яны — маладыя». Халера ясная, я, можа, таксама хачу, каб у мяне было пяцёра-шасцёра дзяцей! Пачынаюць ціснуць, маўляў, неўзабаве тарыфікацыя, у цябе козыр з'явіцца. Заробак падвысяць… Сумная і смешная гісторыя. Загнаў на край свядомасці…

Аднойчы здымаў людзей, якія былі ў канцлагеры. Звычайна гэтыя людзі пазбягаюць сустрэч. Ёсць нешта ненатуральнае ў тым, каб збірацца і ўспамінаць вайну. Успамінаць, як іх забівалі і як яны самі забівалі. Людзі, якія зведалі або перажылі разам прыніжэнні… Гэтыя людзі бягуць адзін ад аднаго. Ад сябе ўцякаюць. Бягуць ад таго, што там даведаліся пра чалавека… Што там з яго вынырнула. З-пад скуры. Вось… Вось чаму… Штосьці там… У Чарнобылі… Я таксама даведаўся, адчуў тое, пра што не хочацца гаварыць. Пра тое, напрыклад, што ўсе нашыя гуманістычныя ўяўленні адносныя… У экстрэмальнай сітуацыі чалавек, па сутнасці, зусім не той чалавек, пра якога пішуць кнігі. Такога чалавека, які ён у кнігах, я не знайшоў, ён мне не сустрэўся. Усё наадварот. Чалавек — не герой. Усе мы — прадаўцы апакаліпсісу. Вялікія і маленькія. Мільгаюць у памяці абрыўкі… Карцінкі… Старшыня калгаса хоча на дзвюх машынах вывезці сваю сям'ю з рэчамі, мэбляй, а парторг просіць адну машыну для сябе. Патрабуе справядлівасці. А ўжо

некалькі дзён, я сведка, не могуць вывезці дзяцей, ясельную групу. Не хапае транспарту. А тут дзвюх машын мала, каб запакаваць усё хатняе барахло ажно да трохлітровых слоікаў з варэннем і закаткамі. Бачыў, як іх назаўтра грузілі. Таксама не зняў... *(Нечакана засмяяўся.)* Купілі там у краме каўбасу, кансервы, а есці страшна. Вазілі гэтыя сеткі з сабой. Шкада было выкідаць *(І ўжо сур'ёзна.)* Механізм зла будзе працаваць і пры апакаліпсісе. Я гэта зразумеў. Таксама будуць пляткарыць, запабягаць перад начальствам, ратаваць свой тэлевізар і каракулевае футра. І перад канцом свету чалавек застанецца такі самы, які ён цяпер. Заўсёды.

Мне неяк няёмка, што я не выбіў сваёй кінагрупе ніякіх прывілеяў. Аднаму нашаму хлопцу трэба была кватэра, іду ў прафкам: «Дапамажыце, мы паўгода праседзелі ў зоне. Нам належаць прывілеі». — «Добра, — сказалі, — нясіце даведачкі. Даведачкі трэба з пячаткамі». А мы там прыязджалі ў райкам, а па калідорах ходзіць адна цётка Насця са швабрай. Усе разбегліся. Ёсць у нас рэжысёр, у яго цэлы стос даведак: дзе быў, што здымаў. Герой!

У мяне ў памяці вялікі, доўгі фільм, якога я не зняў. Шмат серый... *(Маўчыць.)* Усе мы — прадаўцы апакаліпсісу...

Заходзім з салдатамі ў хату. Жыве адна старая.

— Ну, бабуля, паедзем.

— Паедзем, дзеткі.

— Тады збірайся, бабуля.

Чакаем на вуліцы. Курым. І вось гэтая бабуля выходзіць: у яе на руках — абраз, кот і клуначак. Гэта ўсё, што яна бярэ з сабой.

— Бабуля, ката нельга. Забаронена. У яго поўсць радыеактыўная.

—Не, дзеткі, без ката не паеду. Як я яго пакіну? Аднаго пакіну. Гэта — мая сям'я.

Вось з той бабкі… І з той яблыні ў квецені… З іх усё пачалося… Я здымаю цяпер толькі звяроў… Я вам казаў: сэнс майго жыцця адкрыўся…

Аднойчы паказаў свае чарнобыльскія сюжэты дзецям. Мяне дакаралі: навошта? Нельга. Не трэба. І без гэтага яны жывуць у страху, сярод такіх размоў, у іх змены ў крыві, парушаная імунная сістэма. Спадзяваўся, што прыйдуць пяць-дзесяць чалавек. Набілася поўная зала. Пытанні задавалі самыя розныя, але адно проста ўрэзалася мне ў памяць. Хлопчык, запінаючыся і чырванеючы, відаць, з ціхіх, негаваркіх, запытаўся: «А чаму нельга было дапамагчы жывёлам, якія там засталіся?» Ну чаму? У мяне ў самога такога пытання не ўзнікала. І я не змог яму адказаць… Мастацтва нашае толькі пра пакуты і любоў да чалавека, а не да ўсяго жывога. Толькі чалавека! Мы не сыходзім да іх: жывёл, раслін… У іншы свет… Але ж чалавек можа ўсё знішчыць. Усіх забіць. Цяпер гэта ўжо не фантазія… Мне расказалі, што ў першыя месяцы пасля аварыі, калі абмяркоўвалася ідэя перасялення людзей, з'явіўся праект разам з людзьмі перасяліць і жывёл. Але як? Як перасяліць усіх? Магчыма, яшчэ неяк можна перагнаць тых, хто на зямлі, а тых, хто ў зямлі — жучкоў, чарвячкоў? А тых, хто наверсе? У небе? Як адправіць у эвакуацыю вераб'я або голуба? Што рабіць з імі? У нас няма сродкаў перадаць ім патрэбную інфармацыю.

Хачу зняць фільм… Будзе называцца «Закладнікі»… Пра жывёл… Памятаеце песню «Плыў па акіяне рыжы востраў»? Тоне карабель, людзі селі ў шлюпкі. А коні не ведалі, што ў шлюпках няма месца для коней…

Сучасная прыпавесць… Дзеянне адбываецца на далёкай планеце. Касманаўт у скафандры. Чуе праз навушнікі шум. Бачыць, як на яго насоўваецца нешта велізарнае. Неабдымнае. Дыназаўр? Яшчэ не разумеючы, хто гэта, ён страляе. Праз імгненне — зноў нешта да яго набліжаецца. Ён і яго знішчае. Яшчэ праз нейкі момант — статак. І ён распачынае сапраўдную бойню. А высвятляецца, пачаўся пажар, і жывёлы ратаваліся, беглі па сцежцы, на якой стаяў касманаўт. Чалавек! А са мной… Я вам скажу… Са мной там адбылося незвычайнае здарэнне. Я іншымі вачыма пачаў глядзець на жывёл… На дрэвы… На птушак… Езджу ў зону… Усе гэтыя гады… З пакінутага, разбуранага чалавечага дома выскоквае дзік… Выходзіць ласіха… Вось гэта я зняў. Гэта — шукаю… Я хачу зрабіць новы фільм. І ўбачыць усё вачыма звера… «Што ты здымаеш? — кажуць мне. — Паглядзі навокал… У Чачні — вайна». А святы Францыск прапаведаваў птушкам. З птушкамі размаўляў, як з роўнымі. А што, калі гэта птушкі размаўлялі з ім на птушынай мове, а не ён зрабіў ім ласку? Яму была зразумелая іх таемная мова.

Памятаеце… У Дастаеўскага… Як чалавек хвастаў каня па рахманых вачах. Вар'ят! Не па крыжы каня біў, а па рахманых вачах…

*Сяргей Гурын, кінааператар*

## Маналог без назвы — крык

Людзі добрыя… Не чапайце нас! Адкасніцеся! Вы пагаварылі і паехалі, а нам тут жыць…

Вось ляжаць медыцынскія карткі… Кожны дзень я бяру іх у рукі. Чытаю…

Аня Будай — 1985 года нараджэння — 380 бэраў.

Віця Грынкевіч — 1986 года нараджэння — 785 бэраў.

Насця Шаблоўская — 1986 года нараджэння — 570 бэраў.

Алёша Пленін — 1985 года нараджэння — 570 бэраў.

Андрэй Котчанка — 1987 года нараджэння — 450 бэраў…

Прывяла мама адну такую дзяўчынку да мяне сёння на прыём.

—Што баліць?

—У мяне баліць усё, як у маёй бабулі, — сэрца, спіна, галава кружыцца.

З дзяцінства яны ведаюць слова «алапецыя», бо многія ходзяць лысенькія. Без валасоў. Няма броваў, веек. Да гэтага ўсе прызвычаіліся. Але ў нашай вёсцы толькі пачатковая школа, у пяты клас іх возяць аўтобусам за дзесяць кіламетраў. І яны плачуць — не хочуць ехаць. Там дзеці будуць з іх смяяцца.

Самі бачылі… У мяне поўны калідор хворых. Чакаюць. Я кожны дзень такое чую, што ўсе вашыя жахалкі ў тэлевізары — поўная лухта. Так і перадайце начальству ў сталіцы. Поўная лухта!

Мадэрн… Постмадэрн… Уначы паднялі на тэрміновы выклік. Прыязджаю… Маці стаіць на каленях каля ложачка — дзіця памірае. Я чую яе галашэнне: «Я хацела, сынок, калі гэта здарыцца, то каб улетку. Улетку цёпла, кветачкі, зямелька мяккая. А цяпер зіма… Пачакай хоць да вясны…» Вы так напішаце?

Я не хачу гандляваць іхнім няшчасцем. Філасофстваваць. Дзеля гэтага мне трэба адысці ўбок. А я не магу. Я кожны дзень чую, што яны кажуць… Як скардзяцца і плачуць… Людзі добрыя… Хочаце ведаць праўду?

Сядайце каля мяне і запісвайце… Але ж ніхто такую кнігу чытаць не будзе…

Лепей не чапайце нас… Нам тут жыць…

*Аркадзь Паўлавіч Багданкевіч, вясковы фельчар*

## Маналог на два галасы — мужчынскі і жаночы

*Настаўнікі Ніна Канстанцінаўна і Мікалай Прохаравіч Жарковы. Ён выкладчык працы, яна — філолаг.*

*Яна:*

— Я так часта думаю пра смерць, што не хаджу на яе глядзець. А вы калі-небудзь чулі дзіцячыя размовы пра смерць?

Вось у мяне… Ужо ў сёмым класе спрачаюцца і абмяркоўваюць: гэта страшна ці не страшна? Маленькіх дзяцей нядаўна цікавіла, адкуль яны. Адкуль дзеці бяруцца? Цяпер іх хвалюе, што будзе пасля атамнай вайны. Яны перасталі любіць класіку, я чытаю на памяць Пушкіна — у іх халодныя, адчужаныя вочы… Пустэча… Вакол іх ужо іншы свет… Чытаюць фантастыку, гэта іх захапляе, там чалавек адрываецца ад зямлі, распараджаецца касмічным часам, рознымі светамі. Яны не могуць баяцца смерці так, як яе баяцца дарослыя людзі, я, напрыклад, — яна хвалюе іх як нешта фантастычнае… Перасяленне кудысьці…

Разважаю… Думаю пра гэта… Смерць вакол прымушае шмат думаць. Я выкладаю рускую літаратуру дзецям, якія не падобныя да тых дзяцей, што былі дзесяць гадоў таму. У гэтых на вачах увесь час штосьці або кагосьці хаваюць. Закопваюць у зямлю… Знаёмых людзей… Дамы і дрэвы… Усё хаваюць… На лінейцы гэтыя

дзеці, пастаяўшы пятнаццаць-дваццаць хвілін, падаюць, бо трацяць прытомнасць, у іх кроў цячэ з носа. Іх нічым не здзівіш і нічым не парадуеш. Заўсёды сонныя, стамлёныя. Твары бледныя, шэрыя. Не гуляюць і не дурэюць. А паб'юцца, незнарок разаб'юць вакно — настаўнікі нават радыя. Не сварацца, бо яны да дзяцей не падобныя. І так павольна растуць… Просіш на ўроку што-небудзь паўтарыць — дзіця не можа, даходзіць да таго, што прамовіш сказ, каб паўтарыў услед, — не запамінае. «Ну дзе ж ты? Дзе?» — тармосіш яго. Думаю… Шмат думаю… Як быццам вадой малюю на шкле, толькі я ведаю, што я малюю, ніхто не бачыць, ніхто не здагадваецца… Ніхто не ўяўляе…

Нашае жыццё круціцца вакол аднаго… Дзе тады быў, ці далёка ад рэактара жыў? Што бачыў? Хто памёр? Хто з'ехаў? Куды? У першыя месяцы, памятаю, зноў загулі рэстараны, зашумелі бяседы: «Жывём адзін раз», «Паміраць, дык з музыкай». Панаехала салдат, афіцэраў… Чарнобыль цяпер не пакідае нас… Нечакана памерла маладая цяжарная жанчына. Без дыягназу, нават патолагаанатам не паставіў дыягназу. Маленькая дзяўчынка засілілася… Пяцікласніца… Ні з чога ні з якога. Бацькі вар'яцеюць. На ўсё адзін дыягназ — Чарнобыль, што б ні здарылася, усе кажуць — Чарнобыль. Нас дакараюць: «Вы хварэеце, таму што баіцеся. Ад страху. Радыефобія». Але чаму маленькія дзеці хварэюць і паміраюць? Ім страх невядомы, яны яшчэ не разумеюць.

Я памятаю тыя дні… Пякло ў горле, цяжар, нейкі цяжар ва ўсім целе. «Вы спадумлівая, вас не пакідаюць падазрэнні, — сказала доктарка. — Усе цяпер такімі зрабіліся, бо Чарнобыль здарыўся». Якая падазронасць! Усё баліць. У мяне няма сіл. Саромеліся з мужам прызнавацца адно аднаму, але ў нас пачалі адымацца ногі. Усе на-

вокал скардзіліся, усе людзі... Ідзеш па дарозе і, здаецца, тут бы і лёг. Лёг і заснуў. Вучні клаліся на парты, у час урокаў засыналі. І жахліва ўсе сталі невясёлыя, змрочныя, за цэлы дзень ніводнага добрага твару не сустрэнеш, ніхто не ўсміхнецца. З васьмі раніцы да дзевяці вечара дзеці былі ў школе, сурова забаранялася гуляць на вуліцы, бегаць. Ім выдалі адзенне: дзяўчынкам — спадніцы і кофты, хлопчыкам — касцюмы, але яны ў гэтым адзенні ішлі дадому, дзе яны там у ім былі, мы не ведалі. Паводле інструкцыі мамы павінны былі дома кожны дзень гэтае адзенне мыць, каб у школу дзеці з'яўляліся ва ўсім чыстым. Па-першае, далі толькі адну, напрыклад, кофтачку і адну спадніцу, а на змену нічога не далі, а па-другое, мамы занятыя хатняй гаспадаркай — куры, карова, парася, ды і не разумеюць яны, што гэтыя рэчы трэба мыць штодня. Бруд для іх — гэта чарнілы, зямля, плямы ад тлушчу, а не ўздзеянне нейкіх ізатопаў з кароткім жыццём. Калі я спрабавала нешта растлумачыць бацькам вучняў, па-мойму, яны разумелі мяне не больш, чым калі б раптам да іх заявіўся шаман з афрыканскага племені. «А што гэта такое — радыяцыя? Не чуваць яе і не відаць... У мяне вунь грошай ад заробку да заробку не хапае. Апошнія тры дні заўсёды на малацэ ды на бульбе сядзім», — махне маці рукой. А малако нельга... І бульбу нельга. У краму завезлі кітайскую тушаніну і грэчку, а на што іх купіць? Грабавыя... Даюць грабавыя... Кампенсацыя за тое, што мы тут жывём, капейкі... Хапае на дзве бляшанкі кансерваў... Інструкцыі разлічаныя на адукаванага чалавека, на пэўную побытавую культуру. Але яе няма! Няма ў нас таго народа, на якога гэтыя інструкцыі разлічаныя. Апрача таго, не вельмі проста кожнаму растлумачыць, чым адрозніваюцца бэры ад рэнтгенаў. Або тэорыю малых дозаў.

З майго пункту гледжання... Я гаварыла б пра наш фаталізм, такі, ведаеце, лёгкі фаталізм. Напрыклад, з гародаў у першы год нічога нельга было ўжываць, усё адно елі, нарыхтоўвалі ў запас. Яшчэ так добра ўсё ўрадзіла! Ты паспрабуй скажы, што гуркі есці нельга... і памідоры. Што значыць — нельга? На смак нармальныя. І ён іх есць, і жывот у яго не баліць... І ў цемры ніхто не «свеціцца»... Суседзі нашы паклалі ў той год новую падлогу з мясцовага лесу, замерылі — фон у сто разоў вышэй дапушчальнага. Ніхто тую падлогу не разабраў, яны так і жылі. Усё, маўляў, неяк наладзіцца, неяк яно будзе, але наладзіцца само сабой, без іх, без іхняга ўдзелу. Напачатку сякія-такія прадукты насілі да дазіметрыстаў, правяралі — у дзясяткі разоў вышэй за норму, але потым кінулі. «Не чуваць, не відаць. А-а, папрыдумляюць гэтыя вучоныя!» Усё ішло сваім парадкам: заaралі, пасеялі, сабралі... Здарылася неймавернае, а людзі жылі, як жылі. І адмовіцца ад гуркоў са свайго гароду было важней за Чарнобыль. Дзяцей усё лета трымалі ў школе, салдаты памылі яе пральным парашком, знялі вакол слой зямлі... А ўвосень? Увосень паслалі вучняў выбіраць буракі. І студэнтаў на поле прывезлі, пэтэвэшнікаў. Усіх сагналі. Чарнобыль — гэта не так страшна, як пакінуць у полі недакапаную бульбу...

Хто вінаваты? Ну хто вінаваты, апрача нас саміх?

Раней мы не заўважалі гэтага свету вакол сябе, ён быў як неба, як паветра, як быццам нехта яго даў нам на векі вякоў і ён ад нас не залежыць. Будзе заўсёды. Раней я любіла легчы ў лесе на траву і любавацца небам, мне было так добра, што я забывала, як мяне завуць. А цяпер? Лес прыгожы, поўна чарніц, але іх ніхто не збірае. У восеньскім лесе рэдка пачуеш чалавечы голас. Страх у адчуваннях, на падсвядомым узроўні... У нас засталіся

толькі тэлевізар і кнігі... Уяўленне... Дзеці растуць у дамах. Без лесу і ракі... Глядзяць з вакна. І гэта зусім іншыя дзеці. А я прыходжу да іх: «Унылая пора. Очей очарованье...» Усё з тым самым Пушкіным, які здаваўся мне вечным. Часам з'яўляецца блюзнерская думка: а раптам уся нашая культура — куфар са старымі рукапісамі? Усё, што я люблю...

*Ён:*

— З'явіўся іншы вораг... Вораг паўстаў перад намі ў іншым вобразе...

А мы мелі ваеннае выхаванне. Ваеннае мысленне. Нас арыентавалі на тое, каб адбіць і ліквідаваць атамны варожы напад. Мы павінны былі супрацьстаяць хімічным, біялагічным і атамным войнам. А не выводзіць з арганізма радыенукліды... Падлічваць... Сачыць за цэзіем і стронцыем... З вайной параўноўваць нельга, гэта не дакладна, а ўсе параўноўваюць. Я дзіцём перажыў ленінградскую блакаду. Параўноўваць гэта нельга. Там мы жылі, як на фронце, пад бясконцымі абстрэламі. І голад, некалькі гадоў голад, калі чалавек апускаецца да звярыных інстынктаў. Да звера ў сабе. А тут, калі ласка, выйшаў — і ў гародзе ўсё расце! І на полі нічога не змянілася, і ў лесе. Гэта непараўнальна. Але я іншае хацеў сказаць... Згубіў нітку... Выслізнула... А-а... Калі пачынаецца абстрэл, крый божа! Ты можаш памерці не калі-небудзь, а зараз, у гэтую хвіліну. Узімку — холад. Палілі мэблю, мы ўсё драўлянае ў сваёй кватэры спалілі, усе кнігі, па-мойму, нават нейкія старыя анучы. Чалавек ідзе па вуліцы і сеў, на наступны дзень ідзеш — ён сядзіць, гэта значыць, ён замерз, ён сядзіць так тыдзень або да вясны сядзіць. Да цяпла. Ні ў кога няма сіл яго з лёду высекчы, у рэдкіх выпадках, калі хто-небудзь на

вуліцы падаў, да яго падыходзілі, дапамагалі. Міма. Усе паўзуць міма. Я памятаю, што людзі не хадзілі, а поўзалі, так павольна яны хадзілі. Гэта ні з чым нельга параўнаць!

З намі, калі выбухнуў рэактар, яшчэ жыла мама, мая мама, яна паўтарала: «Самае страшнае, сынок, мы з табой перажылі. Мы перажылі блакаду. Нічога страшнейшага не можа быць». Яна так думала...

Мы рыхтаваліся да вайны, да атамнай вайны, будавалі ядзерныя сховішчы. Ад атаму хацелі схавацца, як ад асколкаў снарадаў. А ён паўсюль... У хлебе... У солі... Дыхаем радыяцыяй, ямо радыяцыю... Тое, што можа не быць хлеба і солі і можна з'есці ўсё, ажно да таго, што зварыць у вадзе скураны рэмень, дзеля паху, наесціся пахам, — я мог зразумець. А гэта — не. Усё атручанае... Цяпер важна зразумець, як нам жыць. У першыя месяцы быў страх, асабліва дактары, настаўнікі, карацей, інтэлігенцыя, больш адукаваныя людзі, яны кідалі ўсё і з'язджалі. Хоць іх запалохвалі, не пускалі. Ваенная дысцыпліна. Партбілет на стол. А я хачу зразумець... Хто вінаваты? Каб адказаць на пытанне, як нам тут жыць, трэба ведаць: хто вінаваты? Дык хто ж? Вучоныя, персанал станцыі? Або мы самі, наш погляд на свет. Не можам спыніцца ў сваім жаданні мець... Спажываць... Вінаватых знайшлі — дырэктар, дзяжурныя аператары. Навука. Але чаму, адкажыце мне, мы не змагаемся з аўтамабілем як са стварэннем розуму чалавечага, а з рэактарам змагаемся? Патрабуем зачыніць усе атамныя станцыі, а саміх атамнікаў аддаць пад суд. Праклінаем! Я абагаўляю чалавечыя веды. І ўсё тое, што створанае чалавекам. Веды... Самі веды не бываюць злачыннымі. Вучоныя — сёння таксама ахвяры Чарнобыля. Я хачу жыць пасля Чарнобыля, а не паміраць па-

сля Чарнобыля. Хачу зразумець, за што я магу зачапіцца ў сваёй веры. Што дасць мне сілы?

Усе ў нас пра гэта думаюць… Рэакцыі цяпер у людзей розныя, усё ж дзесяць гадоў прамінула, а яны мераюць вайной. Вайна чатыры гады цягнулася… Ужо, лічыце, дзве вайны. Я пералічу вам, якія ёсць рэакцыі: «Усё ўжо прамінула», «Неяк абыдзецца», «Дзесяць гадоў прайшло. Ужо не страшна», «Мы ўсе памром! Усе хутка памром», «Хачу з'ехаць за мяжу», «Нам павінны дапамагчы», «Ды напляваць! Трэба жыць». Здаецца, усё перабраў? Вось гэта мы кожны дзень чуем… Паўтараецца… З майго пункту гледжання, мы — матэрыял для навуковых даследаванняў. Міжнародная лабараторыя… У цэнтры Еўропы… Нас, беларусаў, дзесяць мільёнаў, больш за два мільёны жывуць на забруджанай зямлі. Натуральная лабараторыя. Запісвай дадзеныя, эксперыментуй! І едуць да нас адусюль, з усяго свету. Абараняюць дысертацыі, пішуць манаграфіі. З Масквы і Пецярбурга… З Японіі, Германіі, Аўстрыі… Едуць, таму што баяцца будучыні… *(Доўгі перапынак у размове.)*

Што я падумаў? Я зноў параўнаў… Я падумаў, што пра Чарнобыль магу гаварыць, а пра блакаду не магу. Атрымаў ліст з Ленінграда. Выбачайце, але слова Пецярбург у маёй свядомасці не прыжылося, бо паміраў я ў Ленінградзе. І вось… У лісце — запрашэнне на сустрэчу «Дзеці блакаднага Ленінграда». Я паехаў… Але не здолеў там і слова з сябе выціснуць. Проста расказаць пра страх? Мала. Проста пра страх… А што ён зрабіў са мной, гэты страх? Я дагэтуль не ведаю… Дома пра блакаду мы ніколі не ўспаміналі, мама не хацела, каб успаміналі. А пра Чарнобыль мы гаворым… Не… *(Перапыняецца.)* Паміж сабой мы не гаворым, гэтая размова ўзнікае, калі хто-небудзь да

нас прыязджае: іншаземцы, журналісты, сваякі, якія тут не жывуць. Чаму мы не гаворым пра Чарнобыль? Няма ў нас гэтай тэмы. У школе… З вучнямі… І дома. Яна заблакаваная. Закрытая. Пра гэта з імі гавораць у Аўстрыі, Францыі, Германіі, куды яны ездзяць лячыцца. Пытаюся ў дзяцей, пра што ў іх хочуць даведацца, чым там цікавяцца? А яны часта не памятаюць ні горада, ні вёскі, ні прозвішчаў людзей, якія іх прымалі. Пералічваюць падарункі, што смачнае елі. Камусьці падаравалі магнітафон, а камусьці — не. Прыязджаюць у адзенні, на якое самі не зарабілі і не зарабілі іхнія бацькі. Як быццам яны недзе на выстаўцы пабывалі. У вялікай краме… Дарагім супермаркеце… Увесь час чакаюць, што іх яшчэ раз туды павязуць. Пакажуць, падарункаў надораць. Яны да гэтага прывыкаюць. Прывыклі. Гэта ўжо лад іхняга жыцця, уяўленне пра жыццё. Пасля гэтай вялікай крамы, якая называецца замежжам, пасля гэтай дарагой выстаўкі трэба ісці да іх у клас. На ўрок. Я іду і ўжо бачу, што гэта назіральнікі… Назіраюць, а не жывуць. Я павінен ім дапамагчы… Я павінен ім патлумачыць, што свет — гэта не супермаркет. Гэта нешта іншае. Больш цяжкае і больш прыўкраснае. Я вяду іх у сваю майстэрню, там стаяць мае драўляныя скульптуры. Яны ім падабаюцца. Кажу: «Гэта ўсё можна стварыць са звычайнага кавалка дрэва. Паспрабуй сам». Прачніся! Мне гэта дапамагло выйсці з блакады, я выходзіў гадамі…

Свет падзяліўся: ёсць мы — чарнобыльцы і ёсць вы, усе іншыя людзі. Заўважылі? У нас тут не акцэнтуюць: я — беларус, я — украінец, я — рускі… Усе называюць сябе чарнобыльцамі. «Мы — з Чарнобыля», «я — чарнобыльскі чалавек». Як быццам мы асобны нейкі народ… Новая нацыя…

## Маналог пра тое, як зусім невядомая рэч запаўзае, залазіць у цябе

Мурашкі... Маленькія мурашкі паўзуць па дрэве...

Вакол грыміць вайсковая тэхніка. Салдаты. Крыкі, лаянка. Мат. Верталёты трашчаць. А яны паўзуць... Я вяртаўся з зоны, і ад усяго пабачанага за дзень самай выразнай заставалася ў памяці адна гэтая карціна... Гэты момант... Мы спыніліся ў лесе, я выйшаў пакурыць каля бярозы. Стаў блізка, абапёрся. Проста перад маім тварам мурашкі поўзалі па ствале, не чуючы нас, не звяртаючы на нас аніякай увагі... Упарта трымаліся свайго маршруту... Мы знікнем, а яны і не заўважаць. Нешта такое прамільгнула ў думках. У абрыўках думак. Столькі было ўражанняў, што думаць я не мог. Я глядзеў на іх... Я... я ніколі іх побач не заўважаў... На блізкай адлегласці...

Спачатку ўсе казалі «катастрофа», потым «ядзерная вайна». Я чытаў пра Хірасіму і Нагасакі, бачыў дакументальныя кадры. Страшна, але зразумела: атамная вайна, радыус выбуху... Гэта я нават мог уявіць. Але тое, што здарылася з намі... На гэта мяне не хапала. Не хапала маіх ведаў, не хапала ўсіх кніг, якія я за жыццё прачытаў. Прыязджаў з камандзіроўкі і з непаразуменнем глядзеў на кніжныя паліцы ў сваім кабінеце... Чытаў... А можна было і не чытаць... Нейкая абсалютна невядомая рэч разбурала ўвесь мой ранейшы свет. Вось яна запаўзае, залазіць у цябе... Па-за тваёй воляй... Памятаю размову з адным вучоным: «Гэта на тысячы гадоў, — тлумачыў ён. — Распад урану — гэта дзвесце трыццаць восем паўраспадаў. Перавядзем у час: адзін мільярд гадоў. А торый — чатырнаццаць мільярдаў гадоў». Пяцьдзясят... Сто... Дзвесце... Але далей? Далей — ступар, шок! Я ўжо не разумеў, што такое — час? Дзе я?

Пісаць пра гэта цяпер, калі ўсяго дзесяць гадоў прамінула… Імгненне… Пісаць? Думаю, рызыкоўна! Ненадзейна. Усё адно будзем прыдумляць нешта падобнае да нашага жыцця. Здымаць кальку. Я спрабаваў… Нічога не атрымалася… пасля Чарнобыля засталася міфалогія пра Чарнобыль. Газеты і часопісы спаборнічаюць, хто напіша страшней, асабліва любіць розныя страхі чалавек, які там не быў. Усе чыталі пра грыбы з чалавечую галаву, але ніхто іх не знаходзіў. Пра птушак з дзвюма дзюбамі… Таму трэба не пісаць, а запісваць. Дакументаваць. Дайце мне фантастычны раман пра Чарнобыль… Няма яго! І не будзе! Я цалкам перакананы! Не будзе!..

У мяне ёсць асобны нататнік… Запісваў з першых дзён… Размовы, чуткі, анекдоты. Гэта самае цікавае і верагоднае. Дакладны адбітак. Што засталося ад Старажытнай Грэцыі? Міфы Старажытнай Грэцыі…

Я аддам вам гэты нататнік… У мяне ён зваляецца сярод папер, ну, можа, дзецям пакажу, калі вырастуць. Усё ж гэта гісторыя…

*З размоў*

«Па радыё ўжо трэці месяц: абстаноўка стабілізуецца… Абстаноўка стабілізуецца… Абстаноўка ста…»

«Імгненна ўваскрэсла забытая сталінская лексіка: “агенты заходніх спецслужбаў”, “заклятыя ворагі сацыялізму”, “шпіёнскія вылазкі”, “дыверсійная акцыя”, “удар у спіну”, “падрыў непарушнага адзінства савецкіх народаў”. Усе навокал паўтараюць пра засланых шпіёнаў і дыверсантаў, а не пра ёдную прафілактыку. Любая неафіцыйная інфармацыя ўспрымаецца як варожая ідэалогія.

Учора з майго рэпартажу рэдактар выкрасліў аповед маці аднаго з пажарнікаў, якія тушылі ў першую ноч ядзерны пажар. Ён памёр ад вострай прамянёвай хваробы. Пахаваўшы сына ў Маскве, бацькі вярнуліся ў сваю вёску, якую ўжо адсялілі. Таемна, праз лес прабраліся да сябе на сядзібу і сабралі мех памідораў і гуркоў. Маці задаволеная: "Закруцілі дваццаць слоікаў". Давер да зямлі... Да вечнага сялянскага досведу... Нават смерць сына не перакуліла звыклы свет...

"Радыё 'Свабода' слухаеш? — выклікаў рэдактар. Я змаўчаў. — Мне ў газеце не трэба панікёраў. Ты пра герояў напішы... Салдаты на дах рэактара палезлі..."

Герой... Героі... Хто яны сёння? Для мяне гэта доктар, які, нягледзячы на загады зверху, гаворыць людзям праўду. І журналіст, і вучоны. Але, як сказаў на планёрцы рэдактар: "Запомніце! У нас няма ні дактароў, ні настаўнікаў, ні журналістаў, у нас ува ўсіх цяпер адна прафесія — савецкі чалавек".

Ці верыў ён сам у свае словы? Няўжо яму не страшна? Мая вера падточваецца кожны дзень».

«Прыехалі інструктары з цэка. Іхні маршрут: на машыне з гасцініцы — у абкам партыі, назад — таксама на машыне. Абстаноўку вывучаюць па падшыўках мясцовых газет. Поўныя саквояжы мінскіх бутэрбродаў. Гарбату заварваюць на мінеральнай вадзе. Таксама прывезенай. Расказвала пра гэта дзяжурная гасцініцы, дзе яны жылі. Людзі не вераць газетам, тэлебачанню і радыё, шукаюць інфармацыю ў паводзінах начальства. Яна найбольш дакладная.

Што рабіць з дзіцём? Хочацца схапіць у ахопак і ўцячы. Але ў мяне партбілет у кішэні. Не магу!»

«Самая папулярная казка зоны: найлепей дапамагае ад стронцыю і цэзію — гарэлка “Сталічная”.

Але ў вясковых крамах нечакана з’явіліся дэфіцытныя тавары. Чуў, як выступаў сакратар абкама: “Мы створым вам райскае жыццё. Толькі заставайцеся і працуйце. Завалім каўбасой і грэчкай. У вас будзе ўсё тое, што ёсць у найлепшых спецкрамах”. Гэта значыць, у іхніх абкамаўскіх буфетах. Стаўленне да народа такое: яму досыць гарэлкі і каўбасы.

Але, каб іх чэрці забралі! Ніколі не бачыў раней у вясковай краме тры гатункі каўбасы. Сам купіў там жонцы імпартныя калготкі…»

«Дазіметры пабылі ў продажы месяц і зніклі. Пра гэта пісаць нельга. Колькі і якіх радыенуклідаў выпала — таксама нельга. Нельга і пра тое, што ў вёсках засталіся адны мужчыны. Жанчын і дзяцей вывезлі. Цэлае лета мужчыны самі мылі бялізну, даілі кароў, ускопвалі гароды. Вядома, пілі. Біліся. Свет без жанчын… Шкада, што я не сцэнарыст. Сюжэт для фільма… Дзе Спілберг? Мой улюбёны Аляксей Герман? Напісаў пра гэта… Але і тут няўмольная рэдактарава рука з чырвоным алоўкам: “Не забывайце: у нас ворагі. У нас шмат ворагаў за акіянам”. І таму ў нас ёсць адно добрае, а дрэннага няма. І незразумелага не можа быць.

Але недзе спецыяльныя цягнікі падаюцца, хтосьці бачыў начальства з валізамі…»

«Каля міліцэйскага паста мяне спыніла бабуля: “Паглядзі ты там на маю хату. Бульбу трэба капаць, а салдаты не пускаюць”. Іх перасялілі. Падманулі, што на тры дні. Іначай яны б не паехалі. Чалавек у вакууме, у чалавека нічога не засталося. Яны прабіраюцца ў свае вёскі

праз вайсковыя кардоны… Ляснымі сцежкамі… Па балотах… Уначы… За імі ганяюцца, ловяць. На машынах і верталётах. “Як пры немцах, — параўноўваюць старыя вяскоўцы. — У вайну…”»

«Бачыў першага марадзёра. Малады хлопец у дзвюх футравых куртках. Даказваў вайсковаму патрулю, што лекуецца такім чынам ад радыкуліту. Калі раскалолі, прызнаўся: “Першы раз страшнавата, а потым — звыклая справа. Выпіў чарку — і пайшоў”. Пераступіўшы інстынкт самазахавання. У нармальным стане гэта немагчыма. Так наш чалавек ідзе на подзвіг. І гэтаксама — на злачынства».

«Зайшлі ў пустую хату — на белым абрусе ляжыць абраз… “Для Бога”, — сказаў хтосьці…

У іншай хаце — стол белым абрусам засланы… Хтосьці сказаў: “Для людзей”».

«З’ездзіў у сваю родную вёску праз год. Сабакі здзічэлі. Знайшоў нашага Рэкса, клічу — не падыходзіць. Не пазнаў? Або не хоча пазнаваць? Пакрыўдзіўся».

«У першыя тыдні і месяцы ўсе прыціхлі. Маўчалі. У прастрацыі. Трэба ад’язджаць, да апошняга дня — не! Свядомасць адключылася. Не памятаю сур’ёзных размоў, памятаю анекдоты: “цяпер ува ўсіх магазінах радыётавары”, “імпатэнты падзяляюцца на радыеактыўных і радыепасіўных”. А потым анекдоты раптам зніклі…»

«У чарзе па цукар:

— Ой, людцы, колькі грыбоў сёлета! І грыбоў, і ягад — як насадзіў хто.

— Яны забруджаныя…

— Дзівак-чалавек… Хто цябе прымушае есці — назбіраў, насушыў і завёз на рынак у Мінск. Мільянерам станеш».

«Ці можна нам дапамагчы? І як? Перасяліць народ у Аўстралію ці ў Канаду? Нібыта такія размовы недзе на самым версе цыркулююць раз-пораз».

«Пад цэрквы выбіралі месцы дакладна з неба. Былі праявы царкоўным людзям. Перад будаўніцтвам дзівосы адбываліся. А атамную станцыю будавалі, як завод або тыпавую свінаферму. Дах залілі асфальтам. Бітумам. І дах, калі гарэў, плавіўся…»

«Чытаў? Пад Чарнобылем злавілі салдата-ўцекача. Выкапаў зямлянку і жыў цэлы год каля рэактара. Хадзіў па кінутых дамах, дзе сала знойдзе, дзе слоік з марынаванымі гуркамі. Ставіў пасткі на звяроў. Уцёк, бо "дзяды" білі смяротным боем. Ратаваўся — у Чарнобылі…»

«Мы — фаталісты. Мы нічога не робім, бо верым: усё будзе так, як будзе. Верым у лёс. У нас такая гісторыя… На кожнае пакаленне выпадала вайна… Кроў… З якой прычыны нам быць іншымі? Мы — фаталісты…»

«З'явіліся першыя воўкасабакі, якія нарадзіліся ў ваўчыц ад сабакаў, якія збеглі ў лес. Яны буйнейшыя за ваўкоў, не звяртаюць увагі на сцяжкі, не баяцца святла і чалавека, не ідуць на "вабу" (падманны паляўнічы заклік). І здзічэлыя каты ўжо збіваюцца ў зграі і не баяцца людзей. Памяць пра тое, як падпарадкоўваліся чалавеку, знікла. Сціраецца мяжа паміж рэальным і нерэальным…»

«Учора майму бацьку споўнілася восемдзесят гадоў... Сабралася за сталом уся сям'я. Я глядзеў на яго і думаў пра тое, колькі змясцілася ў яго жыцці — сталінскі ГУЛаг, вайна, а цяпер вось Чарнобыль. Усё выпала ягонаму пакаленню. Аднаму пакаленню. А ён любіць рыбалку... Капацца ў садзе... У маладосці, крыўдзілася маці, быў бабнік: "Ніводнай спадніцы ў наваколлі не прапусціў". І цяпер я заўважаў, як апускае вочы, калі насустрач ідзе маладая прыгожая жанчына...

Што мы ведаем пра чалавека? Пра тое, на што ён здатны... Наколькі яго хапае...»

### *З чутак*

«За Чарнобылем будуюць лагеры, дзе будуць трымаць тых, хто трапіў пад радыяцыю. Патрымаюць, паназіраюць і пахаваюць.

З найбліжэйшых да станцыі вёсак мерцвякоў ужо вывозяць аўтобусамі і проста на могілкі, тысячамі закопваюць у брацкія магілы. Як у ленінградскую блакаду...»

«Некалькі чалавек нібыта бачылі напярэдадні выбуху незразумелае святло над станцыяй. Хтосьці яго нават сфатаграфаваў. На стужцы відаць, што гэта лунае нейкае незямное цела...»

«У Мінску памылі пасажырскія і таварныя цягнікі. Будуць усю сталіцу вывозіць у Сібір. Там ужо рамантуюць баракі, што засталіся ад сталінскіх лагераў. Пачнуць з жанчын і дзяцей. А ўкраінцаў ужо вывозяць...».

«Рыбакі ўсё часцей сустракаюць рыб-амфібій, якія могуць жыць і ў вадзе, і на зямлі. Па зямлі яны ходзяць на

плаўніках-лапах. Пачалі трапляцца шчупакі без галавы і плаўнікоў. Плавае адно чэрава…

Нешта падобнае хутка стане адбывацца і з людзьмі. Беларусы ператворацца ў гуманоідаў…»

«Гэта была не аварыя, а землятрус. У падземнай корцы штосьці адбылося. Геалагічны выбух. Удзельнічалі геафізічныя і космафізічныя сілы. Вайскоўцы пра гэта ведалі загадзя, маглі папярэдзіць, але ў іх усё катэгарычна засакрэчана».

«У дзікіх звяроў — прамянёвая хвароба. Яны блукаюць па лясах сумныя, у іх журботныя вочы. Паляўнічым страшна і шкада па іх страляць. І звяры ўжо не баяцца чалавека. Лісіцы і ваўкі заходзяць у вёскі і лашчацца да дзяцей».

«Ад чарнобыльцаў нараджаюцца дзеці, але замест крыві ў іх цячэ невядомая жоўтая вадкасць. Ёсць вучоныя, якія даказваюць: малпа зрабілася такой разумнай, бо жыла ў радыяцыі. Дзеці, народжаныя праз тры-чатыры пакаленні, усе будуць Эйнштэйнамі. Гэта касмічны эксперымент над намі…»

*Анатоль Шыманскі, журналіст*

## Маналог пра картэзіянскую філасофію і пра тое, як ясі разам з іншым чалавекам забруджаны бутэрброд, каб не было сорамна

Я жыў сярод кніг… Дваццаць гадоў чытаў лекцыі ва ўніверсітэце…

Акадэмічны вучоны… Чалавек, які выбраў сабе ўлюбёны час у гісторыі і жыве там, у тым часе. Заняты

гэтым цалкам, заглыблены ў сваю прастору. У ідэале… У ідэале, вядома… Таму што філасофія ў нас была тады марксісцка-ленінская, і тэмы для дысертацый прапаноўваліся: роля марксізму-ленінізму ў развіцці сельскай гаспадаркі або ў асваенні цалінных земляў. Роля правадыра сусветнага пралетарыяту… Наогул тут не да картэзіянскіх разважанняў. Але мне пашанцавала… Мая навуковая студэнцкая праца трапіла на конкурс у Маскву, і адтуль затэлефанавалі: «Не чапайце гэтага хлопца. Няхай піша». А пісаў я пра французскага рэлігійнага філосафа Мальбранша, які ўзяўся тлумачыць Біблію з пазіцыі рацыянальнага розуму. Васямнаццатае стагоддзе — эпоха Асветніцтва. Вера ў розум. У тое, што мы здольныя вытлумачыць свет. Як я цяпер разумею, мне пашанцавала. Я не патрапіў у зубадрабільную машыну… У бетонамяшалку… Дзіва! Перад гэтым мяне колькі разоў папярэджвалі: для студэнцкай навуковай працы Мальбранш — гэта, магчыма, і цікава, а вось для дысертацыі давядзецца над тэмай падумаць. Тут ужо ўсё сур'ёзна. Мы, маўляў, пакідаем вас у аспірантуры на кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі. А вы ў мінулае эмігруеце… Самі разумееце…

Пачалася гарбачоўская перабудова… Час, якога мы доўга чакалі. Першае, што я заўважыў, — у людзей адразу пачалі мяняцца твары, аднекуль раптам з'явіліся іншыя твары. Людзі нават па-іншаму пачалі хадзіць, жыццё падкарэктавала штосьці ў самой пластыцы, яны больш усміхаліся адно аднаму. Іншая энергія адчувалася ўва ўсім. Штосьці… Так, штосьці зусім змянілася. Я і цяпер здзіўлены. Як хутка гэта адбылося. І мяне… Мяне таксама выцягнула з картэзіянскага жыцця. Замест філасофскіх кніг я цяпер чытаў свежыя газеты і часопісы, чакаў з нецярплівасцю кожны нумар перабудовачнага

«Огонька». Раніцамі каля шапікаў «Саюздруку» стаялі чэргі, так ніколі — ні да, ні пасля — газет не чыталі. Так ніколі ім больш не верылі. Ішла лавіна інфармацыі… Быў апублікаваны палітычны запавет Леніна, які паўстагоддзя ляжаў у спецсховішчах. На кніжных прылаўках з'явіўся Салжаніцын, за ім Шаламаў… Бухарын… Яшчэ нядаўна тых, хто захоўваў гэтыя кнігі, арыштоўвалі. Давалі тэрмін. Вярнулі з высылкі акадэміка Сахарава. Упершыню па тэлевізары паказвалі паседжанні Вярхоўнага Савета СССР. Уся краіна, прыцішыўшы дыханне, сядзела каля экранаў… Мы размаўлялі і размаўлялі… Размаўлялі ўголас пра тое, аб чым нядаўна яшчэ шапталіся на кухнях. Колькі пакаленняў у нас прашапталася на кухнях! Знікла там! Засталося ў летуценнях! Семдзесят з гакам гадоў… Уся савецкая гісторыя… Цяпер усе хадзілі на мітынгі. На дэманстрацыі. Нешта падпісвалі, супраць чагосьці галасавалі. Я памятаю, як выступаў па тэлевізары нейкі гісторык… Ён прынёс у студыю карту сталінскіх лагераў… Уся Сібір — у чырвоных сцяжках… Мы даведаліся праўду пра Курапаты… Шок! Грамадства знямела! Беларускія Курапаты — брацкая магіла трыццаць сёмага года. Там ляжаць разам беларусы, рускія, палякі, літоўцы… Дзясяткі тысяч… Энкавэдэшныя равы на два метры ў глыбіню, людзей клалі ў два-тры слаі. Калісьці гэтая мясціна знаходзілася далёка за Мінскам, а потым увайшла ў межы горада. Зрабілася горадам. Трамваем можна даехаць. У пяцідзясятыя гады пасадзілі там малады лясок, хвоі падраслі, і гараджане, ні пра што не падазраваючы, ладзілі там па выхадных днях пікнікі. Узімку каталіся на лыжах. Пачаліся раскопкі… Улада… Камуністычная ўлада хлусіла. Выкручвалася. Уначы міліцыя засыпала адкрытыя магілы, але ўдзень іх зноў раскопвалі. Бачыў дакументальныя кадры: шэрагі

ачышчаных ад зямлі чарапоў… І ў кожным дзірачка ў патыліцы…

Вядома, мы жылі з адчуваннем, што бяром удзел у рэвалюцыі… У новай гісторыі…

Я не сышоў убок ад нашай тэмы. Не хвалюйцеся. Я хачу ўспомніць, якія мы былі, калі здарыўся Чарнобыль. Таму што ў гісторыі яны застануцца разам — крах сацыялізму і чарнобыльская катастрофа. Яны супалі. Чарнобыль паскорыў развал Савецкага Саюза. Узарваў імперыю.

А з мяне ён зрабіў палітыка…

Чацвёртага мая… На дзявяты дзень пасля аварыі выступіў Гарбачоў, гэта, вядома, была баязлівасць. Разгубленасць. Як у першыя дні вайны… У сорак першым… У газетах пісалі пра варожыя інтрыгі і заходнюю істэрыю. Пра антысавецкі ажыятаж і правакацыйныя чуткі, якія пашыраюць нашы ворагі. З-за бугра. Успамінаю сябе ў тыя дні… Страху доўга не было, амаль месяц усе былі ў стане чакання, вось-вось нам абвесцяць: пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі нашы вучоныя… нашы гераічныя пажарнікі і салдаты… у чарговы раз утаймавалі стыхію. Атрымалі нечуваную перамогу. Загналі касмічны агонь у прабірку. Страх з'явіўся не адразу, мы яго доўгі час у сярэдзіну сябе не пускалі. Абсалютна дакладна. Так… Так! Як я цяпер разумею, ён ніяк не мог злучыцца ў нашай свядомасці з мірным атамам. Са школьных падручнікаў, з прачытаных кніг… У нашых уяўленнях карціна свету выглядала наступным чынам: ваенны атам — злавесны грыб да неба, як у Хірасіме і Нагасакі, людзі, якія за адну секунду ператварыліся ў попел, а мірны атам — бяскрыўдная электрычная лямпачка. У нас была дзіцячая карціна свету. Жылі паводле буквара. Не толькі мы, а ўсё чалавецтва

зрабілася пасля Чарнобыля разумнейшым... Больш дарослым. Уступіла ў іншы ўзрост.

Размовы ў першыя дні:

—Гарыць атамная станцыя. Але недзе далёка гарыць. На Украіне.

—Я чытаў у газетах: туды пайшла вайсковая тэхніка. Армія. Пераможам!

—У Беларусі няма ніводнай атамнай станцыі. Мы спакойныя.

Мая першая паездка ў зону...

Я ехаў і думаў, што ўсё там пакрытае шэрым попелам. Чорнай сажай. Карціна Брулова «Апошні дзень Пампеі». А там... Прыязджаеш, а там — прыгажосць! Такое ўсё навокал прыгажэннае! Лугі цвітуць, мяккая вясновая зяляніна лясоў. Я акурат люблю гэтую пару... Усё ажывае... Расце, спявае... Больш за ўсё гэта мяне і ўразіла — спалучэнне прыгажосці і страху. Страх ужо быў неаддзельны ад прыгажосці, а прыгажосць — ад страху. Усё наадварот... Як я цяпер разумею, наадварот... Незнаёмае пачуццё смерці...

Мы прыехалі групай... Ніхто нас не пасылаў. Група беларускіх дэпутатаў ад апазіцыі. Такія вось былі часы! Незабыўныя! Камуністычная ўлада адступала... Рабілася слабой, няўпэўненай. Усё хісталася. Але мясцовае начальства сустракала непрыязна: «У вас ёсць дазвол? Ці маеце вы права бударажыць людзей? Задаваць пытанні? Хто вам даў даручэнне?» Спасылаліся на інструкцыю, атрыманую зверху: «Не паддавацца паніцы. Чакаць указанняў». Маўляў, вы народ запалохаеце, а нам планы трэба выконваць. Пастаўкі збожжа і мяса. Баяліся не за здароўе людзей, а за планы. Рэспубліканскія, саюзныя... Баяліся больш высокага начальства. А тыя баяліся тых, хто яшчэ вышэй, і так па ланцужку да генсека. Адзін ча-

лавек усё вырашаў, недзе там, у паднябеснай вышыні. Так была пабудаваная піраміда ўлады. На чале — цар. На той момант — камуністычны цар. «Усё тут забруджанае, — тлумачым мы. — Усе прадукты, што ў вас вырабляюцца, нельга будзе ўжываць». — «Вы — правакатары. Спыняйце варожую агітацыю. Мы будзем званіць… Дакладваць…» І званілі, дакладвалі куды трэба…

Вёска Малінаўка… Пяцьдзясят дзевяць кюры на квадратны метр…

Зайшлі ў школу:

—Ну як маецеся?

—Усе напалоханыя, вядома. Але нас супакоілі: трэба толькі дахі памыць, закрыць калодзежы плёнкай, сцежкі заасфальтаваць. І можна жыць! Праўда, чамусьці вось каты ўвесь час чэшуцца і ў коней смаркачы да зямлі.

Завуч школы запрасіла да сябе дадому. Паабедаць. Дом новы, два месяцы таму адсвяткавалі ўваходзіны. Побач з домам дыхтоўны хлеў, пограб. Тое, што калісьці называлася кулацкай гаспадаркай, такіх раскулачвалі. Толькі, здавалася б, парадавацца такому дому і пазайздросціць.

—Але вам хутка давядзецца адсюль з'язджаць.

—Нізавошта! Тут столькі нашай працы.

—Паглядзіце на дазіметр…

—Ездзяць тут… Вучоныя, тваю маць! Не даюць людзям спакойна жыць! — Гаспадар махнуў рукой і пайшоў на луг па каня. Не развітаўся.

Вёска Чудзяны… Сто пяцьдзясят кюры на квадратны метр…

Жанчыны капаюцца на гародах, дзеці бегаюць па вуліцах. У канцы вёскі мужыкі чэшуць бярвенне на новы зруб. Спынілі каля іх машыну. Абкружылі нас. Папрасілі закурыць.

— Як там, у сталіцы, жывуць? Гарэлку даюць? У нас — перабоі. Дапамагае тое, што самагонку гонім. Гарбачоў сам не п'е і нам забараняе.

— А-а-а... Значыцца, дэпутаты. З табакай у нас тут таксама хранова.

— Мужыкі, — пачынаем тлумачыць ім, — а вам хутка давядзецца адсюль пераязджаць. Вось дазіметр... Глядзіце: радыяцыя на гэтым месцы, дзе мы цяпер стаім, у сто разоў вышэй за норму.

— Ну, загнуў... А-а-а... Каму твой дазіметр трэба! Ты паехаў, а мы тут застанемся. Да ядронай фені нам твой дазіметр!

Я некалькі разоў глядзеў фільм пра «Тытанік», ён нагадваў мне тое, што я там бачыў. У зоне. Што адбывалася на маіх вачах... Сам перажыў у першыя чарнобыльскія дні... Усё было, як на «Тытаніку», абсалютна падобна паводзілі сябе людзі. Аднолькавая псіхалогія. Я пазнаваў. Нават параўноўваў... Вось ужо прабітае дно карабля, вада пад велізарным напорам залівае ніжнія трумы, перакульвае бочкі, скрынкі... Паўзе... Прабіваецца праз перашкоды... А наверсе гараць агні. Гучыць музыка. Разносяць шампанскае. Працягваюцца сямейныя спрэчкі, завязваюцца любоўныя раманы. Вада хвошча... Ідзе па сходах... У каюты...

Гараць агні. Гучыць музыка. Разносяць шампанскае...

Наша ментальнасць... Асобная размова... У нас на першым месцы пачуццё. Яно дае размах, дае нашаму жыццю вышыню, і ў той самы час гэтае пачуццё — згубнае. А рацыянальны выбар для нас — заўсёды непаўнавартасны. Свае ўчынкі правяраем сэрцам, а не розумам. Зойдзеш у вёсцы на падворак — ужо госць. Ужо радасць. Пераймаюцца... Хітаюць галавой: «Шкада, рыбы све-

жай няма, а то б пачаставалі», «Малачка хочаце? Зараз кубак налью». Не адпускаюць. У хату клічуць. Некаторыя баяліся, а я пагаджаўся. Заходзіў, сядаў за стол. Еў забруджаны бутэрброд, таму што ўсе елі. Выпіваў чарку. Нават ганарыўся, што я вось такі — магу. Здольны! Так… Так! Я казаў сабе: калі я не ў стане нічога змяніць у жыцці гэтага чалавека, то ўсё, што я магу, гэта з'есці разам з ім забруджаны бутэрброд, каб не было сорамна. Падзяліць лёс. Такое вось у нас стаўленне да ўласнага жыцця. А ў мяне жонка і двое дзяцей, я за іх павінен мець адказнасць. У мяне дазіметр у кішэні… Як я цяпер разумею, гэта наш свет, гэта — мы. Дзесяць гадоў таму я ганарыўся, што я вось такі, а сёння мне сорамна, што я вось такі. Але ўсё адно сяду за стол і зноў буду есці гэты пракляты бутэрброд. Я думаў… Я думаў пра тое, што мы за людзі. Гэты пракляты бутэрброд не пакідаў маёй галавы. Яго сэрцам трэба есці, а не розумам. Нехта добра напісаў, што ў дваццатым… цяпер ужо і ў дваццаць першым стагоддзі мы жывём так, як навучыла літаратура дзевятнаццатага стагоддзя. Госпадзе! Мяне часта мучаюць сумневы… Я шмат з кім гэта абмяркоўваў… Хто ж мы такія? Хто?

Я меў цікавую размову з жонкай, цяпер ужо ўдавой, аднаго верталётчыка, які загінуў. Разумная жанчына. Доўга сядзелі з ёй. Яна таксама хацела зразумець… Зразумець і знайсці для сябе сэнс мужавай смерці. Змірыцца з ёю. І не магла. Я шмат разоў чытаў у газетах, як працавалі верталётчыкі над рэактарам. Спачатку скідвалі свінцовыя пліты, але тыя бясследна знікалі ў дзірцы, тады хтосьці ўспомніў, што свінец пры тэмпературы семсот градусаў ператвараецца ў пару, а там было дзве тысячы градусаў. Пасля гэтага паляцелі ўніз мяхі з даламітам і пяском. На вышыні была ноч ад

узнятага пылу. Цемра. Слупы пылу. Каб дакладна «адбамбавацца», яны адчынялі вокны кабін і прыцэльваліся вокам, які нахіл даць: улева-ўправа, уверх-уніз. Дозы велізарныя! Помню назвы артыкулаў: «Героі ў небе», «Чарнобыльскія сокалы». Вось гэтая жанчына... Яна прызналася мне ў сваіх сумневах: «Цяпер пішуць, што мой муж — герой. Так, ён — герой. Але што такое герой? Я ведаю, што мой муж быў сумленны і старанны афіцэр. Дысцыплінаваны. Вярнуўся з Чарнобыля і праз некалькі месяцаў захварэў. У Крамлі яму ўручылі ўзнагароду, там ён убачыў сваіх таварышаў, яны таксама ўсе былі хворыя. Але радыя, што сустрэліся. Прыехаў дадому шчаслівы... З ордэнам... Я яго тады запыталася: "А ці мог ты не так моцна пацярпець? Захаваць здароўе?" — "Напэўна, мог бы, каб больш думаў, — адказаў ён. — Трэба было мець добры ахоўны касцюм, спецыяльныя акуляры, маску. У нас — ні першага, ні другога, ні трэцяга. Самі мы таксама не выконвалі правілаў асабістай бяспекі. Мы не думалі..."». Мы ўсе тады мала думалі... Як шкада, што мы раней мала думалі... З пункту гледжання нашай культуры думаць пра сябе — эгаізм. Слабасць духу. Заўсёды знаходзіцца нешта большае, чым ты. Чым тваё жыццё.

Восемдзесят дзявяты год... Дваццаць шостага красавіка — трэція ўгодкі. Прамінула тры гады пасля катастрофы... Людзей выселілі з трыццацікіламетровай зоны, але больш за два мільёны беларусаў па-ранейшаму жылі ў забруджаных мясцінах. Пра іх забылі. Беларуская апазіцыя прызначыла на гэты дзень дэманстрацыю, а ўлада ў адказ абвясціла суботнік. Па горадзе развесілі чырвоныя сцягі, працавалі выязныя буфеты з дэфіцытным па тых часах асартыментам: сыравэнджаная каўбаса, шакаладныя цукеркі, бляшанкі з распуш-

чальнай кавай. Паўсюль шнырылі міліцэйскія машыны. Завіхаліся хлопцы ў цывільным… Фатаграфавалі… Але… Новая прыкмета! На іх ужо ніхто не зважаў, іх не баяліся, як раней. Людзі пачалі збірацца каля парку Чалюскінцаў… Падыходзілі і падыходзілі. На дзесяць гадзін раніцы ўжо было дваццаць-трыццаць тысяч (карыстаюся міліцэйскімі зводкамі, іх потым паведамілі па тэлевізары), і кожную хвіліну падыходзілі новыя людзі. Мы самі такога не чакалі… Усе на ўздыме… Хто можа перашкодзіць гэтаму мору людзей? Роўна а дзясятай, як мы і планавалі, калона рушыла па Ленінскім праспекце ў цэнтр горада, дзе меўся адбыцца мітынг. На ўсім шляху да нас далучаліся новыя групы, яны чакалі калону на паралельных вуліцах, у завулках. У пад'ездах. Праляцела чутка: міліцыя і вайсковыя патрулі заблакавалі ўезды ў горад, затрымліваюць аўтобусы і машыны з дэманстрантамі з іншых мясцін, разварочваюць іх назад, але ніхто не паддаўся паніцы. Людзі пакідаюць транспарт і ідуць нам насустрач пешшу. Абвясцілі пра гэта праз мегафон. Над калонай разлеглася магутнае «Ур-ра-а-а!»… Балконы перапоўненыя людзьмі, яны адчынялі вокны наросхрыст. Станавіліся на падаконнікі. Махалі нам рукамі. Віталі нас хусткамі, дзіцячымі сцяжкамі. Тут я заўважыў… І ўсе вакол пра гэта загаварылі… Кудысьці рассмакталася міліцыя, хлопчыкі ў цывільным са сваімі фотаапаратамі… Як я цяпер разумею, атрымалі каманду і сышлі ў двары, селі і зачыніліся ў машынах пад брызентам. Улада затаілася… Вычэквала… Улада напалохалася… Людзі ішлі і плакалі, усе трымаліся за рукі. Плакалі таму, што перамагалі свой страх. Вызваляліся ад страху…

Пачаўся мітынг… І хоць мы да яго доўга рыхтаваліся, абмяркоўвалі спіс выступоўцаў, ніхто пра спіс не

ўспомніў. Да спехам зладжанай трыбуны самі падыходзілі і без усякіх паперак прамаўлялі простыя людзі, якія прыехалі з чарнобыльскіх мясцін. Утварылася жывая чарга. Мы слухалі сведкаў... Сведкі давалі паказанні... З вядомых асобаў выступіў толькі акадэмік Веліхаў, адзін з былых кіраўнікоў штабу ліквідацыі аварыі, але ягонага выступу я не запомніў. Запомніліся іншыя...

Маці з двума дзецьмі... Дзяўчынка і хлопчык...

Жанчына ўзяла дзяцей з сабой на трыбуну: «Яны ў мяне даўно не смяюцца. Не гарэзяць. Не бегаюць у двары. У іх няма сіл. Яны — як бабуля з дзядулем».

Жанчына-ліквідатар...

Калі яна закасала рукавы сукенкі і паказала свае рукі, усе ўбачылі, што рукі ў язвах. У струпах. «Я мыла адзенне нашых мужчын, якія працавалі паблізу рэактара, — расказвала яна. — Мылі пераважна ўручную, бо пральных машын завезлі мала. Яны хутка ад перагрузак зламаліся».

Малады доктар...

Ён пачаў з таго, што прачытаў клятву Гіпакрата... Казаў, як усе дадзеныя пра хваробы хаваюць пад шыфрам «сакрэтна» і «звышсакрэтна»... Медыцыну і навуку ўцягваюць у палітыку...

Гэта быў чарнобыльскі трыбунал.

Я прызнаюся... Не буду хаваць: самы значны дзень у маім жыцці. Мы былі шчаслівыя.

А назаўтра нас, арганізатараў дэманстрацыі, выклікалі ў міліцыю і судзілі за тое, што шматтысячны натоўп перакрыў праспект, перашкаджаў руху грамадскага транспарту. Неслі несанкцыянаваныя лозунгі. Кожнаму з нас далі па пятнаццаць сутак паводле артыкула «Злоснае хуліганства». Суддзі, які абвясціў прысуд, і міліцыянерам, якія суправаджалі нас у ізалятар, было

сорамна. Ім усім было сорамна. А мы смяяліся… Так… Так! Бо мы былі шчаслівыя…

Цяпер перад намі паўстала пытанне: што мы здольныя зрабіць? Што далей?

У адной з чарнобыльскіх вёсак, даведаўшыся, што мы з Мінска, кабета ўпала перад намі на калені: «Выратуйце маё дзіця! Забярыце з сабой! Нашы дактары не могуць зразумець, што з ім. А дзіця задыхаецца, сінее. Яно памірае». *(Маўчыць.)*

Я прыйшоў у бальніцу… Хлопчык. Сем гадоў. Рак шчытападобнай залозы. Я хацеў яго нечым разважыць, пачаў жартаваць. А ён адвярнуўся да сценкі: «Толькі не трэба расказваць, што я не памру. Я ведаю, што памру».

У Акадэміі навук… Здаецца, там… Мне паказалі здымак лёгкіх чалавека, прапаленых «гарачымі часцінкамі». Лёгкія былі падобныя да зорнага неба. «Гарачыя часцінкі» — гэта найдрабнейшыя мікраскапічныя часцінкі, якія ўтварыліся, калі рэактар, які гарэў, засыпалі свінцом і пяском. Атамы свінцу, пяску і графіту зляпліваліся і ад удараў падымаліся высока ў паветра. Разляталіся на вялікія адлегласці… На сотні кіламетраў… Праз дыхальныя шляхі яны трапляюць у арганізм чалавека. Часцей за іншых гінуць трактарысты і шаферы — тыя, хто арэ зямлю, ездзіць па вясковых дарогах. Любы орган, у якім пасяляюцца гэтыя часцінкі, на здымках «свеціцца». Сотні дзірачак, як у дробным рэшаце. Чалавек памірае… Згарае… І калі чалавек смяротны, то «гарачыя часцінкі» неўміручыя. Чалавек памрэ і за тысячу гадоў ператворыцца ў зямлю, у пыл, а «гарачыя часцінкі» будуць жыць. І гэты пыл будзе зноў забіваць… *(Маўчыць.)*

Я вяртаўся з паездак… Я быў перапоўнены. Расказваў… Мая жонка, яна з адукацыі лінгвіст, раней ніколі не цікавілася палітыкай, як і спортам, а тут яна ўвесь

час задавала мне адно і тое ж пытанне: «Што мы можам? Што далей рабіць?» І мы ўзяліся за справу, якая з пункту гледжання цвярозага розуму была немагчымая. Адважыцца на нешта падобнае чалавек здольны ў моманты ўзрушэння, у моманты поўнага духоўнага разняволення. А тады быў такі час... Гарбачоўскі час... Час надзеі! Веры! Мы вырашылі ратаваць дзяцей. Адкрыць свету, у якой небяспецы жывуць беларускія дзеці. Прасіць дапамогі. Крычаць. Біць ва ўсе званы! Улада маўчыць, яна здрадзіла свайму народу, мы маўчаць не будзем. І... хутка... Вельмі хутка... Сабралася кола верных памочнікаў і аднадумцаў. Пароль быў такі: «Што чытаеш? Салжаніцына, Платонава? Да нас». Працавалі па дванаццаць гадзін на суткі. Трэба прыдумаць нашай арганізацыі імя... Перабралі дзясяткі варыянтаў назваў, спыніліся на самай простай — Фонд «Дзецям Чарнобыля». Цяпер ужо немагчыма ні растлумачыць, ні ўявіць нашы сумневы... Спрэчкі... Нашыя страхі... Такіх фондаў, як наш, ужо вельмі шмат, а дзесяць гадоў таму мы былі першапраходцамі. Першая грамадзянская ініцыятыва... Нікім зверху не санкцыянаваная... Рэакцыя ўва ўсіх чыноўнікаў была аднолькавая: «Фонд? Які фонд? У нас для гэтага ёсць міністэрства аховы здароўя».

Як я цяпер разумею, Чарнобыль вызваляў нас... Вучыліся быць свабоднымі...

У мяне перад вачыма... *(Смяецца.)* У мяне гэта перад вачыма заўсёды... Першыя рэфрыжэратары з гуманітарнай дапамогай заехалі ў двор нашага дома. На хатні адрас. Я глядзеў на іх з вакна сваёй кватэры і не ўяўляў: як усё гэта разгрузіць, дзе захоўваць? Добра памятаю, што машыны былі з Малдавіі. Сямнаццаць-дваццаць тонаў з сокамі, фруктовай сумессю, дзіцячым харчаваннем. Ужо тады прасочваліся чуткі: каб вывесці

радыяцыю, трэба больш садавіны, вось гэтую мякаць ужываць у рацыёне. Абтэлефанаваў сяброў — хто на дачы, хто на працы. Пачалі разгружаць удваіх з жонкай, але паступова, адзін за адным, выходзілі з нашага дома людзі (усё ж дзевяціпавярховік), спыняліся выпадковыя мінакі: «Што за машыны?» — «Дапамога для чарнобыльскіх дзяцей». Кідалі свае справы, далучаліся да нас. Пад вечар машыны разгрузілі. Груз разнеслі па падвалах і гаражах, дамовіліся з нейкай школай. Смяяліся потым над сабой… А калі павезлі гэтую дапамогу ў забруджаныя раёны… Пачалі раздаваць… Звычайна людзі збіраліся ў школе або ў Доме культуры. Вось што прыйшло мне цяпер на памяць… Адзін выпадак у Веткаўскім раёне… Маладая сям'я… Яны атрымалі, як і ўсе, слоічкі дзіцячага харчавання, пакеты з сокамі. Мужчына сеў і заплакаў. Гэтыя слоічкі, гэтыя пакеты не маглі выратаваць ягоных дзяцей, можна махнуць рукой — лухта! Але ён плакаў, бо высветлілася, што пра іх не забыліся. Пра іх нехта памятае. Значыцца, ёсць надзея.

Адгукнуўся ўвесь свет… Нашых дзяцей згадзіліся прымаць на лячэнне ў Італіі, Францыі, Германіі… Авіякампанія «Люфтганза» перавезла іх у Германію за свой кошт. Сярод нямецкіх лётчыкаў правялі конкурс, доўга іх адбіралі. Паляцелі найлепшыя лётчыкі. Калі дзеці ішлі да самалётаў, кідалася ў вочы, што яны ўсе бледныя-бледныя. Ціхія-ціхія. Не абыходзілася без кур'ёзаў… *(Смяецца.)* Бацька аднаго хлопчыка ўварваўся да мяне ў кабінет і запатрабаваў вярнуць сынавы дакументы: «У нашых дзяцей там будуць браць кроў. Праводзіць над імі эксперыменты». Вядома, памяць пра тую страшную вайну яшчэ не памерла… Народ памятае… Але тут і іншае. Мы доўга жылі за дротам. У сацыялістычным лагеры. Баяліся іншага свету… Не ведалі яго…

Чарнобыльскія мамы і таты — гэта яшчэ адна тэма. Працяг размовы пра нашу ментальнасць... Савецкую ментальнасць. Разваліўся Савецкі Саюз... А ўсе яшчэ доўга чакалі дапамогі ад вялікай і магутнай краіны, якой ужо не было. Мой дыягназ... Хочаце? Сумесь турмы і дзіцячага саду — вось што такое сацыялізм. Савецкі сацыялізм. Чалавек аддаваў дзяржаве душу, сумленне, сэрца, а наўзамен атрымліваў паёк. Тут ужо каму як пашанцуе — у каго вялікі паёк, а ў каго маленькі. Адно аднолькавае — выдаюць яго наўзамен душы. Больш за ўсё мы баяліся, каб наш фонд не стаў займацца раздачай вось гэтага пайка. Чарнобыльскага пайка. А людзі ўжо прывыклі чакаць і скардзіцца: «Я — чарнобылец. Мне належыць, бо я — чарнобылец». Як я цяпер разумею, Чарнобыль — гэта вялікае выпрабаванне і для нашага духу. Для нашай культуры.

У першы год выправілі за мяжу пяць тысяч дзяцей, у другі — ужо дзесяць, у трэці — пятнаццаць...

А вы размаўлялі з дзецьмі пра Чарнобыль? Не з дарослымі, а з дзецьмі? У іх бываюць нечаканыя разважанні. Мне як філосафу заўсёды цікава. Вось прыклад... Адна дзяўчынка расказала, як іхні клас паслалі ўвосень восемдзесят шостага года ў поле... збіраць буракі і моркву. Усюды ім трапляліся здохлыя мышы, і яны смяяліся: вось вымруць мышы, жукі, чарвякі, а потым пачнуць паміраць зайцы, ваўкі. За імі — мы. Людзі памруць апошнімі. Далей яны давалі волю фантазіі: якім будзе свет без звяроў і птушак? Без мышэй. На нейкі час застануцца жыць адны людзі. Без нікога. Нават мухі не будуць лётаць. Дзецям было па дванаццаць-пятнаццаць гадоў. Так яны ўяўлялі будучыню.

Размова з іншай дзяўчынкай... Яна паехала ў піянерскі лагер і там пасябравала з адным хлопчыкам.

«Такі добры хлопчык, — успамінала яна, — увесь час мы бавілі разам». А потым ягоныя сябры сказалі яму, што яна з Чарнобыля, — больш ён да яе не падышоў ні разу. З гэтай дзяўчынкай мы нават ліставаліся. «Цяпер, калі я думаю пра сваю будучыню, — пісала яна, — я мару, што скончу школу і паеду куды-небудзь далёка-далёка, дзе ніхто не будзе ведаць, адкуль я. Там мяне хто-небудзь пакахае. І я ўсё забуду…»

Запісвайце, запісвайце… Так… Так! Усё знікае з памяці, сыходзіць. Я шкадую, што не запісваў… Яшчэ адна гісторыя… Прыехалі ў забруджаную вёску. Каля школы дзеці гуляюць з мячыкам. Той закаціўся ў клумбу з кветкамі, дзеці абкружылі яе, ходзяць вакол, але дастаць мячык баяцца. Спачатку я нават не зразумеў, у чым рэч, тэарэтычна я ведаў, але ж я тут не жыву, у мяне заўсёдная пільнасць адсутнічае, я з нармальнага свету прыехаў. І я зрабіў крок да клумбы. А дзеці як закрычалі: «Нельга! Нельга! Дзядзя, нельга!» За тры гады (а было гэта ў восемдзесят дзявятым годзе) яны прывыклі да думкі, што нельга сесці на траву, нельга рваць кветкі. Нельга залезці на дрэва. Калі мы прывозілі іх за мяжу і прасілі: «Ідзіце ў лес, ідзіце да ракі. Купайцеся, загарайце», трэба было бачыць, як няўпэўнена яны заходзілі ў ваду… Як гладзілі траву… Але потым… Потым… Колькі было шчасця! Можна зноў даваць нырца, ляжаць на пяску… Увесь час хадзілі з букетамі, звівалі вянкі з кветак. Пра што я думаю? Пра што… Так, мы можам іх вывезці і палячыць, але як ім вярнуць ранейшы свет? Як ім вярнуць іх мінулае? І будучыню?

Тут пытанне… Нам трэба адказаць на пытанне: хто мы? Без гэтага нічога не адбудзецца і не зменіцца. Што такое для нас жыццё? І што для нас свабода? Умеем пра свабоду толькі марыць. Маглі быць свабоднымі, але не

сталі свабоднымі. Зноў не атрымалася. Семдзесят гадоў будавалі камунізм, сёння будуем капіталізм. Раней маліліся на Маркса, цяпер на долар. Мы згубіліся ў гісторыі. Калі думаеш пра Чарнобыль, то вяртаешся сюды, у гэтую кропку: хто мы? Што зразумелі пра сябе? Пра свой свет? У нашых ваенных музеях, а іх у нас больш, чым музеяў мастацтваў, захоўваюцца старыя аўтаматы, штыкі, гранаты, а ў двары стаяць танкі і мінамёты. Школьнікаў водзяць туды на экскурсіі і паказваюць — гэта вайна. Вайна вось такая... А яна ўжо іншая... Дваццаць шостага красавіка тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага года мы перажылі яшчэ адну вайну. Яна не скончылася...

А мы... Хто мы?

*Генадзь Грушавы, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі, старшыня Фонду «Дзецям Чарнобыля»*

## Маналог пра тое, што мы даўно злезлі з дрэва і не прыдумалі такога, каб яно адразу расло, быццам кола

Сядайце... Пасоўвайцеся бліжэй... Але я з вамі буду шчырая: не люблю журналістаў, а яны мяне не надта шануюць.

— А гэта чаму?

— Вы не ў курсе? Не паспелі яшчэ папярэдзіць? Тады зразумела, чаму вы тут. У маім кабінеце. А я — адыёзная фігура. Так мяне вашы калегі журналісты называюць. Усе вакол крычаць: на гэтай зямлі жыць нельга! А я адказваю: можна. Трэба навучыцца на ёй жыць. Мець мужнасць. Давайце закрыем забруджаныя тэрыторыі, абцягнем дротам траціну краіны, кінем і ўцячэм.

Зямлі ў нас яшчэ шмат. Не! З аднаго боку, наша цывілізацыя антыбіялагічная, чалавек — самы страшны вораг прыроды, а з другой — ён творца. Перайначвае свет. Эйфелева вежа, напрыклад, або касмічны карабель… Але прагрэс патрабуе ахвяр, і чым далей, тым гэтых ахвяр трэба ўсё больш. Не менш, чым на вайне, гэта цяпер зрабілася зразумелым. Забруджванне паветра, атручванне глебы, азонавыя дзіркі… Клімат Зямлі мяняецца. І мы жахнуліся. Але веды самі па сабе не могуць быць віной або злачынствам. Чарнобыль… Хто вінаваты — рэактар або чалавек? Без абмеркаванняў — чалавек, ён яго дрэнна абслугоўваў, былі зробленыя жудасныя памылкі. Сума памылак. Не будзем заглыбляцца ў тэхнічны бок… Але гэта ўжо факт… Працавалі сотні камісій і экспертаў. Самая вялікая тэхнагенная катастрофа ў гісторыі чалавецтва, нашыя страты фантастычныя, матэрыяльныя яшчэ неяк можна падлічыць. А не матэрыяльныя? Чарнобыль ударыў па нашым уяўленні. Па нашай будучыні. Мы спалохаліся будучыні… У такім разе не трэба было злазіць з дрэва або мы павінны былі прыдумаць нешта такое, каб дрэва адразу расло, быццам кола. Паводле колькасці ахвяр не чарнобыльская катастрофа, а аўтамабіль займае першае месца ў свеце. Чаму ніхто не забараняе вытворчасць аўтамабіляў? Ездзіць на ровары ці на восліку больш бяспечна… На калёсах…

Тут маўчаць… Маўчаць мае апаненты…

Мяне абвінавачваюць… У мяне пытаюцца: «А як вы ставіцеся да таго, што дзеці п'юць радыеактыўнае малако? Ядуць радыеактыўныя ягады?» Дрэнна я да гэтага стаўлюся. Вельмі дрэнна! Але я лічу, што ў дзяцей ёсць таты і мамы, і мы маем урад, які павінен пра гэта думаць. Я супраць аднаго… Я супраць таго, каб людзі, якія не ведаюць або ўжо забылі табліцу Мендзялеева,

вучылі нас, як жыць. Запалохвалі нас. Наш народ і без гэтага заўсёды жыў у страху — рэвалюцыя, вайна. Гэты вампір… Д'ябал! Сталін… Цяпер — Чарнобыль… А потым здзіўляемся: чаму ў нас людзі такія? Чаму яны не свабодныя, баяцца свабоды? Ім жа больш звычна жыць пад царом. Пад царом-бацюхнам. Ён можа называцца генсекам або прэзідэнтам, якая розніца. Ніякай. Але я — не палітык, я — вучоны. Я ўсё жыццё думаю пра зямлю, вывучаю зямлю. Зямля — такая самая загадкавая матэрыя, як і кроў. Нібыта ўсё пра яе ведаем, а нейкая таямніца застаецца. Мы падзяліліся — не на тых, хто за тое, каб тут жыць, і тых, хто супраць, а на вучоных і невучоных. Калі ў вас здарыцца прыступ апендыцыту і трэба аперацыя, да каго вы звернецеся? Вядома, да хірурга, а не да грамадскіх энтузіястаў. Вы будзеце слухаць спецыяліста. Я — не палітык. Я думаю… А што яшчэ ёсць у Беларусі, апрача зямлі, вады, лесу? Нафты шмат? Або алмазаў? Нічога няма. Таму трэба берагчы тое, што маем. Аднаўляць. Так, вядома… Нам спачуваюць, шмат людзей у свеце хочуць дапамагчы, але не будзем жа мы бясконца жыць заходнімі падачкамі. Спадзявацца на чужы партманет. Усе, хто хацеў, ужо з'ехалі, засталіся адно тыя, хто хоча жыць пасля Чарнобыля, а не паміраць. Тут іхняя радзіма.

—Што вы прапаноўваеце? Як чалавеку тут жыць?

—Чалавек лечыцца… І забруджаная зямля таксама лечыцца…

Трэба працаваць. Думаць. Няхай маленечкімі крокамі, але некуды караскацца. Ісці наперад. А мы… Як у нас? З нашай жудаснай славянскай лянотай мы хутчэй паверым у дзіва, чым у магчымасць штосьці стварыць сваімі рукамі. Паглядзіце на прыроду… У яе трэба вучыцца… Прырода працуе, яна самаачышчаецца, да-

памагае нам. Паводзіць сябе разумней за чалавека. Яна імкнецца да першабытнай раўнавагі. Да вечнасці.

Выклікаюць мяне ў аблвыканкам…

— Справа незвычайная… Вы зразумейце нас, Слава Канстанцінаўна, не ведаем, каму верыць. Дзясяткі вучоных паўтараюць адно, вы — іншае. Ці чулі вы што-небудзь пра славутую вядзьмарку Параску? Мы вырашылі запрасіць яе да нас, яна абяцае за лета панізіць гамафон.

Вам смешна… А са мной сур'ёзныя людзі размаўлялі, у гэтай Парасkі ўжо былі падпісаныя дамовы з некаторымі гаспадаркамі. Заплацілі ёй вялікія грошы. Гэтае захапленне мы перажылі… Зацьменне розумаў… Агульная істэрыка… Памятаеце? Тысячы… Мільёны сядзелі каля тэлевізараў, і ведзьмакі, яны называлі сябе экстрасэнсамі, Чумак, за ім Кашпіроўскі «зараджалі» ваду. Мае калегі, з навуковымі ступенямі, налівалі трохлітровыя слоікі вады і ставілі каля экранаў. Пілі гэтую ваду, мылі твар… Лічылася, што яна ацаляе. Ведзьмакі выступалі на стадыёнах, дзе збіралася такая колькасць гледачоў, што Але Пугачовай і не снілася. Народ туды ішоў, ехаў, поўз. З неверагоднай верай! Развітаемся ад узмаху чароўнай палачкі з усімі хваробамі! А што? Новы бальшавіцкі праект… Публіка поўная энтузіязму… Галовы задураныя новай утопіяй… «Ну, — думаю, — цяпер ведзьмакі будуць нас ратаваць ад Чарнобыля».

Да мяне пытанне:

— Як вы мяркуеце? Вядома, мы ўсе атэісты, але вось гавораць… І ў газетах пішуць… Мы арганізуем вам сустрэчу?

Сустрэлася я з гэтай Параскай… Адкуль яна ўзялася, не ведаю. Напэўна, з Украіны. Яна ўжо два гады паўсюль ездзіла і паніжала гамафон.

— Што вы збіраецеся рабіць? — запытала я.

—У мяне такія нутраныя сілы... Я адчуваю, што магу паніжаць гамафон.

—А што вам для гэтага трэба?

—Мне трэба верталёт.

Тут я ўжо раззлавалася. І на Параску, і на нашых чыноў, якія, разявіўшы раты, слухалі, як яна іх тры разы вакол пальца абводзіла.

—Ну навошта, — кажу я, — адразу верталёт. Вось мы зараз прывязём і насыплем на падлогу забруджанай зямлі. Ну хоць бы паўметра. І давайце... Здымайце фон...

Так і зрабілі. Прывезлі зямлі... І яна пачала... Нешта шаптала, плявала. Нейкіх духаў рукамі гнала. І што? Ну, што атрымалася? Нічога не атрымалася. Сядзіць Параска цяпер недзе ва Украіне ў турме. За махлярства. Яшчэ адна вядзьмарка... Яна абяцала на ста гектарах паскорыць распад стронцыю і цэзію. Адкуль яны браліся? Я думаю, іх нараджала наша жаданне дзіва. Наша чаканне. Іхнія фотаздымкі, іхнія інтэрв'ю. Хтосьці ж даваў ім цэлыя палосы ў газетах, самы дарагі час на тэлебачанні. Калі вера ў розум пакідае чалавека, у ягонай душы пасяляецца страх. Як у дзікуна. Вылазяць пачвары...

Тут маўчаць... Маўчаць мае апаненты...

Я памятаю толькі аднаго буйнога кіраўніка, які патэлефанаваў мне і папрасіў: «Давайце я прыеду да вас у інстытут і вы мне растлумачыце: што такое кюры? Што такое мікрарэнтген? Як гэты мікрарэнтген пераходзіць, дапусцім, у імпульс? Езджу па вёсках, у мяне пытаюцца, а я — як ідыёт. Як школьнік». Адзін такі сустрэўся. Аляксей Аляксеевіч Шахноў... Запішыце прозвішча... А большасць кіраўнікоў нічога не хацелі ведаць, ніякай фізікі і матэматыкі. Усе яны сканчвалі вышэйшую пар-

тыйную школу, там добра вучылі толькі аднаму прадмету — марксізму. Натхняць і ўздымаць масы. Мысленне камісараў… Яно не памянялася з часоў конніцы Будзённага… Я ўспамінаю афарызм улюбёнага сталінскага камандарма: «А мне ўсё роўна, каго сячы. Мне шашкай махаць падабаецца».

А наконт рэкамендацый… Як нам жыць на гэтай зямлі? Баюся, што вам будзе сумна, як і ўсім. Не знойдзеце сенсацыі. Феерверку. Колькі разоў я выступала перад журналістамі, расказвала адно, а чытала на наступны дзень іншае. Чытач павінен быў памерці ад страху. Хтосьці бачыў у зоне плантацыі маку і паселішчы наркаманаў. А нехта ката з трыма хвастамі… Нябесную праяву ў дзень аварыі…

Вось распрацаваныя нашым інстытутам праграмы. Надрукаваныя памяткі для калгасаў і для насельніцтва. Магу даць з сабой… Прапагандуйце…

Памятка для калгасаў… *(Чытае.)*

«Што мы прапануем? Навучыцца кіраваць радыяцыяй, як электрычнасцю, накіроўваючы яе па ланцужках у абход чалавека. Для гэтага трэба перабудова нашага тыпу гаспадарання… Карэкцыя… Замест малака і мяса наладзіць вытворчасць тэхнічных культур, якія не трапляюць у ежу. Напрыклад, рапсу. З яго можна рабіць масла, у тым ліку і маторнае. Выкарыстоўваць як паліва ў рухавіку. Можна вырошчваць насенне і саджанцы. Насенне спецыяльна апраменьваюць у лабараторных умовах, каб захаваць чысціню сорту. Для насення радыяцыя бяспечная. Гэта адзін шлях. Ёсць другі… Калі мы ўсё ж вырабляем мяса… У нас няма спосабаў ачысціць гатовае збожжа, знаходзім выйсце — скормліваем яго жывёле, прапускаем праз яе. Так званая заалагічная дэзактывацыя. Перад забоем бычкоў на два-тры месяцы

пераводзім іх на стойлавае ўтрыманне, прывозім ім чыстыя кармы. Яны ачышчаюцца…»

Думаю, дастаткова… Не чытаць жа мне вам лекцыю? Мы гаворым пра навуковыя ідэі… Я нават назвала б гэта філасофіяй выжывання…

Памятка для прыватніка…

Я прыязджаю ў вёску да бабуль і дзядуль… Зачытваю… А яны тупаюць на мяне нагамі. Слухаць адмаўляюцца, яны хочуць жыць так, як жылі іхнія дзяды і прадзеды. Пражшчуры. Хочуць піць малако… А малако піць нельга. Купляйце сепаратар і цісніце з яго тварог, збівайце масла. Сыроватку — выліваць, сыроватку — у зямлю. Хочуць сушыць грыбы… Спачатку вымачыце іх. Трэба высыпаць грыбы нанач у карыта, заліць вадой, а потым сушыць. А найлепей іх наогул не есці. Уся Францыя ў шампіньёнах, яны ж не на вуліцы вырошчваюць. У цяплярнях. Дзе нашы цяплярні? Дамы ў Беларусі драўляныя, адвеку жывуць беларусы сярод лясоў, а дамы лепей абкласці цэглай. Цэгла добра экрануе, гэта значыць, рассейвае выпрамяньванне, якое іанізуе. Рассейвае ў дваццаць разоў лепей, чым дрэва. Раз на пяць гадоў прысядзібны ўчастак трэба вапнаваць. Стронцый і цэзій хітрыя. Чакаюць сваёй пары. Нельга карыстацца гноем з-пад сваёй кароўкі, лепей купіць мінеральныя ўгнаенні…

— Для выканання вашых планаў трэба іншая краіна, іншы чалавек і іншы чыноўнік. Старым людзям у нас з цяжкасцю хапае на хлеб і на цукар, а вы раіце — мінеральныя ўгнаенні набываць. Купіць сепаратар…

— Магу адказаць… Я зараз абараняю навуку. Я вам даводжу, што не навука вінаватая ў Чарнобылі, а чалавек. Не рэактар, а чалавек. А палітычныя пытанні не да мяне. Не па адрасе…

Вось… Гэта ж трэба! Выскачыла з галавы, я нават пазначыла сабе на аркушыку, каб не забыць. Расказаць. Да нас прыехаў з Масквы малады навуковец, у яго мара ўдзельнічаць у чарнобыльскім праекце. Юра Жучэнка… Ён прывёз з сабой цяжарную жонку… На пятым месяцы… Усе толькі галовамі хітаюць — чаму? Навошта? Свае ўцякаюць, а чужыя едуць. А таму, што гэта сапраўдны вучоны, ён хоча даказаць: адукаваны чалавек можа тут жыць. Адукаваны і дысцыплінаваны, якраз тыя дзве якасці, што цэняцца ў нас найменш. У нас трэба голымі грудзямі на кулямёт легчы. З факелам прабегчы. А тут… Вымочваць грыбы, зліваць першую ваду, калі бульба закіпіць… Рэгулярна піць вітаміны… Насіць у лабараторыю на праверку ягады. Закопваць у зямлю попел… Я была ў Германіі, бачыла, як там кожны немец уважліва стаіцца да смецця: у гэты кантэйнер — бутэлькі з белага шкла, сюды — з зялёнага… Накрыўку ад пакета малака асобна — туды, дзе пластык, сам пакет — туды, дзе папера. Батарэйкі ад фотаапарата яшчэ некуды. Асобна — біяадкіды… Чалавек працуе… Не ўяўляю нашага чалавека за такім заняткам: белае шкло, чырвонае — для яго гэта было б сумна і ганебна. Маць-перамаць. Яму трэба сібірскія рэкі павярнуць у адваротным кірунку… Што-небудзь такое… «Размахнись, плечо, разойдись, рука…» А каб выжыць, нам трэба змяніцца.

Але гэта ўжо не мае пытанні… Вашы… Гэта пытанні культуры. Ментальнасці. Усяго нашага жыцця.

Тут маўчаць… Маўчаць мае апаненты… *(Задумалася.)*

Хочацца памарыць… Пра тое, што неўзабаве чарнобыльскую станцыю зачыняць. Знясуць. А пляцоўку пад ёйператвораць у зялёны лужок…

*Слава Канстанцінаўна Фірсакова,*
*доктар сельскагаспадарчых навук*

## Маналог каля закрытага калодзежа

Па вясновым бездарожжы я з цяжкасцю дабралася да старога хутара. Наш міліцэйскі «ўазік», які ўжо шмат чаго на сваім вяку пабачыў, канчаткова заглух — на шчасце, ужо каля сядзібы, абсаджанай старымі дубамі і клёнамі. Прыехала я да вядомай на Палессі пяюнні і казачніцы — Марыі Фядотаўны Вялічкі.

На падворку сустрэла яе сыноў. Знаёмімся: старэйшы Мацвей — настаўнік, малодшы Андрэй — інжынер. Ахвотна ўступаюць у размову, як высвятляецца, усе ўзбуджаныя блізкім пераездам.

—Госць — на двор, а гаспадыня — з двара. Забіраем маму ў горад. Машыну чакаем… А вы якую кніжку пішаце?

—Пра Чарнобыль.

—Пра Чарнобыль сёння ўспамінаць цікава… Я сачу, пра што пішуць на гэтую тэму ў газетах. Кніжак пакуль мала. Мне як настаўніку трэба гэта ведаць, нас ніхто не вучыць, як размаўляць на чарнобыльскую тэму з нашымі дзецьмі. Мяне хвалюе не фізіка… Я выкладаю літаратуру, і мяне хвалююць вось такія пытанні… Чаму акадэмік Лягасаў, адзін з тых, хто кіраваў ліквідацыяй аварыі, скончыў жыццё самагубствам? Вярнуўся дадому ў Маскву і застрэліўся. А галоўны інжынер атамнай станцыі звар'яцеў… Бэта-часціца, альфа-часціца… Цэзій, стронцый… Яны распадаюцца, размываюцца, пераносяцца… А што з чалавекам?

—А я — за прагрэс! За навуку! Ніхто з нас ужо не адмовіцца ад электрычнай лямпачкі… Страхам пачалі гандляваць… Прадаюць чарнобыльскі страх, бо ў нас больш няма нічога такога, што мы маглі б прадаць на сусветным рынку. Новы тавар — прадаём свае пакуты.

—Перасялілі сотні вёсак... Дзясяткі тысяч людзей... Вялікую сялянскую Атлантыду... Яна рассыпалася па былым Савецкім Саюзе, назад ужо не збярэш. Не выратуеш. Цэлы свет мы страцілі... Такога свету больш не будзе, ён не паўторыцца. Вось паслухайце нашу маму...

Нечаканая размова, што распачалася так сур'ёзна, на маё шкадаванне, працягу не атрымала. Чакала пільная праца. Я разумела: яны назаўсёды пакідаюць родны дом.

Але тут з'яўляецца на парозе гаспадыня. Абняла, як родную, пацалавала.

—Донечка, я тут адна дзве зімы зімавала. Людзі не прыбіваліся... А звяры забягалі... Лісіца неяк заскочыла, убачыла мяне і здзівілася. Узімку і дзень доўгі, і ноч — як жыццё, і заспявала б табе, і казак напляла б. Старому чалавеку сумна жыць, размова — гэта ягоная праца. Калісьці да мяне са сталіцы студэнты прыязджалі, на магнітафон запісвалі. А было гэта даўно... Да Чарнобыля...

Што табе расказаць? Можа, паспею... Днямі на ваду варажыла, і паказала мне на дарогу... Вырываецца наш корань з зямелькі. Дзяды, прадзеды тут жылі. У лясах мы тут на свет заявіліся і мянялі адно аднаго век за векам, а цяпер час такі надышоў, што бяда гоніць са сваёй зямлі. Такой бяды і ў казках няма, я не ведаю... Во-о-о...

А ўзгадаю табе, донечка, як мы ў дзеўках варажылі... Добрае ўзгадаю. Вясёлае. Як маё жыццё тут пачыналася... У мамы з татам весела да сямнаццаці гадоў, а там трэба замуж збірацца. Суджанага клікаць, а па-нашаму — гукаць. Улетку варажылі на ваду, а зімой на дым — куды дым з коміна паверне, у той бок

і замуж возьмуць. Я любіла на вадзе варажыць... На рацэ... Вада, яна першая на зямлі была, яна ўсё ведае. Можа падказаць. Пускалі па вадзе свечкі, лілі воск. Свечка паплыве — значыцца, каханне блізка, а патоне — на гэты год у дзеўках застанешся. Дзеваваць будзеш. Дзе яна, доля? Дзе маё шчасце? Па-ўсякаму варажылі... Бралі люстэрка ды ішлі ў лазню, сядзелі там усю ноч, а калі ў люстэрку хто пакажацца, дык трэба яго адразу на стол, а то чорт выскачыць. Чорт любіць праз люстэрка прыходзіць... Адтуль... Варажылі па цені... Над шклянкай вады палілі паперы і глядзелі на цень на сцяне. Пакажацца крыж — да смерці, а купал царквы — да вяселля. Хто плача, а хто ўсміхаецца... Каму якая доля... На ноч разуваліся і адзін чаравік пад падушку хавалі. Прыйдзе ўначы суджаны, будзе разуваць, а ты на яго паглядзіш і — які ён з твару — запамятаеш. Да мяне нехта іншы прыходзіў, не мой Андрэй, нехта высокі, белы з твару, а мой Андрэй быў росту невысокага, бровы чорныя ды ўсё смяяўся: «Эх, пані-сударыня... Мая ты спадарыня...» *(Смяецца.)* Пражылі мы з ім шэсцьдзясят гадкоў... Траіх дзяцей на свет пусцілі... Няма дзеда. На могілкі сыны аднеслі. Перад смерцю мяне астатні раз пацалаваў: «Эх, панi-спадарыня, адна застанешся...» Што я ведаю? Доўга жывеш — і жыццё забываецца, і каханне забываецца. Во-о-о... Дай божа! Яшчэ ў дзеўках засоўвалі пад падушку грабянец. Валасы распусціш і так спіш. Прыйдзе суджаны-наканаваны ў сне. Папросіць вады напіцца або каня напаіць...

Вакол калодзежа мак сыпалі... Кружком... Адвячоркам сыдземся і крычым у калодзеж: «Доля, у-у-у! Доля, го-о-о!» Рэха ішло, і па гуку чыталі: каму — што. Я і зараз хацела да калодзежа пайсці... Спытаць сваю

долю... Хоць мала ўжо той долі засталося. Крошачкі. Сухое зернейка. А ўсе калодзежы ў нас салдаты пазакрывалі. Забілі дошкамі. Мёртвыя калодзежы. Закрытыя. Засталася адна жалезная калонка каля калгаснай канторы. Была ў вёсцы знахарка, яна і на долю варажыла, дык яна да дачкі ў горад паехала. Мяхі... Два бульбяныя мяхі зёлак з сабой павезла. Дай божа! Во-о-о... Старыя чарапкі, у якіх узвары рабіла... Белыя палотны... Каму яны трэба ў тым горадзе? У горадзе сядзяць і тэлевізар круцяць або кніжкі чытаюць. Гэта мы тут... Як птушкі... Па зямлі, па траве, па дрэвах чыталі. Калі зямля ўвесну доўга адкрываецца, не растае, тады трэба чакаць улетку засуху. Месяц калі цьмяна свеціць, скаціна не будзе нараджацца. Паляцелі жоравы рана — да маразоў... *(Расказвае і ціха пагойдваецца ў такт сваім словам.)*

У мяне сыны добрыя і нявесткі ласкавыя. І ўнукі. Але да каго ты ў горадзе на вуліцы загаворыш? Чужына. Пустое для сэрца месца. Што з чужымі людзьмі ўзгадаеш? Я ў лес любіла хадзіць, мы з лесу жылі, там заўсёды ў кампаніі. Пры людзях. Цяпер у лес не пускаюць... Міліцыя стаіць, вартуе радыяцыю...

Два гады... Дай божа! Два гады сыны мяне ўпрошвалі: «Мама, збірайся ў горад». Угаварылі нарэшце... Такія харашэнныя ў нас ёсць мясціны, вакол лясы, азёры. Азёры чыстыя, з русалкамі. Старыя людзі казалі, што дзяўчынкі, якія рана памерлі, русалачкамі жывуць. Апранахі ім на кустах пакідалі — кашулі жаночыя. На кустах і на вяровачку ў жыце вешалі. Яны выйдуць з вады і па жыце бегаюць. А ты ці верыш мне? Некалі людзі ва ўсё верылі... Слухалі... Тады тэлевізара не было, яшчэ не прыдумалі. *(Смяецца.)* Во-о-о... Прыгожая ў нас зямля! Мы тут жылі, а нашыя дзеці тут жыць

не будуць. Не-е-е… Я люблю гэтую пару… Сонейка высока на неба палезла, птушкі вярнуліся. Зіма надакучыла. Увечары з хаты не выйдзеш. Дзікі па вёсцы гойсаюць, як па лесе. Бульбачку перабірала… Хацела цыбулю пасадзіць… Трэба нешта рабіць, не будзеш жа сядзець, склаўшы рукі, ды чакаць смерці. Тады яна давеку не прыйдзе.

А ўзгадаю, донечка, пра дамавіка… Ён у мяне даўно жыве, дакладна не ведаю — дзе, але выходзіць з-пад печы. У чорнай адзежы, у чорным картузе, а гузікі на касцюме блішчаць. Цела няма, а ён ідзе. Я спярша думала, што гэта мой гаспадар мяне пераведвае. Во-о-о… Дык не… Дамавічок… Адна жыву, няма да каго загаварыць, дык я ўначы яму свой дзень расказваю: «Выйшла ранютка… Так сонейка ззяе, што я стаяла і дзівілася на зямлю. Радавалася. Такое шчаслівае было маё сэрца…» Ды вось трэба ехаць… Пакідаць свой край… На вербніцу я заўсёды вярбу ламала. Бацюшкі няма, дык я хадзіла да ракі і сама там свяціла. На вароты ставіла. У хату заносіла, прыбірала прыгожа. Панатыкаю ў сцены, дзверы, у столь, пад страху пакладу. Хаджу і прыгаворваю: «Каб ты, вербачка, кароўку маю ратавала. Каб жыта ўрадзіла і яблыкі былі. Каб кураняты выводзіліся і гусі несліся». Трэба так хадзіць і доўга прыгаворваць.

Раней мы вясну весела сустракалі… Гралі. Спявалі. Пачыналі ад таго дня, калі ўпершыню гаспадыні кароў на пашу пускалі. Трэба ведзьмаў прагнаць… Каб ведзьмы кароў не псавалі, не здойвалі малако, а то яны бягуць дадому выдаеныя. І пярэпалах між імі. Ты запамінай, можа, яно яшчэ вернецца ўсё, пра тое ў царкоўных кнігах напісана. Калі ў нас бацюшка служыў, ён чытаў. Жыццё можа скончыцца, а потым зноўку пачнецца. Слухай далей… Мала хто ўжо памятае, мала хто табе раска-

жа. Перад першым статкам… Трэба разаслаць на дарозе белы абрус, няхай статак па ім прабяжыць, а следам пастушкі пройдуць. Будуць ісці яны са словамі: «Злая ведзьма, грызі цяпер камень… Зямлю грызі… А вы, кароўкі, будзеце спакойна хадзіць па лугах і балотах, нікога не баяцца — ні людзей ліхіх, ні звяроў лютых». Увесну не адна трава з зямлі паўзе, а ўсё паўзе. Усякая погань. А хаваецца яна ў цёмным месцы, у доме па кутах. У пуні, дзе цёпла. Вуж на падворак з возера прыпаўзе, уранні ў расе купаецца. Чалавеку трэба бараніцца. Добра бывае зямлю з мурашніка каля весніц закапаць, а самае надзейнае — стары замок закапаць каля варотаў. Закрые ён усяму гадаўю зубы. Губы. А зямелька? Яна не толькі плуга і бараны патрабуе, ёй таксама абарона трэба. Ад злых духаў. Поле сваё трэба абысці двойчы, ісці і нагаворваць: «Сею — сею, пасяваю… Дай мне добрага ўраджаю. А мышам не давай шмат зерня. Хай на добрае паверне…»

Што табе яшчэ прыгадаць? Буслу-буську таксама трэба ўвесну пакланіцца. Сказаць дзякуй за тое, што прыляцеў на старое месца. Бусел ад пажару бароніць, дзяцей малых прыносіць. Клічуць яго: «Клё-клё-клё… Бусько, да нас! Да нас!» А маладыя, якія нядаўна пажаніліся, асобна просяць: «Клё-клё-клё… Каб нам любілася і кахалася. А дзеткі каб раслі гладзенькія, як вярба».

А на Вялікдзень усе фарбавалі яйкі… Чырвоныя, сінія, жоўтыя яйкі. А ў каго хто памёр у хаце, адно яйка чорнае. Жалобнае. На тугу. А чырвонае — каханне, сіняе — каб жыць доўга. Во-о-о! Як я?.. Жыву і жыву. Усё ўжо ведаю: і што ўвесну будзе, і што ўлетку… Увосень і ўзімку… А дзеля нечага жыву. Гляджу на свет… І не скажу, што не радуюся. Донечка… А вось гэта таксама

паслухай... Пакладзеш на Вялікдзень чырвонае яйка ў ваду, яно паляжыць, а ты тады памыйся. Твар зробіцца прыгожы. Чысты. Захочаш, каб хто табе хто з тваіх прысніўся , які памёр, прыйдзі на магілку і пакачай яйка па зямельцы: «Мамачка мая, прыйдзі да мяне. Пажаліцца хачу». І раскажаш ёй усё. Сваё жыццё. І калі муж крыўдзіць, яна добрае што парадзіць. Перад тым як качаць яйка, патрымай яго ў руках. Заплюшчы вочы і падумай... Могілак не бойся, гэта калі вязуць нябожчыка, дык страшна. Зачыняюць вокны і дзверы, каб смерць не заляцела. Яна заўсёды ў белым, уся ў белым і з касой. Я сама не бачыла, але людзі баюць... Хто з ёю сустракаўся... Нельга ёй на вочы патрапіць. Смяецца: «Ха-ха-а-а...»

Як іду на могілкі, два яйкі нясу: чырвонае і чорнае. Адно ў жалобнай фарбе. Сяду каля мужа, там на помніку ягоная фатаграфія, не маладая і не старая, добрая фатаграфія: «Прыйшла, Андрэй. Давай пагаворым». Навіны ўсе раскажу. І хтосьці мяне пакліча... Аднекуль адтуль голас праляціць: «Эх, пані-спадарыня...» Пераведала Андрэя, іду да дачушкі... Дачушка памерла ў сорак гадоў, гэты рак да яе залез, куды мы яе ні вазілі, нічога не дапамагло. Маладая легла ў зямельку... Прыгожая... На тым свеце таксама ўсякія трэба: і старыя, і маладыя. І прыгожыя, і непрыгожыя. Нават маленькія. А хто гэтых туды кліча? Ну што яны там могуць пра гэты свет расказаць? Не разумею я... Я не разумею, але і вучоныя людзі зразумець не могуць. Прафесары ў горадзе. Можа, бацюшка ў царкве ведае. Сустрэну — запытаюся. Во-о-о... З дачушкай я размаўляю так: «Донечка мая! Красачка мая! З якімі птушачкамі прыляціш з далёкага краю? З салоўкамі ці з зязюлькамі? З якога боку цябе чакаць?» Вось так пяю ёй і чакаю. Раптам з'явіцца...

Дасць мне знак... Але на могілках заставацца да ночы нельга, да пяці гадзін трэба сыходзіць. Сонца мусіць яшчэ высока стаяць, а як пачне каціцца долу... Долу... Развітвайся... Яны адны там хочуць пабыць... Вось як мы. Аднолькава. У мёртвых сваё жыццё, як і ў нас. Я не ведаю, ды здагадку такую маю. Думаю так. А то... Яшчэ табе дадам... Калі памірае чалавек і доўга пакутуе, а ў хаце шмат людзей, дык усім трэба выйсці на двор, каб ён адзін застаўся. Нават маме з татам трэба выйсці і дзецям.

Ад самага досвітку хаджу сёння па двары, па гародзе і сваё жыццё ўзгадваю. Сыны ў мяне тут добрыя выраслі, як дубы. Шчасце было, ды мала, усё жыццё працавала. Колькі мае рукі адной бульбачкі перабралі! Перанеслі. Арала, сеяла... *(Паўтарае.)* Арала, сеяла... І цяпер... Рэшата з насеннем вынесу... Засталося ў мяне насенне — боб, сланечнікі, бурачкі... Пакідаю яго так, на голую зямельку. Няхай маё насенне жыве. І кветачкі па двары развею... А ці ведаеш ты, як пахнуць касмеі ў восеньскую ноч? Асабліва перад дажджом яны моцна пахнуць. І духмяны гарошак... Але надышла такая часіна, што чапаць насенне — марна: кінеш у зямлю, яно вырасце, сілы набярэ, ды не для чалавека. Такі час... Бог даў нам знак... А ў той дзень, калі Чарнобыль гэты пракляты здарыўся, я пчол прысніла, лічыць тых пчол — не злічыць. Лятуць і лятуць некуды. Рой за роем. А пчолы — гэта на пажар. Зямля загарыцца... Бог даў нам знак, што гасцюе чалавек на зямлі, не дома ён тут, а на гасцінах. На гасцінах мы тут... *(Заплакала.)*

—Мама! — паклікаў хтосьці з сыноў. — Мама! Машына прыехала...

## Маналог пра тугу па сюжэце і ролі

Напісалі ўжо дзясяткі кніг… Знялі фільмы. Адкаментавалі. А падзея ўсё роўна вышэй за нас, за любы каментарый…

Аднойчы я пачуў або прачытаў, што праблема Чарнобыля стаіць перад намі найперш як праблема самапазнання. З гэтым пагадзіўся, гэта супала з маімі пачуццямі. Я ўвесь час чакаю, што нехта разумны мне ўсё патлумачыць… Раскладзе па палічках… Як адукоўваюць мяне наконт Сталіна, Леніна, бальшавізму. Або бясконца дзяўбуць: «Рынак! Рынак! Свабодны рынак!» А мы… Людзі, выхаваныя ў свеце без Чарнобыля, жывём з Чарнобылем.

Я — прафесійны ракетчык, спецыяліст па ракетным паліве. Служыў на Байкануры. Праграмы «Космас», «Інтэркосмас» — гэта вялікі кавалак майго жыцця. Даеш неба! Даеш Арктыку! Даеш цаліну! Даеш космас! Разам з Гагарыным увесь савецкі свет паляцеў у космас, адарваўся ад зямлі… Усе мы! Я дагэтуль закаханы ў яго! Цудоўны рускі чалавек! З цудоўнай усмешкай! Нават смерць ягоная нейкая адрэжысараваная. Мары пра тое, каб лунаць, лётаць, быць свабодным… Жаданне кудысьці вырвацца… Гэта быў неверагодны час! Па сямейных абставінах я пераехаў у Беларусь, тут даслужваў. Калі я прыехаў… Заглыбіўся ў гэтую чарнобыльскую прастору, яна адкарэктавала мае пачуцці. Немагчыма было ўявіць нешта падобнае, хоць я заўсёды меў справу з самай сучаснай тэхнікай, з касмічнай тэхнікай… Цяжка пакуль сфармуляваць… Не паддаецца ўяўленню… Нешта… *(Задумваецца.)* А секунду назад здавалася, што злавіў сэнс… Секунду назад… Цягне філасофстваваць. З кім ні загаворыш пра Чарнобыль, усіх цягне філасофстваваць.

Аднак лепей я вам раскажу пра сваю працу. Чым мы толькі ні займаемся! Будуем царкву…. Чарнобыльскую царкву ў гонар абраза Божай Маці «Адшуканне загінулых». Збіраем ахвяраванні, наведваем хворых і тых, хто памірае. Складаем летапіс. Ствараем музей. Нейкі час думаў, што я не змагу, не з маім сэрцам працаваць на такім месцы. Далі першае даручэнне: «Вось грошы, падзялі іх на трыццаць пяць сем'яў. На трыццаць пяць удоў, у якіх мужы памерлі». Усе яны былі ліквідатары. Трэба справядліва. А як? У адной удавы — маленькая дзяўчынка, хворая, у другой удавы — двое дзяцей, трэцяя жанчына сама хворая, а яшчэ адна наймае кватэру, а ў іншай — чацвёра дзяцей. Уначы прачынаўся з думкаю: «Як жа мне нікога не абдзяліць?» Думаў і лічыў, лічыў і думаў. Уяўляеце?.. І не змог… Мы раздалі грошы ўсім пароўну, па спісе.

Але тое, што я ствараю, — гэта музей. Музей Чарнобыля. *(Маўчыць.)* Але часам мне здаецца, што тут будзе не музей, а пахавальнае бюро. Я служу ў пахавальнай камандзе! Сёння ўранні не паспеў паліто зняць, адчыняюцца дзверы, жанчына з парога галосіць… не галосіць, а крычыць: «Забярыце яго медаль і ўсе граматы! Забярыце ўсе прывілеі! Аддайце мужа!» Доўга крычала. Пакінула ягоны медаль, пакінула граматы. Ну, будуць яны ляжаць у музеі, пад шклом… Будуць на іх глядзець… Але крыку, яе крыку ніхто, апрача мяне, не чуў, толькі я, калі буду раскладваць гэтыя граматы, буду памятаць.

Цяпер памірае палкоўнік Ярашук… Хімік-дазіметрыст. Такі мужык быў, волат сапраўдны! Ляжыць паралізаваны. Жонка пераварочвае яго, як падушку… Корміць з лыжачкі… У яго і камяні ў нырках, трэба раздрабіць камяні, а ў нас няма грошай, каб аплаціць

аперацыю. Мы — жабракі, існуем на тое, што пададуць. А дзяржава паводзіць сябе, як махляр, яно гэтых людзей кінула. Памрэ — назавуць ягоным імем вуліцу, школу або вайсковую частку, але гэта калі ён памрэ.... Палкоўнік Ярашук... Хадзіў пешшу па зоне і вызначаў межы максімальных кропак забруджання, іначай кажучы — чалавека ў поўным сэнсе гэтага слова выкарыстоўвалі як біяробата. І ён гэта разумеў, але ён ішоў ад самай атамнай станцыі. Пешшу. З дазіметрычнымі прыборамі ў руках. Намацаў «пляму» — і рухаецца ўздоўж мяжы гэтай «плямы», каб дакладна перанесці на карту...

А салдаты, якія працавалі на самым даху рэактара? Разам на ліквідацыю наступстваў аварыі кінулі дзвесце дзесяць вайсковых частак, каля трохсот сарака тысяч вайскоўцаў. Самае пекла выпала тым, хто чысціў дах... Ім выдавалі свінцовыя фартухі, але фон ішоў знізу, а там чалавек быў непрыкрыты. Яны — у звычайных кірзавых ботах... За дзень па паўтары-дзве хвіліны на даху... А потым іх звальнялі з арміі, давалі грамату і прэмію — сто рублёў. І яны знікалі на бяскрайніх прасторах нашай радзімы. На даху зграбалі паліва і рэактарны графіт, асколкі бетону і арматуры... Дваццаць-трыццаць секунд, каб нагрузіць насілкі, і столькі ж, каб скінуць «смецце» з даху. Адны гэтыя спецыяльныя насілкі важылі сорак кілаграмаў. Вось уявіце: свінцовы фартух, маскі, гэтыя насілкі і шалёную хуткасць... Уяўляеце? У музеі ў Кіеве ляжыць муляж графіту, памерам з фуражку, кажуць, калі б ён быў сапраўдны, важыў бы шаснаццаць кілаграмаў, такі ён шчыльны, цяжкі. Радыекіраваныя маніпулятары часта адмаўляліся выконваць каманды або рабілі зусім не тое, бо іх электронныя схемы ў высокіх палях разбураліся. Самымі

надзейнымі робатамі былі салдаты. Іх ахрысцілі «зялёнымі робатамі» — па колеры вайсковай формы. Праз дах разбуранага рэактара прайшлі тры тысячы шэсцьсот салдатаў. Спалі на зямлі, яны ўсе расказваюць, як напачатку кідалі ў палатках на зямлю салому. Бралі яе тут жа сама, са стагоў каля рэактара.

Маладыя хлопцы... Яны цяпер таксама паміраюць, але яны разумеюць, што калі б не яны... Гэта яшчэ і людзі асаблівай культуры. Культуры подзвігу. Ахвяры.

Быў момант, калі існавала небяспека ядзернага выбуху, трэба было спусціць з-пад рэактара грунтавую ваду, каб туды не трапіў расплаў урану і графіту, разам з вадой яны далі б крытычную масу. Выбух — тры-пяць мегатон. Не толькі Кіеў і Мінск абязлюднелі б, але і велізарная частка Еўропы зрабілася б непрыдатнай для жыцця. Уяўляеце?! Паставілі задачу: хто нырне ў гэтую ваду і адчыніць там засаўку спускавога клапана? Абяцалі машыну, кватэру, дачу і ўтрыманне родных да канца іхніх дзён. Шукалі добраахвотнікаў. І яны знайшліся! Хлопцы давалі нырца, шмат разоў, і адчынілі гэтую засаўку, і ім далі на каманду сем тысяч рублёў. А пра абяцаныя машыны і кватэры забыліся. Дый не за барахло яны давалі нырца! Не за матэрыяльнае нешта, найменш за матэрыяльнае... не такі наш чалавек просты... Зразумелы... *(Расхваляваўся.)*

Гэтых людзей ужо няма. Толькі дакументы ў нашым музеі. Прозвішчы... Але калі б яны не зрабілі гэтага? Наша гатоўнасць да самаахвярнасці... У гэтым няма роўных...

Я тут спрачаўся з адным... Ён мне даказваў, што гэта звязанае з тым, што ў нас вельмі нізкая цана жыцця. Азіяцкі такі фаталізм. Чалавек, які ахвяруе сабой, не адчувае сябе ўнікальнай, непаўторнай асобай. Якой

больш ніколі не будзе. Туга па ролі. Раней ён быў чалавекам без тэксту, статыстам. Ён не меў сюжэта, служыў фонам. А тут раптам стаў галоўнай дзейнай асобай. Туга па сэнсе. Што такое наша прапаганда? Наша ідэалогія? Вам прапануюць памерці, але знайсці сябе, атрымаць сэнс жыцця. Узвышаюць. Даюць ролю! Смерць мае вялікую каштоўнасць, бо за смерцю — вечнасць. Ён даказваў мне. Даваў прыклады... Але я не згодны! Катэгарычна! Так, мы выхаваныя быць салдатамі. Нас так вучылі. Заўсёды мабілізаваныя, заўсёды гатовыя на нешта немагчымае. Мой бацька, калі я пасля школы хацеў пайсці ў грамадзянскі інстытут, быў уражаны: «Я — кадравы вайсковец, а ты будзеш насіць пінжак? Айчыну трэба абараняць!» Некалькі месяцаў са мной не размаўляў, пакуль я не падаў дакументы ў вайсковую вучэльню. Бацька — удзельнік вайны, ён памёр ужо. Практычна ніякай маёмасці не меў, як і ўсё яго пакаленне. Пасля яго нічога не засталося: ні дома, ні машыны, ні зямлі... Што я маю? Палявую афіцэрскую сумку, ён яе атрымаў перад фінскай кампаніяй, а ў ёй — ягоныя баявыя ордэны. Яшчэ ў поліэтыленавым пакеце ў мяне ляжаць трыста бацькавых лістоў з фронту, пачынаючы з сорак першага года, маці іх захавала. Усё, што засталося... Але, я лічу, гэта бясцэнны капітал!

Цяпер вы разумееце, якім мне бачыцца наш музей? Вунь там, у слоічку, зямля чарнобыльская... Жменька... Вунь шахцёрская каска... Таксама адтуль... Сялянскае начынне з зоны... Сюды нельга дазіметрыстаў пускаць. Фон! Але тут усё павінна быць сапраўдным! Без муляжоў! Нам павінны паверыць. А павераць толькі сапраўднаму, бо занадта шмат хлусні вакол Чарнобыля. Было і ёсць. Атам можна выкарыстоўваць не толькі

ў ваенных і мірных мэтах, але і ў асабістых. Чарнобыль аброс фондамі, камерцыйнымі структурамі…

Калі вы пішаце такую ўнікальную кнігу, павінны паглядзець наш унікальны відэаматэрыял. Па драбнічках збіраем. Чарнобыльскай хронікі, лічыце, няма! Яе не далі зняць, усё засакрэцілі. Калі камусьці што-небудзь удавалася паздымаць, то адпаведныя органы адразу забіралі гэты матэрыял і вярталі размагнічаныя стужкі. У нас няма хронікі, як праходзіла эвакуацыя людзей, як вывозілі жывёлу… Трагедыю здымаць забаранялася, здымалі — гераізм! Чарнобыльскія альбомы ўсё ж выдадзеныя, але колькі разоў кіна- і тэлеаператарам разбівалі камеры! Цягалі па інстанцыях. Каб сумленна расказаць пра Чарнобыль, трэба была мужнасць, яна і цяпер патрэбная. Паверце мне! Але вы павінны ўбачыць… Гэтыя кадры… Гэта ўжо вочы людзей, якія ведаюць, што адыходзяць ад нас. На адным фрагменце — ногі жанчыны, якая ўранні пасля катастрофы пайшла працаваць на свой гародзік каля атамнай станцыі. Ішла па роснай траве… Ногі нагадваюць рэшата, усе ў дзірачках да самых каленяў… Гэта трэба ўбачыць, калі вы пішаце такую кнігу…

Я прыходжу дадому і не магу ўзяць на рукі свайго маленькага сына. Мне трэба выпіць пяцьдзясят, а лепей сто грамаў гарэлкі, каб узяць на рукі дзіця…

Цэлы раздзел у музеі — верталётчыкі… Палкоўнік Вадалажскі… Герой Расіі, пахаваны на беларускай зямлі, у вёсцы Жукаў Луг. Калі ён атрымаў звышвелізарную дозу, павінен быў сысці, неадкладная эвакуацыя, але ён застаўся і падрыхтаваў яшчэ трыццаць тры экіпажы. Сам зрабіў сто дваццаць вылетаў, скінуў дзвесце-трыста тонаў грузу. Чатыры-пяць вылетаў на суткі пры вышыні трыста метраў над рэактарам, тэмпература

ў кабіне — да шасцідзесяці градусаў. А што рабілася ўнізе, калі мяхі з пяском скідвалі? Уяўляеце... Пекла... Актыўнасць дасягала тысячы восемсот рэнтгенаў у гадзіну. Пілотам рабілася кепска ў паветры. Каб кінуць дакладна, трапіць у цэль — у вогненнае жарала, — яны высоўвалі галовы з кабінаў... Глядзелі ўніз... Іншага спосабу не было... На паседжаннях урадавай камісіі проста, будзённа дакладвалі: «На гэта трэба пакласці два-тры жыцці. А на гэта — адно жыццё». Проста і будзённа...

Палкоўнік Вадалажскі памёр. У картцы ўліку дозаў, набраных над рэактарам, дактары яму запісалі... сем бэр. У сапраўднасці іх было шэсцьсот!

А чатырыста шахцёраў, якія ўдзень і ўначы дзяўблі тунэль пад рэактарам? Трэба было пракапаць тунэль, каб заліць туды вадкі азот і замарозіць зямельную падушку, як гэта называецца на інжынернай мове. Інакш рэактар пайшоў бы ў грунтовыя воды... Шахцёры Масквы, Кіева, Днепрапятроўска... Я нідзе пра іх не чытаў. А яны голыя, пры тэмпературы за пяцьдзясят градусаў штурхалі перад сабой ваганеткі на карачках. Там... Усё тыя ж сотні рэнтгенаў...

Цяпер яны паміраюць... Але калі б яны не зрабілі гэтага? Я лічу, што яны — героі, а не ахвяры вайны, якой нібыта і не было. Называюць яе аварыяй, катастрофай. А была вайна. І нашы чарнобыльскія помнікі падобныя да ваенных...

Ёсць рэчы, якія ў нас проста не абмяркоўваюць, славянская сарамлівасць. А вы павінны ведаць... Такую кнігу пішаце... У тых, хто працаваў на рэактары або ў непасрэднай блізкасці ад яго, звычайна адбывалася паражэнне... падобны сімптом у ракетчыкаў, гэта знаёмыя справы... звычайна паражалася мочапола-

вая сістэма. Мужчынскае багацце... Але пра гэта ў нас уголас не гавораць... Няма такога звычаю... Я аднойчы суправаджаў англійскага журналіста, ён падрыхтаваў вельмі цікавыя пытанні. Якраз на гэтую тэму, яго ацікавіў чалавечы бок праблемы. Што пасля гэтага адбываецца з чалавекам — дома, у побыце, у інтымным жыцці? Толькі ніводнай шчырай размовы не атрымалася. Папрасіў ён сабраць, напрыклад, верталётчыкаў... Паразмаўляць у мужчынскай кампаніі... Яны прыехалі, некаторыя пенсіянеры ўжо ў трыццаць пяць, сорак гадоў, аднаго прывезлі са зламанай нагой, у яго старэчы пералом, гэта значыць, пад уздзеяннем радыяцыі косці робяцца крохкімі. Яго прывезлі... Англічанін пытаецца ў іх: як вы цяпер у сям'і, са сваімі маладымі жонкамі? Верталётчыкі маўчаць, яны прыйшлі расказаць, як рабілі па пяць вылетаў на суткі. А тут... Пра жонак? Пра такое... Ён тады ўзяўся іх па адным выцягваць... Адказваюць дружна: здароўе нармальнае, дзяржава цэніць, у сям'і — любоў. Ніводны... Ніводны з іх не адкрыўся. Яны пайшлі, а я адчуваю, што ён прыгнечаны. «Цяпер ты разумееш, — кажа, — чаму вам ніхто не верыць? Вы падманваеце саміх сябе». А сустрэча гэтая адбывалася ў кавярні, абслугоўвалі дзве прыгожанькія афіцыянткі, яны ўжо ўсё прыбіраюць са сталоў, і ён у іх пытаецца: «А вы можаце мне адказаць на некалькі пытанняў?» І гэтыя дзве дзеўчынёшкі яму ўсё выклалі. Ён: «Вы хочаце выйсці замуж?» — «Хочам, але толькі не тут. Кожная з нас марыць выйсці замуж за іншаземца, каб нарадзіць здаровае дзіця». Тады ён пасмялеў: «Ну а ў вас ёсць партнёры? Як яны? Яны вас задавальняюць? Вы самі разумееце, што я маю на ўвазе?» «Вось тут сядзелі з вамі хлопцы, — смяюцца яны, — верталётчыкі. Пад два метры. Медалямі звінелі. Яны для прэзідыумаў добрыя, але не

для пасцелі». Уяўляеце… Сфатаграфаваў ён гэтых дзяўчат, а мне паўтарыў тую самую фразу: «Цяпер ты разумееш, чаму вам ніхто не верыць? Вы падманваеце саміх сябе».

Паехалі мы з ім у зону. Статыстыка вядомая: вакол Чарнобыля — восемсот могільнікаў. Ён чакаў нейкіх фантастычных інжынерных збудаванняў, а гэта — звычайныя ямы. Ляжыць у іх «рыжы лес», высечаны вакол рэактара на ста пяцідзесяці гектарах (у першыя два дні пасля аварыі сосны і яліны зрабіліся чырвонымі, а затым рыжымі). Ляжаць тысячы тонаў металу і сталі, дробныя трубы, спецвопратка, бетонныя канструкцыі… Ён паказаў мне здымак з англійскага часопіса. Панарамны. Зверху… Тысячы адзінак аўтатрактарнай і авіяцыйнай тэхнікі… Пажарныя машыны і машыны «хуткай дапамогі»… Самы буйны могільнік каля рэактара. Ён хацеў яго зняць — ужо цяпер — праз дзесяць гадоў. Яму абяцалі за гэты здымак вялікія грошы. І вось мы кружляем з ім, кружляем, і адзін начальнік нас адсылае да другога — то карты няма, то дазволу. Маталіся, пакуль да мяне не дайшло: няма гэтага могільніка, яго ўжо не існуе ў рэальнасці, толькі ў справаздачах, даўно расцягнулі па рынках, на запчасткі — па калгасах і па сваіх дварах. Раскралі, вывезлі. Англічанін гэтага зразумець не мог. Не паверыў! Калі я сказаў яму ўсю праўду, ён не паверыў! І я цяпер, чытаючы нават самы смелы артыкул, не веру, заўсёды ў падсвядомасці круціцца думка: а раптам гэта таксама хлусня? Або нейкія байкі? Згадаць трагедыю зрабілася ўжо завядзёнкай… Зацяганым штампам! Жахалкай! *(Сканчвае і надоўга замаўкае.)*

Цягну ўсё ў музей… Збіраю… Але, бывае, думаю: «Кінуць! Уцячы!» Ну як вытрымаць?!

Была ў мяне размова з маладым святаром…

Мы стаялі каля свежай магілы старшыны Сашы Ганчарова… З тых, хто быў на даху рэактара… Снег. Вецер. Надвор'е лютае. Святар служыць паніхіду. Чытае малітву. З непакрытай галавой. «Вы як быццам і не адчувалі холаду?» — запытаўся я потым. «Не адчуваю, — адказаў ён, — у такія хвіліны я ўсемагутны. Ніводны царкоўны абрад не дае мне такой энергіі, як паніхіда». Я гэта запомніў — словы чалавека, які заўсёды каля смерці. Не раз пытаўся ў замежных журналістаў, якія прыязджаюць да нас, шмат хто — зноў і зноў, чаму яны едуць, просяцца ў зону? Глупствам было б думаць, што дзеля адных грошай або кар'еры. «Нам падабаецца ў вас, — прызнаваліся, — атрымліваем тут магутны энергетычны зарад». Уяўляеце?.. Нечаканы адказ, праўда? Для іх, напэўна, наш чалавек, ягоныя пачуцці, яго свет — нешта яшчэ нязведанае. Загадкавая руская душа… Самі мы таксама любім выпіць і спрачацца пра гэта на кухні… Адзін з маіх сяброў аднойчы сказаў: «Вось станем сытымі. Развучымся пакутаваць. Каму мы будзем цікавыя?» Я не магу забыць гэтых слоў… Але я так і не высветліў, што іншым у нас саміх падабаецца: мы самі? Або тое, што пра нас можна напісаць? Праз нас — зразумець?

Што ж гэта мы ўсё круцімся вакол смерці?

Чарнобыль… У нас іншага свету ўжо не будзе… Спачатку, калі вырвалі зямлю з-пад ног, выплёсквалі гэты боль шчыра, а цяпер прыйшло ўсведамленне, што іншага свету няма і падацца няма куды. Пачуццё трагічнай аселасці на гэтай чарнобыльскай зямлі, зусім іншае светаадчуванне. З вайны вяртаецца «страчанае» пакаленне… Успомнім Рэмарка… А з Чарнобылем жыве «разгубленае» пакаленне… Мы разгубіліся… Нязменнымі

засталіся толькі чалавечыя пакуты… Наш адзіны капітал. Неразменны!

Я прыходжу дадому… Пасля ўсяго… Жонка слухае мяне. А потым ціха кажа: «Я кахаю цябе, але сына табе не аддам. Нікому яго не аддам. Ні Чарнобылю, ні Чачні… Нікому!» У ёй пасяліўся ўжо гэты страх…

*Сяргей Васільевіч Собалеў, намеснік старшыні праўлення Рэспубліканскай асацыяцыі «Шчыт Чарнобыля»*

# НАРОДНЫ ХОР

*Клаўдзія Рыгораўна Барсук, жонка ліквідатара; Тамара Васільеўна Белавокая, доктар; Кацярына Фёдараўна Баброва, перасяленка з горада Прыпяць; Андрэй Буртыс, журналіст; Іван Навумавіч Вяргейчык, педыятр; Алена Ільінічна Варанько, жыхарка гарадскога пасёлка Брагін; Святлана Говар, жонка ліквідатара; Наталля Максімаўна Ганчарэнка, перасяленка; Тамара Ільінічна Дубікоўская, жыхарка гарадскога пасёлка Нароўля; Альберт Мікалаевіч Зарыцкі, доктар; Аляксандра Іванаўна Краўцова, доктар; Элеанора Іванаўна Ладуценка, радыёлаг; Ірына Юр'еўна Лукашэвіч, акушэрка; Антаніна Максімаўна Ларывончык, перасяленка; Анатоль Іванавіч Палішчук, гідраметэаролаг; Марыя Якаўлеўна Савельева, маці; Ніна Ханцэвіч, жонка ліквідатара.*

«Даўно не бачу шчаслівых цяжарных жанчын... Шчаслівых маці...

Вось яна толькі што нарадзіла. Апрытомнела... Кліча: "Доктар, пакажыце мне! Прынясіце!" Дакранаецца да галоўкі, лобіка, цельца. Пальчыкі лічыць... На нагах, на ручках... Правярае. Хоча ўпэўніцца: "Доктар, у мяне нармальнае дзіця нарадзілася? Усё добра?" Прынясуць яго карміць... Баіцца: "Я недалёка ад Чарнобыля жыву... Я пад 'чорны дождж' патрапіла..."

Сны расказваюць: то цялятка нарадзіла з васьмю ножкамі, то шчаня з галавой вожыка... Такія дзіўныя сны. Раней такіх сноў у жанчын не было. Я не чула.

У мяне трыццаць гадоў акушэрскага стажу...»

«Я ўсё жыццё жыву ў слове... Са словам...

Выкладаю ў школе рускую мову і літаратуру. Гэта, здаецца, было на пачатку чэрвеня. Ішлі экзамены. Раптам дырэктар школы збірае нас і абвяшчае: "Заўтра ўсім прыйсці з рыдлёўкамі". Высветлілася: мы павінны зняць верхні забруджаны слой зямлі вакол школьных будынкаў, а потым прыедуць салдаты і заасфальтуюць. Пытанні: "Якія выдадуць ахоўныя сродкі? Ці прывязуць спецыяльныя касцюмы, рэспіратары?" Адказалі, што не прывязуць. "Возьмеце рыдлёўкі і будзеце капаць". Толькі двое маладых настаўнікаў адмовіліся, астатнія пайшлі і капалі. Прыгнечанасць і ў той самы час пачуццё выкананага абавязку, жыве гэта ў нашай душы: быць там, дзе цяжка, небяспечна, абараняць радзіму. Хіба я нечаму іншаму вучыла сваіх вучняў — толькі гэтаму: пайсці, кінуцца ў агонь, абараняць, ахвяраваць. Літаратура, якую я выкладала, яна не пра жыццё, яна пра вайну. Пра смерць. Шолахаў, Серафімовіч, Фурманаў, Фадзееў... Барыс Палявы... Толькі двое маладых настаўнікаў адмовіліся. Але яны з новага пакалення. Гэта ўжо іншыя людзі.

Капалі зямлю ад раніцы да вечара. Калі вярталіся дадому, здавалася дзіўным, што працуюць гарадскія крамы, жанчыны купляюць панчохі, духі. Мы ўжо былі ва ўладзе ваенных адчуванняў. І было куды больш зразумела, калі раптам з'явіліся чэргі па хлеб, соль, запалкі... Усе ўзяліся сушыць сухары... Мылі падлогу па пяцьшэсць разоў на дзень, заканапацілі вокны. Увесь час слухалі радыё. Гэтыя паводзіны здаліся мне знаёмымі, хоць я нарадзілася пасля вайны. Спрабавала аналізаваць свае пачуцці і ўразілася, наколькі хутка перабудавалася мая псіхіка, якім неспасцігальным чынам мне аказаўся знаёмы ваенны досвед. Магла ўявіць, як кіну

дом, як мы з дзецьмі пераедзем у іншае месца, якія рэчы возьмем, што напішу маме. Хоць вакол ішло звычайнае жыццё, па тэлевізары паказвалі кінакамедыі.

Нам памяць падказвала... Мы заўсёды жылі ў жаху, мы ўмеем жыць у жаху, гэта — нашае жыццёвае асяроддзе.

Тут нашаму народу няма роўных...»

«Я не была на вайне, але мне гэта нагадала...

Салдаты заходзілі ў вёскі і займаліся эвакуацыяй людзей. Вясковыя вуліцы загаціла вайсковая тэхніка: бронетранспарцёры, грузавікі пад зялёным брызентам, нават танкі. Людзі развітваліся са сваімі дамамі ў прысутнасці салдатаў, дзейнічала гэта гнятліва, асабліва на тых, хто перажыў вайну. Спачатку вінавацілі рускіх — на іх ляжыць віна, іхняя станцыя... Затым: "Камуністы вінаватыя..." Сэрца заходзілася ад незямнога страху...

Нас падманулі. Паабяцалі, што мы праз тры дні вернемся. Пакінулі мы дом, лазню, разьблёны калодзеж, стары сад. Уначы перад ад'ездам я выйшла ў сад і ўбачыла, як раскрыліся кветкі. А раніцой яны ўсе апалі. Мама не змагла перажыць перасяленне. Праз год памерла. У мяне два сны паўтараюцца... Першы — бачу наш пусты дом, а другі — каля нашых весніц: чырвоныя вяргіні... і стаіць мая мама... Жывая. І ўсміхаецца.

Вельмі часта параўноўваюць з вайной. Але вайну... яе можна зразумець... Пра вайну мне бацька расказваў, я кнігі чытала... А тут? Засталіся ад нашай вёскі могілкі: на адных людзі ляжаць, гэта старыя могілкі, на другіх — расстраляныя каты і сабакі, якіх мы кінулі, на трэціх — нашыя дамы.

Нават нашыя дамы пахавалі...»

«Кожны дзень… Кожны дзень я блукаю па сваіх успамінах…

По тых самых вуліцах, міма тых самых дамоў. Такі ціхі ў нас быў гарадок. Ніякіх заводаў, адна цукерачная фабрыка. Нядзеля… Ляжу, загараю. Бяжыць мама: “Дзетачка, Чарнобыль узарваўся, людзі па дамах хаваюцца, а ты пад сонцам”. Я пасмяялася — ад Чарнобыля да Нароўлі сорак кіламетраў.

Увечары каля нашага дома спыніліся “Жыгулі”, заходзіць мая знаёмая з мужам: яна — у хатнім халаце, ён — у спартыўным трыко і ў нейкіх старых тэпцях. Праз лес, палявымі дарогамі яны ехалі з Прыпяці. Уцякалі. На дарогах дзяжурыла міліцыя, вайсковыя пасты, нікога не выпускалі. Першае, што яна мне закрычала: “Трэба тэрмінова шукаць малако і гарэлку! Тэрмінова!” Крычала і крычала: “Толькі што новую мэблю купілі, новы халадзільнік. Я сабе футра пашыла. Усё пакінулі, абвязалі цэлафанам… Ноч не спалі… Што будзе? Што будзе?” Муж яе супакойваў. Расказваў, што над горадам лётаюць верталёты, а вайсковыя машыны паліваюць вуліцы нейкай пенай. Мужчын забіраюць на паўгода ў армію, як на вайну. Днямі сядзелі каля тэлевізара і чакалі, калі Гарбачоў выступіць. Улада маўчала…

Толькі калі адгрымелі майскія святы, Гарбачоў сказаў: не хвалюйцеся, маўляў, таварышы, сітуацыя пад кантролем… Пажар, проста пажар. Нічога асаблівага… Людзі там жывуць, працуюць…

Мы верылі…»

«Такія карціны… Баяліся ўначы спаць… Заплюшчыць вочы…

Гналі жывёлу… Усю жывёлу з выселеных вёсак гналі да нас у райцэнтр на прыёмныя пункты. Ашалелыя

каровы, авечкі, парасяты бегалі па вуліцах… Хто хацеў, той лавіў… З мясакамбіната машыны з тушамі ішлі на станцыю Калінкавічы, адтуль грузілі на Маскву. Масква не прымала. І гэтыя вагоны, ужо могільнікі, вярталіся назад да нас. Цэлыя эшалоны. Тут іх закопвалі. Пах гнілога мяса праследаваў па начах… “Няўжо так пахне атамная вайна?” — думала я. Вайна павінна пахнуць дымам…

У першыя дні нашых дзяцей вывозілі ўначы, каб менш людзей бачыла. Утойвалі бяду, хавалі. А народ усё адно даведваўся. Выносілі на дарогу да нашых аўтобусаў бітончыкі з малаком, пяклі булачкі.

Як у вайну… З чым яшчэ параўнаць?»

«Нарада ў аблвыканкаме… Ваенная абстаноўка…

Усе чакаюць выступу начальніка грамадзянскай абароны, бо калі хто-небудзь і ўспомніў што пра радыяцыю, дык толькі нейкія абрыўкі з падручніка фізікі за дзясяты клас. Ён выходзіць на трыбуну і пачынае казаць тое, што напісана ў кнігах і падручніках пра атамную вайну: атрымаўшы пяцьдзясят рэнтгенаў, салдат павінен выйсці з бою… Як будаваць схованкі, як карыстацца супрацьгазам, пра радыус выбуху… Але тут не Хірасіма і Нагасакі, тут усё па-іншаму… Мы ўжо здагадваемся…

У забруджаную зону вылецелі на верталёце. Рыштунак паводле інструкцыі: споднай бялізны няма, камбінезон з бавоўны, як у кухара, на ім ахоўная плёнка, рукавіцы, марлевая павязка. Абчапляныя ўсе прыборамі. Спускаемся з неба каля вёскі, а там дзятва купаецца, як вераб’і, у пяску. У роце каменьчык, галінка. Малыя — без штаноў. З голымі дупцямі… А ў нас загад: з народам у кантакт не ўступаць, паніку не падымаць…

І вось цяпер жыву з гэтым…»

«Па тэлевізары раптам замільгацелі перадачы…

Адзін з сюжэтаў: бабка падаіла карову, наліла малако ў слоік, рэпарцёр падыходзіць з вайсковым дазіметрам, прыкладае да слоіка… Вось глядзіце, абсалютная норма, а да рэактара дзесяць кіламетраў. Паказваюць раку Прыпяць… Купаюцца, загараюць… Воддаль відаць рэактар і клубы дыму над ім… Каментарый: заходнія галасы сеюць паніку, пашыраюць наўмысную хлусню пра аварыю. І зноў з гэтым дазіметрам — то да талеркі юшкі яго прыкладаюць, то да шакаладкі, то да пончыкаў каля адчыненай крамкі. Гэта быў падман. Вайсковыя дазіметры, якія былі ў той час на ўзбраенні нашай арміі, не разлічаныя на праверку прадуктаў, яны толькі мераюць фон.

Такая колькасць хлусні, з якой звязаны ў нашай свядомасці Чарнобыль, была, відаць, толькі ў сорак першым… Пры Сталіне…»

«Хацела нарадзіць ад кахання…

Мы чакалі першае дзіця. Муж хацеў хлопчыка, а я — дзяўчынку. Дактары ўгаворвалі мяне: “Трэба адважыцца на аборт. Ваш муж доўгі час знаходзіўся ў Чарнобылі”. Ён — шафёр, і яго ў першыя дні туды прызвалі. Вазіў пясок і бетон. Але я нікому не верыла. Не хацела верыць… Я чытала ў кнігах, што каханне можа ўсё перамагчы. Нават смерць.

Дзіця нарадзілася мёртвае. І без двух пальчыкаў. Дзяўчынка. Я плакала: “Ну няхай бы ў яе хоць пальчыкі былі. Яна ж — дзяўчынка…”»

«Ніхто не разумеў, што адбылося…

Затэлефанавала ў ваенкамат, мы — медыкі, усе вайсковаабавязаныя, прапанавала сваю дапамогу. Не

памятаю прозвішча, але званне было маёр, адказаў мне: "Нам трэба маладыя". Я спрабавала пераконваць: "Маладыя дактары, па-першае, не гатовыя, а па-другое, яны трапляюць у большую небяспеку. Малады арганізм больш адчувальны да ўздзеяння радыяцыі". Адказ: "У нас загад — браць маладых".

Памятаю… У хворых пачалі дрэнна загойвацца раны. Яшчэ… Той першы радыеактыўны дождж, пасля якога пажаўцелі лужыны. Зрабіліся жоўтымі на сонцы. Цяпер гэты колер непакоіць заўсёды. З аднаго боку, свядомасць ні да чаго такога аказалася не гатовая, а з другога — мы ж самыя лепшыя, самыя незвычайныя, у нас самая вялікая і цудоўная краіна. Мой муж, чалавек з вышэйшай адукацыяй, інжынер, ён цалкам сур'ёзна пераконваў мяне, што гэта тэрарыстычны акт. Варожая дыверсія. Мы так думалі… Мы так былі выхаваныя… Але я ўспамінала, як ехала ў цягніку з адным гаспадарнікам і ён расказваў мне пра будаўніцтва Смаленскай атамнай станцыі: колькі цэменту, дошак, цвікоў, пяску сплывала з аб'екта ў навакольныя вёскі. За грошы, за бутэльку гарэлкі…

У вёсках… На заводах… Выступалі работнікі райкамаў партыі, ездзілі, размаўлялі з народам. Але ніводны з іх не здольны быў адказаць на пытанні, што такое дэзактывацыя, як абараніць дзяцей, якія каэфіцыенты пераходу радыенуклідаў у харчовыя ланцужкі? Пра альфа- і гама-часціцы, пра радыебіялогію, пра выпраменьванні, якія іанізуюць, не кажучы ўжо пра ізатопы. Для іх гэта было нешта з іншага свету. Яны чыталі лекцыі пра гераізм савецкіх людзей, сімвалы ваеннай мужнасці, падкопы заходніх спецслужбаў…

Узяла слова на партсходзе: дзе прафесіяналы? Фізікі? Радыёлагі? Мяне прыстрашылі, што забяруць партбілет…»

«Шмат было невытлумачальных смерцяў... Нечаканых...

У маёй сястры балела сэрца... Калі яна пачула пра Чарнобыль, сказала: "Вы перажываеце, а я — не". Яна памерла праз некалькі месяцаў... Дактары нічога не растлумачылі. А з яе дыягназам яшчэ доўга можна было жыць...

Кажуць... У старых жанчын з'яўлялася ў грудзях малако, як у парадзіх. На медыцынскай тэрміналогіі гэтая з'ява называецца "рэлаксацыя". А для сялян? Божае пакаранне... Вось здарылася такое з адзінокай бабкай, якая жыла без мужа і без дзяцей. Збажаволіла. Хадзіла па вёсцы і гушкала што-небудзь на руках, возьме палена ці дзіцячы мячык, абвяжа хусткай... Люлі-люлі... Баю-бай...»

«Я баюся жыць на гэтай зямлі...

Далі дазіметр, а навошта ён мне? Памыю бялізну, яна ў мяне бялюткая — дазіметр звініць. Прыгатую вячэру, спяку пірог — звініць. Засцялю пасцель — звініць. Навошта ён мне? Я кармлю дзяцей і плачу. "Чаму ты, мамка, плачаш?"

Двое дзяцей — двое хлопчыкаў. Увесь час з імі па бальніцах. Па дактарах. Старэйшы: ці то дзяўчынка, ці то хлопчык. Лысенькі. Я — і да прафесараў з ім, і да бабак. Да шаптух, знахарак. Самы маленькі ў класе. Яму нельга бегаць. Гуляць з іншымі дзецьмі ў гульні, калі хто незнарок ударыць — пацячэ кроў, ён можа памерці. Хвароба крыві. Я назву нават не вымаўлю. Ляжу з ім у бальніцы і думаю: "Памрэ". Потым зразумела, што так думаць нельга, а то смерць пачуе. Плакала ў прыбіральні. Усе мамы ў палатах не плачуць, а ў туалетах, у ваннай. Вярнулася вясёлая:

—У цябе ўжо шчочкі паружавелі. Ачуньваеш.

—Мамачка. Забяры мяне з бальніцы. Я тут памру. Тут усе паміраюць.

—Дзе мне плакаць? У туалеце? А там чарга... Там усе такія, як я...»

«На Радаўніцу... У дзень памінання продкаў...

Нас пускаюць на могілкі... А заходзіць у свае двары, міліцыя загадвае, няможна. На верталётах яны над намі лётаюць. Дык мы хоць здаля паглядзім на нашыя хаты... Перахрысцім іх...

Прывязу галінку бэзу з роднага месца. І яна цэлы год у мяне стаіць...»

«Раскажу вам, што такое чалавек... Савецкі...

У "забруджаных" раёнах... У першыя гады магазіны завалілі грэчкай, кітайскай тушанінай, і людзі радаваліся, хваліліся, маўляў, нас цяпер адсюль не выганіш. Нам тут добра! Забрудзілася глеба нераўнамерна, у адным калгасе і "чыстыя", і "брудныя" палі. Тым, хто працуе на "брудных", плацяць больш, і ўсе просяцца туды. На "чыстыя" ехаць адмаўляюцца...

Нядаўна быў у мяне на гасцінах брат з Далёкага Усходу. "Вы, — кажа, — тут, як 'чорныя скрынкі'"... Людзі — "чорныя скрынкі"... "Чорныя скрынкі" ёсць на кожным самалёце, яны запісваюць усю інфармацыю. Пасля авіякатастрофы — шукаюць "чорныя скрынкі".

Мы думаем, што жывём як усе... Ходзім, працуем... Кахаем... Не! Мы запісваем інфармацыю для будучыні...»

«Я — дзіцячы доктар...

У дзяцей усё іначай, чым у дарослых. У іх, напрыклад, няма страху смерці... Гэты вобраз у іх не ўзнікае.

Яны ўсё пра сябе ведаюць: дыягназ, назвы ўсіх працэдур, лекаў. Ведаюць больш, чым іх мамы. А іхнія гульні? Бегаюць па палатах адно за адным і крычаць: "Я — радыяцыя! Я — радыяцыя!" Мне здаецца, калі яны паміраюць, у іх такія здзіўленыя твары... Яны ў непаразуменні...

Ляжаць з такімі здзіўленымі тварамі...»

«Дактары мяне папярэдзілі, што мой муж памрэ... У яго рак крыві...

Ён захварэў, калі вярнуўся з чарнобыльскай зоны. Праз два месяцы. Яго з завода туды паслалі. Прыйшоў з начной змены:

— Раніцой ад'язджаю...

— Што ты там будзеш рабіць?

— Працаваць у калгасе.

Складалі сена ў пятнаццацікіламетровай зоне. Выбіралі буракі. Капалі бульбу.

Вярнуўся. Паехалі да ягоных бацькоў. Дапамагаў бацьку тынкаваць печ. І там паваліўся. Выклікалі "хуткую", адвезлі ў бальніцу — смяротны ўзровень лейкацытаў. Адправілі ў Маскву.

Вярнуўся адтуль з адной думкай: "Я памру". Пачаў больш маўчаць. Пераконвала. Прасіла. Словам маім не верыў. Тады я нарадзіла яму дачку, каб паверыў. Я сны свае не разгадваю... То мяне вядуць на эшафот, то я ўся ў белым... Соннік не чытаю. Прачнуся ўранні, пагляджу на яго: як жа гэта я застануся адна? Хоць бы дзяўчынка падрасла ды яго запомніла. Яна маленькая. Нядаўна пайшла... Бяжыць да яго: "Та-та-а..." Адпрэчваю гэтыя думкі...

Калі б я ведала... Зачыніла б усе дзверы, стала б на парозе. Замкнулася б на дзесяць замкоў...»

«Ужо два гады жывём з маім хлопчыкам у бальніцы...

Маленькія дзяўчынкі ў бальнічных халатах гуляюць у лялькі. Лялькі ў іх заплюшчваюць вочы. Так лялькі паміраюць.

— Чаму лялькі паміраюць?

— Таму што гэта нашы дзеці, а нашы дзеці жыць не будуць. Яны народзяцца і памруць.

Майму Арцёмку сем гадоў. А выглядае на пяць.

Заплюшчыць вочы. І я думаю, што заснуў. Тады заплачу — ён жа не бачыць.

А ён адгукаецца:

— Мама, я паміраю?

Засне і амаль не дыхае. Я стану перад ім на каленях. Перад ложачкам.

— Арцёмка, расплюшчы вочкі... Скажы што-небудзь...

“Ты яшчэ цёпленькі...” — думаю сама сабе.

Расплюшчыць вочы. Зноў засне. І так ціха. Нібыта памёр.

— Арцёмка, расплюшчы вочкі...

Я не даю яму памерці...»

«Нядаўна святкавалі Новы год... Зрабілі добры стол. Усё сваё: вяндліна, сала, мяса, гурочкі марынаваныя. Адно хлеб з магазіна. Нават гарэлка свая, самаробная. Сваё, як у нас смяюцца. Чарнобыльскае. З цэзіем, стронцыем упрыкуску. А дзе што ўзяць? Магазіны ў вёсках з пустымі прылаўкамі, а калі што і з’явіцца, дык з такімі, як у нас, заробкамі і пенсіямі не падступішся.

Прыйшлі да нас госці. Нашы добрыя суседзі. Маладыя. Адзін — настаўнік, другі — калгасны механік з жонкай. Выпілі. Закусілі. І пачаліся песні. Не згаворваючыся, заспявалі рэвалюцыйныя песні. Песні пра

вайну. “Утро красит нежным светом стены древнего Кремля” — маю любімую. І атрымаўся цудоўны вечар. Такі, як раней.

Напісала пра гэта сыну. Ён у нас вучыцца ў сталіцы. Студэнт. Атрымліваю адказ: “Мама, я ўявіў гэтае відовішча — чарнобыльская зямля. Наша хата. Ззяе навагодняя ялінка… А людзі за сталом пяюць рэвалюцыйныя і ваенныя песні, быццам не было ў іх ні ГУЛагу, ні Чарнобыля…”

Мне зрабілася страшна не за сябе, а за сына. Яму няма куды вярнуцца…»

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

# ЗАХАПЛЕННЕ СМУТКАМ

## Маналог пра тое, чаго мы не ведалі: смерць можа быць такой прыгожай

У першыя дні галоўнае пытанне: хто вінаваты? Нам патрэбны быў вінаваты…

Потым, калі мы даведаліся больш, пачалі думаць: што рабіць? Як уратавацца? Цяпер, скарыўшыся з думкай, што гэта не на год і не на два, а на шмат пакаленняў, пачалі ў думках вяртацца назад, перагортваць старонку за старонкай…

Гэта здарылася ў ноч з пятніцы на суботу… Раніцой ніхто нічога не падазраваў. Выправіла ў школу сына, муж пайшоў у цырульню. Гатую абед. Муж хутка вярнуўся… Вярнуўся са словамі: «На атамнай нейкі пажар. Загад: не выключаць радыё». Я забыла сказаць, што мы жылі ў Прыпяці, недалёка ад рэактара. Дагэтуль перад вачыма — ярка-малінавае зарыва, рэактар неяк з сярэдзіны свяціўся. Неверагодны колер. Гэта быў не звычайны пажар, а нейкае свячэнне. Прыгожа. Калі забыць пра астатняе, то вельмі прыгожа. Нічога падобнага я і ў кіно не бачыла, нават ніякага параўнання. Увечары людзі высыпалі на балконы, у каго не было — ішлі да сяброў, знаёмых. У нас дзявяты паверх, усё цудоўна відаць. Наўпрост кіламетры тры. Выносілі дзяцей, падымалі на руках: «Паглядзі! Запомні!» І гэта людзі, якія на рэактары працавалі…. Інжынеры, рабочыя… Былі і настаўнікі фізікі… Стаялі ў чорным пыле… Размаўлялі. Дыхалі. Любаваліся. Некаторыя за дзясяткі кіламетраў прыязджалі на машынах, роварах, каб паглядзець. Мы не ведалі, што смерць можа быць такой прыгожай. Але

я не сказала б, што яна не мела паху. Не вясновы і не восеньскі пах, а нешта зусім іншае, і не пах зямлі… Не… Пяршыла ў горле, на вачах — слёзы самі сабой накручваліся. Я не спала ўсю ноч і чула, як тупалі наверсе суседзі, таксама без сну. Штосьці яны там перацягвалі, стукалі, магчыма, рэчы пакавалі. Заклейвалі вокны. Глушыла галаўны боль цытрамонам. Уранні, калі разднела, азірнулася навокал, гэта я не цяпер прыдумала, не потым, а тады адчула: нешта не так, нешта памянялася. Назаўсёды. А восьмай раніцы па вуліцах ужо хадзілі вайскоўцы ў супрацьгазах. Калі мы ўбачылі ў горадзе салдатаў і вайсковую тэхніку, мы не спалохаліся, а, наадварот, супакоіліся. Калі армія прыйшла на дапамогу, усё будзе нармальна. Мы ніякага паняцця не мелі, што мірны атам таксама забівае… Што ўвесь горад мог не прачнуцца ў тую ноч… Пад вокнамі хтосьці смяяўся, грала музыка.

Пасля абеду радыё пачало абвяшчаць, каб рыхтаваліся да эвакуацыі: вывезуць на тры дні, памыюць, праверацць. Як цяпер чую голас дыктара: «эвакуацыя ў бліжэйшыя вёскі», «хатніх жывёл не браць», «збірацца каля пад'езда'». Дзецям сказалі абавязкова ўзяць з сабой падручнікі. Муж усё ж паклаў у партфель дакументы і нашы вясельныя фатаграфіі. А я адзінае, што прыхапіла, гэта газавую хустачку на выпадак дрэннага надвор'я…

З першых дзён адчулі, што мы — чарнобыльцы, цяпер ужо адрынутыя. Нас баяцца. Аўтобус, у якім мы ехалі, спыніўся нанач у нейкай вёсцы. Людзі спалі на падлозе ў школе, у клубе. Не было дзе прыткнуцца. І адна жанчына запрасіла нас да сябе: «Хадзіце, я пасцялю на ложку. Шкада вашага хлопчыка». А другая, якая стаяла побач, адцягвала яе ад нас: «Ты што, звар'яцела?! Яны — заразныя». Калі мы пасяліліся ўжо ў Магі-

лёве і сын пайшоў у школу, у першы ж дзень ён прыбег дадому са слязамі… Яго пасадзілі разам з дзяўчынкай, а тая не хоча, бо ён радыяцыйны, і калі з ім сядзець, то можна памерці. Сын вучыўся ў чацвёртым класе, і так атрымалася, што ён, чарнобыльскі, быў у гэтым класе адзін. Яны ўсе яго баяліся, называлі «светлячком»… «чарнобыльскім вожыкам»… Я спалохалася, што ў яго так хутка скончылася дзяцінства.

Мы выязджалі з Прыпяці, а насустрач нам ішлі вайсковыя калоны. Бронетэхніка. Тут зрабілася страшна. Незразумела і страшна. Але мяне не пакідала адчуванне, што ўсё гэта адбываецца не са мной, а з некім іншым. Дзіўнае адчуванне. Сама плакала, шукала ежу, начлег, абдымала і супакойвала сына, а ўнутры — нават не думка, заўсёднае пачуццё: я — глядач. Я гляджу праз шкло… Бачу кагосьці іншага… Толькі ў Кіеве нам выдалі першыя грошы, а купіць за іх нічога нельга: сотні тысяч людзей падняли з месца, усё скупілі, з'елі. Шмат у каго — інфаркты, інсульты, проста там — на вакзалах, у аўтобусах. Мяне выратавала мая мама. За сваё доўгае жыццё яна не раз страчвала дом, нажытую маёмасць. Упершыню яе рэпрэсавалі ў трыццатыя гады, забралі ўсё: карову, каня, хату. Другі раз — пажар, толькі мяне, маленькую, з агню выхапіла. «Трэба пераЖыць, — суцяшала яна. — Мы ж самі — жывыя».

Успомніла… Сядзім у аўтобусе. Плачам. Мужчына на першым сядзенні гучна лае жонку: «Якая ж ты дурная! Усе хоць нейкія рэчы ўзялі, а мы з табой трохлітровымі слоікамі загрузіліся». Жонка ягоная вырашыла, што калі ўжо яны едуць на аўтобусе, то яна па дарозе перадасць сваёй маці пустыя слоікі для марынадаў. Каля іх ляжалі велізарныя поўныя сеткі, мы ўсю дарогу аб іх спатыкаліся. Так з гэтымі слоікамі і прыехалі ў Кіеў.

Я спяваю ў царкоўным хоры. Евангелле чытаю. Хаджу ў царкву, бо толькі там гавораць пра вечнае жыццё. Суцяшаюць чалавека. Больш нідзе гэтых слоў не пачуеш, а так хочацца пачуць. Калі мы ехалі ў эвакуацыю і па дарозе сустракалася царква, то ўсе ішлі туды. Немагчыма было прабіцца. Атэісты і камуністы — усе ішлі.

Мне часта сніцца сон, што мы ідзём з сынам па сонечнай Прыпяці — цяпер гэта ўжо горад-прывід... Ідзём і разглядаем ружы, у Прыпяці было шмат ружаў, вялікія кветнікі з ружамі. Сон... Усё тое наша жыццё — ужо сон. Я была тады такая маладая. Сын маленькі... Кахала...

Прамінуў час, усё зрабілася ўспамінам. Я зноў як быццам глядач...

*Надзея Пятроўна Выгоўская, перасяленка з горада Прыпяць*

## Маналог пра тое, як лёгка стаць зямлёй

Я вёў дзённік...

І стараўся запомніць тыя дні... Было шмат новых адчуванняў. Ну і страх, вядома... Вырваліся ў нязведанае, як на Марс... Я родам з Курска, у шэсцьдзясят дзявятым годзе недалёка ад нас пабудавалі атамную станцыю. У горадзе Курчатаве. З Курска туды ездзілі па прадукты. Па каўбасу. Вучоных-атамнікаў забяспечвалі па найвышэйшай катэгорыі. Я запомніў вялікую сажалку, там вудзілі рыбу. Паблізу рэактара... Пасля Чарнобыля я часта гэта ўспамінаў... Цяпер такое ўжо немагчыма...

Значыцца, так: мне ўручаюць позву, і я, як чалавек дысцыплінаваны, у той самы дзень прыходжу ў ваенкамат. Ваенком гартае маю «справу». «Ты, — кажа, — ні разу не быў у нас на зборах. А тут хімікі трэба. Не хочаш у лагер пад Мінск на дваццаць пяць дзён?» Я падумаў:

«Чаму б мне не адпачыць ад сям'і, ад працы? Памаршырую па свежым паветры». Дваццаць другога чэрвеня тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага года з рэчамі, кацялком і зубной шчоткай аб адзінаццатай гадзіне я прыбыў на зборны пункт. Здзівіла тое, што нас занадта шмат для мірнага часу. Мільганулі нейкія ўспаміны. З ваенных фільмаў. І дзень якраз такі выпаў: дваццаць другое чэрвеня… Пачатак вайны… То загадаюць шыхтавацца, то разысціся, і так да вечара. У аўтобусы пагрузіліся, калі пачало ўжо цямнець. Каманда: «Хто ўзяў спіртное, выпівайце. Уначы сядзем у цягнік, а раніцой будзем на месцы. Каб выйшлі свежыя, як гурочкі, і без лішняга багажу». Ну, усё зразумела. Гулі ўсю ноч.

Раніцой знайшлі ў лесе сваю вайсковую частку. Зноў нас пашыхтавалі і выклікаюць па алфавіце. Атрымалі спецвопратку. Далі адзін камплект, другі, трэці — ну, думаю, справа сур'ёзная. Яшчэ выдаюць шынель, шапку, матрац, падушку — усё зімовае. А на вуліцы лета, і абяцалі, што адпусцяць праз дваццаць пяць дзён. «Ды вы што, хлопцы, — смяецца капітан, які нас вёз. — Дваццаць пяць дзён?! На паўгода ў Чарнобыль загрыміце». Непаразуменне. Агрэсія. Тут нас узяліся ўгаворваць: хто за дваццаць кіламетраў патрапіць — падвойны аклад, хто за дзесяць — патройны, хто да самага рэактара — памнажай на шэсць. Адзін пачынае лічыць, што ён праз шэсць месяцаў на сваёй машыне дадому прыедзе, другі хацеў бы ўцячы, але ваенная дысцыпліна. Што такое радыяцыя? Ніхто не чуў. А я акурат перад гэтым прайшоў курсы грамадзянскай абароны, нам выдавалі інфармацыю трыццацігадовай даўніны: пяцьдзясят рэнтгенаў — смяротная доза. Вучылі, як падаць, каб ударная хваля над табой прайшла. Не закранула. Апраменьванне, цеплавое награванне… А пра тое, што радыеактыўнае

заражэнне мясцовасці — самы небяспечны фактар, — ні слова. І тыя кадравыя афіцэры, якія везлі нас у Чарнобыль, не надта кемілі, ведалі адно: гарэлкі трэба паболей, ад радыяцыі дапамагае. Шэсць дзён стаялі пад Мінскам, шэсць дзён пілі. Я калекцыянаваў этыкеткі ад бутэлек. Спачатку гарэлку пілі, потым, гляджу, пайшлі нейкія дзіўныя напоі: нітхінол і розныя іншыя шклоачышчальнікі. Як хіміку, мне гэта было цікава. Пасля нітхінолу — ногі ватныя, а галава цвярозая. Даеш сабе каманду: «Устаць!» А сам падаеш.

Значыцца так: я — інжынер-хімік, кандыдат навук, прызвалі мяне з пасады загадчыка лабараторыі буйнога вытворчага аб'яднання. Як мяне выкарыстоўвалі? Далі ў рукі рыдлёўку, практычна гэта быў мой адзіны інструмент. Адразу нарадзіўся афарызм: «На атом — с лопатой!» Ахоўныя сродкі: рэспіратары, супрацьгазы. Але ніхто імі не карыстаўся, бо спёка да трыццаці градусаў, нацягнеш — памрэш адразу. Распісаліся як за дадатковую амуніцыю і забылі. Яшчэ адзін штрых. Як мы ехалі… З аўтобусаў пераселі ў цягнік, пасадачных месцаў у вагоне — сорак пяць, а нас — семдзесят. Спалі па чарзе. Гэта цяпер успомнілася… Ну вось, што такое Чарнобыль? Баявая тэхніка і салдаты. Мыйныя пасты. Ваенная абстаноўка. Размясцілі ў палатках па дзесяць чалавек. У некага засталіся дома дзеці, у некага жонка нараджае, у кагосьці кватэры няма. Ніхто не скардзіўся. Трэба — значыць, трэба. Радзіма прызвала, радзіма загадала. Такі ў нас народ…

Вакол палатак — гіганцкія горы пустых бляшанак з-пад кансерваў. Манбланы! Недзе ў вайсковых сховішчах ляжаў недатыкальны запас. Мяркуючы па этыкетках, захоўваўся гадоў дваццаць-трыццаць… На выпадак вайны. Бляшанкі з-пад тушаніны, панцаку… З-пад

кількі... Зграі катоў... Іх — як мух... Вёскі выселеныя, людзей няма. Ад ветру весніцы зарыпяць — імгненна азіраешся: чакаеш чалавека. Замест чалавека — кошка выходзіць...

Здымалі забруджаны верхні слой зямлі, грузілі ў машыны і вывозілі на могільнікі. Я думаў, што могільнік — гэта нейкае складанае інжынернае збудаванне, а гэта звычайны курган. Зямлю мы падымалі і згортвалі вялікімі рулонамі... Як дыван... Зялёны дзірван з травой, кветкамі, карэннем... З павукамі, чарвякамі... Праца для вар'ятаў. Нельга ж абдзерці ўсю зямлю, зняць з яе ўсё жывое. Калі б не пілі да адключкі кожную ноч, сумняюся, што змаглі б вытрымаць. Псіхіка б не справілася. Сотні метраў абдзёртай зямлі, бясплоднай. Дамы, хлявы, дрэвы, шаша, дзіцячыя садкі, калодзежы — заставаліся як голыя. Сярод пяску, у пяску. Раніцой трэба пагаліцца, баішся зірнуць у люстэрка, убачыць самога сябе. Таму што думкі з'яўляліся розныя... Розныя думкі... Цяжка было ўявіць, каб туды зноў вярнуліся людзі, зноў пачалося жыццё. Але мы мянялі шыфер, мылі дахі. Тое, што праца бескарысная, разумелі ўсе. Тысячы людзей. Але кожную раніцу падымаліся і зноў яе рабілі. Абсурд! Непісьменны дзед, бывала, сустрэне: «Кідайце, сынкі, дурную работу. Сядайце за стол. Паабедайце з намі». Вецер дзьме. Хмары плывуць. Рэактар не закрыты... Знялі слой, праз тыдзень вярнуліся, можна зноў пачынаць. А здымаць ужо няма чаго. Пясок сыплецца... Сэнс зразумеў адзін раз, калі з верталётаў распырсквалі спецыяльны раствор, каб атрымалася палімерная плёначка, якая не дазваляе лёгкаму грунту рухацца. Гэта мне было зразумела. Але мы капалі, капалі...

Людзей адправілі ў эвакуацыю, але ў некаторых вёсках заставаліся старыя. Ну вось... І зайцці

ў звычайную хату, і сесці паабедаць… Сам рытуал… Няхай сабе толькі паўгадзіны нармалёвага чалавечага жыцця… Хоць есці там нічога нельга. Забаранялася. Але так хацелася пасядзець за сталом… У старой хаце…

Пасля нас заставаліся толькі курганы. Потым іх нібыта павінны былі абкласці бетоннымі плітамі, абгарадзіць калючым дротам. Там пакідалі самазвалы, «уазікі», краны, на якіх працавалі, бо метал мае ўласцівасць радыяцыю паглынаць і збіраць у сабе. Кажуць, што потым усё гэта некуды знікла. Раскралі. Я веру, што ў нас можа быць усё. Аднойчы трывога: дазіметрысты праверылі, і высветлілася, што сталоўку пабудавалі на месцы, дзе радыяцыя вышэй, чым там, куды мы ездзілі працаваць. А мы ўжо жылі там два месяцы. Такі ў нас народ… Слупы, і на іх дошкі набітыя на ўзроўні грудзей — гэта называлася сталовая. Стоячы елі. Мыліся з бочкі. Туалет — доўгая траншэя ў чыстым полі. У руках — рыдлёўка. А побач — рэактар…

Праз два месяцы мы пачалі ўжо нешта разумець. Пачалі пытацца: «Мы ж не смяротнікі. Пабылі два месяцы, хопіць. Пара нас памяняць». Генерал-маёр Антошкін праводзіў з намі гутарку, ішоў на шчырасць: «Нам вас мяняць нявыгадна. Мы вам далі адзін камплект адзення. Другі, трэці. Вы навыкі набылі. Мяняць вас — справа дарагая, лішнія турботы». І націск робіць на тое, што мы — героі. Раз на тыдзень тым, хто добра зямлю капаў, уручалі пахвальную грамату. Найлепшы пахавальнік Савецкага Саюза. Ну хіба гэта не вар'яцтва?

Пустыя вёскі… Жывуць куры ды каты. Зойдзеш у хлеў — той поўны яек. Смажылі. Салдаты — хлопцы зухаватыя. Курыцу зловяць. Вогнішча. Бутля самагонкі. Кожны дзень у палатцы выпівалі хорам трохлітровы бутыль самагонкі. Нехта ў шахматы гуляе, нехта на

гітары брынькае. Чалавек да ўсяго прывыкае. Адзін нап'ецца — і ў ложак, другому пакрычаць ахвота. Пабіцца. Двое селі п'яныя ў машыну. Разбіліся. Аўтагенам іх выразалі, выцягвалі з расплюшчанага жалеза. Я ратаваўся тым, што пісаў дадому доўгія лісты і вёў дзённік. Высачыў мяне начальнік палітаддзела, пачаў на мяне паляваць: дзе захоўваю? Што пішу? Падгаварыў суседа за мной шпіёніць. Той цікавіцца: «Што папісваеш?» — «Кандыдацкую абараніў. Доктарскую пішу». Смяецца. «Я так палкоўніку і перадам. А ты гэта падалей схавай». Добрыя былі хлопцы. Я ўжо казаў, ніводнага не трапілася, каб нылі. Ніводнага баязліўца. Паверце: нас ніхто ніколі не пераможа. Ніколі! Афіцэры не вылазілі з палатак. Валяліся ў хатніх тэпцях. Пілі. А нам напляваць! Мы капалі. Няхай атрымліваюць на пагоны новыя зорачкі. Напляваць! Такі ў нас народ…

Дазіметрысты — багі. Усе да іх точацца: «Ну, сынок, якая ў мяне радыяцыя?» Адзін прадпрымальны салдат скеміў: узяў звычайную палку, накруціў на яе дрот. Пастукаўся ў адну хату і па сцяне гэтай палкай водзіць. Бабка за ім: «Сынок, што тут у мяне?» — «Ваенная таямніца, бабуля». — «А ты мне скажы, сынок. Я табе шкляначку самагонкі налью». — «Ну давай!» Выпіў. «Усё нармальна ў цябе, бабуля». І пайшоў далей «замеры» рабіць…

У сярэдзіне тэрміну нам нарэшце выдалі ўсім дазіметры, такія маленькія скрыначкі, усярэдзіне крышталь. Некаторыя даўмеліся: трэба яго ўранні адвезці да могільніка і пакінуць, а ў канцы дня забраць. Чым больш радыяцыі, тым хутчэй адпачынак дадуць. Або болей заплацяць. Нехта на бот, там лямпачка ёсць, пачапіў, каб бліжэй да зямлі. Тэатр абсурду! Абсурд! Гэтыя датчыкі былі не забруджаныя, для таго, каб яны пачалі адлік, іх трэба было зарадзіць першаснай дозай радыяцыі. Гэта

значыць, тыя фінціфлюшкі, цацкі тыя далі нам дзеля прыліку. Псіхатэрапія. Насамрэч выявілася, што гэта крэмніевая прылада, гадоў пяцьдзясят на складзе валялася. У вайсковы білет пры канцы тэрміну кожнаму запісалі аднолькавую лічбу: сярэднюю дозу радыяцыі памножылі на колькасць дзён знаходжання ў зоне. Замерылі сярэднюю дозу ў палатках, дзе мы жылі.

Ці то анекдот гэта, ці то быль… Звоніць салдат каханай дзяўчыне. Яна хвалюецца: «Што ты там робіш?» Ён вырашыў пахваліцца: «Толькі што з-пад рэактара вылез, рукі памыў». І тут — гудкі. Размова абарвалася. Кадэбэ слухае…

Дзве гадзіны — на адпачынак. Ляжаш пад кусцік, а ўжо вішні паспелі, такія буйныя, салодкія, абцёр — і ў рот. На шаўкоўніцах ягады спелыя… Я ўпершыню бачыў шаўкоўніцу…

Калі працы не было, вадзілі маршыраваць. Па забруджанай зямлі… Абсурд! Па вечарах фільмы глядзелі. Індыйскія. Пра каханне. Да трох-чатырох гадзін раніцы. Кашавар праспіць, каша на сняданак — сырая. Прывозілі газеты. Там пісалі, што мы — героі! Добраахвотнікі! Спадкаемцы Паўкі Карчагіна. Друкаваліся фатаграфіі. Сустрэў бы я таго фатографа…

Недалёка ад нас стаялі інтэрнацыянальныя часткі. Татары з Казані. Бачыў іхні самасуд. Гоняць перад шарэнгай салдата, спыніцца або адбяжыць убок — б'юць. Нагамі. Лазіў па хатах, краў. Сумку барахла ў яго знайшлі. Асобна месціліся літоўцы. Праз месяц узбунтаваліся і запатрабавалі, каб адпраўлялі дадому.

Быў аднойчы спецзаказ: тэрмінова памыць дом у пустой вёсцы. Абсурд! «Навошта?» — «Заўтра там будуць гуляць вяселле». Аблілі са шлангаў дах, дрэвы, сашкраблі зямлю. Скасілі бульбоўнік у гародзе, траву на падворку.

Навокал — пустка. Назаўтра прывезлі маладых. Прыехаў аўтобус з гасцямі. З музыкай... Сапраўдныя, а не кіношныя жаніх і нявеста. Яны ўжо жылі ў іншым месцы, перасяліліся, але іх угаварылі прыехаць сюды, каб зняць для гісторыі. Прапаганда працавала. Фабрыка мрояў... Ахоўвала нашыя міфы: мы паўсюль выжывем, нават на мёртвай зямлі...

Перад самым ад'ездам выклікаў мяне камандзір: «Што ты пісаў?» — «Лісты маладой жонцы», — адказаў я. «Ты ў мяне глядзі там...»

Што засталося ў памяці пра тыя дні? Як мы капалі. Капалі... Недзе ў дзённіку ў мяне запісана, што я там зразумеў. У самыя першыя дні... Я зразумеў, як лёгка стаць зямлёй...

*Іван Мікалаевіч Жмыхаў, інжынер-хімік*

## Маналог пра сімвалы і таямніцы вялікай краіны

Успамінаю, як пра вайну...

Ужо на пачатку мая, недзе праз месяц пасля аварыі, да нас пачалі паступаць на праверку прадукты з трыццацікіламетровай зоны. Інстытут працаваў кругласутачна. Як ваенны. У рэспубліцы адны мы мелі на той момант прафесіяналаў і спецыяльную апаратуру. Прывозілі вантробы свойскай і дзікай жывёлы. Правяралі малако. Пасля першых спробаў зрабілася зразумела, што да нас вязуць не мяса, а радыеактыўныя адкіды. Вахтавым метадам у зоне пасвілі статкі. Пастухі прыязджалі і ад'язджалі, даярак прывозілі толькі на даенне. Малаказаводы выконвалі планы. Праверылі. Не малако, а радыеактыўныя адкіды. Сухі малочны парашок і бляшанкі згушчанага і канцэнтраванага малака Рагачоўскага

малаказавода мы доўга выкарыстоўвалі на лекцыях як эталонную крыніцу. А ў гэты час іх прадавалі ў магазінах. Ува ўсіх прадуктовых крамах... Калі людзі чыталі на этыкетках, што малако з Рагачова і не бралі яго, яно затаварвалася. А потым раптам з'явіліся бляшанкі без этыкетак. Думаю, прычына не ў тым, што не хапала паперы, — людзей падманвалі. Падманвала дзяржава. Уся інфармацыя зрабілася таемнай... Менавіта ў той час, калі элементы з кароткім жыццём давалі жорсткае апраменьванне і ўсё «свяцілася». Мы ўвесь час пісалі службовыя запіскі. Увесь час... Але сказаць адкрыта пра вынікі... Пазбавіцца навуковай ступені, а то і партбілета... *(Пачынае нервавацца.)* Але не ў страху... Не ў страху прычына, хоць і ў ім, вядома... А ў тым, што мы былі людзі свайго часу, сваёй савецкай краіны. Верылі ў яе, прычына — у веры. У нашай веры. *(Ад хвалявання закурвае.)* Паверце, не ад страху... Не ад аднаго страху... Я адказваю сумленна. Каб я паважаў сябе, мне трэба быць цяпер сумленным. Я хачу...

Першая паездка ў зону: у лесе фон у пяць-шэсць разоў вышэй, чым у полі, на дарозе. Паўсюль высокія дозы. Працуюць трактары... Сяляне капаюць свае гароды... У некалькіх вёсках праверылі дарослым і дзецям шчытападобную залозу: апраменьванне ў сто, дзвесце, трыста разоў вышэй дапушчальнай нормы. Была ў нас у групе жанчына. Радыёлаг. З ёй, калі ўбачыла дзяцей, якія гулялі ў пяску, здарылася істэрыка. Дзеці пускалі ў лужынах караблікі. Адчыненыя крамы і, як звычайна ў нас у вёсках, мануфактура і прадукты побач: касцюмы, сукенкі, а па суседстве каўбаса, маргарын. Ляжаць свабодна, нават не накрытыя цэлафанам. Бяром каўбасу, яйкі... Робім замеры: не прадукты, а радыеактыўныя адкіды. Сядзіць маладая жанчына на лавачцы каля

дома, корміць немаўля грудзьмі… Праверылі грудное малако — радыеактыўнае. Чарнобыльская мадонна…

Мы пыталіся: што рабіць? Нам адказвалі: «Рабіце замеры. Глядзіце тэлевізар». Па тэлевізары Гарбачоў супакойваў: «Зроблены неадкладныя захады». Я верыў… Інжынер з дваццацігадовым стажам, добра знаёмы з законамі фізікі. Я ж ведаў, што з гэтых мясцін трэба сысці ўсяму жывому. Хоць на нейкі час. Але мы добрасумленна рабілі замеры і глядзелі тэлевізар. Мы прывыклі верыць. Я — з пасляваеннага пакалення, якое вырасла ў гэтай веры. Адкуль вера? Мы перамаглі ў такой страшнай вайне. Перад намі тады ўвесь свет з удзячнасцю схіліў галаву. Гэта ж было! У Кардыльерах на скалах было высечанае імя — Сталін. Што гэта? Сімвал! Сімвал вялікай краіны.

Вось адказ на ваша пытанне: чаму мы ведалі і маўчалі? Чаму не выйшлі на плошчу, не крычалі? Мы дакладвалі… Я вам казаў, пісалі службовыя запіскі. А маўчалі і без пярэчанняў падпарадкоўваліся, таму што партыйная дысцыпліна, я — камуніст. Не памятаю, каб хто-небудзь з нашых супрацоўнікаў спалохаўся за сябе асабіста і адмовіўся ад камандзіроўкі ў зону. Не праз страх пакласці партбілет. А праз веру. Найперш — вера, што мы жывём прыгожа і справядліва, і чалавек у нас вышэй за ўсё, мера ўсіх рэчаў. Крах гэтай веры потым для шмат каго скончваўся інфарктам або самагубствам. Куляй у сэрца, як у акадэміка Лягасава… Таму што, калі губляеш веру, застаешся без веры, ты ўжо не ўдзельнік, а саўдзельнік, у цябе няма апраўдання. Я так яго разумею.

Нейкі знак… На кожнай атамнай станцыі ў былым Саюзе ў сейфе ляжаў план ліквідацыі аварыі. Тыпавы план. Сакрэтны. Без такога плану нельга было атрымаць

дазвол на пуск станцыі. За шмат гадоў да аварыі яго распрацавалі менавіта на прыкладзе чарнобыльскай станцыі: што рабіць і як. Хто за што адказвае. Дзе знаходзіцца. Да найдрабнейшых дэталяў… І раптам там, на гэтай станцыі, адбываецца катастрофа… Што гэта — супадзенне? Містыка? Калі б я быў вернікам… Калі хочаш знайсці сэнс, адчуваеш сябе рэлігійным чалавекам. А я — інжынер. Я — чалавек іншай веры. У мяне іншыя сімвалы…

Што цяпер мне рабіць са сваёй верай? Што цяпер…

*Марат Піліпавіч Коханаў, былы галоўны інжынер*
*Інстытута ядзернай энергетыкі Акадэміі навук Беларусі*

### Маналог пра тое, што ў жыцці страшнае адбываецца ціха і натуральна

Ад самага пачатку…

Недзе нешта здарылася. Я нават назву добра не пачула, недзе далёка ад нашага Магілёва... Прыбег са школы брат: усім дзецям раздаюць нейкія таблеткі. Відаць, сапраўды нешта здарылася. Ай-я-яй! І ўсё. Першае мая мы цудоўна адсвяткавалі, цэлы дзень бавілі на прыродзе. Вярнуліся дадому позна ўвечары, у маім пакоі вакно расчыненае ветрам… Гэта ўспомнілася пазней…

Працавала я ў інспекцыі аховы прыроды. Там чакалі якіх-небудзь інструкцый, але яны не прыходзілі. Чакалі… У штаце інспекцыі прафесіяналаў амаль не было, асабліва сярод кіраўніцтва: адстаўныя палкоўнікі, былыя партработнікі, пенсіянеры або непажаданыя недзе асобы. У іншым месцы праштрафіўся — яго да нас. Сядзіць. Шамаціць паперкамі. Зашумелі, загаварылі яны пасля выступу ў Маскве нашага беларускага пісь-

менніка Алеся Адамовіча, які пачаў званіць ва ўсе званы. Як яны яго ненавідзелі! Нешта ірэальнае. Тут жывуць іх дзеці, унукі, але не яны, а пісьменнік крычыць усяму свету: ратуйце! Здавалася б, павінен спрацаваць інстынкт самазахавання. На партсходах, у курылках — усе пра «пісакаў». Чаму яны лезуць не ў сваю справу? Параспускаліся! Існуе інструкцыя! Субардынацыя! Што ён разумее? Ён жа не фізік! Ёсць цэка, ёсць генеральны сакратар! Я тады, магчыма, упершыню зразумела, што такое — трыццаць сёмы год. Як гэта было…

На той час маё ўяўленне пра атамную станцыю было цалкам ідылічнае. У школе, інстытуце нас вучылі, што гэта казачныя «фабрыкі энергіі з нічога», дзе людзі ў белых халатах сядзяць і націскаюць кнопкі. Чарнобыль выбухнуў на фоне непадрыхтаванай свядомасці, абсалютнай веры ў тэхніку. Апрача таго, ніякай інфармацыі. Горы папераў з грыфам «зусім сакрэтна»: «засакрэціць звесткі пра аварыю», «засакрэціць звесткі пра ступень радыеактыўнага паражэння персаналу, які ўдзельнічаў у ліквідацыі»… Хадзілі чуткі: нехта ў газетах прачытаў, нехта недзе чуў, некаму сказалі… З бібліятэк знікла ўся смяхотная (як потым высветлілася) макулатура, выдадзеная па грамадзянскай абароне. Хтосьці слухаў заходнія галасы, толькі яны тады перадавалі, якія таблеткі піць, як іх правільна выкарыстоўваць. Але рэакцыя найчасцей была такая: ворагі зларадніцаюць, а ў нас усё добра. Дзявятага мая ветэраны пойдуць на парад… Будзе граць духавы аркестр. Нават тыя, хто тушыў рэактар, як потым высветлілася, таксама жылі сярод чутак. Здаецца, рукамі небяспечна браць граніт… Здаецца…

Аднекуль з'явілася ў горадзе вар'ятка. Хадзіла па рынку і казала: «Бачыла я гэтую радыяцыю. Яна сіняясіняя, пераліваецца…» Людзі ўжо не куплялі на рынку

малако, тварог. Стаіць бабулька з малаком, ніхто яго ў яе не бярэ. «Не бойцеся, — угаворвае бабулька, — я карову ў поле не выводжу, я траву ёй сама нашу». Выедзеш за горад, усцяж дарогі — нейкія пудзілы: пасецца абвязаная цэлафанам карова, а побач бабка, таксама ўся ў цэлафане. Хоць плач, хоць смейся. І нас пачалі пасылаць ужо на праверкі. Мяне накіравалі ў лясгас. Лясніцтвам планы пастаўкі драўніны не зменшылі, як быў план, так і застаўся. На складзе ўключылі прыбор. А ён чорт ведае што паказвае. Каля дошак нібыта нармальна, а побач з нарыхтаванымі мётламі — зашкальвае... «Адкуль мётлы?» — «З Краснаполля (як потым даведаліся, самы забруджаны раён у нашай Магілёўскай вобласці). Апошняя партыя засталася. Усе адправілі». Як іх цяпер па розных гарадах шукаць?

Нешта я яшчэ баялася забыць?.. Адметнае... А! Успомніла. Чарнобыль... І раптам новае, нязвыклае пачуццё, што ў кожнага з нас ёсць сваё жыццё, дагэтуль яно як быццам непатрэбнае было. А тут людзі пачалі задумвацца: што яны ядуць, чым кормяць дзяцей. Што небяспечна для здароўя, а што не? Пераязджаць у іншае месца або не пераязджаць? Кожнаму трэба было прыняць рашэнне. А прывыклі жыць як? Усёй вёскай. Заводам, калгасам. Мы былі савецкія людзі. Я, напрыклад, была савецкім чалавекам. Вельмі! Вучылася ў інстытуце, кожнае лета ездзіла з каматрадам. Быў такі моладзевы рух — студэнцкія камуністычныя атрады. Мы там працавалі, а грошы пералічвалі якой-небудзь лацінаамерыканскай кампартыі. Наш атрад, у прыватнасці, Уругваю...

Мы змяніліся. Усё змянілася. Вельмі вялікія намаганні трэба, каб зразумець. Адарвацца ад звыклага... Я — біёлаг. Мая дыпломная праца — паводзіны восаў. Два месяцы сядзела на ненаселеным востраве. У мяне

было там сваё асінае гняздо. Яны прынялі мяне ў сваю сям'ю пасля таго, як тыдзень прыглядаліся. Бліжэй, чым на тры метры, нікога не падпускалі, а мяне на дзесяць сантыметраў ужо праз тыдзень. Я падкормлівала іх з запалкі варэннем проста на гняздзе. «Не разбурай мурашнік, гэта добрая форма чужога жыцця», — улюбёная прымаўка нашага выкладчыка. Асінае гняздо звязанае з усім лесам, і я паступова таксама рабілася часткаю ландшафту. Падбягае мышаня і сядае на мысок маіх красовак, дзікае, лясное, але яно ўжо ўспрымае мяне як частку краявіду — учора сядзела, сёння сяджу, заўтра буду сядзець…

Пасля Чарнобыля… На выстаўцы дзіцячых малюнкаў: ходзіць па чорным вясновым полі бусел… І подпіс: «Буслу ніхто нічога не сказаў». Гэта — мае пачуцці тады. І была праца. Штодзённая праца… Мы ездзілі па вобласці, бралі пробы вады, пробы зямлі — і адвозілі ў Мінск. Дзяўчаткі нашыя бурчэлі: «Гарачыя піражкі возім». Ні ахоўных сродкаў. Ні спецвопраткі. Сядзіш на пярэднім сядзенні, а за спінай нашыя пробы — «свецяцца». Складалі акты для пахавання радыеактыўнага грунту. Хавалі зямлю ў зямлі… Новы чалавечы занятак… Ніхто яго зразумець не мог. Інструкцыя патрабуе такое пахаванне рабіць з геалагічнай разведкай. Каб глыбіня знаходжання грунтовай вады была не болей за чатыры-шэсць метраў, а калі глыбіня пахавання — невялікая, сцены і дно катлавану трэба зацягнуць поліэтыленавай плёнкай. Але гэта ў інструкцыі, а ў жыцці, натуральна, інакш. Як заўсёды. Ніякай геолагаразведкі. Тыцнуць пальцам: «Тут капай». Экскаватаршчык капае. «Дык на якую глыбіню капалі?» — «А чорт яго ведае! Вада з'явілася, я кінуў». Бухалі зямлю забруджаную проста ў грунтовую ваду…

Вось кажуць: святы народ, злачынны ўрад... Я потым вам скажу, што я пра гэта думаю... Пра народ наш і пра сябе...

Самая вялікая камандзіроўка ў мяне была ў Краснапольскі раён, я ўжо казала, самы-самы. Каб прадухіліць змыванне радыенуклідаў з палёў у рэкі, належала дзейнічаць паводле інструкцыі: пракапаць падвойныя раўчукі — затым пропуск, яшчэ раз падвойныя раўчукі — і далей праз такія самыя інтэрвалы. Мне трэба было праехаць уздоўж усіх малых рэк. Праверыць. Да райцэнтра дабіраюся рэйсавым аўтобусам, далей, вядома, трэба машына. Іду да старшыні райвыканкама. Старшыня сядзіць у сваім кабінеце, абхапіў галаву рукамі: план ніхто не здымаў, структуры севазвароту ніхто не мяняў, як сеялі гарох, так і сеюць, хоць вядома, што гарох найбольш набірае радыяцыю, як і ўсе бабовыя. А там месцамі сорак кюры і вышэй. Яму не да мяне. У дзіцячых садах паразбягаліся кухары і медсёстры. Дзеці галодныя. Любая аперацыя — трэба везці чалавека на «хуткай» у суседні раён, шэсцьдзясят кіламетраў, а дарога — як пральная дошка. Усе хірургі з'ехалі. Якая машына?! Якія падвойныя раўчукі? Яму не да мяне. Тады я паткнулася да вайскоўцаў. Маладыя хлопцы. Яны адпрацавалі там па паўгода. Цяпер страшэнна хворыя. Далі яны тады мне ў распараджэнне бэтээр з экіпажам, нават не бэтээр, а бээрдэмку, як яны яе называлі (БРДМ), — разведвальная машына з кулямётам. Я вельмі шкадавала, што не сфатаграфавалася на ёй. На броні. Зноў жа — рамантыка! Прапаршчык, які камандаваў гэтай машынай, увесь час звязваўся з базай: «Сокал! Сокал! Працягваем працу». Едзем... Дарогі нашы, лясы нашы, а мы — на баявой машыне. Стаяць каля платоў жанчыны. Стаяць і плачуць. Апошні раз

яны бачылі гэтую тэхніку ў час вайны. І ў іх страх, што пачалася вайна.

Паводле інструкцыі, у трактараў для разворвання гэтых раўчукоў кабіна павінна быць абароненай, герметызаванай. Такі трактар я бачыла, кабіна сапраўды герметычная. Трактар стаяў, а трактарыст ляжаў на траве, адпачываў. «Вы што, звар'яцелі? Хіба вас не папярэдзілі?» — «Дык я ж галаву целагрэйкай накрыў», — адказвае ён. Людзі не разумелі. Іх увесь час палохалі, рыхтавалі да атамнай вайны. А не да Чарнобыля...

Мясціны там прыгожыя неверагодна. Лес захаваўся не пасаджаны, а сапраўдны. Старажытны. Пакручастыя рачулкі, дзе вада чайнага колеру і празрыстая-празрыстая. Зялёная трава. Людзі ў лесе перагукаюцца... А ты ўжо ведаеш, што ўсё гэта атручана. Грыбы. Ягады. Вавёрачкі ў ляшчыне бегаюць...

Сустрэлася нам бабка:

—Дзеткі, а малачко ад сваёй кароўкі можна піць?

Мы — вочы ў зямлю, у нас загад: дадзеныя збіраць, але з насельніцтвам у шчыльныя кантакты не ўступаць.

Першым знайшоў што адказаць прапаршчык:

—Бабуля, а колькі вам гадкоў?

—Ды ўжо за восемдзесят, а можа, і больш. Дакументы ў вайну згарэлі.

—Ну тады можна малачко піць.

Вясковых людзей больш за ўсіх шкада, яны бязвінна пацярпелі, як дзеці. Бо Чарнобыль не селянін прыдумаў, у яго з прыродай свае стасункі — даверлівыя, не захопніцкія, як і сто гадоў таму, як і тысячу. Як у боскай задуме... І яны не разумелі, што адбылося, яны хацелі верыць вучоным, любому адукаванаму чалавеку — як святару. А ім паўтаралі: «Усё добра. Нічога страшнага. Толькі мыйце рукі перад ядой». Зразумела не адразу,

а праз некалькі гадоў, што ўсе мы ўдзельнічалі... У злачынстве... *(Маўчыць.)*

Вы не можаце ўявіць, у якой колькасці на машынах з зоны вывозілася ўсё, што туды накіроўвалі ў выглядзе дапамогі яе жыхарам: кава, тушаніна, вяндліна, апельсіны. Скрынкамі, фурамі. Тады ж такіх прадуктаў нідзе не было. Жывіліся мясцовыя гандляры, кожны праверальшчык, усё гэтае дробнае і сярэдняе чынавенства. Чалавек выявіўся горшым, чым я думала. І я сама... Таксама горшай... Я цяпер гэта пра сябе ведаю... *(Задумваецца.)* Я, канешне, прызнаюся... Для мяне самой гэта важна... Зноў жа прыклад... У адным калгасе, скажам, пяць вёсак. Тры «чыстыя», дзве «брудныя», ад адной да другой — дватры кіламетры. Дзвюм плацяць «грабавыя», тром — не. У «чыстай» вёсцы будуюць жывёлагадоўчы комплекс. Маўляў, будзем завозіць чысты корм. А дзе яго ўзяць? Вецер нясе пыл з аднаго поля на другое. Адна зямля. Каб пабудаваць комплекс, трэба паперы. Камісія іх падпісвае, я — у гэтай камісіі, хоць кожны ведае, што падпісваць нельга. Злачынства! Урэшце, знаходзіла я сабе апраўданне, праблема чыстых кармоў — не клопат інспектара аховы прыроды. Я чалавек маленькі. Што я магу?

Кожны знаходзіў сабе нейкае апраўданне. Тлумачэнне. Я праводзіла такі доследна сабе... І наогул я зразумела: у жыцці страшнае адбываецца ціха і натуральна...

*Зоя Данілаўна Брук, інспектар аховы прыроды*

## Маналог пра тое, што рускі чалавек заўсёды хоча ў што-небудзь верыць

А вы хіба не заўважалі, што паміж сабой мы нават не гаворым пра гэта? Праз дзясяткі гадоў, праз стагоддзі —

гэта будуць міфалагічныя гады. Заселяць гэтыя мясціны казкамі і міфамі… Легендамі…

Я баюся дажджу — вось што такое Чарнобыль. Баюся снегу. Лесу. Аблокаў баюся. Ветру… Адкуль дзьме? Што нясе з сабой? Гэта не абстракцыя, не высновa, а асабістае пачуццё. Чарнобыль… Ён у маім доме… У самай дарагой для мяне істоце, у маім сыне, які нарадзіўся ўвесну восемдзесят шостага… Ён хворы. Жывёлы, нават прусакі, яны ведаюць, колькі і калі нараджаць. Людзі так не могуць. Творца не даў ім дару прадчування. Нядаўна ў газетах апублікавалі, што ў дзевяноста трэцім годзе толькі ў нас, у Беларусі, жанчыны зрабілі дзвесце тысяч абортаў. Асноўная прычына — Чарнобыль. Мы ўжо жывём з гэтым страхам… Прырода як быццам згарнулася, чакаючы нечага. Вычэкваючы. «Гора мне! Куды знік час?» — усклікнуў бы Заратустра.

Я шмат разважаў. Шукаў сэнс… Адказ… Чарнобыль — гэта катастрофа рускай ментальнасці. Вы пра гэта не задумваліся? Вядома, я згодны, калі пішуць, што гэта не рэактар узарваўся, а ўся ранейшая сістэма каштоўнасцяў. Але ў гэтым тлумачэнні мне чагосьці не стае…

Я гаварыў бы пра тое, пра што першым сказаў Чаадаеў, — пра нашую варожасць прагрэсу. Пра нашую антытэхналагічнасць. Пра нашую антыінструментальнасць. Угледзьцеся ў Еўропу. Пачынаючы з эпохі Адраджэння яна жыве пад знакам інструментальнага стаўлення да свету. Разумнага. Рацыянальнага. Гэта павага да чалавека-майстра, да інструмента ў ягоных руках. Ёсць цудоўнае апавяданне ў Ляскова — «Жалезны характар». Што гэта такое? Рускі характар — «авось» ды «нябось». Лейтматыў рускай тэмы. Нямецкі характар — стаўка на інструмент, на машыну. У нас… У нас?

З аднаго боку, спроба пераадолець, утаймаваць хаос, з другога — нашая родная стыхійнасць. Прыедзьце куды заўгодна, ну, напрыклад, у Кіжы, і што вы пачуеце, пра што з гонарам раскажа любы экскурсавод? Што гэты храм пабудаваны выключна сякерай, ніводнага цвіка! Замест таго каб пракласці добрую дарогу, падкуём блыху. Колы патанаюць у гразюцы, затое трымаем у руках жар-птушку. Другое… Так! Гэта расплата за хуткую індустрыялізацыю пасля рэвалюцыі. Пасля Кастрычніка… За скачок. На Захадзе быў прадзільны, мануфактурны век…. Машына і чалавек рухаліся, мяняліся разам. Фармавалася тэхналагічная свядомасць, мысленне. А ў нас? Што ў нашага мужыка на ягоным уласным падворку, апрача рук? Дагэтуль! Сякера, каса, нож — і ўсё. На гэтым увесь ягоны свет трымаецца. Ну яшчэ рыдлёўка. Як рускі чалавек размаўляе з машынай? Толькі матам. Або кувалдай, выспяткам. Ён яе не любіць, машыну, ненавідзіць, пагарджае ёю, насамрэч жа ён да канца не разумее, што ў ягоных руках. Якая гэта сіла. Я недзе чытаў, што рабочы персанал атамных станцый часта называў рэактар каструляй, самаварам, керагазам. Фаеркай. Тут ужо ёсць фанабэрыя: на сонцы засмажым яечню! Сярод тых, хто працаваў на Чарнобыльскай станцыі, шмат вясковых людзей. Удзень яны на рэактары. А ўвечары — на сваіх гародах або ў бацькоў у суседняй вёсцы, дзе бульбу яшчэ садзяць рыдлёўкай, гной раскідваюць віламі… Выкопваюць ураджай таксама ўручную… Іхняя свядомасць існавала ў гэтых двух перападах, у двух вяках — каменным і атамным. У дзвюх эпохах. Чалавек увесь час, як маятнік, хістаўся. Уявіце сабе чыгунку, пракладзеную выдатнымі інжынерамі, імчыцца цягнік, але на месцы машыністаў — учарашнія рамізнікі. Фурманы. Гэта лёс Расіі — падарожнічаць у дзвюх культурах.

Паміж атамам і рыдлёўкай. А тэхналагічная дысцыпліна? Для нашага народа яна — частка гвалту... Калодкі, кайданы. Народ стыхійны, вольны. Заўсёды марыў не пра свабоду — пра вольніцу. Для нас дысцыпліна — гэта рэпрэсіўны інструмент. Ёсць штосьці асаблівае ў нашым невуцтве, нешта блізкае да невуцтва ўсходняга...

Я — гісторык... Раней шмат займаўся лінгвістыкай, філасофіяй мовы. Не толькі мы думаем мовай, але і мова думае намі. У васямнаццаць гадоў, а можа, і крыху раней, калі пачаў чытаць самвыдат і адкрыў для сябе Шаламава, Салжаніцына, я раптам зразумеў, што ўсё маё дзяцінства, дзяцінства маёй вуліцы, а рос я ў інтэлігентнай сям'і (прадзед святар, бацька прафесар Пецярбургскага ўніверсітэта), прасякнутае лагернай свядомасцю. І ўвесь слоўнік майго дзяцінства — мова зэкаў. Для нас, падлеткаў, гэта было цалкам натуральна: бацьку называлі «пахан», маці — «махана». «На хитрую жопу есть и х... с винтом» — гэта я ў дзевяць гадоў засвоіў. Вось так! Ніводнага цывільнага слова. Нават гульні, прымаўкі, загадкі былі зэкаўскія. Бо зэкі — гэта не асобны свет, які існаваў недзе ў турмах. Далёка. Гэта ўсё было побач. Як пісала Ахматава, «полстраны сажало, полстраны сидело». Думаю, што вось гэтая наша лагерная свядомасць немінуча мусіла сутыкнуцца з культурай. З цывілізацыяй, з сінхрафазатронам...

Вядома... гэта факт... Мы былі выхаваныя ў асаблівым савецкім паганстве: чалавек — уладар, вянец тварэння. І яго права рабіць са светам усё, што ён захоча. Мічурынская формула: «Мы не можам чакаць міласцяў ад прыроды, узяць іх у яе — наша задача». Спроба прышчапіць народу тыя якасці, якіх у яго няма. Мара пра сусветную рэвалюцыю — гэта мара пра тое, каб чалавека перарабіць і ўвесь свет навокал. Усё перарабіць.

Менавіта так! Знакаміты бальшавіцкі лозунг: «Загонім жалезнай рукой чалавецтва ў шчасце!». Псіхалогія гвалтаўніка. Пячорны матэрыялізм. Выклік гісторыі і выклік прыродзе. І гэта не сканчваецца... Разбураецца адна ўтопія, на змену ёй прыходзіць іншая. Цяпер раптам усе загаварылі пра Бога. Пра Бога і пра рынак адначасова. Чаму яго не шукалі ў ГУЛагу, у камерах трыццаць сёмага, на партсходах сорак восьмага, калі грамілі касмапалітызм, пры Хрушчове, калі нішчылі храмы? Сучасны падтэкст рускага богашукальніцтва хітры і хлуслівы. Бомбы падаюць на мірныя дамы ў Чачні, знішчаюць маленькі народ з пачуццём уласнай годнасці... А ў царкве стаяць са свечкамі... Мы ўмеем толькі з мячом... Аўтамат Калашнікава ў нас замест слова. Абгарэлых рускіх танкістаў зграбаюць у Грозным рыдлёўкамі і віламі... Тое, што ад іх засталося... І тут жа прэзідэнт і ягоныя генералы моляцца. Краіна глядзіць гэта па тэлевізары...

Што нам трэба? Адказаць на пытанне: ці здольная руская нацыя на такі глабальны перагляд усёй сваёй гісторыі, як аказаліся здольныя на гэта пасля Другой сусветнай вайны японцы? Немцы... Ці хопіць у нас інтэлектуальнай мужнасці? Пра гэта маўчаць. Кажуць пра рынак, ваўчары, чэкі... Мы чарговы раз выжываем, уся энергія ідзе на гэта. А душа пакінутая... Чалавек зноў адзінокі... Тады навошта ўсё гэта? Ваша кніга? Мае бяссонныя ночы? Калі жыццё наша, як чырк запалкай? Тут можа быць некалькі адказаў. Прымітыўны фаталізм. І могуць быць вялікія адказы. Рускі чалавек заўсёды хоча ў што-небудзь верыць: у чыгунку, у жабу (тургенеўскі Базараў), у візантыйства, у атам... А цяпер вось — у рынак...

Булгакаў у «Кабале святош»: «Усё жыццё грашыла. Актрысай была». Усведамленне грахоўнасці мастацтва.

Амаральнасці яго прыроды. Зазіранне ў чужое жыццё... Але яно, як сыроватка забруджанага, можа стаць прышчэпкай чужога досведу. Чарнобыль — гэта тэма Дастаеўскага... Спроба апраўдання чалавека. А можа, усё вельмі проста: увайсці ў свет на пальчыках і спыніцца ля парога?!

Здзівіцца гэтаму боскаму свету... І так жыць...

*Аляксандр Рэвальскі, гісторык*

## Маналог пра тое, што маленькае жыццё ў вялікі час — безабароннае

Не пытайцеся... Не буду... Не буду пра гэта... *(Адлучана маўчыць.)*

Не, я магу з вамі паразмаўляць, каб уразумець... Калі вы дапаможаце... Толькі не трэба мяне шкадаваць, не трэба суцяшаць. Прашу вас! Не трэба! Не... Нельга без сэнсу так пакутаваць, нельга столькі перадумаць. Немагчыма! Немагчыма! *(Зрываецца на крык.)* Мы зноў у рэзервацыі, зноў жывём у лагеры... У Чарнобыльскім лагеры... Крычаць на мітынгах, нясуць лозунгі. У газетах пішуць... Чарнобыль разваліў імперыю, ён вылечыў нас ад камунізму... Ад подзвігаў, падобных да самагубства, ад страшных ідэй... Я ўжо разумею... Подзвіг — гэта слова, якое прыдумала дзяржава. Для такіх, як я. Але ў мяне нічога больш няма, нічога іншага, я вырасла сярод такіх слоў і такіх людзей. Усё знікла, гэтае жыццё знікла. За што трымацца? Чым ратавацца? Без сэнсу так пакутаваць нельга. *(Маўчыць.)* Адно я ведаю, што ніколі ўжо не буду шчаслівай...

Ён прыехаў адтуль... Некалькі гадоў жыў як у няспынным трызненні... Расказваў і расказваў. Я запамінала...

Пасярод вёскі — чырвоная лужына. Гусі і качкі яе абыходзяць.

Хлапчукі-салдаты, разутыя-раздзетыя. Ляжаць у траве. Загараюць. «Уставайце, чэрці, а то — загінеце!» Яны: га-га-га!

З вёсак многія ад'язджалі на сваіх машынах. Машыны забруджаныя. Каманда: «Выгружайся!», а машыну скідваюць у спецыяльную яму. Людзі стаяць, плачуць. А ўначы яе таемна выцягваюць…

«Ніна, як добра, што ў нас з табой двое дзяцей…»

Дактары мне сказалі: сэрца павялічанае ў паўтара раза, ныркі павялічаныя ў паўтара раза, печань павялічаная ў паўтара раза.

Аднойчы ўначы спытаў: «Ты не баішся мяне?» Ён пачаў ужо баяцца блізкасці.

Сама я не распытвала. Разумела яго, душой слухала… Я хацела ў вас запытацца… я хацела сказаць… Часта здаецца… Мне іншым разам так сіл не стае, што я ведаць гэтага не хачу. Ненавіджу ўспамінаць! Ненавіджу! *(Зноў зрываецца на крык.)* Калісьці… Калісьці я зайздросціла героям. Тым, хто ўдзельнічаў у вялікіх падзеях, быў на пераломе. На перавале. Так мы тады гаварылі, так спявалі. Песні прыгожыя былі. *(Пачынае спяваць.)* «Орленок, орленок…». Цяпер я і словы забылася… «Лети выше солнца…». Здаецца, так? Якія прыгожыя словы былі ў нашых песень! Я марыла! Шкадавала, што не нарадзілася ў сямнаццатым або ў сорак першым… А цяпер думаю па-іншаму: я не хачу жыць гісторыяй, у гістарычны час. Маё маленькае жыццё тады такое безабароннае. Вялікія падзеі растоптваюць яго, нават не заўважыўшы. Не прыпыніўшыся… *(Задумваецца.)* Пасля нас застанецца толькі гісторыя… Чарнобыль застанецца… А дзе маё жыццё? Маё каханне?

Расказваў і расказваў. Я запамінала.

Галубы, вераб'і… Буслы… Бусел бяжыць-бяжыць па полі, хоча ўзляцець, а не можа. А верабей па зямлі скача, але не падымаецца, вышэй за плот не ўзлятае.

Людзі пайшлі, а ў дамах засталіся жыць іхнія фатаграфіі…

Едуць па адселенай вёсцы і бачаць відовішча — як у казцы: сядзяць на ганку бабуля з дзядулем, а вакол іх бегаюць вожыкі. І вожыкаў так шмат, як куранятаў. Без людзей у вёсцы ціха, быццам у лесе, вожыкі не баяцца, прыходзяць і просяць малака. І лісіцы, расказвалі ім, прыбягаюць, і ласі. Хтосьці з хлопцаў не вытрымаў: «Я ж — паляўнічы!» — «Што ты! Што ты! — замахалі рукамі старыя. — Звяроў чапаць нельга! Мы з імі параднілiся. Цяпер — адна сям'я».

Ён ведаў, што памрэ… Паміpae… І даў сабе слова — жыць толькі сяброўствам і каханнем. Я працавала ў двух месцах, ягонай пенсіі нам не хапала, але ён папрасіў: «Давай прададзім машыну, яна не новая, але ўсё роўна нешта нам за яе дадуць. Пабудзь дома. Я проста пагляджу на цябе». Клікаў сяброў… Прыязджалі, жылі падоўгу ў нас ягоныя бацькі. Штосьці ён зразумеў… Штосьці ён там зразумеў пра жыццё, чаго раней не разумеў… Словы ў яго ўжо былі іншыя…

«Ніна, як добра, што ў нас з табой двое дзяцей. Дзяўчынка і хлопчык…»

Запытаюся:

—Ты думаў пра нас з дзецьмі? Пра што ты там думаў?

—Бачыў хлопчыка, ён нарадзіўся праз два месяцы пасля выбуху. Далі імя — Антон. А ўсе звалі Атамчык.

—Ты думаў…

—Там усіх шкада. Нават мошку шкадуеш і вераб'я.

Няхай усе жывуць. Няхай мухі лётаюць, восы джаляць, прусакі поўзаюць…

—Ты…

—Дзеці малююць Чарнобыль… Дрэвы на малюнках растуць уверх каранямі. Вада ў рэках чырвоная або жоўтая. Намалююць і самі плачуць.

А яго сябар… Яго сябар, ён мне расказваў, што там было неверагодна цікава, весела. Вершы чыталі, спявалі пад гітару. Туды прыехалі найлепшыя інжынеры, вучоныя. Маскоўская і ленінградская эліта. Філасофствавалі… Пугачова перад імі выступала… у полі… «Калі вы не засняце, буду спяваць вам, хлопчыкі, да раніцы». Яна называлі іх героямі… Яго сябар… Ён памёр першы… Танцаваў на вяселлі ў дачкі, анекдотамі ўсіх смяшыў. Узяў келіх, каб сказаць тост, і паваліўся… Нашы мужчыны… Яны паміраюць — як на вайне, але сярод мірнага жыцця. Не хачу! Не хачу ўспамінаць… *(Заплюшчвае вочы і ціха пагойдваецца.)* Не хачу гаварыць… Ён памёр, і было так страшна, такі чорны лес…

«Ніна, як добра, што ў нас з табой двое дзяцей. Дзяўчынка і хлопчык. Яны застануцца…»

*(Працягвае.)*

Што я хачу зразумець? Сама не ведаю… *(Неўпрыкмет усміхнулася.)* Яго сябар зрабіў мне прапанову выйсці за яго замуж. Яшчэ калі мы вучыліся, у студэнцтве ён да мяне заляцаўся, потым ажаніўся з маёй сяброўкай, але неўзабаве развёўся. Штосьці ў іх не атрымалася. Ён прыйшоў з букетам кветак: «Будзеш жыць, як каралева». У яго крама, шыкоўная кватэра ў горадзе. Дача… Я адмовілася. Ён пакрыўдзіўся: «Пяць гадоў прайшло… Ніяк свайго героя не забудзеш!? Ха-ха… Жывеш з помнікам…» *(Зрываецца на крык.)* Выгнала! Выгнала! «Дурніца! Жыві на свой настаўніцкі заробак, на свае

сто долараў». Жыву… *(Супакоіўшыся.)* Чарнобыль напоўніў маю душу, і мая душа пашырылася. Ёй балюча… Запаветны ключык… Пачынаеш пасля болю гаварыць, добра говорыш. Я так гаварыла… Такой мовою толькі тады, калі кахала. І цяпер… Калі б я не верыла, што ён на небе, як бы я гэта перажыла?

Ён расказваў… Я запаміняла… *(Кажа, нібыта ў забыцці.)*

Хмары пылу… Трактары ў полі. Жанчыны з віламі. Дазіметр пстрыкае…

Людзей няма, і час рухаецца іначай… Дзень доўгі-доўгі, як у дзяцінстве…

Лістоту нельга было спальваць… Хавалі яе, закопвалі ў зямлю…

Без сэнсу так пакутаваць нельга. *(Плача.)* Без знаёмых прыгожых слоў. Нават без медаля, які яму далі. Ляжыць дома ў шафе… пакінуў нам…

Але адно я ведаю — што ніколі ўжо не буду шчаслівай…

*Ніна Прохараўна Літвіна, жонка ліквідатара*

## Маналог пра фізіку, у якую ўсе мы былі калісьці закаханыя

Я — той чалавек, які вам патрэбны… Вы не памыліліся…

З юнацтва я меў звычку ўсё запісваць. Напрыклад, калі Сталін памёр — што адбывалася на вуліцах, пра што паведамлялі газеты. І Чарнобыль я запісваў ад першага дня, ведаў, што праміне час — і шмат што забудзецца, незваротна знікне. Так гэта і здарылася. Мае сябры, яны былі ў цэнтры падзей, фізікі-ядзершчыкі, забылі, што яны тады адчувалі, пра што размаўлялі са мной. А ў мяне ўсё запісана…

У той дзень… Я, загадчык лабараторыі Інстытута ядзернай энергетыкі Акадэміі навук Беларусі, прыехаў на працу. Інстытут наш за горадам, у лесе. Цудоўнае надвор'е! Вясна. Адчыніў вакно. Паветра чыстае, свежае. Здзівіўся: чамусьці сёння не залятаюць сінічкі, якіх я за зіму прыкарміў, чапляючы за вакном кавалачкі каўбасы. Куды сінічкі зніклі?

А тым часам на нашым інстытуцкім рэактары паніка: дазіметрычныя прыборы паказвалі падвышэнне актыўнасці, на паветраачышчальных фільтрах яна паднялася ў дзвесце разоў. Магутнасць дозы каля прахадной — блізу трох мілірэнтгенаў у гадзіну. Гэта вельмі сур'ёзна. Такая магутнасць дапускаецца як гранічная ў радыяцыйна небяспечных памяшканнях пры знаходжанні там не больш за шэсць гадзін. Першая здагадка — у актыўнай зоне разгерметызавалася абалонка аднаго з цеплавыдзяляльных элементаў. Праверылі — норма. А можа, перавозілі кантэйнер з радыехімічнай лабараторыі і так страсянулі па дарозе, што пашкодзілі нутраную абалонку, забрудзілі тэрыторыю? Паспрабуйце пасля гэтага адмыць пляму на асфальце! Што ж здарылася? А тут яшчэ ўнутранае радыё абвясціла: супрацоўнікам не рэкамендуецца выходзіць з будынка. Паміж карпусамі зрабілася пустэльна. Ніводнага чалавека. Жудліва. Незвычайна.

Дазіметрысты праверылі мой кабінет: «свеціць» стол, «свецяць» адзенне, сцены… Я падымаюся. У мяне няма жадання нават сядаць на крэсла. Вымыў галаву над ракавінай. Паглядзеў на дазіметр — эфект у наяўнасці. Няўжо гэта ўсё ж у нас, надзвычайнае здарэнне ў нашым інстытуце?! Уцечка? Як цяпер дэзактываваць аўтобусы, якія развозяць нас па горадзе? Супрацоўнікаў? Давядзецца напружыць мазгавыя звіліны… Я вельмі ганарыўся нашым рэактарам, я вывучыў яго да міліметра…

Тэлефануем на Ігналінскую атамную станцыю. Яна побач. У іх прыборы таксама крычма крычаць. Таксама паніка. Тэлефануем на Чарнобыль… На станцыі не адказвае ніводны тэлефон… Пад абед высвятляецца. На ўсім Мінскам радыеактыўнае воблака. Мы вызначылі — актыўнасць ёдная. Аварыя на нейкім рэактары…

Першая рэакцыя: пазваніць дадому жонцы, папярэдзіць. Але ўсе нашы тэлефоны ў інстытуце праслухоўваюць. О, гэты вечны страх, які ўбівалі нам у галовы дзесяцігоддзямі! Але ж яны там нічога не ведаюць… Дачка пасля заняткаў у кансерваторыі гуляе з сяброўкамі па горадзе. Есць марозіва. Пазваніць?! Аднак могуць быць непрыемнасці. Не дапусцяць да сакрэтных даследаванняў… Усё адно не вытрымліваю, падымаю трубку:

—Слухай мяне ўважліва.

—Пра што ты? — гучна перапытала мяне жонка.

—Цішэй. Зачыні форткі, усе прадукты — у поліэтыленавыя пакеты. Надзень гумовыя пальчаткі і пратры вільготнай анучкай усё, што можна. Анучку — таксама ў пакет і схавай як мага далей. Бялізну, што сохне на балконе, — назад мыць. Хлеб не купляй. І ні ў якім разе ніякіх піражкоў на вуліцы…

—Што ў вас здарылася?

—Цішэй. Развядзі дзве кроплі ёду ў шклянцы вады. Вымый галаву….

—Што… — Але я не даю жонцы дагаварыць, кладу трубку. Яна павінна зразумець: сама супрацоўніца нашага інстытута. А калі гэбіст слухаў, то, відаць, запісваў на паперку для сябе і сваёй сям'і выратавальныя рэкамендацыі.

У пятнаццаць трыццаць высветлілі — аварыя на чарнобыльскім рэактары…

Увечары вяртаемся ў Мінск на службовым аўтобусе. Паўгадзіны, што едзем, маўчым або перамаўляемся пра нешта неістотнае. Баімся загаварыць уголас адзін з адным пра тое, што здарылася. У кожнага — партбілет у кішэні…

Перад дзвярыма кватэры ляжала мокрая ануча. Значыцца, жонка ўсё зразумела. Заходжу. У вітальні скідваю з сябе касцюм, кашулю, распранаюся да майтак. Нечакана захлынаюся ад лютасці… Да д'ябла гэтую сакрэтнасць! Гэты страх! Бяру гарадскі тэлефонны даведнік… Тэлефонныя нататнікі дачкі, жонкі… Пачынаю ўсім запар званіць, што я — супрацоўнік Інстытута ядзернай энергетыкі, што над Мінскам радыеактыўнае воблака… І далей пералічваю, што трэба неадкладна рабіць: вымыць галаву гаспадарчым мылам, зачыніць форткі… Праціраць кожныя тры-чатыры гадзіны мокрай анучай падлогу. Бялізну з балкона — зноў мыць… Выпіць ёд. Як яго правільна прымаць… Рэакцыя людзей: дзякуй. Ні роспытаў, ні пярэпалаху. Я думаю, што яны мне не верылі або былі не здольныя асэнсаваць грандыёзнасць падзеі. Ніхто не спалохаўся. Рэакцыя дзіўная. Неверагодная!

Увечары тэлефануе мой сябар. Фізік-ядзершчык, доктар навук… Як бесклапотна! З якой верай мы жылі! Толькі цяпер гэта разумееш… Ён тэлефануе і кажа між іншага, што хоча паехаць на майскія святы да жончыных бацькоў на Гомельшчыну. Там жа побач Чарнобыль. Едзе з маленькімі дзецьмі. «Цудоўная задумка! — закрычаў я. — Ты што, з глузду з'ехаў?!» Гэта наконт прафесіяналізму. І наконт нашай веры. Я крычаў. Ён, напэўна, не памятае, што я выратаваў ягоных дзяцей… *(Перадыхнуўшы, працягвае.)*

Мы... Я кажу пра нас усіх... Мы Чарнобыль не забылі, мы яго не зразумелі. Што дзікуны маглі зразумець у маланцы?

У кнізе эсэ Алеся Адамовіча... Ягоная размова з Андрэем Сахаравым пра атамную бомбу... «А вы ведаеце, як хораша пахне азонам пасля ядзернага выбуху?» — усклікнуў акадэмік, бацька вадароднай бомбы. У гэтых словах рамантыка. Мая... Майго пакалення... Выбачайце, па твары бачу рэакцыю... Вам гэта здаецца захапленнем перад сусветным кашмарам, а не перад чалавечым геніем... Але гэта цяпер ядзерная энергетыка прыніжаная, зганьбаваная. Маё пакаленне... У сорак пятым, калі ўзарвалі атамную бомбу, мне было сямнаццаць гадоў. Я любіў фантастыку. Марыў паляцець на іншыя планеты, верыў, што ядзерная энергія падыме нас у космас. Паступіў у Маскоўскі энергетычны інстытут і там даведаўся, што ёсць звышсакрэтны факультэт — фізічна-энергетычны. Пяцідзясятыя-шасцідзясятыя гады... Фізікі-ядзершчыкі... Эліта... Усе ў захапленні перад будучыняй. Гуманітарыі на другім плане. У трох капейках, казаў наш школьны настаўнік, столькі энергіі, што можа працаваць электрастанцыя. Дыханне пераймала! Я зачытваўся амерыканцам Смітам, ён пісаў, як вынайшлі атамную бомбу, праводзілі выпрабаванні, дэталі выбуху. У нас усё трымалі ў сакрэце. Я чытаў... Уяўляў... Выйшаў фільм пра савецкіх атамнікаў «Дзевяць дзён аднаго года». Быў ён вельмі папулярны... Высокія заробкі, сакрэтнасць дадавалі рамантызму. Культ фізікі! Час фізікі! Нават ужо калі ў Чарнобылі рванула... Як павольна мы развітваліся з гэтым культам... Выклікалі вучоных... Яны прыляцелі на рэактар спецрэйсам, але шмат хто не захапіў з сабой нават брытваў, думалі, што ляцяць на некалькі гадзін. Хоць ім паведамілі, што на атамнай станцыі выбух. Але

яны верылі ў сваю фізіку. Яны ўсе былі з пакалення гэтай веры. Час фізікі ў Чарнобылі скончыўся…

У вас ужо іншы погляд на свет… У майго ўлюбёнага філосафа Канстанціна Лявонцьева нядаўна вычытаў думку пра тое, што вынікі фізічна-хімічнай распусты калі-небудзь прымусяць касмічны розум умяшацца ў нашы зямныя справы. А мы, выхаваныя ў сталінскія часы, мы не маглі ў сваіх думках дапусціць існавання нейкіх звышнатуральных сіл. Паралельных светаў… Біблію я прачытаў потым… І ажаніўся з адной і той самай жанчынай два разы. Сышоў і вярнуўся. Яшчэ раз сустрэліся… Хто мне растлумачыць гэты цуд? Жыццё — дзівосная рэч! Загадкавая! Цяпер я веру… У што я веру? Што трохмерны свет ужо цесны для сучаснага чалавека… Чаму сёння такая цікавасць да іншай рэальнасці? Да новых ведаў… Чалавек адрываецца ад зямлі… Ён мае справу з іншымі катэгорыямі часу, не толькі з адной Зямлёй, але і з рознымі светамі. Апакаліпсіс… Ядзерная зіма… У заходнім мастацтве ўсё гэта ўжо апісанае. Намаляванае. Знятае ў кіно. Яны рыхтаваліся да будучыні… Выбух вялікай колькасці ядзернай зброі выкліча гіганцкія пажары. Атмасфера насыціцца дымам. Сонечныя промні не змогуць прабівацца да зямлі, а там пачнецца ланцуговая рэакцыя холадна, халадней, халадней. Гэтую нецаркоўную версію пра канец свету ўкараняюць з часоў прамысловай рэвалюцыі васямнаццатага стагоддзя. Але атамныя бомбы не знікнуць нават тады, калі знішчаць апошнюю боегалоўку… Застануцца веды…

Вы маўчыце… А я з вамі ўвесь час спрачаюся… У нас спрэчка паміж пакаленнямі… Вы заўважаеце? Гісторыя атаму — гэта не толькі вайсковы сакрэт, таямніца, праклён. Гэта — наша юнацтва, наш час. Наша рэлігія… Але цяпер? Цяпер мне таксама здаецца, што

светам кіруе хтосьці іншы, што мы са сваімі гарматамі і касмічнымі караблямі — як дзеці. Але я ў гэтым яшчэ не пераканаўся… Не ўпэўнены… Дзівосная рэч — жыццё! Я любіў фізіку і думаў: нічым, апрача фізікі, займацца ніколі не буду. А цяпер хачу пісаць. Напрыклад, пра тое, што навуку чалавек не задавальняе, цёплы чалавек, ён ёй перашкаджае. Маленькі чалавек са сваімі маленькімі праблемамі. Або: як некалькі фізікаў могуць змяніць увесь свет. Пра новую дыктатуру. Дыктатуру фізікі і матэматыкі… Мне адкрылася яшчэ адно жыццё…

Перад аперацыяй… Я ўжо ведаў, што ў мяне рак… Я думаў, што мне засталіся лічаныя дні, і страшэнна не хацелася паміраць. Раптам я ўбачыў кожны лісток, яркія кветкі, неверагодна яркі шэры асфальт, расколіны на ім, а ў іх завіхаюцца мурашкі. Не, думаю, іх трэба абыходзіць. Шкада іх. Не хачу, каб яны паміралі. Ад лясных пахаў у мяне кружылася галава… Пах успрымаўся мацней за колер. Лёгкія бярозы… Цяжкія яліны… І ўсяго гэтага я не ўбачу? На секунду, на хвіліну больш пражыць! Навошта я столькі часу, гадзін, дзён прасядзеў каля тэлевізара, сярод кучы газет? Галоўнае — жыццё і смерць. Нічога іншага не існуе. Не кінеш на шалі вагаў…

Я зразумеў, што сэнс мае толькі жывы час… Наш жывы час…

*Валянцін Аляксеевіч Барысевіч, былы загадчык лабараторыі Інстытута ядзернай фізікі Акадэміі навук Беларусі*

## Маналог пра тое, што далей за Калыму, Асвенцім і Халакост

Мне трэба выказацца… Мяне перапаўняюць пачуцці…

У першыя дні… Адчуванні былі змяшаныя… Памятаю два найбольш моцныя пачуцці — пачуццё страху

і пачуццё крыўды. Усё адбылося, і ніякай інфармацыі: улада маўчыць, медыкі нічога не кажуць. Ніякіх адказаў. У раёне чакалі ўказанняў з вобласці, у вобласці — з Мінска, а ў Мінску — з Масквы. Доўгі-доўгі ланцужок... А насамрэч мы аказаліся безабароннымі. Вось гэта было ў тыя дні галоўным пачуццём. Недзе далёка — Гарбачоў... І яшчэ некалькі чалавек... Два-тры чалавекі вырашалі наш лёс. Вырашалі за ўсіх. Лёс мільёнаў людзей. І ўсяго некалькі чалавек маглі нас забіць... Не маньякі і не злачынцы з тэрарыстычным планам у галаве, а звычайныя дзяжурныя аператары на атамнай станцыі. Напэўна, нядрэнныя хлопцы. Калі я гэта зразумела, я перажыла моцнае ўзрушэнне. Я адкрыла для сябе штосьці такое... Я зразумела, што Чарнобыль далей за Калыму і Асвенцім... І далей за Халакост... Я зразумела кажу? Чалавек з сякерай і лукам або чалавек з гранатамётам і газавымі камерамі не мог забіць усіх. Але чалавек з атамам... Тут... Уся Зямля ў небяспецы...

Я не філосаф, не стану філасофстваваць. Раскажу тое, што памятаю...

Паніка першых дзён: хтосьці кінуўся ў аптэкі і накупляў ёду, хтосьці пакінуў хадзіць на рынак, купляць там малако, мяса, асабліва ялавічыну. У нашай сям'і ў гэты час стараліся не ашчаджаць, бралі дарагую каўбасу, спадзеючыся, што яна з добрага мяса. Але хутка даведаліся, што менавіта ў дарагую каўбасу падмешвалі забруджанае мяса, маўляў, калі яна дарагая, яе купляюць меней, ядуць меней. Мы аказаліся безабароннымі. Але гэта ўсё вам, канешне, вядома. Хачу расказаць пра іншае. Пра тое, што мы былі пакаленнем савецкім.

Мае сябры — дактары, настаўнікі. Мясцовая інтэлігенцыя. У нас быў свой гурток. Сабраліся ў мяне дома.

П'ём каву. Сядзяць дзве неразлучныя сяброўкі, адна з іх доктар. У абедзвюх маленькія дзеці.

Першая:

—Заўтра паеду да бацькоў. Завязу дзяцей. Раптам захварэюць, потым ніколі сабе не дарую.

Другая:

—У газетах пішуць, што праз некалькі дзён абстаноўка нармалізуецца. Там — нашы войскі. Верталёты, бронетэхніка. Па радыё паведамлялі…

Першая:

—Табе таксама раю: вывезі дзяцей! Схавай! Здарылася… Здарылася нешта страшнейшае за вайну… Мы нават не можам сабе ўявіць — што.

Нечакана яны перайшлі на высокія тоны і пасварыліся. Скончылася ўзаемнымі абвінавачваннямі:

—Дзе твой інстынкт маці? Фанатычка!

—Ты — здрадніца! Што б з намі было, калі б кожны паводзіў сябе, як ты? Ці перамаглі б мы ў вайну?

Спрачаліся дзве маладыя прыгожыя жанчыны, якія неверагодна любілі сваіх дзяцей. Нешта паўтаралася… Знаёмая партытура…

І ўва ўсіх, хто там быў… І маё, у прыватнасці, адчуванне — яна, першая з сяброўак, нясе трывогу. Пазбаўляе нас раўнавагі. Даверу да ўсяго, чаму мы прывыклі давяраць. Трэба дачакацца, пакуль скажуць. Аб'явяць. Яна — доктар, ведала больш: «Сваіх дзяцей не здольныя абараніць. Вам ніхто не пагражае! А вы ўсё адно баіцеся!»

Як мы ёю ў тыя хвіліны пагарджалі, нават ненавідзелі яе. Яна сапсавала нам вечар. Вы разумееце? Не толькі ўлада падманвала нас, але мы самі не хацелі ведаць праўды. Дзесьці там… У глыбіні падсвядомасці… Канечне, цяпер мы не хочам сабе ў гэтым прызнавацца,

нам больш падабаецца лаяць Гарбачова... Лаяць камуністаў... Гэта яны вінаватыя, а мы — добрыя. Мы — ахвяры.

На наступны дзень яна з'ехала, а мы па-святочнаму апранулі сваіх дзяцей і павялі іх на першамайскую дэманстрацыю. Маглі ісці, а маглі і не ісці. Мы мелі выбар. Нас ніхто не прымушаў, не патрабаваў. Але мы палічылі гэта сваім абавязкам. Ну як жа іначай! У такі час, у такі дзень... Усе мусяць быць разам. Беглі на вуліцу, у натоўп...

На трыбуне стаялі ўсе сакратары райкома партыі, побач з першым сакратаром — ягоная маленькая дачка, яна стаяла так, каб яе бачылі. На ёй — плашч і шапачка, хоць свяціла сонца, а на ім — вайсковая плашч-палатка. Але яны стаялі... Гэта я памятаю... «Забруджаная» не толькі наша зямля, але і наша свядомасць. І таксама на шмат гадоў.

Я змянілася за гэтыя гады больш, чым за ўсё сваё ранейшае жыццё — за сорак гадоў. Мы зачыненыя ў зоне... Адсяленне спынілася. І мы жывём як у ГУЛагу... Чарнобыльскім ГУЛагу... Я працую ў дзіцячай бібліятэцы. Дзеці чакаюць размовы: Чарнобыль паўсюль, ён навокал, у нас няма выбару — трэба навучыцца з ім жыць. Асабліва старшакласнікі, у іх пытанні. А як? Дзе пра гэта даведацца? Прачытаць? Няма кніг. Фільмаў. Нават казак няма. І міфаў. Я вучу любоўю, я хачу перамагчы страх любоўю. Стаю перад дзецьмі: люблю нашу вёску, люблю нашу рэчку, нашы лясы... Самыя лепшыя! Лепей за іх для мяне няма. Я не хлушу. Я вучу любоўю. Вы разумееце?

Мне перашкаджае настаўніцкі досвед... Я заўсёды кажу і пішу крыху высакамоўна, з нямодным сёння пафасам. Але я адказваю на ваша пытанне: чаму

мы бяссільныя? Я бяссільная... Ёсць дачарнобыльская культура, але няма паслячарнобыльскай культуры... Жывём сярод ідэй вайны, краху сацыялізму і няпэўнай будучыні. Не хапае новых уяўленняў, мэтаў, думак. Дзе нашы пісьменнікі, філосафы? Я ўжо не кажу пра тое, што наша інтэлігенцыя, якая больш за ўсіх чакала і падрыхтоўвала, набліжала свабоду, сёння адкінутая на ўзбочыну. Жабрацкая і прыніжаная. Мы аказаліся не запатрабаваныя. Не патрэбныя. Я не магу купіць нават неабходных кніг, а кнігі — маё жыццё. Мне... нам... як ніколі патрэбныя новыя кнігі, бо навокал новае жыццё. Але мы ў ім чужыя. Не здольныя з гэтым зміррыцца. Увесь час ува мне пытанне — чаму? Хто будзе рабіць нашу працу? Тэлевізар дзяцей не навучыць, вучыць дзяцей павінен настаўнік. Але гэта — асобная тэма...

Я ўспомніла... Дзеля праўды тых дзён і нашых пачуццяў. Каб не забыць, як мяняліся мы... І наша жыццё...

*Людміла Дзмітрыеўна Палянская, вясковая настаўніца*

## Маналог пра свабоду і мару пра звычайную смерць

Гэта была свабода. Там я адчуваў сябе свабодным чалавекам...

Вы здзівіліся? Бачу... Вы здзівіліся... Зразумець гэта можа толькі той, хто быў на вайне. Яны вып'юць, мужыкі, якія ваявалі, і ўспамінаюць, я іх слухаў, у іх дагэтуль туга. Туга па той свабодзе, па тым узлёце. «Ні кроку назад!» — сталінскі загад. Заградатрады. Ну, вядома... Гэта ўжо гісторыя... Але ты страляеш, выжываеш, атрымліваеш належныя сто грамаў, махорку... Тысячу разоў можаш памерці, разляцецца на кавалкі, але калі пастараешся, перахітрыш — чорта, д'ябла, старшыну,

камбата, таго, хто ў чужой касцы і з чужым штыком, угаворыш самога Усявышняга — ты можаш выжыць! Я быў на рэактары... Там — як у акопе на перадавой. Страх і свабода! Жывеш на поўную катушку... У звычайным жыцці гэтага не зразумееш. Не дойдзе. Памятаеце, нас увесь час рыхтавалі: будзе вайна. А свядомасць аказалася не гатовай. Я быў не гатовы... У той дзень... Збіраліся пайсці з жонкай у кіно... Прыйшлі на завод двое вайскоўцаў. Выклікалі мяне: «Салярку ад бензіну адрозніш?» Пытаюся: «Куды пасылаеце?» — «Куды-куды. Добраахвотнікам у Чарнобыль». Мая вайсковая прафесія — спецыяліст па ракетным паліве. Сакрэтная спецыяльнасць. Забралі проста з завода, у адной майцы і футболцы, дадому не далі заскочыць. Прасіў: «Жонку трэба папярэдзіць». — «Мы самі паведамім». У аўтобусе нас сабралася чалавек пятнаццаць, афіцэры запасу. Мужыкі мне спадабаліся. Трэба — паехалі, трэба — працуем... Пагналі на рэактар — палезлі на дах рэактара...

Каля выселеных вёсак стаялі вышкі, салдаты на вышках — са зброяй. Аўтаматы з патронамі. Шлагбаумы. Таблічкі: «Узбочына забруджаная. Заязджаць і спыняцца забаронена». Шэра-белыя дрэвы, аблітыя дэзактывацыйнай вадкасцю. Белай як снег. Мазгі адразу — набакір! У першыя дні баяліся сесці на зямлю, на траву, не хадзілі, а бегалі, ледзь машына праедзе — нацягвалі рэспіратары. Пасля змены сядзелі ў палатках. Ха-ха! Праз пару месяцаў... Гэта ўжо нешта нармальнае — гэта ўжо тваё жыццё. Рвалі слівы, брадніком рыбу лавілі, там шчупакі такія — о-го-го! І ляшчы. Ляшчоў сушылі да піва. Вы пра гэта, відаць, ужо чулі? У футбол гулялі. Купаліся! Ха-ха... *(Зноў смяецца.)* Верылі ў лёс, у глыбіні душы мы ўсе фаталісты, а не аптэкары. Не рацыяналісты. Менталітэт славянскі... Я верыў у сваю

зорку! Ха-ха! Інвалід другой групы... Захварэў адразу. Прамянёвая праклятая... Ну ясна... А ў мяне датуль нават медыцынскай карткі ў паліклініцы не было. Чорт з ім! Не я адзін... Менталітэт...

Я — салдат, я зачыняў чужы дом, заходзіў у чужое жытло. Гэта такое пачуццё... Ты як быццам падглядваеш за некім... Або зямля, на якой нельга сеяць... Карова тыцкаецца ў весніцы, а яны зачыненыя, а на доме замок. Малако крапае на зямлю... Гэта такое пачуццё! У яшчэ не адселеных вёсках сяляне гналі самагонку, гэта быў іхні заробак. Прадавалі нам. А ў нас грошай — поўныя кішэні: трайныя аклады на працы, і сутачныя выдавалі трайныя. Потым выйшаў загад: таго, хто будзе піць, пакінуць на другі тэрмін. Дык дапамагае гарэлка ці не? Ну хоць псіхалагічна... Там у гэты рэцэпт шчыра верылі. Ну ясна...

Сялянскае жыццё кацілася проста: нешта пасадзіў, вырасціў, сабраў, а ўсё астатняе ідзе без іх. Ім няма справы ні да цара, ні да першага сакратара цэка, ні да прэзідэнта... Касмічныя караблі і атамныя станцыі, мітынгі ў сталіцы — не іхні клопат. І яны не маглі паверыць, што свет за адзін дзень перакуліўся і яны жывуць ужо ў іншым свеце... Чарнобыльскім... Яны ж нікуды не выязджалі. Людзі пачыналі хварэць ад узрушэння. Яны не скараліся, яны хацелі жыць як заўсёды. Дровы з сабой забіралі ўпотай, зялёныя памідоры збіралі, закатвалі. Слоікі ўскрываліся — яшчэ раз кіпяцілі. Як гэта знішчыць, закапаць, ператварыць у смецце? А мы якраз гэтым і займаліся. Анулявалі іх працу, адвечны сэнс іхняга жыцця. Мы для іх былі ворагі...

А я рваўся на сам рэактар. «Не спяшайся, — папярэджвалі мяне, — у апошні месяц, перад дэмбелем, усіх на дах гоняць». Служылі мы шэсць месяцаў.

І сапраўды, праз пяць месяцаў перадыслакацыя, цяпер ужо пад самы рэактар. Жарцікі розныя і сур'ёзныя размовы, што вось праз дах пройдзем... Ну няхай пяць гадоў пасля гэтага працягнем... Сем... Дзесяць... Ясная справа... Чамусьці найчасцей называлася лічба «пяць». Адкуль яна ўзялася? Без шуму, без панікі. «Добраахвотнікі, крок наперад!» Уся рота — крок наперад. Перад камандзірам — манітор, уключае — на экране дах рэактара: кавалкі графіту, расплаўлены бітум. «Вунь, хлопцы, бачыце — абломкі ляжаць. Трэба пачысціць. А вось тут, у гэтым квадраце, тут трэба зрабіць адтуліну». Час — сорак-пяцьдзясят секунд. Паводле інструкцыі. Але гэта немагчыма, трэба хоць некалькі хвілін. Туды — назад, забег — кідок. Хтосьці нагрузіў насілкі, іншыя скінулі. Туды, у разваліны, у дзірку. Скінуў. Але ўніз не глядзі, нельга. Усё адно зазіралі. Газеты пісалі: «Паветра над рэактарам чыстае». Чыталі і смяяліся. Мацюкаліся. Паветра чыстае, а мы такія дозы хапаем. Выдалі дазіметры. Адзін — на пяць рэнтгенаў, ён з першай хвіліны зашкальваў, другі, як аўтаручка, на сотню рэнтгенаў, таксама ў некаторых месцах зашкальваў. Пяць гадоў, сказалі. Дзяцей нельга будзе мець... Калі за пяць гадоў не памром... Ха-ха!..*(Смяецца.)*

Уручалі нам граматы. Іх у мяне дзве... З усімі гэтымі карцінкамі: Маркс, Энгельс, Ленін... Чырвоныя сцягі... Адзін хлопец знік, думалі, што ўцёк. Праз два дні знайшлі ў хмызняку. Павесіўся. Пачуццё такое ўва ўсіх, самі разумееце... Тады выступіў замп аліт, маўляў, ён ліст з дому атрымаў — жонка яму здрадзіла. Хто яго ведае? Праз тыдзень у нас дэмбель, а яго ў хмызняку знайшлі... Быў у нас кухар, дык ён так баяўся, што жыў не ў палатцы, а на складзе — выкапаў сабе нішу пад скрынкамі з маслам і тушанінай. Перанёс туды матрац,

падушку... Жыў пад зямлёй... Прысылаюць разнарадку: набраць новую каманду — і ўсіх на дах. А ўсе там ужо былі. Знайсці людзей! Ну і яго залічылі. Адзін толькі раз залез... Другая група інваліднасці... Звоніць мне часта. Сувязі не губляем, трымаемся адзін за аднаго... За сваю памяць, яна будзе жыць столькі, колькі мы пражывем. Так і напішыце...

У газетах хлусня... Суцэльная хлусня... Нідзе не чытаў, як шылі мы сабе кальчугі. Кашулі свінцовыя. Майточкі. Нам выдавалі гумовыя халаты са свінцовым напыленнем. Але плавачкі свінцовыя мы самі сабе майстравалі... За гэтай справай сачылі... Ну ясна... У адной вёсцы нам паказалі два таемныя дамы спатканняў... Усе туды наведваліся. Мужчыны, адарваныя ад дому, шэсць месяцаў без жанчын, экстрэмальная сітуацыя. І дзеўчынёшкі мясцовыя гулялі — усё адно, плакалі, хутка памром. Плавачкі свінцовыя надзявалі наверх на штаны... Напішыце... Анекдоты бясконцыя... Вось, калі ласка. Амерыканскі робат выправілі на дах, пяць хвілін працы і — стоп. Японскі робат дзевяць хвілін адпрацаваў — стоп. Рускі робат дзве гадзіны працуе. Каманда па рацыі: «Радавы Іваноў, можаце спусціцца ўніз на перакур». Ха-ха!

Перад тым як нам выходзіць на рэактар, камандзір дае інструктаж... Ставіць у шарэнгу... Некалькі хлопцаў узбунтаваліся: «Мы ўжо там былі, нас дадому павінны адправіць». Мая, напрыклад, справа — паліва, бензін, а мяне таксама на дах пасылалі. Але я маўчаў. Я сам хацеў, мне было цікава. А гэтыя ўзбунтаваліся. Камандзір: «У нас на дах пойдуць добраахвотнікі, астатнія крок наперад, з вамі правядзе гутарку пракурор». Ну, гэтыя хлопцы пастаялі, параіліся і пагадзіліся. Прысягу прымаў — значыць, мусіш. Сцяг цалаваў... На калена перад сцягам станавіўся... Мне здаецца, ніхто з нас не

сумняваўся, што могуць тэрмін даць і пасадзіць. Чутку пусцілі, што два-тры гады даюць. Калі салдат атрымліваў больш за дваццаць пяць рэнтгенаў, то камандзіра маглі пасадзіць за тое, што апраменіў асабовы склад падначаленых… Ні ў кога больш за дваццаць пяць рэнтгенаў… Ува ўсіх меней… Разумееце? Але людзі мне падабаліся. Двое захварэлі, знайшоўся адзін, сам сказаў: «Давайце я». А ён ужо адзін раз на даху быў у той дзень. Запаважалі. Прэмія — пяцьсот рублёў. Другі яму зверху рабіў, трэба сыходзіць — дзяўбе. Мы яму махаем: «Уніз!» А ён на калені ўпаў і дабівае. Дах трэба было прабіць у тым месцы, каб жолаб паставіць, смецце спускаць. Пакуль не прабіў — не спусціўся. Прэмія — тысяча рублёў. За гэтыя грошы тады можна было купіць два матацыклы. У яго цяпер першая група інваліднасці. Ну ясна… Але за страх плацілі адразу. І вось ён памірае. Цяпер памірае… Страшэнна пакутуе… На гэтых выходных ездзіў да яго… «Спытай, пра што я мару?» — «Пра што?» — «Пра звычайную смерць». Яму сорак гадоў. Жанчын любіў. Жонка прыгожая…

Дэмбель. Загрузіліся ў машыны. Колькі ехалі па зоне, столькі сігналілі. Я азіраюся на тыя дні… Я быў побач з нечым… З нечым фантастычным. Але гэтыя словы — «гіганцкі», «фантастычны» — яны ўсяго гэтага не перадаюць. Было такое пачуццё… Якое? *(Задумаўся.)*

Такое пачуццё я не перажываў нават у каханні…

*Аляксандр Кудрагін, ліквідатар*

## Маналог пра пачварку, якую ўсё адно будуць любіць

Не саромейцеся… Пытайцеся… Пра нас ужо столькі напісалі, мы прызвычаіліся. Бывае, што і газету пры-

шлюць. Але я не чытаю. Хто нас зразумее? Нам тут жыць…

Мая дачка нядаўна сказала: «Мама, калі я нараджу пачварку, я ўсё адно буду яе любіць». Уяўляеце?! Яна вучыцца ў дзясятым класе. У яе ўжо такія думкі. Яе сяброўкі… Яны ўсе пра гэта думаюць… У нашых знаёмых нарадзіўся хлопчык… Чакалі яго, першае дзіця. Прыгожая маладая пара. А ў хлопчыка рот да вушэй, а аднаго вушка няма… Я не хаджу да іх, як раней. Няма сіл… А дачка раз-пораз забягае. Яе цягне туды, яна ці то прыглядаецца, ці то прымерваецца… А я не магу…

Маглі б з'ехаць адсюль, але паразважалі з мужам і адмовіліся. Баімся іншых людзей. А тут мы ўсе — чарнобыльцы. Не палохаемся адно аднаго. Калі хтосьці частуе яблыкамі ці гуркамі са свайго саду і гароду, бярэм іх і ямо, а не хаваем сарамліва ў кішэню або сумачку. Каб потым выкінуць. Мы — з адной памяццю. З аднолькавым лёсам… А паўсюль, у любым іншым месцы, мы — чужыя. Касавурацца на нас з асцярогаю… Усе прывыклі да слоў «чарнобыльцы», «чарнобыльскія дзеці», «чарнобыльскія перасяленцы»… Чарнобыль… Цяпер — прыстаўка да ўсяго нашага жыцця. Але вы нічога пра нас не ведаеце. Вы баіцеся нас… Уцякаеце… Напэўна, калі б нас не выпускалі адсюль, калі б паставілі міліцэйскія кардоны, шмат хто з вас супакоіўся б. *(Спыняецца.)* Не даводзьце мне нічога… Не пераконвайце! Я гэта даведалася і перажыла ў першыя дні… Схапіла дачку і рынулася ў Мінск, да сястры… Мая родная сястра не пусціла нас у дом, бо мела малое грудное дзіця. У страшным сне я такога б не ўявіла! Не прыдумала б. І мы начавалі на вакзале. Вар'яцкія думкі прыходзілі ў галаву… Куды нам бегчы? Можа, лепей накласці на сябе рукі, каб не пакутаваць?.. Гэта ж першыя дні… Вы ўяўляеце

нейкія страшныя хваробы… Усе ўяўлялі нейкія страшныя хваробы. Неверагодныя. А я ж доктар. Можна толькі здагадвацца, што рабілася з іншымі… Чуткі заўсёды жахлівейшыя за любую праўдзівую інфармацыю. Любую! Я гляджу на нашых дзяцей: куды б яны ні паехалі, яны адчуваюць сябе адрынутымі. Жывымі страшылкамі… Мішэнямі для кпінаў… У піянерскім лагеры, дзе мая дачка адзін год адпачывала, да яе баяліся дакрануцца: «Чарнобыльскі светлячок. Яна ў цемры свеціцца». Клікалі ўвечары на двор, каб спраўдзіць: свеціцца ці не свеціцца? Ці няма ў яе німба над галавой…

Вось кажуць — вайна… Ваеннае становішча… Параўноўваюць… Ваеннае пакаленне? Ды яно ж шчаслівае! У іх была Перамога. Яны перамаглі! Гэта дало ім магутную энергію жыцця, калі карыстацца сённяшнімі словамі — наймацнейшую ўстаноўку на выжыванне. Яны нічога не баяліся... Хацелі жыць, вучыцца, нараджаць дзяцей, а мы? Мы ўсяго баімся… Баімся за дзяцей… За ўнукаў, якіх яшчэ няма… Іх няма, а нам ужо страшна… Людзі менш усміхаюцца. Не спяваюць, як раней спявалі на святы. Не толькі ландшафт мяняецца, калі замест палёў зноў падымаюцца лясы, хмызняк, але і нацыянальны характар. Ува ўсіх дэпрэсія… Пачуццё асуджанасці… Для кагосьці Чарнобыль — метафара. Лозунг. А тут — нашае жыццё. Проста жыццё.

Іншым разам думаю, што лепей бы пра нас не пісалі. Не назіралі б збоку… Не ставілі б дыягназы: радыефобія або нешта яшчэ, не вылучалі б сярод астатніх. Тады б нас менш баяліся. Не кажуць жа ў доме анкалагічнага хворага пра ягоную страшную хваробу. А ў камеры пажыццёвага зняволення ніхто не згадвае пра тэрмін… *(Маўчыць.)* Столькі нагаварыла, не ведаю, трэба вам або не… *(Пытаецца.)* Сабраць на стол? Папалуднуем

ці баіцеся? Адказвайце сумленна, мы ўжо не крыўдуем. Мы ўжо ўсяго наглядзеліся. Да мяне заходзіць адзін карэспандэнт... Бачу: хоча піць. Я нясу яму кубак вады, а ён дастае з сумкі сваю ваду. Мінеральную. Яму сорамна... Апраўдваецца... Размовы ў нас, вядома, не атрымалася, я не магла з ім быць шчырай. Я ж не робат і не камп'ютар. Не жалезка! Ён п'е сваю мінеральную ваду, баіцца да майго кубка дакрануцца, а я павінна пакласці яму душу на стол... Аддаць яму сваю душу...

*(Ужо сядзім за сталом. Палуднуем.)*

Учора ўсю ноч праплакала... Муж успомніў: «Ты была такая прыгожая». Я ведаю, пра што ён... Бачу сябе ў люстэрку. Кожнае раніцы... Тут людзі хутка старэюць, мне сорак гадоў, а можна даць усе шэсцьдзясят. Таму дзяўчаткі замуж і спяшаюцца. Юнацтва шкада, яно ў іх кароткае. *(Зрываецца.)* Ну што вы ведаеце пра Чарнобыль? Што можна запісаць? Даруйце... *(Маўчыць.)*

Як запісаць маю душу? Калі я сама яе не заўсёды чытаю...

*Надзея Апанасаўна Буракова, жыхарка горада Хойнікі*

## Маналог пра тое, што да звычайнага жыцця трэба нешта дадаць, каб гэтае жыццё зразумець

Вам трэба факты, дэталі тых дзён? Ці мая гісторыя?

Я там стаў фатографам... Датуль фатаграфіяй ніколі не займаўся, а там раптам пачаў здымаць, са мной выпадкова аказаўся фотаапарат. Так, думаў, для сябе. А цяпер гэта — мая прафесія. Я не змог вызваліцца ад новых пачуццяў, гэта былі не кароткія перажыванні, а цэлая

гісторыя маёй душы. Я змяніўся… Убачыў свет іншым… Разумееце?

*(Гаворыць і раскладае на стале, крэслах, падаконніках фатаграфіі: гіганцкі, памерам з кола ад падводы, сланечнік; буслянка ў пустой вёсцы; адзінокія вясковыя могілкі з прыбрамнай таблічкай: «Высокая радыяцыя. Уваход і заезд забаронены»; дзіцячы вазок у двары дома з забітымі вокнамі, на вазку, як над сваім гняздом, сядзіць варона; спрадвечны жураўліны ключ над здзічэлымі палямі…)*

Пытаюцца: «Чаму не здымаеш на каляровую стужку? У колеры?» Але ж Чарнобыль… Чорная быль… Астатніх фарбаў не існуе… Мая гісторыя? Каментарый да гэтага… *(Паказвае на фатаграфіі.)* Добра. Паспрабую. Разумееце, усё гэта ёсць тут… *(Зноў паказвае на здымкі.)* У той час я працаваў на заводзе, а завочна вучыўся ва ўніверсітэце на гістарычным. Слесар другога разраду. Нас набралі ў групу і ў тэрміновым парадку адправілі. Як на фронт.

— Куды едзем?

— Куды загадаюць.

— Што будзем рабіць?

— Што загадаюць.

— Але мы — будаўнікі.

— Вось і будзеце будаваць. Адбудоўваць.

Будавалі падсобныя памяшканні: пральні, сховішчы, павеці. Мяне паставілі разгружаць цэмент. Які цэмент, адкуль — ніхто не правяраў. Загружалі, выгружалі. Дзень махаеш рыдлёўкай, пад вечар адны зубы блішчаць. Чалавек з цэменту. Шэры. І сам, і спяцоўка наскрозь. Увечары яе вытрас, разумееце, а ўранні зноў надзеў. Праводзілі з намі палітгутаркі. Героі, подзвіг, на пярэднім краі… Ваенная лексіка… А што такое бэр?

Кюры? Што такое мілірэнтген? Задаём пытанні, камандзір растлумачыць не можа, у вайсковай вучэльні гэтаму не вучылі. Мілі, мікра... Кітайская грамата. «Навошта вам ведаць? Выконвайце, што загадаюць. Тут вы — салдаты». Мы — салдаты, але не зэкі.

Прыехала камісія. «Ну, — супакойваюць, — у вас усё нармальна. Фон нармальны. Вось за чатыры кіламетры адсюль, там жыць нельга, людзей будуць высяляць. А ў вас спакойна». З імі дазіметрыст, ён узяў ды і ўключыў скрынку, што ў яго на плячы вісела, і даўгім гэтым шастом — па нашых ботах. І як адскочыць убок — міжвольная рэакцыя...

Вось тут пачынаецца самае цікавае, для вас — як пісьменніцы — асабліва. Як доўга, вы думаеце, мы ўспаміналі пра гэты момант? Ну, можа, некалькі дзён, не больш. Не здольны наш чалавек думаць толькі пра сябе, пра ўласнае жыццё, быць такой замкнёнай сістэмай. Палітыкі нашы не здольныя думаць пра каштоўнасць жыцця, але і сам чалавек — таксама. Разумееце? Не так мы зробленыя. З іншага цеста. Канешне, усе мы там пілі, і прытым моцна пілі. Да адбою цвярозых не заставалася, але пілі не каб напіцца, а каб паразмаўляць. Пасля першых дзвюх чарак хтосьці засумуе, успомніць жонку, дзяцей, аб сваёй працы раскажа. Начальства мацюкамі абкладзе. Але потым, пасля адной-дзвюх пляшак... Размовы толькі пра лёс краіны і пра будову Сусвету. Спрэчкі пра Гарбачова і Лігачова. Пра Сталіна. Вялікая мы дзяржава або не, абгонім ці не абгонім амерыканцаў? Восемдзесят шосты год... Чые самалёты лепшыя, а касмічныя караблі — больш надзейныя? Ну, Чарнобыль выбухнуў, але наш чалавек першым вырваўся ў космас! Разумееце? Да сіпаты, да раніцы спрэчкі. Пра тое, чаму ў нас няма дазіметраў і не даюць якіх-небудзь парашкоў

на ўсякі выпадак. Няма пральных машын, каб спяцоўкі мыць кожны дзень, а не два разы на месяц, — гэта абмяркоўвалася ў апошнюю чаргу. Мімаходзь. Ну з такога вось мы цеста. Чорт пабяры!

Гарэлка цанілася даражэй, чым золата. Купіць немагчыма. У навакольных вёсках выпілі ўсё: гарэлку, самагонку, ласьён, дайшлі да лакаў, аэразоляў... На стале — трохлітровы слоік з самагонкай або сетка з адэкалонам «Шыпр»... І размовы-размовы. Сярод нас былі настаўнікі, інжынеры... Поўны інтэрнацыянал: рускія, беларусы, казахі, украінцы. Філасофскія размовы. Пра тое, што мы — у палоне ў матэрыялізму, а матэрыялізм абмяжоўвае нас рэчыўным светам. Чарнобыль — выйсце ў бясконцасць. Я памятаю, як дыскутавалі пра лёс рускай культуры, пра яе прыцягненне да трагічнага. Без ценю смерці нічога нельга зразумець. Толькі на аснове рускай культуры і можна будзе асэнсаваць катастрофу. Толькі яна да гэтага гатовая. Жыла прадчуваннем... Баяліся бомбы, атамнага грыба, а вось як атрымалася... Хірасіма — гэта страшна, але ўжо зразумела... А тут... Ведаем, як гарыць дом ад запалкі або снарада, ну а гэта ні да чаго не падобнае. Даходзілі чуткі, што агонь неземны, нават не агонь, а святло. Мігценне. Ззянне. Не сінеча, а блакіт. І не дым. На месцы багоў раней урачыста сядзелі вучоныя, а цяпер там — анёлы-адступнікі. Дэманы! Чалавечая натура як была, так і засталася для іх таямніцай. Я — рускі, з Браншчыны. У нас, разумееце, сядзіць дзед на парозе, дом скасабочыўся, хутка развалiцца, а ён філасофствуе, свет перабудоўвае. Абавязкова знойдзецца свой Арыстоцель у любой заводскай курылцы. У піўбары. А мы — пад самым рэактарам...

Да нас залятаюць газетныя рэпарцёры. Здымалі. Сюжэты надуманыя. Здымаюць вакно пакінутай хаты,

кладуць перад ім скрыпку... І называюць — «Чарнобыльская сімфонія». А там нічога не трэба было прыдумляць. Хацелася пакінуць у памяці ўсё: расціснуты трактарам глобус у школьным двары, пачарнелую памытую бялізну, якая ўжо некалькі гадоў вісіць на балконе, пастарэлыя ад дажджоў лялькі... Закінутыя брацкія магілы... Трава на іх упоравень з гіпсавымі салдатамі, а на гіпсавых аўтаматах — птушыныя гнёзды. Дзверы ў доме выбітыя, ужо ўсё каштоўнае вынеслі адтуль марадзёры, а фіранкі на вокнах зашморгнутыя. Людзі пайшлі, засталіся жыць у хатах фатаграфіі. Быццам іхнія душы. Не было нічога неістотнага, дробнага. Усё хацелася запомніць дакладна і падрабязна: час дня, калі гэта ўбачыў, колер неба, свае адчуванні. Разумееце? Чалавек пакінуў гэтыя мясціны назаўсёды. А што гэта такое? Мы — першыя людзі, якія перажылі гэтае «назаўсёды». Нельга забыць ніводнай драбніцы. Твары старых сялян, падобныя да абразоў... Ім найменш з усіх было зразумела, што здарылася. Яны ніколі не пакідалі свайго двара, сваёй зямлі. З'ўляліся на свет, любіліся, здабывалі мазольнаю працай хлеб свой надзённы, працягвалі род. Чакалі ўнукаў. І, пражыўшы жыццё, пакорліва пакідалі гэтую зямлю, сыходзілі ў яе, самі робячыся ёю. Беларуская хата! Гэта для нас, гараджан, дом — машына для жыцця. А для іх — цэлы свет. Космас. Едзеш праз пустыя вёскі... І так хочацца сустрэць чалавека. Разрабаваная царква... Мы зайшлі — пахла воскам. Захацелася памаліцца...

Я хацеў усё гэта запомніць. Я пачаў фатаграфаваць... Гэта — мая гісторыя...

Нядаўна пахаваў знаёмага, з якім быў там. Ён памёр ад раку крыві. Памінкі. Па славянскім звычаі выпілі, закусілі, разумееце? І завязаліся размовы, да поўначы.

Спачатку пра яго, таго, што адышоў. А потым? А потым зноў пра лёс краіны і пра будову Сусвету. Выведзе Расія войскі з Чачні або не выведзе? Пачнецца другая каўказская вайна або яна ўжо ідзе? Якія шанцы ў Жырыноўскага стаць прэзідэнтам? Якія ў Ельцына? Пра англійскую карону і прынцэсу Дыяну. Пра рускую манархію. Пра Чарнобыль. Цяпер ужо розныя здагадкі… Адна з іх, што іншапланецяне ведалі пра катастрофу і дапамаглі нам, другая — гэта быў касмічны эксперымент, і праз нейкі час пачнуць нараджацца дзеці з геніяльнымі здольнасцямі. Незвычайныя. А можа, беларусы знікнуць, як некалі зніклі іншыя народы: скіфы, хазары, сарматы, кімерыйцы, хуастэкі? Мы — метафізікі… Жывём не на зямлі, а ў летуценнях, у размовах. У словах… Да звычайнага жыцця трэба нешта дадаць, каб гэтае жыццё зразумець. Нават побач са смерцю…

Гэта мая гісторыя… Я расказаў… Чаму я пачаў фатаграфаваць? Таму што мне не хапала слоў…

*Віктар Латун, фатограф*

## Маналог пра нямога салдата

У саму зону я больш не паеду, а раней мяне цягнула. Калі буду гэта бачыць, думаць пра гэта, я захварэю і памру… Памруць мае фантазіі…

Памятаеце, быў фільм пра вайну «Ідзі і глядзі». Я не змагла яго дагледзець, страціла прытомнасць. Там забівалі карову. І яе зрэнка на ўвесь экран… Адна зрэнка… Як забівалі людзей, я ўжо не бачыла… Не! Мастацтва — гэта любоў, абсалютна ў гэтым перакананая! Не хачу ўключаць тэлевізар, чытаць сённяшнія газеты. Там забіваюць, забіваюць… У Чачні, у Босніі…

Афганістане… Пачынаю страчваць розум, псуецца зрок. Жах… ён зрабіўся звыклы, нават банальны. І мы так змяніліся, што сённяшні жах на экране павінен быць страшней, чым учарашні. Іначай ужо не страшна. Мы перайшлі мяжу…

Учора еду ў тралейбусе. Сцэнка: хлопчык не саступіў месца старому мужчыну. Той яго павучае:

— Будзеш стары — табе таксама не саступяць.

— А я ніколі стары не буду, — адказвае хлопчык.

— Чаму?

— Мы ўсе хутка памром.

Навокал размовы пра смерць. Дзеці думаюць пра смерць. Але гэта тое, аб чым пры канцы жыцця задумваюцца, а не на пачатку.

Мне свет бачыцца ў сцэнках… Вуліца для мяне — тэатр, дом — тэатр. Чалавек — тэатр. Ніколі не запамінаю падзею цалкам. Толькі дэталі, жэсты…

Усё пераблыталася ў маёй памяці, перамяшалася. Ці то з кіно, з газет… Ці то я гэта недзе бачыла, чула… Падгледзела?

Бачу: брыдзе па закінутай вёсцы звар'яцелая лісіца. Ціхая, добрая. Як дзіця… Лашчыцца да здзічэлых катоў, кароваў…

Цішыня. Там такая цішыня! Зусім іншая, чым тут… І раптам сярод гэтай цішыні дзіўная чалавечая мова: «Гоша харошы. Гоша харошы». Гайдаецца на старой яблыні ржавая клетка з адчыненымі дзверцамі. Хатні папугай сам з сабою размаўляе.

Пачынаецца эвакуацыя… Апячаталі школу, калгасную кантору, сельсавет. Удзень салдаты вывозяць сейфы і дакументы. А ўначы вяскоўцы расцягваюць са школы тое, што ў ёй засталося. Цягнуць кнігі з бібліятэкі, люстэркі, крэслы, сантэхніку, велізарны глобус… Хтосьці

апошні пад раніцу прыбег, ужо нічога няма, пуста. Назбіраў пустых прабірак у хімлабараторыі.

Хоць усе ведаюць: праз тры дні іх таксама вывезуць. Усё застанецца.

Навошта я гэта збіраю? Я ніколі не пастаўлю спектакля пра Чарнобыль, як не паставіла ніводнага спектакля пра вайну. У мяне ніколі не будзе на сцэне мёртвага чалавека. Нават мёртвага звера або птушкі. У лесе падышла да хваіны, нешта белае… Думала: грыбы, а гэта мёртвыя вераб'і грудкамі ўгору. Там, у зоне… Я не разумею смерці. Я перад ёю спыняюся, каб не звар'яцець. Не перайсці… На другі бок жыцця… Вайну трэба паказваць так страшна, каб чалавека званітавала. Каб ён захварэў… Гэта не відовішча…

У першыя дні… Яшчэ не паказалі ніводнага здымка, а я ўжо ўяўляла: праваленыя перакрыцці, разбураныя сцены, дым, бітае шкло. Кудысьці вывозяць прыціхлых дзяцей. Чароды машын. Дарослыя плачуць, а дзеці — не. Яшчэ ніводнай фатаграфіі не надрукавалі… Напэўна, калі распытаць людзей, іншага вобраза жаху ў нас няма: выбух, пажар, трупы, паніка. Я гэта памятаю з дзяцінства… *(Замаўкае.)* Але пра гэта потым… асобна…

А тут… Адбылося штосьці незнаёмае… Гэта іншы страх. Яго не чуваць, не відаць, ні паху, ні колеру, а фізічна і псіхічна мы мяняемся. Мяняецца формула крыві, мяняецца генетычны код, мяняецца краявід… І што б мы ні думалі, ні рабілі… Вось я ўранні ўстаю, п'ю гарбату. Іду на рэпетыцыі да студэнтаў… А гэта нада мной вісіць. Як знак. І як пытанне. Мне няма з чым гэта параўнаць. З дзяцінства я памятаю штосьці зусім непадобнае…

Бачыла ўсяго толькі адзін добры фільм пра вайну. Забылася назву. Фільм пра нямога салдата. Ён маўчаў увесь фільм. Вёз цяжарную немку, цяжарную ад рускага

салдата. І нарадзілася дзіця, яно нарадзілася ў дарозе, на калёсах. Ён яго падняў на руках і трымае, і дзіця сікае на ягоны аўтамат… Мужчына смяецца… Гэта ў яго як словы, гэты яго смех. Ён глядзіць на дзіця, на свой аўтамат і смяецца… Канец фільма.

У фільме няма рускіх, няма немцаў. Ёсць пачвара — вайна. І ёсць дзіва — жыццё. Але цяпер, пасля Чарнобыля, усё змянілася. І гэта таксама. Змяніўся свет, ён цяпер не здаецца вечным. Зямля як быццам зменшылася, зрабілася маленькай. Мы пазбавіліся неўміручасці — вось што з намі здарылася. Страчанае пачуццё вечнасці. А ў тэлевізары я бачу, што кожны дзень забіваюць. Страляюць. Адзін чалавек забівае іншага чалавека. Пасля Чарнобыля.

Штосьці вельмі неакрэсленае, як быццам здалёк… Мне было тры гады, калі нас з мамай вывезлі ў Нямеччыну. У канцлагер… Я памятаю ўсё — прыгожае… Можа, у мяне зрок такі адмысловы. Высокая гара… Падаў ці то дождж, ці то снег. Вялікім чорным паўкругам стаялі людзі, ува ўсіх — нумары. Нумары на чаравіках… Такія выразныя, ярка-жоўтай фарбаю на чаравіках. На спінах. Паўсюль нумары, нумары… Калючы дрот. На вышцы стаіць чалавек у касцы, бегаюць сабакі, вельмі гучна брэшуць. І ніякага страху. Два немцы: адзін вялікі, тоўсты — у чорным, а другі маленькі — у брунатным касцюме. Той, які ў чорным, паказвае кудысьці рукой… З цёмнага паўкола выходзіць чорны цень і робіцца чалавекам. Немец у чорным пачынае яго біць. А той ці то дождж, ці то снег падае… Падае…

Памятаю высокага прыгожага італьянца… Ён заўсёды спяваў… Мая мама плакала і іншыя людзі плакалі. А я не магла зразумець, чаму ўсе плачуць, калі ён так прыгожа спявае?

У мяне былі эцюды пра вайну. Я спрабавала. Я ніколі не пастаўлю спектакля пра вайну. Ён у мяне не атрымаецца.

У чарнобыльскую зону мы павезлі вясёлы спектакль «Дай вады, калодзеж». Казку. Прыехалі ў райцэнтр Хоцімск. Там ёсць дзіцячы дом для дзяцей-сірот. Іх нікуды не вывезлі.

Антракт. Яны не пляскаюць. Не ўстаюць. Маўчаць. Другое аддзяленне. Скончыўся спектакль. Зноў не пляскаюць. Не падымаюцца. Маўчаць.

Мае студэнты плачуць. Сабраліся за кулісамі: што з дзецьмі? Потым мы зразумелі: яны верылі ва ўсё, што адбывалася на сцэне. Там увесь спектакль чакаюць дзіва. Звычайныя дзеці, дамашнія, разумелі, што перад імі — тэатр. А гэтыя чакалі дзіва...

У нас, у беларусаў, ніколі не было вечнага. Мы не мелі нават вечнай зямлі, увесь час яе хтосьці забіраў, сціраў нашыя сляды. І мы не маглі жыць вечным, як у Старым запавеце напісана: гэты нарадзіў таго і таго, той таго і таго... Бясконцы ланцужок... Мы не ведаем, што з гэтым вечным рабіць, мы не ўмеем з ім жыць. Не здольныя яго асэнсаваць. А яно нарэшце падараванае нам. Нашае вечнае — гэта Чарнобыль. Вось яно ў нас з'явілася... І што мы? Мы смяёмся... Як у старой прыпавесці... Людзі спачуваюць чалавеку, у якога згарэў дом, пуня... Усё згарэла... А ён у адказ: «Ну а затое колькі мышэй ляснула!» — і шапку весела аб падлогу. У гэтым увесь ён — беларус! Смех скрозь слёзы.

А нашы багі не смяюцца. Нашы багі — пакутнікі. Гэта ў старажытных грэкаў былі вясёлыя багі, якія смяяліся. А што калі фантазіі, сны, анекдоты — гэта таксама тэксты? Пра тое, хто мы? Але мы не ўмеем іх чытаць. Я паўсюль чую адну мелодыю... Яна цягнецца-цягнец-

ца... Не мелодыя, не песня, а галашэнне. Гэта запраграмаванасць нашага народа на любую бяду. Вечнае чаканне бяды. А шчасце? Шчасце — рэч часовая, неспадзяваная... Народ кажа: «адна бяда — не бяда», «ад бяды кіем не абаронішся», «што ні мах, то ўся бяда па зубах», «не да Каляды, калі хата поўная бяды». Апрача пакуты, у нас нічога іншага няма. Няма іншай гісторыі, іншай культуры...

А мае студэнты сустракаюць сваё каханне. Нараджаюць дзяцей. Але яны ў іх ціхія, слабыя. Пасля вайны я вярнулася з канцлагера... Жывая! Тады трэба было толькі выжыць, маё пакаленне дагэтуль здзіўляецца, што яно выжыла. Я магла замест вады есці снег, улетку не вылазіць з рэчкі, па сто разоў даваць нырца. Іхнія дзеці не могуць есці снег. Нават самы чысты, самы белы снег... *(Замаўкае, заглыбіўшыся ў сябе.)*

Якім я ўяўляю спектакль? Я ж пра яго думаю. Увесь час думаю.

З зоны мне прывезлі адзін сюжэт. Сучасную казку...

Засталіся ў вёсцы дзед з бабай. Узімку дзед памёр. Бабуля яго пахавала. Тыдзень выдзёўбвала ямачку на могілках. Захутала ў цёплы кажух, каб не замерз, паклала на дзіцячыя саначкі і павезла... Усю дарогу яна з ім сваё жыццё ўспамінала...

Засмажыла апошнюю курыцу на памінкі. На пах прыпаўзло да старой галоднае шчаня. І было ёй з кім паразмаўляць і паплакаць...

Аднойчы мне нават прысніўся мой будучы спектакль...

Бачу: пустая вёска, цвітуць яблыні. Цвіце чаромха. Раскошна. Гожа. Цвіце груша-дзічка на могілках...

Па ўтравелых вуліцах бегаюць каты з паднятымі хвастамі. Нікога няма. Каты натхнёна любяцца. Усё

квітнее. Прыгажосць і цішыня. Вось каты выбягаюць на дарогу, яны кагосьці чакаюць. Пэўна, яны яшчэ памятаюць чалавека…

У нас, беларусаў, няма Талстога, няма Пушкіна. Але ёсць Янка Купала… Якуб Колас… Яны пісалі пра зямлю… Мы людзі зямлі, а не неба. Наша монакультура — бульба, мы яе капаем, садзім і ўвесь час у зямлю глядзім. Долу! Уніз! А калі ўскіне чалавек галаву, то не вышэй за буслянку. Яму ўжо і гэта высока, гэта і ёсць для яго неба. А неба, якое завецца космасам, у нас няма, у нашай свядомасці яно адсутнічае. Тады мы бяром нешта ў рускай літаратуры… У польскай… Так нарвежцам быў патрэбны Грыг, а яўрэям — Шолам-Алейхем, як цэнтр крышталізацыі, вакол чаго яны маглі аб'яднацца і ўсвядоміць, хто яны. А ў нас гэта — Чарнобыль… Штосьці лепіць ён з нас. Стварае. Цяпер мы сталі народам. Чарнобыльскім народам. А не дарогай — з Расіі ў Еўропу або з Еўропы ў Расію. Толькі цяпер…

Мастацтва — гэта ўспамін. Успамін пра тое, што мы — былі. Я баюся… Я баюся аднаго: што страх заменяе ў нашым жыцці любоў…

*Лілія Міхайлаўна Кузьменка, выкладчыца*
*Магілёўскага культпрасветвучылішча, рэжысёр*

## Маналог пра вечнае і праклятае

Я — чалавек свайго часу, я — перакананы камуніст…

Нам не даюць слова… Модна… Сёння модна лаяць камуністаў… Цяпер мы — ворагі народа, усе злачынцы. Цяпер адказваем за ўсё, нават за законы фізікі. Я быў тады першым сакратаром райкама партыі. У газетах пішуць… Гэта яны, маўляў, камуністы вінаватыя — бу-

давалі дрэнныя, танныя атамныя станцыі, а чалавечыя жыцці не лічылі. Пра чалавека не думалі, ён для іх — пясок, гной гісторыі. Ату іх! Ату! Праклятыя пытанні: што рабіць і хто вінаваты? Вечныя. Нязменныя ў нашай гісторыі. Усе ў нецярпенні, прагнуць помсты і крыві. Ату іх! Ату! Чакаюць адсечаных галоў... Хлеба і відовішчаў...

Іншыя маўчаць, а я скажу... Вы пішаце... Ну, не канкрэтна вы, а ў газетах пішуць — камуністы падманвалі народ, хавалі ад яго праўду. Але мы павінны былі... Тэлеграмы з цэка, з абкама партыі... Перад намі паставілі задачу: не дапусціць панікі. А паніка сапраўды страшная рэч. Толькі ў час вайны так сачылі за зводкамі з фронту, як тады за паведамленнямі з Чарнобыля. Страх і чуткі. Людзі пакутавалі не ад радыяцыі, а ад самой падзеі. Мы павінны былі... Наш абавязак... Нельга сказаць, што адразу ўсё хавалі, утойвалі — спачатку ніхто не разумеў маштабу таго, што адбылося. Кіраваліся вышэйшымі палітычнымі меркаваннямі. Але калі адкінуць эмоцыі, палітыку адкінуць... Трэба прызнаць, што ніхто не верыў у тое, што здарылася. Вучоныя, і тыя не маглі паверыць! Ніводнага падобнага прыкладу. Не толькі ў нас, але і ў цэлым свеце. Вучоныя на месцы, на самой станцыі, вывучалі абстаноўку і адразу прымалі рашэнні. Я нядаўна глядзеў перадачу «Момант ісціны» з Аляксандрам Якаўлевым, членам палітбюро, у той час галоўным ідэолагам партыі. Побач з Гарбачовым... Што ён успамінае? Яны там, наверсе, таксама не ўяўлялі ўсёй карціны... На пасяджэнні палітбюро хтосьці з генералаў растлумачыў: «А што радыяцыя? На палігоне... Пасля атамнага выбуху... Увечары выпілі па бутэльцы чырвонага віна — і ўсё нармальна». Казалі пра Чарнобыль як пра аварыю, звычайную аварыю...

Калі б я тады заявіў, што нельга выводзіць людзей на вуліцу… «Вы што, хочаце сарваць Першамай?» Палітычная справа. Партбілет на стол… *(Крыху супакойваецца.)* Не анекдот, я думаю, а праўда. Быль. Расказваюць, што старшыня ўрадавай камісіі Шчарбіна, калі прыбыў на станцыю ў першыя пасля выбуху дні, запатрабаваў неадкладна завезці яго на месца здарэння. Яму тлумачаць: графітныя завалы, шалёныя радыяцыйныя палі, высокая тэмпература — туды нельга. «Якая яшчэ фізіка? Я павінен усё ўбачыць на ўласныя вочы, — крычаў ён на падначаленых. — Мне ўвечары дакладваць на палітбюро». Ваенны стэрэатып паводзін. Іншага не ведалі… Не разумелі, што сапраўды ёсць фізіка… Ланцуговая рэакцыя… І ніякія загады і ўрадавыя пастановы гэтую фізіку не зменяць. Свет стаіць на ёй, а не на ідэях Маркса. Але калі б я тады заявіў… Паспрабаваў адмяніць першамайскую дэманстрацыю… *(Зноў пачынае распаляцца.)* У газетах пішуць… Нібыта народ быў на вуліцах, а мы ў падземных бункерах сядзелі. Я стаяў на трыбуне дзве гадзіны пад гэтым сонцам… Без шапкі, без плашча. І на Дзявятага мая, на дзень Перамогі… Ішоў з ветэранамі… Гармонік граў. Танцавалі. Выпівалі. Мы ўсе былі часткаю гэтай сістэмы. Верылі! Верылі ў высокія ідэалы. У нашу перамогу! Пераможам Чарнобыль! Навалімся — і пераможам. Натхнёна чыталі пра гераічную барацьбу ўтаймавальнікаў рэактара, які выйшаў з-пад улады людзей. Праводзілі палітгутаркі. Наш чалавек без ідэі? Без вялікай мары? Гэта таксама страшна… Паглядзіце, што цяпер робіцца! Развал. Безуладдзе. Дзікі капіталізм… Але… Мінуламу абвясцілі прысуд… Усяму нашаму жыццю… Застаўся толькі Сталін… Архіпелаг ГУЛаг… А якія тады былі фільмы! Якія песні шчаслівыя! Скажыце: чаму? Адкажыце мне… Падумайце і адкажыце… Чаму

цяпер такіх фільмаў няма? Такіх песень? Чалавека трэба падняць, натхніць. Патрэбны ідэалы… Тады будзе моцная дзяржава. Каўбаса не можа быць ідэалам, поўны халадзільнік — не ідэал. І «мерседэс» — не ідэал. Патрэбны ідэалы, якія б ззялі! Яны ў нас былі.

У газетах… Па радыё і тэлебачанні крычалі: праўду, праўду! На мітынгах патрабавалі: праўду! Кепска, вельмі кепска! Вельмі кепска! Хутка мы ўсе памром! Знікне нацыя! Каму яна трэба, такая праўда? Калі ў канвент уварваўся натоўп і патрабаваў пакараць смерцю Рабесп'ера, хіба праўда была на баку натоўпу? Падпарадкавацца натоўпу, стаць ім… Мы павінны былі не дапусціць панікі… Мая праца… Абавязак… *(Маўчыць.)* Калі я — злачынец, то чаму мая ўнучка… Маё дзіця… Яна таксама хворая… Дачка нарадзіла яе ў тую вясну, прывезла да нас у Слаўгарад у пялюшачках. У вазку. Яны прыехалі праз некалькі тыдняў пасля выбуху на станцыі… Верталёты лётаюць, вайсковыя машыны на дарогах… Жонка прасіла: «Трэба іх адправіць да сваякоў. Вывезці адсюль». Я быў першым сакратаром райкама партыі… Я катэгарычна забараніў: «Што людзі падумаюць, калі я сваю дачку з маленькім дзіцем вывезу? Іхнія ж дзеці тут застаюцца». Тых, хто ўцякаў, ратаваў сваю шкуру… Я выклікаў іх у райкам, на бюро: «Ты камуніст або не камуніст?» Людзі правяраліся. Калі я злачынец, то чаму я забіваў сваё дзіця? *(Далей бязладна.)* Я сам… Яна… У маім доме… *(Праз нейкі час супакойваецца.)*

Першыя месяцы… На Украіне — трывога, а ў нас у Беларусі ўсё спакойна. Пасяўная ў разгары. Я не хаваўся, не адседжваўся ў кабінетах, а матаўся па палях, лугах. Аралі, сеялі. Вы забылі, што да Чарнобыля атам называлі мірным працаўніком, ганарыліся: жывём

у атамнай эры. Атамнага страху не памятаю... Тады мы яшчэ не баяліся будучыні... Ну што такое — першы сакратар райкама партыі? Звычайны чалавек са звычайным інстытуцкім дыпломам, найчасцей інжынера ці агранома. Хтосьці скончыў яшчэ вышэйшую партыйную школу. Я ведаў пра радыяцыю тое, што нам паспелі прачытаць на курсах грамадзянскай абароны. Там я не чуў ні слова пра цэзій у малацэ, пра стронцый... Мы везлі малако на малаказаводы. Здавалі мяса. Касілі саракакюрыйную траву. Выконвалі планы... З усёй адказнасцю... Я іх выбіваў. Планы з нас ніхто не здымаў...

Адзін штрых... Як кажуць, да партрэта... У першыя дні людзі адчувалі не толькі страх, але і ўздым. Я — чалавек, у якога адсутнічае інстынкт самазахавання. Гэта нармальна, бо моцна развітае пачуццё абавязку. Такіх тады было шмат, не я адзін... У мяне на стале ляжалі дзясяткі заяў з просьбай: «Прашу накіраваць у Чарнобыль». Па закліку сэрца! Людзі гатовыя былі ахвяраваць сабой, не задумваючыся і не патрабуючы нічога ўзамен. Што б вы там ні пісалі, але быў ён, савецкі характар. І быў ён, савецкі чалавек. Што б вы ні пісалі, як бы заўзята ні выракаліся... Вам яшчэ шкада будзе гэтага чалавека... Успомніце пра яго...

Прыязджалі да нас вучоныя, яны спрачаліся да крыку. Да сіпаты. Падыходжу да аднаго: «Нашы дзеці ў радыяцыйным пяску капаюцца?» А ён мне адказвае: «Панікёры! Дылетанты! Што вам пра радыяцыю вядома? Я — ядзершчык. Вось адбыўся атамны выбух. Праз гадзіну я ехаў да эпіцэнтру на “ўазіку”. Па расплаўленай зямлі. Што вы паніку сееце?» Я ім верыў. Я выклікаў да сябе ў кабінет людзей: «Братцы! Я збягу, вы на ўцёкі кінецеся. Што людзі пра нас падумаюць? Скажуць, што камуністы — дэзерціры?» Калі не пераконваў словамі,

пачуццямі, дзейнічаў іначай: «Ты патрыёт або не патрыёт? Калі не — кладзі на стол партбілет. Кідай!» Некаторыя кідалі…

Штосьці пачаў падазраваць… былі здагадкі… Заключылі мы дамову з Інстытутам ядзернай фізікі на абследаванне нашых земляў. Яны бяруць траву, бяруць пласты чарназёму і вязуць туды, да сябе ў Мінск. Робяць там аналізы. А потым звоняць мне: «Арганізуйце, калі ласка, транспарт, каб забраць вашую глебу назад». — «Вы што, жартуеце? Да Мінска чатырыста кіламетраў…» У мяне трубка з рук ледзь не выпала. Везці зямлю назад? «Не, не жартуем, — адказваюць мне. — У нас гэтыя пробы згодна з інструкцыяй належыць пахаваць у могільніку, у падземным жалезабетонным бункеры. З усёй Беларусі да нас вязуць. За месяц сваю ёмістасць да краёў запоўнілі». Вы чулі? А мы на гэтай зямлі аром, сеем. На ёй нашыя дзеці гуляюць… З нас патрабуюць планы па малацэ і мясе. Са збожжа гналі спірт. Яблыкі, грушы, вішні ішлі на сокі…

Эвакуацыя… Калі б хто-небудзь паглядзеў зверху, падумаў бы, што пачалася трэцяя сусветная вайна… Адну вёску вывозяць, а другую папярэджваюць: эвакуацыя праз тыдзень! І ўвесь гэты тыдзень там сціртуюць салому. Косяць траву, капаюцца на гародах, дровы колюць… Звычайнае жыццё. Людзі не разумеюць, што адбываецца. А праз тыдзень іх вывозяць на вайсковых машынах… Нарады, камандзіроўкі, нахлабучкі, бяссонныя ночы. Колькі ўсяго было! Каля гаркама партыі ў Мінску, памятаю, стаіць чалавек з плакатам: «Дайце народу ёду!». Спёка. Ён у плашчы…

*(Вяртаецца да пачатку нашай размовы.)*

Вы забылі… Тады… Атамныя станцыі — гэта будучыня. Я не раз выступаў. Прапагандаваў… Я быў на

адной атамнай станцыі: ціха, урачыста. Чысціня. У кутку — чырвоныя сцягі і вымпелы «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва». Наша будучыня... Мы жылі ў шчаслівым грамадстве. Нам сказалі, што мы шчаслівыя, і мы былі шчаслівыя. Я быў свабодны, я нават не мог зразумець, што нехта можа лічыць маю свабоду несвабодай. А цяпер гісторыя нас спісала, нас як быццам няма... Я чытаю цяпер Салжаніцына... Я думаю... *(Маўчыць.)* У маёй унучкі лейкемія... За ўсё я заплаціў... Дарагой цаной...

Я — чалавек свайго часу... Я — не злачынец...

*Уладзімір Мацвеевіч Іваноў, былы першы сакратар Слаўгарадскага райкама партыі*

## Маналог абаронца савецкай улады

Э-э-э... вашу маць... Э-э-э! *(Шматпавярховы мат.)* Сталіна на вас няма! Жалезнай рукі...

Што вы тут запісваеце? Хто вам дазвол даў? Фатаграфуеце... Прыбярыце сваю цацку... Схавайце! А то разаб'ю. Бач ты, прыехалі! Мы жывём. Пакутуем, а вы пісаць будзеце. Пісакі! Народ з тропу збіваеце... Бунтуеце... Выпытваеце не тое, што трэба. Няма цяпер парадку! Парадку няма! Бач ты, прыехалі... З магнітафонам...

Так, я абараняю! Я савецкую ўладу абараняю. Нашую ўладу. Народную! Пры савецкай уладзе мы былі моцныя, нас усе баяліся. Увесь свет на нас глядзеў! Адных трэсла ад страху, другія зайздросцілі. Бл..! А што цяпер? Пры дэмакратыі? «Снікерс» і маргарын заляжалы да нас вязуць, пратэрмінаваныя лекі і ношаныя джынсы, як тубыльцам, якія нядаўна з дрэва злезлі. З пальмы. За

дзяржаву крыўдна! Бач ты, прыехалі... Такая дзяржава была! Бл..! Пакуль Гарбачоў не ўзляцеў... На царства... Чорт мечаны, са знакам! Горбі... Горбі дзейнічаў па іхніх планах, па планах цэрэу... Што вы мне тут даказваеце? Бач ты... Яны Чарнобыль падарвалі... Цэрэушнікі з дэмакратамі... Я ў газетах чытаў... Не выбухнуў бы Чарнобыль, дзяржава б не развалілася! Вялікая дзяржава! Бл..! *(Зноў мат.)* Бач ты... Бохан хлеба пры камуністах каштаваў дваццаць капеек, а цяпер — дзве тысячы. Я за тры рублі купляў бутэльку, яшчэ і на закусь хапала... А пры дэмакратах? Штаны другі месяц не магу сабе купіць. У падранай кухвайцы хаджу. Распрадалі ўсё! Пазакладалі! Нашы ўнукі не разлічацца...

Я — не п'яны, я — за камуністаў! Яны былі за нас, за простых людзей. Не трэба мне казак! Дэмакратыя... Цэнзуру адмянілі. Што хочаш, тое і пішы. Свабодны чалавек... Бл..! А памрэ гэты свабодны чалавек, яго хаваць няма за што. У нас памерла бабка. Адзінокая, без дзяцей. Два дні, гаротніца, у хаце ляжала... У старой кофце... Пад абразамі... Труну не маглі купіць... Стаханаўкай некалі была, звеннявой. Мы два дні ў поле не выходзілі. Мітынгавалі. Бл..! Пакуль старшыня калгаса не выступіў... Перад народам... І не паабяцаў, што цяпер, калі памрэ чалавек, калгас выдзяляе задарма: драўляную труну, цяля або парася і дзве скрынкі гарэлкі на памінкі. Пры дэмакратах... Дзве скрынкі гарэлкі... Задарма! Бутэлька на аднаго мужыка — п'янка, паўбутэлькі — лекі. Нам ад радыяцыі...

Чаму вы гэта не запісваеце? Мае словы. А запісваеце толькі тое, што вам выгадна. Народ з тропу збіваеце... Бунтуеце... Палітычны капітал трэба? Кішэні доларамі набіць? Мы тут жывём... Пакутуем... А вінаватых няма! Назавіце мне вінаватых! Я за камуністаў! Яны вернуцца

і вінаватых адразу знойдуць... Бл..! Бач ты, прыязджаюць... Запісваюць...

Э-э-э... Тваю маць...

*(Прозвішча не назваў.)*

## Маналог пра тое, як два анёлы сустрэлі маленькую Волечку

У мяне ёсць матэрыял... Усе кніжныя паліцы застаўленыя вялікімі папкамі. Я столькі ведаю, што ўжо не магу пісаць...

Сем гадоў збірала — газетныя выразкі, інструкцыі. Улёткі... Свае нататкі... Я маю лічбы. Я вам усё аддам... Я магу змагацца: арганізоўваць дэманстрацыі, пікеты, здабываць лекі, наведваць хворых дзяцей — але не пісаць. Вазьміцеся... А ў мяне самой столькі пачуццяў, што я з імі не спраўлюся, яны мяне паралізуюць. Замінаюць мне. Чарнобыль мае ўжо сваіх сталкераў... Сваіх пісьменнікаў... Але я не хачу ўваходзіць у кола тых, хто эксплуатуе гэтую тэму. Трэба пісаць сумленна. Усё напісаць... *(Задумваецца.)*

Цёплы красавіцкі дождж... Сем гадоў я памятаю гэты дождж... Кропелькі скочваліся, як іртуць. Кажуць, што радыяцыя бясколерная? Але лужыны сталі зялёныя або ярка-жоўтыя. Суседка шэптам паведаміла, што радыё «Свабода» перадало пра аварыю на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Я не надала гэтаму ніякай увагі. Была абсалютная ўпэўненасць, што — калі б нешта сур'ёзнае здарылася — нас бы апавясцілі. Ёсць спецыяльная тэхніка, спецыяльная сігналізацыя, бамбасховішчы. Нас папярэдзяць. Мы былі ў гэтым перакананыя! Усе вучыліся на курсах грамадзянскай

абароны. Я сама там праводзіла заняткі… Прымала экзамены… Але ўвечары таго самага дня суседка прынесла нейкія парашочкі. Даў іх ейны сваяк, растлумачыў, як прымаць (ён працаваў у Інстытуце ядзернай фізікі), але ўзяў слова, што яна будзе маўчаць. Як рыба! Як камень! Асабліва ён баяўся размоў і пытанняў па тэлефоне…

У мяне ў гэты час жыў маленькі ўнук… А я? Я ўсё адно не паверыла. Здаецца, ніхто з нас гэтых парашочкаў не піў. Мы былі вельмі даверлівыя… Не толькі старэйшае пакаленне, але і маладыя…

Успамінаю першыя ўражанні, першыя чуткі… Пераходжу з аднаго часу ў іншы, з аднаго стану ў іншы стан… Адсюль — туды… Як чалавек, што піша, я задумвалася над гэтымі пераходамі, яны мяне цікавілі. Ува мне нібыта два чалавекі — дачарнобыльскі і чарнобыльскі. Але вось гэтага дачарнобыльскага цяпер цяжка аднавіць з поўнай дакладнасцю. Маё светабачанне змянілася…

Я ездзіла ў зону з першых дзён… Памятаю, спыніліся ў нейкай вёсцы, і што мяне ўразіла — цішыня! Ні птушак, нічога… Ідзеш па вуліцы… Цішыня. Ну, зразумела, хаты вымерлі, людзей няма, з'ехалі, але ўсё навокал замоўкла, ніводнай птушкі. Я ўпершыню ўбачыла зямлю без птушак… Без камароў… Нічога не лётала…

Прыехалі мы ў вёску Чудзяны — сто пяцьдзясят кюры… У вёсцы Малінаўка — пяцьдзясят дзевяць кюры… Жыхары атрымалі дозы ў сотні разоў большыя за тыя, што атрымліваюць салдаты, якія ахоўваюць раёны выпрабаванняў ядзерных бомбаў. Ядзерныя палігоны. У сотні разоў! Дазіметр сакоча, яго зашкальвае… А ў калгасных канторах вісяць падпісаныя раённымі радыёлагамі аб'явы, што цыбулю, салату, памідоры, гуркі — усё можна есці. Усё расце, усё ядуць.

Што яны цяпер гавораць, гэтыя раённыя радыёлагі? Сакратары райкамаў партыі? Як апраўдваюцца?

Ува ўсіх вёсках мы сустракалі шмат п'яных людзей. Хадзілі пад чаркай нават жанчыны, асабліва даяркі, цялятніцы. Спявалі песеньку... Модная песенька ў тыя часы: «А нам всё равно. А нам всё равно...» Адным словам, усё «трын-трава». З кінафільма «Брыльянтавая рука».

У той вёсцы Малінаўка Чэрыкаўскага раёна зайшлі ў дзіцячы садок. Дзеці бегаюць па двары... Маленькія — поўзаюць у пясочніцы... Загадчыца тлумачыць, што пясок мяняюць кожны месяц. Аднекуль прывозяць. Можна ўявіць, адкуль яго маглі прывезці. Дзеці сумныя... Мы жартуем, яны не ўсміхаюцца... Выхавальніца заплакала: «Не старайцеся. Нашыя дзеці не ўсміхаюцца. А ў сне яны плачуць». Сустрэлі на вуліцы жанчыну з немаўлём. «Хто вам дазволіў тут нараджаць? Пяцьдзясят дзевяць кюры...» — «Доктар-радыёлаг прыязджала. Раіла толькі не сушыць пялюшкі на вуліцы». Людзей угаворвалі не з'язджаць, заставацца. Як жа іначай — працоўная сіла! Нават калі вёскі адсялялі... Калі эвакуацыя была... Назусім. Усё адно прывозілі людзей на сельгасработы. Бульбу капаць...

Што яны цяпер гавораць? Сакратары райкамаў і абкамаў? Як апраўдваюцца? Хто ў іх вінаваты?

Я захавала шмат інструкцый... Абсалютна сакрэтных. Я іх усе вам аддам.... Інструкцыя па апрацоўцы забруджаных курыных тушак... У цэху, дзе іх апрацоўвалі, трэба было быць адзетым, як на забруджанай тэрыторыі пры кантакце з радыеактыўнымі элементамі: у гумовых пальчатках і гумовых халатах, ботах і гэтак далей. Калі там столькі і столькі кюры, трэба паварыць у салёнай вадзе, зліць ваду ў каналізацыю, а мяса дадаць у паштэ-

ты, каўбасы. Калі столькі і столькі кюры — у касцяную муку, на корм жывёле... Так выконвалі планы па мясе. З забруджаных раёнаў цялят танна прадавалі ў іншыя месцы. У чыстыя. Кіроўцы, якія вазілі такіх цялят, расказвалі, што цяляты былі смешныя — поўсць да самай зямлі, і такія галодныя, што елі ўсё — і анучы, і паперу. Іх карміць было лёгка! Прадавалі ў калгасы, але калі хто хацеў — мог узяць і сабе. У сваю гаспадарку. Крымінальныя справы! Крымінальныя!

Сустрэлі на дарозе машыну... Грузавая машына ішла павольна, як на хаўтурах... Спынілі. За рулём — малады хлопец. Пытаюся: «Табе, напэўна, блага, што так павольна едзеш?» — «Не, я вязу радыеактыўную зямлю». А спякота! Пыл! «Ты што, звар'яцеў?! Табе ж яшчэ жаніцца, дзяцей гадаваць». — «А дзе яшчэ я зараблю пяцьдзясят рублёў за адну паездку?» За пяцьдзясят рублёў па тых коштах можна было купіць добры мужчынскі гарнітур. І пра даплаты тады размаўлялі больш, чым пра радыяцыю. Пра даплату і нейкія мізэрныя надбаўкі... Мізэрныя з пункту гледжання цаны жыцця....

Трагічнае і смешнае побач...

Сядзяць бабулькі на лавачках каля дома. Дзеці бегаюць. Мы замерылі — семдзесят кюры...

—Адкуль дзеці?

—З Мінска на лета прыехалі.

—Дык у вас жа вялікая радыяцыя!

—Што ты нам распісваеш етую радыяцыю! Мы яе бачылі.

—Дык яе ж нельга ўбачыць!

—Вунь, зірні: хата недабудаваная стаіць, людзі кінулі ды паехалі. А мы ўвечары пайшлі і глядзім... У вакно глядзім... А яна пад бэлькай сядзіць, етая радыяцыя. Злая-злая, і вочы блішчаць... Чорная-чорная...

—Не можа такога быць!

—Вось мы табе паклясціся можам. Перахрысцімся!

Хрысцяцца. Весела хрысцяцца. Смяюцца — ці то з сябе, ці то з нас.

Збіраемся пасля паездак у рэдакцыі. «Ну як?» — пытаемся адно ў аднаго. «Усё нармалёва!» — «Нармалёва? Паглядзі на сябе ў люстэрка, ты з сівізной прыехаў!» Анекдоты з'явіліся. Чарнобыльскія анекдоты. Самы кароткі: «Добры быў народ — беларусы».

Атрымала заданне — напісаць пра эвакуацыю… На Палессі існуе павер'е: хочаш вярнуцца дадому, пасадзі перад далёкай дарогай дрэва. Прыязджаю… У адзін двор зайшла, у другі… Усе садзяць дрэвы. У трэці зайшла, села і заплакала. А гаспадыня мне паказвае: «Дачка з зяцем пасадзілі сліву, другая дачка — чорную рабіну, старэйшы сын — каліну, а самы малодшы — вярбу. Мы з гаспадаром удваіх — адну яблыньку». Развітваемся, яна просіць: «У мяне столькі клубніцаў — цэлы двор. Вазьмі ў мяне клубніцаў». Ёй хацелася, каб нешта засталося, нейкі след ад яе жыцця…

Мала я паспела запісаць. Мала… Усё адкладала: сяду калі-небудзь і ўзгадаю. У адпачынак паеду…

А вось… Мільганула ў памяці… вясковыя могілкі… Каля брамы знак: «Высокая радыяцыя. Заезд і выезд забаронены». Нават на той свет, як той казаў, не патрапіш. *(Нечакана засмяялася. Упершыню за ўсю доўгую размову.)*

А вам расказвалі, што фатаграфаваць каля рэактара было катэгарычна забаронена? Толькі са спецдазволамі. Забіралі фотаапараты. Перад ад'ездам салдат, якія там служылі, абшуквалі, як у Афганістане, каб, крый божа, ніякага здымка. Ніякага рэчыўнага доказу. У тэлевізійнікаў забіралі стужкі ў кадэбэ. Вярталі засве-

чаныя. Колькі дакументаў знішчылі! Сведчанняў. Яны страчаныя для навукі. Для гісторыі. Знайсці б тых, хто загадваў гэта рабіць…

Як бы яны апраўдваліся? Што прыдумвалі б?

Я ніколі іх не апраўдаю… Ніколі! Праз адну дзяўчынку… Яна танчыла ў бальніцы, танчыла мне полечку. Ёй дзевяць гадоў у той дзень споўнілася. Так прыгожа танчыла… Прайшло два месяцы, і мне тэлефануе яе мама: «Волечка памірае!» І ў мяне не хапіла сіл пайсці ў той дзень у бальніцу. А потым — позна ўжо. У Волечкі была малодшая сястрычка. Яна прачнулася ўранні і кажа: «Мамачка, я ў сне бачыла, як прыляцелі два анёлы і забралі нашу Волечку. Яны сказалі, што Волечцы будзе там добра. У яе нічога не будзе балець. Мамачка, нашу Волечку забралі два анёлы…»

Я нікога не магу апраўдаць…

*Ірына Кісялёва, журналістка*

## Маналог пра бязмежную ўладу аднаго чалавека над іншым чалавекам

Я не гуманітарый, я — фізік. Таму факты, толькі факты…

За Чарнобыль калі-небудзь давядзецца адказваць… Надыдзе такі час, што давядзецца адказваць, як за трыццаць сёмы год. Няхай праз пяцьдзясят гадоў! Няхай старыя… Няхай мёртвыя… Яны адкажуць, яны — злачынцы! *(Памаўчаўшы.)* Трэба захаваць факты… Факты! Яны будуць запатрабаваныя…

У той дзень, дваццаць шостага красавіка… Я быў у Маскве. У камандзіроўцы. Там даведаўся пра аварыю.

Званю ў Мінск першаму сакратару цэка Беларусі Слюнькову, адзін, два, тры разы званю, але мяне не

злучаюць. Знаходжу яго памочніка, той мяне добра ведае:

— Я званю з Масквы. Злучыце мяне са Слюньковым, у мяне тэрміновая інфармацыя. Аварыйная!

Званю па ўрадавай сувязі, але ўжо ўсё засакрэцілі. Як толькі пачынаеш гаварыць пра аварыю, тэлефон адразу адключаецца. Назіраюць, натуральна! Праслухоўваюць. Адпаведныя органы… Дзяржава ў дзяржаве… І гэта пры тым, што я званю першаму сакратару цэка… А я? Я — дырэктар Інстытута ядзернай энергетыкі Акадэміі навук Беларусі. Прафесар, член-карэспандэнт… Але і ад мяне засакрэцілі…

Гадзіны дзве мне спатрэбілася, каб трубку ўсё ж узяў сам Слюнькоў. Дакладваю:

— Аварыя сур'ёзная. Па маіх падліках (а я ўжо з сім-тым у Маскве паразмаўляў, зрабіў падлікі), радыеактыўны слуп рухаецца да нас. На Беларусь. Трэба неадкладна правесці ёдавую прафілактыку насельніцтва і адсяліць усіх, хто жыве каля станцыі. Да ста кіламетраў трэба прыбраць людзей і жывёлу.

— Мне ўжо дакладвалі, — кажа Слюнькоў, — там быў пажар, але яго патушылі.

Я не вытрымліваю:

— Гэта падман! Відавочны падман! Вам любы фізік скажа, што графіт гарыць з хуткасцю пяць тонаў у гадзіну. Уяўляеце, колькі ён будзе гарэць?!

Самым першым цягніком еду ў Мінск. Бяссонная ноч. Раніцой — дома. Мераю ў сына шчытападобную залозу — сто восемдзесят мікрарэнтгенаў у гадзіну. Тады гэтая залоза была ідэальным дазіметрам. Нам патрэбны быў ёдыд калія. Гэта звычайны ёд. На паўшклянкі кісялю дзве-тры кроплі дзецям, а даросламу — тры-чатыры кроплі. Рэактар гарэў дзесяць дзён, дзесяць

дзён так трэба было рабіць. Але нас ніхто не слухаў! Вучоных, медыкаў. Навука служыла палітыцы, і медыцыну ўцягнулі ў палітыку. Вядома! Не трэба забываць, на якім фоне свядомасці ўсё гэта адбывалася, якія мы былі на той момант, дзесяць гадоў таму. Працаваў кадэбэ, таемны вышук. Глушыліся «заходнія галасы». Тысячы табу, партыйных і ваенных таямніц... Інструкцый... Апрача таго, усе выхаваныя так, што мірны савецкі атам небяспечны гэтаксама, як торф і вугаль. Мы былі людзьмі, скутымі страхам і прымхамі. Забабонамі... Але факты. Толькі факты... У той дзень... Дваццаць сёмага красавіка я вырашаю выехаць у Гомельскую вобласць, якая мяжуе з Украінай. У райцэнтры Брагін, Хойнікі, Нароўля, ад іх да станцыі ўсяго некалькі дзясяткаў кіламетраў. Мне трэба поўная інфармацыя. Узяць прыборы, замерыць фон. А фон быў такі: у Брагіне — трыццаць тысяч мікрарэнтгенаў у гадзіну, у Нароўлі — дваццаць восем тысяч... Сеюць, аруць палі. Рыхтуюцца да Вялікадня... Фарбуюць яйкі. Пякуць булкі... Якая радыяцыя? Што гэта такое? Ніякай каманды не было. Зверху патрабуюць зводкі: як ідзе пасяўная, якімі тэмпамі? На мяне глядзяць, як на вар'ята: «Адкуль? Вы пра што, прафесар?» Рэнтгены. Мікрарэнтгены... Мова іншапланетніка...

Вяртаемся ў Мінск. На праспекце, як заўсёды, гандлююць піражкамі, марозівам, мясным фаршам, булачкамі. Пад радыеактыўным воблакам...

Дваццаць дзявятага красавіка. Усё памятаю дакладна... Па датах... А восьмай раніцы я ўжо сядзеў у прыёмнай Слюнькова. Прабіваюся, прабіваюся. Мяне не прымаюць. І так да паловы шостай вечара. А палове шостай з кабінета Слюнькова выходзіць адзін наш вядомы паэт. Мы з ім знаёмыя:

— З таварышам Слюньковым абмяркоўвалі праблемы беларускай культуры.

— Хутка не будзе каму развіваць гэтую культуру, — не вытрымліваю я, — не будзе каму чытаць вашы кніжкі, калі мы зараз не адселім людзей з-пад Чарнобыля! Не выратуем!

— Ды што вы?! Там ужо ўсё патушылі.

Усё ж прарываюся да Слюнькова. Абмалёўваю ўбачаную ўчора карціну. Трэба ратаваць людзей! На Украіне (я туды ўжо званіў) пачалася эвакуацыя…

— Чаму гэта вашы дазіметрысты (з майго інстытута) па горадзе бегаюць, паніку сеюць! Я раіўся з Масквой, з акадэмікам Ільіным. У нас усё нармальна… На прарыў кінутая армія, вайсковая тэхніка. На станцыі працуе ўрадавая камісія. Пракуратура. Там разбіраюцца… Нельга забываць: ідзе халодная вайна. Мы абкружаныя ворагамі…

На нашай зямлі ўжо ляжалі тысячы тонаў цэзію, ёду, свінцу, цырконію, кадмію, берылію, бору, невядомая колькасць плутонію (ва ўранава-графітавых рэактарах вялікай магутнасці чарнобыльскага варыянту напрацоўваўся збройны плутоній, з якога рабілі атамныя бомбы) — усяго чатырыста пяцьдзясят тыпаў радыенуклідаў. Іх колькасць была роўная тромстам пяцідзесяці бомбам, скінутым на Хірасіму. Трэба было казаць пра фізіку. Пра законы фізікі. А казалі пра ворагаў. Шукалі ворагаў.

Раней ці пазней, але адказваць за гэта давядзецца. «Вы калі-небудзь будзеце апраўдвацца, — казаў я Слюнькову, — што вы — трактарабудаўнік (былы дырэктар трактарнага завода), і ў радыяцыі не разбіраліся. А я — фізік, маю ўяўленне пра наступствы». Але як гэта? Нейкі прафесар, нейкія фізікі насмельваюцца

вучыць цэка? Не, яны не былі хеўрай бандытаў. Больш дакладна — змова невуцтва і карпаратыўнасці. Прынцып іх жыцця, апаратная вывучка — не высоўвацца. Дагаджаць. Слюнькова якраз забіралі ў Маскву на павышэнне. Вось-вось! Думаю, быў званок з Крамля… Ад Гарбачова… Маўляў, вы там, беларусы, не ўздымайце панікі. Захад і без таго шуміць. А правілы гульні такія, што, калі не дагодзіце вышэйшаму начальству, вы не атрымаеце чаканай пасады, вам выдзеляць не тую пуцёўку, не тую дачу… Трэба спадабацца… Калі б мы засталіся закрытай сістэмай, за жалезнай заслонай, людзі дагэтуль жылі б каля самой станцыі. Засакрэцілі б. Успомніце: Кыштым, Сяміпалацінск… Сталінская краіна. Па-ранейшаму сталінская краіна…

Інструкцыі на выпадак пагрозы ядзернай вайны патрабавалі неадкладна праводзіць ёдавую прафілактыку насельніцтва. Пры пагрозе! А тут… Тры тысячы мікрарэнтген у гадзіну… Але баяцца не за людзей, а за ўладу. Краіна ўлады, а не краіна людзей. Прыярытэт дзяржавы бясспрэчны. А каштоўнасць чалавечага жыцця роўная нулю. Знаходзіліся ж спосабы! Мы прапаноўвалі… Без аб'яваў, без панікі… Проста ўводзіць ёдавыя прэпараты ў вадаёмы, з якіх бяруць пітную ваду, дадаваць у малако. Ну адчулі б не той смак вады… Не той смак малака… У горадзе трымалі напагатове семсот кілаграмаў прэпаратаў. Яны так і засталіся на складах… Гневу зверху баяліся больш, чым атаму. Кожны чакаў званка, загаду, але нічога не рабіў сам. Страх асабістай адказнасці. У партфелі я насіў дазіметр… Навошта? Мяне не прапускалі, я ім надакучыў у высокіх кабінетах… Тады я даставаў дазіметр і прыкладаў яго да шчытападобнай залозы сакратаркам, асабістым кіроўцам, якія сядзелі ў прыёмных. Яны палохаліся, і гэта

часам дапамагала — мяне прапускалі. «Ну, што гэта вы, прафесар, істэрыкі наладжваеце? Вы што, адзін пра беларускі народ турбуецеся? Чалавек жа ўсё роўна ад нечага памірае: ад курэння, у аўтамабільнай катастрофе, сканчвае жыццё самагубствам». Смяяліся з украінцаў. Тыя, маўляў, на каленях у Крамлі поўзаюць, выпрошваюць грошы, медыкаменты, дазіметрычную апаратуру (яе не хапала), а наш (гэта Слюнькоў) за пятнаццаць хвілін далажыў абстаноўку: «Усё нармальна. Справімся сваімі сіламі». Пахвалілі: «Малайцы, братцы-беларусы!»

Колькі жыццяў каштавала гэтая пахвала?!

Я маю інфармацыю, што самі яны, начальства, ёд прымалі. Калі іх абследавалі супрацоўнікі нашага інстытута — ува ўсіх шчытападобная залоза чыстая. Без ёду гэта немагчыма. Сваіх дзяцей яны таксама цішком вывезлі, ад граху падалей. Самі, калі выпраўляліся ў камандзіроўкі, мелі рэспіратары, спецробы. Усё тое, чаго ў іншых не было. І ўжо даўно не сакрэт, што пад Мінскам трымалі спецыяльны статак. Кожная карова з нумарком і замацаваная за некім індывідуальна. Персанальна. Спецыяльныя землі, спецыяльныя парнікі… Спецкантроль… Самае агіднае… *(Памаўчаўшы.)* За гэта ніхто яшчэ не пакараны…

Перасталі мяне прымаць. Выслухоўваць. Я пачаў закідваць іх лістамі. Дакладнымі запіскамі. Рассылаў карты, лічбы. Ва ўсе інстанцыі. Назбіралася чатыры папкі па дзвесце пяцьдзясят аркушаў. Факты, толькі факты… На ўсякі выпадак скапіяваў два экзэмпляры, адзін знаходзіўся ў маім службовым кабінеце, а другі схаваў дома. Жонка схавала. Чаму я зрабіў копіі? У нас павінна быць памяць… Мы жывём у такой краіне… Кабінет я заўсёды сам зачыняў. Прыязджаю з адной камандзіроўкі — папкі зніклі… Усе чатыры пульхныя

папкі... Але я вырас на Украіне, у мяне дзяды — казакі. Казацкі характар. Я працягваў пісаць. Выступаць. Трэба ратаваць людзей! Тэрмінова адсяляць! Мы не вылазілі з камандзіровак. Наш інстытут склаў першую карту «забруджаных» раёнаў. Увесь поўдзень — у чырвоным... Поўдзень палымнеў.

Гэта ўжо гісторыя. Гісторыя злачынства...

З інстытута забралі ўсю апаратуру для радыяцыйнага кантролю. Канфіскавалі. Без тлумачэнняў. Званкі мне дадому з пагрозай: «Хопіць, прафесар, палохаць людзей! Вышлем туды, куды Макар цялят не ганяў. Не здагадваешся? Забылі? Хутка забылі!» Ціск на супрацоўнікаў інстытута. Запалохванне.

Я напісаў у Маскву... Выклікае мяне прэзідэнт нашай Акадэміі навук Платонаў:

— Беларускі народ калі-небудзь успомніць цябе, ты шмат для яго зрабіў, але дрэнна, што напісаў у Маскву. Вельмі дрэнна! Патрабуюць, каб я зняў цябе з пасады. Навошта ты напісаў? Хіба не разумееш, на каго замахнуўся?

У мяне карты, лічбы. А ў іх? Маглі пасадзіць у псіхушку... Пагражалі. Мог трапіць у аўтамабільную катастрофу... Папярэджвалі. Маглі завесці крымінальную справу... За антысавеччыну. Або за скрынку цвікоў, не ўлічаных інстытуцкім загадчыкам гаспадаркі.

Крымінальную справу завялі...

Яны свайго дамагліся. Я злёг з інфарктам... *(Маўчыць.)*

Усё ёсць у папках... Факты і лічбы... Злачынныя лічбы...

У першы год...

Мільён тонаў «забруджанага» збожжа перапрацавалі на камбікорм, скармілі яго жывёле, а мяса потым

трапляла на наш стол. Птушак і свіней кармілі касцяной мукой, начыненай стронцыем…

Вёскі — у эвакуацыю, а палі засявалі. Згодна з дадзенымі нашага інстытута, трэцяя частка калгасаў і саўгасаў мела землі, «забруджаныя» цэзіем-137, часта шчыльнасць «забруджанасці» перавышала пятнаццаць кюры на квадратны кіламетр. Не магло і гаворкі ісці пра атрыманне чыстай прадукцыі, там нават нельга было працяглы час знаходзіцца. На многіх землях асеў стронцый-90…

У вёсках людзі кормяцца са сваіх прысядзібных участкаў — і ніякай праверкі. Ніхто не вучыў, як цяпер трэба жыць. Нават праграмы такой не было. Правяралася толькі тое, што ішло на вываз… Дзяржпастаўкі ў Маскву… У Расію…

Мы агледзелі выбарачна дзяцей у вёсках… Некалькі тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак. У іх — тысяча пяцьсот, дзве тысячы, тры тысячы мікрарэнтгенаў. Звыш трох тысяч. Гэтыя дзяўчаткі ўжо нікога не народзяць. На іх генныя адзнакі…

Колькі гадоў прамінула, а я часам прачнуся і не магу заснуць…

Арэ трактар… Пытаюся ў работніка райкама, які нас суправаджае:

—Трактарыст абаронены хоць рэспіратарам?

—Не, яны без рэспіратараў працуюць.

—Вам іх не прывезлі?

—Ды што вы! Прывезлі столькі, што да дзвюхтысячнага года хопіць. Але мы не выдаем. А то пачнецца паніка. Усе разбягуцца! Параз’язджаюцца!

—Што вы вырабляеце?

—Вам лёгка, прафесар, разважаць! Вас выганяць з працы, вы іншую знойдзеце. А куды мне падзецца?

Якая ўлада! Бязмежная ўлада аднаго чалавека над іншым чалавекам. Гэта ўжо не падман, гэта вайна з нявіннымі…

Усцяж Прыпяці… Стаяць палаткі, людзі адпачываюць сем'ямі. Купаюцца, загараюць. Яны не ведаюць, што ўжо некалькі тыдняў купаюцца і загараюць пад радыеактыўным воблакам. Катэгарычна забаранялася ўступаць з імі ў кантакт. Але бачу дзяцей… Падыходжу і пачынаю тлумачыць. Здзіўленне: «А чаму радыё і тэлебачанне пра гэта маўчаць?» З намі звычайна ездзіў хтосьці з мясцовай улады, з райкама — такі парадак… Ён маўчыць… Я магу прасачыць па яго твары, якія пачуцці ў ім змагаюцца: далажыць або не далажыць? У той самы час шкада людзей! Ён жа нармальны чалавек… Але я не ведаю, якое з пачуццяў пераможа, калі мы вернемся. Будзе на мяне данос ці не будзе? Кожны рабіў свой выбар… *(Нейкі час маўчыць.)*

Мы па-ранейшаму сталінская краіна… І жыве ў ёй сталінскі чалавек…

Памятаю, у Кіеве… На вакзале… цягнікі адзін за адным вывозяць тысячы перапалоханых дзяцей. Мужчыны і жанчыны плачуць. Я ўпершыню падумаў: каму трэба такая фізіка? Такая навука? Калі такой дарагой цаной… Цяпер пра гэта вядома. Напісалі, якімі ўдарнымі тэмпамі будавалі чарнобыльскую атамную станцыю. Будавалі па-савецку. У японцаў на такія аб'екты ідзе дванаццаць гадоў, а ў нас — два-тры. Якасць і надзейнасць асаблівага аб'екта — як у жывёлагадоўчага комплексу. Як у птушкафабрыкі! Калі чагосьці не хапала, плявалі на праект і замянялі тым, што было на той час пад рукой. Напрыклад, дах машыннай залы залілі бітумам. Якраз яго і тушылі пажарнікі. А хто кіраваў атамнай станцыяй? У кіраўніцтве — ніводнага

фізіка-ядзершчыка. Былі энергетыкі, турбіншчыкі, палітработнікі, але ніводнага спецыяліста. Ніводнага фізіка…

Чалавек прыдумаў тэхніку, да якой яшчэ не гатовы. Не роўны ёй. Хіба можна дзіцяці даваць у рукі пісталет? Мы — неразумныя дзеці. Але гэта — эмоцыі, я забараняю сабе эмоцыі…

На зямлі… У зямлі, у вадзе ляжаць радыенукліды, дзясяткі радыенуклідаў. Трэба радыеэколагі… Але ў Беларусі іх не было, клікалі з Масквы. Калісьці ў нашай Акадэміі навук працавала прафесар Чаркасава, яна займалася праблемамі малых дозаў, унутранага апраменьвання. За пяць гадоў да Чарнобыля яе лабараторыю скасавалі — у нас не можа быць ніякіх катастроф. Пра што вы? Савецкія атамныя станцыі — перадавыя і найлепшыя ў свеце. Якія малыя дозы? Якое ўнутранае апраменьванне? Якія радыеактыўныя прадукты харчавання… Лабараторыю скарацілі, прафесара адправілі на пенсію. Яна вахцёрам недзе ўладкавалася, падавала паліто…

І ніхто ні за што не быў пакараны…

Праз пяць гадоў… Захворванні ракам шчытападобнай залозы выраслі ў трыццаць разоў. Выяўлены рост прыроджаных адхіленняў развіцця, захворванняў нырак, сэрца, дзіцячага цукровага дыябету…

Праз дзесяць гадоў… Працягласць жыцця беларусаў скарацілася да шасцідзесяці гадоў…

Я веру ў гісторыю… У суд гісторыі… Чарнобыль не скончыўся, ён толькі пачынаецца…

*Васіль Барысавіч Несцярэнка,*
*былы дырэктар Інстытута ядзернай энергетыкі*
*Акадэміі навук Беларусі*

## Маналог пра ахвяр і жрацоў

Чалавек падымаецца раннім ранкам... Пачынае свой дзень...

І ён не думае пра вечнае, яго думкі пра хлеб надзённы. А вы хочаце прымусіць людзей думаць пра вечнае. Памылка ўсіх гуманістаў...

Што такое Чарнобыль?

Прыязджаем у вёску... У нас маленькі нямецкі аўтобус (падаравалі нашаму фонду), дзеці абкружаюць нас: «Цёця! Дзядзя! Мы — чарнобыльцы. Што вы прывезлі? Дайце нам што-небудзь. Дайце!»

Вось ён — Чарнобыль...

Па дарозе ў зону сустракаем бабульку ў святочнай вышыванай спадніцы, у фартуху, за плячыма клуначак.

— Куды, бабуля? На гасціны?

— Іду ў Маркі... У свой двор...

А там сорак кюры! Ісці ёй кіламетраў дваццаць пяць. Яна дзень ідзе туды і дзень назад. Прынясе трохлітровы слоік, які два гады вісеў у яе на плоце. Але пабыла на сваім двары.

Вось ён, Чарнобыль...

Што я памятаю з першых дзён? Як гэта было? Усё ж трэба адтуль... Каб расказаць сваё жыццё, трэба пачынаць з дзяцінства. Так і тут... У мяне свой пункт адліку. Я ўспамінаю нібыта іншае... Успамінаю саракагоддзе Перамогі. Тады ў нашым Магілёве быў першы феерверк. Пасля афіцыйнай урачыстасці людзі не разышліся, а пачалі спяваць песні. Зусім нечакана. Я памятаю гэтае агульнае пачуццё. Праз сорак гадоў пра вайну загаварылі ўсе, прыйшло асэнсаванне. А да гэтага выжывалі, аднаўлялі, нараджалі дзяцей. Так і з Чарнобылем... Яшчэ вернемся да яго, ён адкрыецца нам глыбей. Зробіцца

святыняй. Сцяной плачу. А пакуль формулы няма. Няма формулы! Ідэй няма. Кюры, бэры, зіверты — гэта не асэнсаванне. Гэта — не філасофія. Не светапогляд. У нас чалавек — або са стрэльбай, або з крыжам. Праз усю гісторыю. А іншага чалавека не было. Пакуль не было.

Мая мама працавала ў штабе грамадзянскай абароны горада, яна даведалася адна з першых. Спрацавалі ўсе прыборы. Згодна з інструкцыяй, якая вісела ў іх у кожным кабінеце, трэба было адразу апавясціць насельніцтва, выдаць рэспіратары, супрацьгазы ды іншае. Адчынілі яны свае сакрэтныя сховішчы, апячатаныя, засургучаныя, але ўсё там аказалася ў жудасным стане, непрыдатнае, выкарыстаць нельга. У школах супрацьгазы былі даваенных узораў, нават памеры дзецям не падыходзілі. Прыборы зашкальвала, але ніхто нічога не мог зразумець, такога ніколі не было. Прыборы проста выключылі. Мама апраўдвалася: «Вось калі б грымнула вайна, мы ведалі б, што рабіць. Ёсць інструкцыя. А тут?» Хто ў нас узначальваў грамадзянскую абарону? Адстаўныя генералы, палкоўнікі, для якіх вайна пачынаецца так: радыё перадае ўрадавыя заявы, паветраная трывога, фугасы, запальныя бомбы… Да іх не даходзіла, што час змяніўся. Патрэбны быў псіхалагічны пералом. І ён адбыўся. Цяпер мы ведаем: будзем сядзець, піць чай за святочным сталом… Будзем размаўляць, смяяцца, а вайна ўжо будзе ісці. Мы нават не заўважым, як знікнем.

А грамадзянская абарона — гэта гульня, у якую гулялі дарослыя дзядзькі. Яны адказвалі за парады, за вучэнні… Каштавала гэта мільёны… Нас зрывалі з працы на тры дні. Нічога не тлумачылі — на вайсковыя вучэнні. Называлася гэтая гульня «На выпадак атамнай вайны». Мужчыны — салдаты і пажарнікі, жанчыны —

сандружынніцы. Выдавалі камбінезоны, боты. Санітарныя сумкі, пакет з бінтамі і нейкімі лекамі. Вядома! Савецкі народ павінен годна сустрэць ворага. Сакрэтныя карты, планы эвакуацыі — усё гэта захоўвалася ў незгаральных сейфах пад сургучнымі пячаткамі. Згодна з гэтымі планамі за лічаныя хвіліны па трывозе трэба было падняць людзей і адвезці іх у лес. У бяспечную зону. Вые сірэна. Увага! Вайна…

Прысуджалі кубкі, сцягі. І яшчэ быў паходны банкет. Мужчыны п'юць за нашу будучую перамогу! І, зразумела, за жанчын!

А нядаўна… Ужо цяпер… Абвясцілі ў горадзе трывогу. Увага! Грамадзянская абарона! Гэта было тыдзень таму… У людзей — страх, але страх іншы. Ужо не амерыканцы напалі, не немцы, а што там — у Чарнобылі? Няўжо зноў?

Восемдзесят шосты год… Хто мы? Якімі нас заспела гэтая тэхналагічная версія канца свету? Я? Мы? Гэта мясцовая інтэлігенцыя, у нас быў свой гурток. Мы жылі асобным жыццём, стаялі ўбаку ад усяго, што навокал. Форма нашага пратэсту. Мы мелі свае законы: не чыталі газету «Правда», але часопіс «Огонёк» перадавалі з рук у рукі. Толькі-толькі павады аслабелі, і мы гэтым упіваліся. Чыталі самвыдат, нарэшце ён трапіў да нас, у нашу глыбінку. Чыталі Салжаніцына, Шаламава… Венечку Ерафеева… Хадзілі адно да аднаго ў госці, бясконцыя размовы на кухнях. Па нечым тужылі. Па чым? Дзесьці жывуць акторы, кіназоркі… Вось я буду Катрын Дэнёў… Надзену недарэчную хламіду, закручу незвычайна валасы… Туга па свабодзе… Той, невядомы свет… Чужы свет… Як форма свабоды… Але і гэта таксама была гульня. Уцёкі ад рэальнасці. Хтосьці з нашага гуртка зламаўся, спіўся, хтосьці ўступіў у партыю,

папоўз па кар'ерных прыступках. Ніхто не верыў, што гэты крамлёўскі мур можна праламіць. Прабіць. І ён разваліцца… Што не пры нашым жыцці — дакладна. Калі так, то напляваць, што ў вас там адбываецца, будзем жыць тут. У нашым свеце ілюзій…

Чарнобыль… І напачатку тая самая рэакцыя. А пры чым тут мы? Няхай улада хвалюецца… Гэта ў іх — Чарнобыль… І гэта далёка. Нават на карту не паглядзелі. Нецікава. Нам ужо не трэба было праўды… Вось калі на бутэльках з малаком з'явіліся налепкі: «Малако для дзяцей» і «Малако для дарослых»… Вось тады мы схамянуліся. Штосьці набліжаецца!.. Так, я не член партыі, але ўсё роўна савецкі чалавек. З'явіўся страх: «Чамусьці ў радыскі лісце сёлета — як у буракоў». Але тут увечары ўключыш тэлевізар: «Не паддавайцеся на правакацыі!» І ўсе сумневы развейваюцца… А першамайская дэманстрацыя? Ніхто нас не прымушаў на яе ісці, мяне, напрыклад, ніхто не абавязваў. Мы мелі выбар. Але мы яго не зрабілі. Я не памятаю такой шматлюднай, такой радаснай першамайскай дэманстрацыі, як у той год. Было трывожна, хацелася, вядома, у статак… Адчуваць локаць… Каб разам з усімі. Хацелася кагосьці лаяць. Начальства… Урад… Камуністаў… Цяпер я думаю… Шукаю абрыў… Дзе абарвалася? А абрыў — на самым пачатку… Наша несвабода… Вяршыня вальнадумства: «Можна есці радыску ці нельга?» Несвабода ўнутры нас…

Працавала я інжынерам на заводзе «Хімвалакно», і ў нас там была група нямецкіх спецыялістаў. Наладжвалі новае абсталяванне. Я ўбачыла, як паводзяць сябе іншыя людзі, іншы народ… З іншага свету… Калі яны даведаліся пра аварыю, адразу ж запатрабавалі, каб былі дактары, каб выдалі дазіметры, кантралявалася ежа.

Яны слухалі сваё радыё, яны ведалі, што трэба рабіць. Ім, канешне, нічога не далі. Тады яны спакавалі валізы і сабраліся з'язджаць. Купляйце нам білеты! Адпраўляйце дадому! Калі вы не здольныя забяспечыць нам неабходную бяспеку, мы ад'язджаем. Баставалі, дасылалі тэлеграмы свайму ўраду... Прэзідэнту... Яны літаральна біліся за сваіх жонак, дзяцей — жылі ў нас з сем'ямі. За сваё жыццё! А мы? Як паводзілі сябе мы? Ах, вы бачыце, якія гэтыя немцы — істэрыкі! Баязліўцы! Мераюць радыяцыю ў баршчы, у катлетах... На вуліцу лішні раз не выйдуць... Смех дый годзе! Вось нашы мужчыны — гэта мужчыны! Рускія мужыкі! Адчайныя! Вядуць бітву з рэактарам! Не трасуцца за сваю шкуру! Падымаюцца на расплаўлены дах з голымі рукамі або ў брызентавых рукавіцах (мы гэта ўжо бачылі па тэлевізары). А нашыя дзеці са сцяжкамі ідуць на дэманстрацыю! І ветэраны вайны... Старая гвардыя! *(Абдумвае.)* Але гэта таксама від варварства — адсутнасць страху за сябе. Мы заўсёды кажам «мы», а не «я»: «мы прадэманструем савецкі гераізм», «мы пакажам савецкі характар». Усяму свету! Але гэтае — я! Я не хачу паміраць... Я баюся...

Цікава сёння прасачыць за сабой, за сваімі пачуццямі. Як яны мяняліся. Прааналізаваць. Даўно злавіла сябе на тым, што стала больш уважлівай да свету навокал. Навокал сябе і ў сабе. Пасля Чарнобыля гэта само сабой атрымліваецца. Мы пачалі вучыцца гаварыць «я»... Я не хачу паміраць! Я баюся... А тады? Я ўключаю тэлевізар гучней: чырвоны сцяг уручаюць даяркам, якія перамаглі ў сацыялістычным спаборніцтве. Але гэта ж у нас? Пад Магілёвам? У вёсцы, што апынулася ў цэнтры цэзіевай плямы? Яе вось-вось перасяляць. Вось-вось... Голас дыктара: «людзі самаахвярна працуюць, нягледзячы ні на што», «дзівосы мужнасці і гераізму». Хоць

патоп! Рэвалюцыйным крокам! Так, я не член партыі, але ўсё роўна савецкі чалавек. «Таварышы, не паддавайцеся на правакацыі!» — грыміць удзень і ўначы тэлевізар. Сумневы рассейваюцца...

*(Тэлефонны званок. Вяртаецца да размовы праз паўгадзіны.)*

Мне цікавы кожны новы чалавек. Кожны. Хто думае пра гэта...

Наперадзе нас чакае разуменне Чарнобыля як філасофіі. Дзве дзяржавы, падзеленыя калючым дротам: адна — сама зона, другая — усё астатняе. На падгнілых слупах вакол зоны, як на крыжах, вісяць белыя ручнікі. Наш звычай. Людзі ідуць сюды, як на могілкі. Свет пасля тэхналогіі... Час пайшоў назад... Тут пахаваны не толькі іхні дом, а цэлая эпоха. Эпоха веры. У навуку. У справядлівую сацыяльную ідэю! Вялікая імперыя распаўзлася па швах. Развалілася. Спачатку — Афганістан, потым — Чарнобыль. Калі імперыя рассыпалася, мы засталіся адны. Баюся вымавіць, але мы... Мы любім Чарнобыль. Палюбілі. Гэта зноў знойдзены сэнс нашага жыцця... Сэнс нашых пакутаў. Як вайна. Пра нас, беларусаў, свет даведаўся пасля Чарнобыля. Гэта было вакно ў Еўропу. Мы адначасова і яго ахвяры, і яго жрацы. Страшна вымавіць... Я зразумела гэта нядаўна...

У самой зоне... Там нават гукі іншыя. Заходзіш у дом... Адчуванне, як ад той казачнай прыгажуні, якая заснула. Калі яшчэ не разрабавалі: фатаграфіі, начынне, мэбля... Яны мусяць быць недзе тут, побач, людзі. Часам мы знаходзім іх... Але яны не гавораць пра Чарнобыль, яны гавораць пра тое, што іх падманулі. Іх хвалюе, ці атрымліваюць яны ўсё, што ім належыць, і ці не атрымліваюць іншыя больш. У нашага народа ўвесь час такое пачуццё, што яго падманваюць. На ўсіх этапах вялікага

шляху. З аднаго боку — нігілізм, адмаўленне, а з другога — фаталізм. Уладзе не верац, вучоным і дактарам не верац, але і самі нічога не робяць. Нявінныя і бездзельныя. У саміх пакутах знойдзены сэнс і апраўданне, усё астатняе нібыта і неістотна. Уздоўж палёў — таблічкі «высокая радыяцыя». Палі ўзараныя. Трыццаць кюры… Пяцьдзясят… Трактарысты сядзяць у адкрытых кабінах, дыхаюць радыеактыўным пылам… Дзесяць гадоў прамінула! Хто ж мы? Жывём на забруджанай зямлі, аром, сеем. Нараджаем дзяцей. У чым тады сэнс нашых пакутаў? Навошта яны? Навошта іх нам дадзена столькі? Мы пра гэта цяпер шмат спрачаемся з маімі сябрамі. Часта абмяркоўваем. Бо зона — гэта не бэры і кюры, не мікрарэнтгены. Гэта — народ. Наш народ. Чарнобыль «дапамог» нашай сістэме, якая ўжо была гінула. Зноў «чрезвычайщина»… Размеркаванне. Паёк. Як раней убівалі ў мазгі «калі б не было вайны», так цяпер з'явілася магчымасць усё спісваць на Чарнобыль. «Калі б не было Чарнобыля». Адразу вочы затуманеныя — смуткуем. Дайце! Дайце нам! Каб было што дзяліць. Кармушка. Громаадвод!

Чарнобыль — ужо гісторыя. Але гэта яшчэ і мая праца. І побыт. Я езджу… Бачу… Была патрыярхальная беларуская вёска. Беларуская хата. Без туалета і цёплай вады, але з абразамі, драўляным калодзежам, вышыванымі ручнікамі, посцілкамі. З гасціннасцю. Зайшлі мы ў адну такую хату папіць вады, а гаспадыня дастае са старога куфра, старога, як яна сама, ручнік і працягвае мне: «Гэта табе на памяць пра мой двор». Быў лес, поле. Захоўваліся абшчына і асколкі свабоды: зямля каля дома, сядзіба, свая кароўка. З Чарнобыля іх пачалі перасяляць у «Еўропу» — у еўрапейскага тыпу пасёлкі. Можна пабудаваць дом — лепшы, камфортны,

але немагчыма пабудаваць на новым месцы ўвесь гэты велізарны свет, з якім яны былі звязаныя пупавінай. Каласальны ўдар па псіхіцы чалавека. Разрыў традыцый, усёй адвечнай культуры. Калі да гэтых новых пасёлкаў пад'язджаеш, яны — як міражы на даляглядзе. Расфарбаваныя. Блакітныя, сінія, жоўта-чырвоныя. І назвы ў іх — Майскі, Сонечны. Еўрапейскія катэджы значна больш зручныя, чым хаты. Гэта ўжо гатовая будучыня. Але ў будучыню нельга спусціць з парашутам… Людзей ператварылі ў дзікуноў… Яны сядзяць на зямлі і чакаюць, калі прыляціць самалёт, прыедзе аўтобус і прывязуць гуманітарную дапамогу. Не каб парадавацца шанцу: я вырваўся з пекла, маю дом, чыстую зямлю і павінен ратаваць сваіх дзяцей, у якіх Чарнобыль ужо ў крыві, у генах. Чакаюць дзіва… Ходзяць у царкву… Ведаеце, пра што просяць Бога? Пра тое самае — пра дзіва… Не, не пра тое, каб ён даў ім здароўя і сілы чагосьці дасягнуць самім. Прывыклі прасіць… То ў замежжа, то ў неба…

Жывуць у гэтых катэджах, як у вальерах. Яны абвальваюцца, рассыпаюцца. Жыве там несвабодны чалавек. Асуджаны. Ён жыве ў крыўдзе і ў страху, цвіка сам не заб'е. Хоча камунізму. Чакае. Зоне трэба камунізм… На ўсіх выбарах там галасуюць за цвёрдую руку, сумуюць па сталінскім ваенным парадку. Для іх гэта сінонім справядлівасці. Там і жывуць па-ваеннаму: міліцэйскія пасты, людзі ў вайсковай форме, прапускная сістэма, пайкі. Чыноўнікі, якія дзеляць гуманітарную дапамогу. На скрынках па-нямецку, па-руску напісана: «Нельга абменьваць. Нельга прадаваць». Вельмі часта прадаецца. У кожнай камерцыйнай крамцы…

І зноў як гульня… Рэкламнае шоу… Я вязу караван з гуманітарнай дапамогай. Чужыя людзі… Іншазем-

цы... Дзеля Хрыста, дзеля яшчэ чагосьці едуць да нас. А ў лужынах, у гразюцы, у фуфайках і ватніках стаіць маё племя... У кірзавых ботах... «Нам нічога не трэба! Усё адно раскрадуць!» — чытаю я ў іхніх вачах. Але побач адразу... Жаданне ўхапіць скрынку нечага замежнага. Ужо ведаем, дзе якая бабка жыве. Як у запаведніку... І агіднае, вар'яцкае жаданне... Крыўда! Раптам кажу: «А мы вам зараз пакажам! Знойдзем такое! Чаго вы і ў Афрыцы не сустрэнеце. Нідзе на свеце такога няма! Дзвесце кюры — трыста кюры...» Заўважаю, як мяняюцца і самі бабкі, некаторыя ну проста «кіназоркамі» парабіліся. У іх ужо ёсць завучаныя маналогі, і слёзы накручваюцца ў тых месцах, дзе трэба. Калі прыязджалі першыя замежнікі, яны маўчалі, толькі плакалі. Цяпер ужо навучыліся гаварыць. Можа, дзецям жуйка, скрынка апранашак лішняя перападзе... Можа... І гэта побач з глыбокай філасофіяй, з тым, што ў іх тут свае стасункі са смерцю, з часам. І не пакідаюць яны сваіх хатаў, родных могілак не з-за нямецкага шакаладу і жуек...

Вяртаемся. Я паказваю: «Якая прыгожая зямля!» Сонца апусцілася нізка-нізка. Заліло святлом лес, поле. Нам на развітанне. «Сапраўды, — адказвае хтосьці з нямецкай групы па-руску, — прыгожая, але атручаная». У яго ў руках — дазіметр.

І я разумею, што гэты захад сонца дарагі толькі мне. Гэта — мая зямля.

*Наталля Арсеньеўна Раслова, старшыня Магілёўскага жаночага камітэта «Дзеці Чарнобыля»*

# ДЗІЦЯЧЫ ХОР

*Алёша Бельскі — 9 гадоў, Аня Богуш — 10 гадоў, Наташа Дварэцкая — 16 гадоў, Лена Жудро — 16 гадоў, Юра Жук —15 гадоў, Воля Звонак — 10 гадоў, Сняжана Зіневіч — 16 гадоў, Іра Кудрачова — 14 гадоў, Юля Каско —11 гадоў, Ваня КаварОў — 12 гадоў, Вадзім Красносолнышка — 9 гадоў, Вася Мікуліч — 15 гадоў, Антон Нашыванкін — 14 гадоў, Марат Татарцаў — 16 гадоў, Юля Тараскіна — 15 гадоў, Каця Шаўчук — 14 гадоў, Барыс Шкірманкоў — 16 гадоў.*

«Я ляжала ў бальніцы…

Мне было так балюча… Я прасіла маму: “Мамачка, я не магу цярпець. Лепей забі мяне!”»

«Такая чорная хмара… Такая залева…

Лужыны зрабіліся жоўтыя… Зялёныя… Як быццам у іх налілі фарбы… Казалі, што гэта пылок ад кветак… Мы не бегалі па лужынах, толькі глядзелі на іх. Бабуля зачыняла нас у пограбе. А сама станавілася на калені і малілася. І нас вучыла: “Маліцеся! Гэта канец свету. Кара Божая за нашы грахі”. Брацiку было восем гадоў, а мне шэсць. Мы пачалі ўспамінаць свае грахі: ён разбіў слоік з малінавым варэннем… А я не прызналася маме, што зачапілася за плот і падрала новую сукенку… Схавала ў шафе…

Мама часта надзявае чорнае. Чорную хустку. На нашай вуліцы ўвесь час кагосьці хаваюць… Плачуць.

Пачую музыку — бягу дахаты і малюся, чытаю "Ойча наш".

Малюся за маму і тату...»

«Па нас прыехалі салдаты на машынах. Я падумаў, што пачалася вайна...

У салдат на плячах віселі сапраўдныя аўтаматы. Яны казалі незразумелыя словы: "дэзактывацыя", "ізатопы"... У дарозе прысніўся сон: прагрымеў выбух! А я жывы! Няма дома, няма бацькоў, няма нават вераб'ёў і варон. У жаху прачынаўся, ускокваў... Рассоўваў шторы... Глядзеў у вакно: ці няма ў небе гэтага грыба кашмарнага?

Памятаю, як салдат ганяўся за коткай... На котцы дазіметр працаваў, як аўтамат: пстрык, пстрык. За ёй — хлопчык і дзяўчынка... Гэта іхняя котка... Хлопчык маўчаў, а дзяўчынка крычала: "Не аддам!" Бегала і крычала: "Міленькая, уцякай! Уцякай, міленькая!"

А салдат з вялікім поліэтыленавым мяшком...»

«У доме мы пакінулі, зачынілі майго хамячка. Бялюткага. На два дні яму ежы пакінулі.

А паехалі назусім...»

«Я ўпершыню ехала ў цягніку...

Поезд быў перапоўнены дзецьмі. Маленькія румзаюць, запэцкаліся. Адна выхавальніца на дваццаць чалавек, а ўсе плачуць: "Мама! Дзе мама? Хачу дадому!" Мне — дзесяць гадоў, такія дзяўчынкі, як я, дапамагалі супакойваць малых. Жанчыны сустракалі нас на пéронах і хрысцілі цягнік. Неслі хатняе печыва, малако, цёплую бульбачку...

Нас везлі ў Ленінградскую вобласць. Там ужо, калі пад'язджалі да станцый, людзі хрысціліся і глядзелі здалёк. Баяліся нашага цягніка, на кожнай станцыі яго доўга мылі. Калі на адным прыпынку мы выскачылі з вагона і забеглі ў буфет, нікога туды больш не пусцілі: "Тут чарнобыльскія дзеці ядуць марозіва". Буфетчыца камусьці па тэлефоне казала: "Яны паедуць, мы памыем падлогу з хлоркай і пракіпяцім шклянкі". Мы чулі...

Сустракалі нас дактары. Яны былі ў супрацьгазах і гумовых пальчатках... Забралі ў нас адзенне, усе рэчы, нават канверты, алоўкі і ручкі, склалі ў цэлафанавыя пакеты і закапалі ў лесе.

Мы так напалохаліся... Потым доўга чакалі, што пачнём паміраць...»

«Мама з татам пацалаваліся, і я нарадзілася.

Раней я думала, што ніколі не памру. А цяпер ведаю, што памру. Хлопчык ляжаў са мной разам у бальніцы... Вадзік Карынкоў... Птушачак мне маляваў. Домікі. Ён памёр. Паміраць не страшна... Будзеш доўга-доўга спаць, ніколі не прачнешся. Вадзік мне казаў, што, калі ён памрэ, будзе доўга жыць у іншым месцы. Яму гэта сказаў хтосьці са старэйшых хлопчыкаў. Ён не баяўся.

Мне сніўся сон, як я памерла. Я чула ў сне, як плакала мая мама. І прачнулася...»

«Мы ад'язджалі...

Хачу расказаць, як развітвалася з нашым домам мая бабуля. Яна папрасіла тату вынесці з клеці мяшок пшана і раскідала яго па садзе: "Божым птушкам". Сабрала ў рэшата яйкі і высыпала на двары: "Нашым кату і сабаку". Нарэзала ім сала. Вытрасла з усіх сваіх мяшэчкаў

насенне: морквы, гарбузоў, гуркоў, цыбулі-чарнушкі... Розных кветак... Рассыпала па гародзе. "Няхай у зямлі жывуць". А потым пакланілася дому. Пакланілася пуні... Абышла і пакланілася кожнай яблыньцы.

А дзядуля, калі мы адыходзілі, зняў шапку...»

«Я быў маленькі...

Шэсць, не, восем гадоў, здаецца. Дакладна, восем. Палічыў зараз. Памятаю шмат страхаў. Баяўся бегаць басаном па траве. Мама напалохала, што памру. Купацца, нырца даваць — усяго баяўся. У лесе арэхі рваць. Узяць у рукі жука... Ён жа па зямлі поўзае, а яна забруджаная. Мурашкі, матылькі, чмялі — усе забруджаныя. Мама ўспамінае, што ў аптэцы ёй параілі даваць мне ёд па чайнай лыжцы! Тры разы на дзень. Але яна спалохалася...

Мы чакалі вясну: няўжо зноў вырастуць рамонкі? Як раней? Усе ў нас чакалі, што свет пераменіцца... Па радыё і па тэлевізары... Рамонкі ператворацца... У што яны ператворацца? У нешта іншае... А ў лісіцы вырасце другі хвост, вожыкі народзяцца без іголак, ружы будуць без пялёсткаў. З'явяцца людзі, падобныя да гуманоідаў, яны будуць жоўтыя. Без валасоў, без веек. Адны вочы. А захады сонца зробяцца не чырвоныя, а зялёныя.

Я быў маленькі... Восем гадоў...

Вясна... Увесну з пупышак, як заўсёды, раскруціліся лісцікі. Зялёныя. Зацвілі яблыні. Белыя. Запахла чаромха. Раскрыліся рамонкі. Яны былі такія самыя. Тады мы пабеглі на рэчку да рыбакоў: у плотак па-ранейшаму галава і хвост? І ў шчупака? Правяралі шпакоўні: ці прыляцелі шпакі? А ці будуць у іх дзеці?

У нас з'явілася шмат працы... Мы ўсё правяралі...»

«Дарослыя шапталіся... Я чуў...

З майго года нараджэння, з восемдзесят шостага — ні хлопчыкаў, ні дзяўчынак у нашай вёсцы няма. Я — адзін. Дактары не дазвалялі... Палохалі маму... Штосьці такое... А мая мама ўцякла з бальніцы і схавалася ў бабулі. І тут я... Знайшоўся... Ну, нарадзіўся, значыцца. Я ўсё гэта падслухаў...

Браціка і сястрычкі ў мяне няма. А я вельмі хачу. А адкуль дзеці бяруцца? Я пайшоў бы і адшукаў сабе браціка.

Бабуля мне па-рознаму адказвае:

—Бусел у дзюбе прыносіць. А то, бывае, на полі дзяўчынка вырасце. Хлопчыкаў у ягадах знаходзяць, калі птушка скіне.

Мама гаворыць іначай:

—Ты мне з неба ўпаў.

—Як?

—Дождж пайшоў, і ты мне проста на рукі ўпаў.

Цёця, ты пісьменніца? Як гэта мяне магло не быць? А дзе б я быў? Недзе высока, на небе? А можа, на іншай планеце?...»

«Раней я любіла хадзіць на выставы... Глядзець карціны...

У наш горад прывезлі выставу пра Чарнобыль... Бяжыць па лесе жарабятка, яно з адных ног, іх восем-дзесяць, цяля з трыма галовамі, сядзяць у клетцы лысыя трусікі, ну быццам пластмасавыя... Людзі гуляюць па лузе ў скафандрах... Дрэвы вышэй за цэрквы, а кветкі — як дрэвы... Я да канца не даглядзела. Натыкнулася на карціну: хлопчык цягне рукі, можа, да дзьмухаўца, можа, да сонца, а ў гэтага хлопчыка замест носа... хобат. Захацелася плакаць, крычаць: “Не трэба нам такіх

выстаў! Не вазіце! І так усе вакол гавораць пра смерць. Пра мутантаў. Не хачу!" У першы дзень на выставе былі людзі, прыйшлі, а потым ніводнага чалавека. У Маскве, Пецярбургу, пісалі ў газетах, на яе хадзілі натоўпамі. А ў нас — пустая зала.

Я ездзіла ў Аўстрыю на аздараўленне, там ёсць людзі, якія могуць павесіць такую фатаграфію ў сябе дома. Хлопчыка з хобатам… Або замест рук у яго ласты… І кожны дзень на яе глядзець, каб не забываць пра тых, каму дрэнна. Але калі жывеш тут, то гэта не фантастыка і не мастацтва, а жыццё. Маё жыццё… Калі мне выбіраць, то я лепей павешу ў сваім пакоі прыгожы пейзаж, каб усё там было нармальнае: і дрэвы, і птушкі. Звычайнае. Радаснае…

Хачу думаць аб прыгожым…»

«У першы год пасля аварыі…

У нас у пасёлку зніклі вераб'і… Яны валяліся паўсюль: у садах, на асфальце. Іх зграбалі і вывозілі ў кантэйнерах з лісцем. У той год лісце не дазвалялі спальваць, яно было радыеактыўнае. Лісце закопвалі ў зямлю.

Праз два гады вераб'і з'явіліся. Мы радаваліся, крычалі адно аднаму: "Я ўчора бачыў вераб'я. Яны вярнуліся".

Прапалі хрушчы. Іх дагэтуль у нас няма. Магчыма, яны вернуцца праз сто або тысячу гадоў, як кажа наш настаўнік. Нават я іх не ўбачу… А мне дзевяць гадоў…

А як мая бабуля? Яна ж старэнькая…»

«Першага верасня… Школьная лінейка…

І ніводнага букета. У кветках, мы ўжо ведалі, шмат радыяцыі. Перад пачаткам навучальнага года ў школе

працавалі не сталяры з малярамі, як раней, а салдаты. Яны касілі кветкі, здымалі зямлю і адвозілі яе кудысьці на машынах з прычэпамі. Высеклі вялікі стары парк. Старыя ліпы. Баба Надзя… Яе заўсёды клікалі ў дом, калі нехта паміраў. Пагаласіць. Пачытаць малітвы. “Маланка не спаліла… Сухмень не высушыла… Мора не заліло… Ляжаць, як чорныя труны… — яна плакала над дрэвамі, нібыта над людзьмі. — А мой ты дубок… А мая ты яблынька…”

А праз год усіх нас вывезлі ў эвакуацыю, вёску закапалі. Мой тата — шафёр, ён ездзіў туды і расказваў. Спачатку выкопваюць вялікую яму… На пяць метраў… Пад'язджаюць пажарнікі. З брандспойтаў паліваюць дом з вільчака да падмурка, каб не ўзняць радыеактыўны пыл. Вокны, дах, парог — усё паліваюць. А потым кран сцягвае дом з месца і ставіць у яму… Валяюцца лялькі, кніжкі, слоікі… Экскаватар падграбае… Усё засыпаюць пяском, глінай, трамбуюць. Замест вёскі — роўнае поле. Там ляжыць наш дом. І школа, і сельсавет… Там мой гербарый і два альбомы з маркамі, я марыла іх забраць.

Быў у мяне ровар… Яго мне толькі што купілі…»

«Мне — дванаццаць гадоў…

Я ўвесь час дома, я — інвалід. У нашым доме паштарка прыносіць пенсію мне і дзядулю. Дзяўчынкі ў класе, калі даведаліся, што ў мяне рак крыві, баяліся са мной сядзець. Дакрануцца. А я глядзела на свае рукі… На свой партфель і сшыткі… Нічога не змянілася. Чаму мяне баяцца?

Дактары сказалі: я захварэла, таму што мой тата працаваў у Чарнобылі. А я пасля гэтага нарадзілася.

А я люблю тату…»

«Я ніколі не бачыла столькі салдат…

Салдаты мылі дрэвы, дамы, дахі… Мылі калгасных кароў… Я думала: “Няшчасныя звяры ў лесе! Іх ніхто не мые. Яны ўсе памруць. І лес ніхто не мые. Ён таксама памрэ”.

Настаўніца сказала: “Намалюйце радыяцыю”. Я намалявала, як ідзе жоўты дождж… І цячэ чырвоная рака…»

«Я з дзяцінства любіў тэхніку… Марыў… Вырасту — буду тэхнар, як тата, ён тэхніку любіў. Мы разам з ім увесь час нешта канструявалі. Будавалі.

Тата паехаў… Я не чуў, як ён збіраўся. Я спаў. Уранні ўбачыў заплаканую маму: “Наш тата — у Чарнобылі”.

Чакала тату, як з вайны…

Ён вярнуўся і зноў пачаў хадзіць на завод. Нічога не расказваў. А я ў школе ўсім хваліўся. Што мой тата прыехаў з Чарнобыля, ён — ліквідатар, а ліквідатары — гэта тыя, хто дапамагаў ліквідоўваць аварыю. Героі! Хлапчукі мне зайздросцілі.

Праз год тата захварэў…

Мы хадзілі па бальнічным скверы… Гэта было пасля другой аперацыі… І ён упершыню загаварыў са мной пра Чарнобыль…

Працавалі яны недалёка ад рэактара. Ціха-мірна, — успамінаў, — прыгожа… А ў той самы час нешта адбываецца. Сады цвітуць. А для каго? Людзі з вёсак сышлі. Ехалі праз горад Прыпяць: на балконе вісіць бялізна, вазоны з кветкамі. Стаіць пад дрэвам ровар з брызентавай паштарскай сумкай, поўнай газет і лістоў. І на сумцы птушынае гняздо. Як у кіно, я бачыў…

Яны “чысцілі” тое, што трэба было кінуць. Здымалі грунт, забруджаны цэзіем і стронцыем. Назаўтра — усё зноў “пстрыкала”.

"На развітанне нам паціснулі рукі і ўручылі даведкі з падзякай за самаахвярнасць"... Бацька ўспамінаў і ўспамінаў. Апошні раз вярнуўся з бальніцы і сказаў нам: "Калі застануся жывы — ніякай хіміі, ніякай фізікі. Сыду з завода... Толькі ў пастухі..."

Мы з мамай засталіся ўдваіх. Я не пайду ў тэхнічны інстытут, як марыць мая мама. У той, дзе тата вучыўся...»

«У мяне ёсць маленькі брат...

Ён любіць гуляць у Чарнобыль. Будуе бамбасховішча, засыпае пяском рэактар... Або апранецца пудзілам, бегае за ўсімі і палохае: "О-о-о! Я — радыяцыя! О-о-о! Я — радыяцыя!"

Яго яшчэ не было, калі гэта здарылася».

«Па начах я лётаю...

Лётаю сярод яркага святла... Гэта не рэальнасць і не тагасветнае. Гэта і адно, і другое, і трэцяе. У сне я ведаю, што магу ўвайсці ў гэты свет, пабыць у ім... Або застацца? Мой язык някруткі, дыханне няправільнае, але мне не трэба там ні з кім размаўляць. Нешта падобнае са мной калісьці ўжо здаралася. Але — калі? Я не памятаю... Мяне распірае жаданне зліцца, але я нікога не бачу... Толькі святло... Адчуванне такое, што я магу яго пакратаць... Які я велізарны! Я з усімі, але ўжо ўбаку, асобна. Адзін. У самым раннім дзяцінстве я бачыў некаторыя каляровыя выявы так, як бачу цяпер. У гэтым сне... Надыходзіць момант, калі я ні пра што іншае ўжо не магу думаць. Толькі... Раптам адчыніцца вакно... Нечаканы павеў ветру. Што гэта? Адкуль? Паміж мной і некім усталёўваецца сувязь... Кантакт... Але як мне замінаюць гэтыя шэрыя бальнічныя сцены. Які я яшчэ

слабы… Святло я закрываю галавой, бо яно замінае бачыць… Я цягнуўся, цягнуўся… Пачаў глядзець вышэй…

І прыйшла мама. Учора яна павесіла ў палаце абраз. Нешта шэпча там у куце, укленчвае. Яны ўсе маўчаць: прафесар, дактары, медсёстры. Думаюць, што я не пазраю, не ведаю, што хутка памру. А я па начах вучуся лётаць…

Хто сказаў, што лётаць лёгка?

Калісьці я пісаў вершы… У пятым класе я закахаўся ў дзяўчынку. У сёмым адкрыў, што ёсць смерць… Мой улюбёны паэт Гарсія Лорка. Вычытаў у яго: “цёмны корань крыку”. Уначы вершы гучаць інначай… Я пачаў вучыцца лётаць… Мне не падабаецца гэтая гульня, але што рабіць?

Майго найлепшага сябра звалі Андрэй… Яму зрабілі дзве аперацыі і адправілі дахаты. Праз паўгода яго чакала трэцяя аперацыя… Ён засіліўся на сваёй папружцы… У пустым класе, калі ўсе сарваліся на ўрок фізкультуры. Дактары забаранілі яму бегаць, скакаць, ён лічыўся лепшым футбалістам у школе. Да… Да аперацыі…

У мяне тут было шмат сяброў… Юля, Каця, Вадзім, Аксана, Алег… Цяпер — Андрэй… “Мы памром і станем навукай”, — казаў Андрэй. “Мы памром, і нас забудуць”, — так думала Каця. “Калі я памру, не хавайце мяне на могілках, я баюся могілак, там толькі нябожчыкі і крумкачы. Пахавайце ў полі…” — прасіла Аксана. “Мы памром…” — плакала Юля.

Для мяне цяпер неба жывое, калі я на яго гляджу… Яны там…»

# САМОТНЫ ЧАЛАВЕЧЫ ГОЛАС

Я нядаўна была такая шчаслівая. Чаму? Забыла...

Усё засталося недзе ў іншым жыцці. Я не разумею...

Не ведаю, як зноў змагла жыць. Захацела жыць. Вось — смяюся, размаўляю. Я была ва ўладзе такой тугі... Быццам паралізаваная... Хацелася з кім-небудзь гаварыць, але з кім-небудзь не з людзей. Зайду ў царкву, там ціха-ціха, як у гарах бывае. Ціха-ціха. Там можна забыць сваё жыццё. А раніцой прачнуся... Шукаю рукой... Дзе ён? Ягоная падушка, ягоны пах... Маленькая незнаёмая птушачка бегае па падваконні з маленькім званочкам і будзіць. Ніколі раней такога гуку, такога голасу не чула. Дзе ён? Я не ўсё магу перадаць, не ўсё прамаўляецца. Не разумею, як я засталася жыць. Увечары дачка падыдзе: «Мам, я ўрокі ўжо вывучыла». Тут я ўзгадаю, што ў мяне ёсць дзеці. А дзе ж ён? «Мам, а ў мяне гузічак адарваўся. Прышый». Як мне пайсці за ім? Сустрэцца. Заплюшчу вочы і думаю пра яго, пакуль не засну. У сне ён прыходзіць, але толькі прамільгне. Адразу знікае. Я нават чую ягоныя крокі... Куды вось ён знікае? А яму так не хацелася паміраць. Глядзіць у вакно і глядзіць. На неба... Я яму адну падушку падкладу, другую. Трэцюю... Каб было высока. Ён паміраў доўга... Цэлы год... Мы не маглі расстацца... *(Доўга маўчыць.)*

Не-не, не бойцеся, не заплачу... Я развучылася плакаць. Іншым разам так цяжка, так невыносна — хачу сказаць сабе, пераканаць, што я нічога не памятаю. Як мая сяброўка. Каб не звар'яцець... Яна... Нашы мужы памерлі ў адзін год, яны разам былі ў Чарнобылі. Яна замуж збіраецца, хоча забыць, прычыніць гэтыя дзверы.

Дзверы туды. За ім... Не-не, я яе разумею. Я ведаю... Трэба выжыць... У яе дзеці... Мы недзе пабылі, дзе яшчэ ніхто не быў, штосьці такое бачылі, чаго ніхто не бачыў. Маўчу-маўчу, а аднойчы ў цягніку пачала расказваць незнаёмым людзям. Навошта? Адной страшна...

Ён паехаў у Чарнобыль у дзень майго нараджэння... Госці яшчэ сядзелі за сталом, перад імі выбачыўся. Пацалаваў. А машына ўжо чакала пад вакном. Дзевятнаццатага кастрычніка тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага года. Мой дзень нараджэння... Ён — мантажнік, ездзіў па ўсім Савецкім Саюзе, а я яго чакала. Так ішло гадамі. Мы жылі, як жывуць закаханыя — развітваліся і сустракаліся. А тады... Страх авалодаў толькі нашымі мамамі, яго мамай і маёй, а ў нас з ім страху не было. Цяпер думаю: чаму? Мы ж ведалі, куды ён едзе. Ну хоць бы ўзялі ў хлопчыка-суседа падручнік фізікі за дзясяты клас і пагарталі. Ён там без шапкі хадзіў. У іншых ягоных хлопцаў праз год усе валасы павыпадалі, а ў яго, наадварот, шавялюра толькі гусцейшай зрабілася. Нікога з іх ужо няма. Ягоная брыгада, сем чалавек, усе памерлі. Маладыя... Адзін за адным... Першы памёр праз тры гады... Ну, думалі, выпадковасць. Лёс. За ім другі, трэці, чацвёрты... Цяпер кожны стаў чакаць, калі ён... Вось як яны жылі! Мой муж памёр апошні... Мантажнікі-верхалазы... Яны адключалі святло ў выселеных вёсках, лазілі па слупах. Па мёртвых дамах хадзілі, па мёртвых вуліцах. Увесь час на вышыні, наверсе. Рост у яго пад два метры, вага — дзевяноста кілаграмаў. Хто мог яго такога забіць? Страху ў нас доўга не было... *(Нечакана ўсміхаецца.)*

Ах, якая я была шчаслівая! Вярнуўся... яго ўбачыла... У доме — свята, заўсёды, калі ён вяртаўся, было свята. Начная кашуля ў мяне ёсць доўгая-доўгая, прыгожаяпрыгожая, я яе надзявала. Любіла дарагую бялізну, яна

ў мяне ўся добрая, але гэтая кашуля асаблівая. Святочная. На першы наш дзень… Першую ноч… Я ўсё ягонае цела ведала на памяць, я ўсё цалавала. Мне, бывала, нават сасніцца сон, што я нейкая частка ягонага цела — такія мы непадзельныя. Без яго вельмі сумавала, мне фізічна без яго было балюча. Калі мы з ім расставаліся, я на нейкі час губляла арыентацыю — дзе я, на якой вуліцы, колькі часу… Проста выпадала з часу… Ён прыехаў адразу з лімфавузламі на шыі, я іх вуснамі адчула, яны невялікія, але я запытала: «Сходзіш да доктара?» Супакоіў: «Пройдзе». — «Як там, у Чарнобылі?» — «Звычайная праца». Ні бравады, ні панікі. Адно выпытала: «Там гэтаксама, як і тут». У сталоўцы, дзе іх кармілі, на першым паверсе абслугоўвалі радавых — локшына, кансервы, а на другім — у начальства, у генералаў — садавіна, чырвонае віно, мінеральная вада. Чыстыя абрусы. У кожнага — дазіметр. А ім на ўсю брыгаду ніводнага не далі.

Я памятаю мора… Мы яшчэ ездзілі з ім на мора, я запомніла, што мора так многа, як і неба. Сяброўка з мужам… яны таксама з намі паехалі… І яна ўспамінае: «Мора бруднае. Усе баяліся халерай заразіцца». Нешта такое газеты пісалі… Я памятаю інакш… У яркім колеры… Я памятаю, што мора было паўсюль, як і неба. Сіняе-сіняе. І ён побач. Я нарадзілася для кахання… Для шчаслівага кахання… У школе дзяўчынкі марылі — хто паступіць у інстытут, хто паехаць на камсамольскую будоўлю, а я хацела выйсці замуж. Кахаць моцна-моцна, як Наташа Растова. Толькі кахаць! Але нікому ў гэтым не магла прызнацца, бо ў той час, вы павінны памятаць, дазвалялася марыць толькі пра камсамольскую будоўлю. Нам гэта ўнушалі. Ірваліся ў Сібір, у непралазную тайгу, памятаеце, спявалі: «за туманом и за запахом тайги». У інстытут я ў першы год не трапіла, не дабра-

ла балаў, пайшла працаваць на тэлефонную станцыю. Там мы з ім і пазнаёміліся. Я дзяжурыла... І я сама яго ажаніла, я яго папрасіла: «Ажаніся са мной. Я цябе так кахаю!» Закахалася бязмежна. Такі прыгожы хлопец... Я на нябёсах лётала. Я сама яго папрасіла: «Ажаніся са мной». *(Усміхаецца.)*

Іншым разам задумаюся і шукаю сабе розныя суцяшэнні: а можа, смерць — гэта не канец, ён усяго толькі змяніўся і жыве недзе ў сваім свеце. Недзе побач? Я працую ў бібліятэцы, шмат кніг чытаю, з рознымі людзьмі сустракаюся. Мне хочацца гаварыць пра смерць. Зразумець. Я шукаю суцяшэння. У газетах, у кнігах вычытваю... У тэатр іду, калі там пра гэта, пра смерць... Мне фізічна без яго балюча, я не магу адна...

Ён не хацеў ісці да доктара: «Я нічога не адчуваю. Мне не баліць». А лімфавузлы ўжо сталі памерам з курынае яйка. Сілай запіхнула ў машыну і завезла ў паліклініку. Накіравалі да анколага. Адзін доктар паглядзеў, паклікаў другога: «Тут яшчэ адзін чарнобылец». І яны яго ўжо не адпусцілі. Праз тыдзень зрабілі аперацыю: цалкам выдалілі шчытападобную залозу, гарлянку і замянілі іх нейкімі трубачкамі. Вось... *(Замаўкае.)* Цяпер я ведаю, што гэта быў яшчэ таксама шчаслівы час. Божа! Якой лухтой я займалася: бегала па крамах, купляла падарункі дактарам — пушкі цукерак, імпартныя лікёры. Нянечкам шакаладкі. І яны бралі. А ён з мяне пасміхаўся: «Зразумей, яны не багі. А хіміі ды апраменьвання тут усім хапае. Дадуць і без цукерак». Але я імчала на іншы канец горада па торт «Птушынае малако» або па французскую парфуму — усё гэта ў той час толькі па знаёмстве, з-пад крыса. Перад выпіскай... Мы... Мы паедзем дадому! Мне далі спецыяльны шпрыц, паказалі, як ім карыстацца. Я павінна была карміць яго праз

гэты шпрыц. Усё засвоіла. Чатыры разы на дзень варыла што-небудзь свежае, абавязкова свежае, перакручвала на мясасечцы, перацірала на сіцечку і потым набірала ў шпрыц. Праколвала адну з трубак, самую вялікую, а яна ішла ў страўнік... Але ён ужо не адчуваў пахі, не адрозніваў. Запытаюся: «Смачна?» Не ведае.

Але мы ўсё адно яшчэ некалькі разоў бегалі ў кіно. І там цалаваліся. Павіслі на такой то-о-о-ненькай нітачцы, а нам уяўлялася, што зноў зачапіліся за жыццё. Пра Чарнобыль стараліся не размаўляць. Не згадваць. Забароненая тэма... Да тэлефона я яго не падпускаю. Перахопліваю. Хлопцы ягоныя адзін за адным паміраюць. Забароненая тэма... Але неяк уранні буджу яго, працягваю халат, а ён не можа падняцца. І сказаць нічога не можа... Ужо не гаворыць... Вочы вялікія-вялікія... Вось калі ён спалохаўся... *(Зноў замаўкае.)* Заставаўся ў нас яшчэ год... Увесь гэты год ён паміраў... З кожным днём яму горш і горш, і ён ужо ведае, што ягоныя хлопцы паміраюць... Мы ж яшчэ і з гэтым жылі... З гэтым чаканнем... Кажуць — Чарнобыль, пішуць — Чарнобыль. Але ніхто не ведае, што гэта... Усё цяпер у нас па-іншаму: нараджаемся не такія, паміраем не так. Не так, як усе. Вы ў мяне спытаеце, як паміраюць пасля Чарнобыля? Чалавек, якога я кахала, кахала так, што не магла б кахаць мацней, калі б я яго сама нарадзіла, на маіх вачах ператвараўся... У пачвару. Выдалілі лімфавузлы, іх няма, і парушыўся кровазварот, і нос ужо неяк ссунуўся, павялічыўся разы ў тры, і вочы ўжо нейкія іншыя — разышліся ў розныя бакі, у іх незнаёмае святло з'явілася і выраз, як быццам не ён, а нехта яшчэ адтуль пазірае. Потым адно вока зусім заплюшчылася... А я чаго баюся? Мне трэба толькі, каб ён сябе не ўбачыў... Не запомніў такім. Але ён пачаў мяне прасіць,

паказваць рукамі, маўляў, прынясі люстэрка. Я то на кухню збягу, быццам забылася, не чула, то яшчэ штонебудзь прыдумаю. Два дні яго так падманвала, на трэці дзень піша мне ў сшытачак вялікімі літарамі і з трыма клічнікамі: «Дай люстэрка!!!» У нас ужо быў сшытачак, аловак, асадка, мы ўжо такім спосабам сумовіліся, бо нават шэптам ён не мог гаварыць, нават шэпту ў яго не атрымлівалася. Поўная немата. Я пабегла на кухню, грукачу каструлямі. Не чытала, не чула. Зноў мне піша: «Дай люстэрка!!!» — і з гэтымі клічнікамі... Прынесла яму люстэрка, самае маленькае. Зірнуў, схапіўся за галаву і качаецца, качаецца на ложку... Я — да яго, пачала ўгаворваць... «Вось крыху ачуняеш, і мы паедзем з табой куды-небудзь у закінутую вёску. Купім дом, будзем там жыць, калі ты не захочаш у горадзе, дзе шмат людзей. Будзем жыць адны». Я яго не падманвала, я паехала б з ім куды заўгодна, толькі б ён быў, а які — няважна. Ён — і ўсё. Я яго не падманвала...

Не ўзгадаю нічога, аб чым хацелася б прамаўчаць. А было ўсё... Я так далёка зазірнула, магчыма, далей за смерць... *(Перапыняецца.)*

Мне было шаснаццаць гадоў, калі мы пазнаёміліся, ён старэйшы за мяне на сем гадоў. Два гады сустракаліся. Я вельмі люблю ў нас у Мінску раён каля галоўпаштамта, вуліцу Валадарскага, там, пад гадзіннікам, ён прызначыў мне спатканне. А я жыла каля камвольнага камбіната і ездзіла на пятым тралейбусе, які не спыняўся каля паштамта, а крыху праязджаў уперад, да магазіна «Дзіцячае адзенне». Ехаў ён да павароту больш павольна, якраз тое, што мне трэба. Ледзь-ледзь заўсёды спазняюся, каб убачыць у вакно і ахнуць: які прыгожы хлопец мяне чакае! Нічога не заўважала два гады — ні зімы, ні лета. Вадзіў на канцэрты... На маю ўлюбёную Эдзіту П'еху...

На танцы не бегалі, на танцпляцоўку, ён не ўмеў танцаваць. Цалаваліся, толькі цалаваліся. Называў мяне: «Маленькая мая». Дзень нараджэння, зноў мой дзень нараджэння… Дзіўна, але ўсё самае галоўнае ў мяне адбывалася менавіта ў гэты дзень, вось і не верце пасля гэтага ў лёс. Стаю пад гадзіннікам: а пятай — спатканне, а яго няма. А шостай — засмучаная, заплаканая цягнуся на свой прыпынак, пераходжу вуліцу, азірнулася, як адчула — бяжыць за мной, на чырвонае святло, у рабочай спяцоўцы, у ботах… З працы раней не адпусцілі… Такім я яго больш за ўсё і любіла: у паляўнічым касцюме, у целагрэйцы — яму ўсё пасавала. Паехалі да яго дадому, ён пераапрануўся, мы вырашылі адзначыць мой дзень нараджэння ў рэстаране. Але ў рэстаран мы ўжо не трапілі, таму што быў вечар, вольных месцаў няма, а сунуць пяцёрку або дзясятку (гэта яшчэ старыя грошы) швейцару, як іншыя, ні ён, ні я не ўмелі. «Давай, — раптам увесь ён проста заззяў, — купім у краме шампанскага, набор піражных і пойдзем у парк, там адсвяткуем». Пад зоркамі, пад небам! Вось ён быў які… На лавачцы ў парку Горкага мы праседзелі да раніцы. Другога такога дня нараджэння ў мяне ў жыцці не было, вось тады я яму і сказала: «Ажаніся са мной. Я цябе так кахаю!» Засмяяўся: «Ты яшчэ маленькая». А назаўтра занеслі заяву ў загс…

Ах, якая я была шчаслівая! Нічога не памяняла б у сваім жыцці, нават калі б папярэдзіў нехта з нябёсаў, з зорак… даў сігнал… У дзень вяселля ён не знайшоў свайго пашпарта, мы ўвесь дом перакапалі, шукалі. Нас запісалі ў загсе на нейкай паперцы. «Дачушка, гэта дрэнны знак», — плакала мая мама. Потым пашпарт знайшоўся ў ягоных старых штанах, на гарышчы. Каханне! Гэта нават было не каханне, а доўгая закаханасць. Як я танчыла раніцой перад люстэркам: я прыгожая, я мала-

дая, ён мяне кахае! Цяпер я забываю свой твар, той твар, што быў у мяне з ім. Я не бачу гэтага твару ў люстэрку…

Ці можна пра гэта казаць? Называць словамі… Бываюць таямніцы… Я дагэтуль не разумею, што гэта было. Да самага апошняга нашага месяца… Ён клікаў мяне ўначы… У яго былі жаданні. Любіў мацней, чым раней… Удзень, калі я глядзела на яго, не верыла ў тое, што адбывалася ўначы… Мы не хацелі з ім расставацца. Я яго лашчыла, гладзіла. У тыя хвіліны я ўспаміналa самае радаснае. Шчаслівае. Як ён прыехаў з Камчаткі з барадой, адгадаваў там бараду. Мой дзень нараджэння ў парку на лавачцы… «Ажаніся са мной…» Ці трэба казаць? Ці можна? Я сама да яго ішла, як ідзе мужчына да жанчыны… Што я магла яму даць, апрача лекаў? Якую надзею? Ён так не хацеў паміраць. У яго была вера, што маё каханне нас уратуе. Такое каханне! Толькі маме сваёй нічога не расказвала, яна б мяне не зразумела. Асудзіла б. Пракляла. Гэта ж не звычайны рак, якога таксама ўсе баяцца, а чарнобыльскі, ён яшчэ страшнейшы. Дактары мне патлумачылі: калі б метастазы паразілі арганізм унутры, ён бы хутка памёр, а яны папаўзлі верхам… Па целе… Па твары… Нешта чорнае на ім нарасло. Кудысьці знік падбародак, прапала шыя, выпаў вонкі язык. Лопаліся сасуды, пачынаўся крывацёк. «Ой, — крычу, — зноў кроў!» З шыі, са шчок, з вушэй… Ва ўсе бакі… Нясу халодную ваду, кладу прымочкі — не ратуюць. Нешта жудаснае. Уся падушка, бывала, зальецца… Тазік падстаўлю, з ваннай… Струменьчыкі б'юць… Як у даёнку… Гэты гук… Такі мірны і вясковы… Я яго і цяпер па начах чую… Пакуль ён у прытомнасці, пляскае ў далоні — гэта ў нас умоўны знак: выклікай «хуткую». Ён не хацеў паміраць… Яму сорак пяць гадоў… Званю на станцыю хуткай дапамогі, а яны ўжо нас ведаюць, ехаць не хочуць. «Вашаму мужу мы нічым не можам дапамагчы». Ну хоць

укол! Морфій! Сама ўкалю, навучылася, а ўкол — сінякам пад скурай, не разыходзіцца. Аднойчы дапрасілася, прыехала «хуткая»... Малады доктар... Наблізіўся да яго і адразу — назад: «Скажыце, а ён у вас выпадкова не чарнобыльскі? Не з тых, хто там быў?» Я адказваю: «Быў». І ён, я не перабольшваю, ускрыкнуў: «Міленькая мая, хутчэй бы гэта скончылася! Хутчэй! Я бачыў, як паміраюць чарнобыльцы». А мой жа ў прытомнасці, ён гэта чуе... Добра яшчэ, што не ведае, не здагадваецца: ён ужо адзін са сваёй брыгады застаўся. Апошні. Іншым разам медсястру з паліклінікі прыслалі, дык яна ў калідоры пастаяла, нават у кватэру не зайшла: «Ой, не магу!» А я магу? Я ўсё магу! Што мне прыдумаць? Дзе выратаванне? Ён крычыць... Яму балюча... Увесь дзень крычыць... Тады я знайшла выйсце: залівала ў яго праз шпрыц бутэльку гарэлкі. Адключыцца. Забудзецца. Не сама здагадалася, іншыя жанчыны падказалі... З такой самай бядой... Прыйдзе ягоная мама: «Чаму ты адпусціла яго ў Чарнобыль? Як ты магла?» А мне і ў галаву тады не магло прыйсці, што трэба было не адпускаць, а яму, напэўна, — што ён мог не паехаць. Гэта ж быў іншы час, як ваенны. І мы тады былі іншыя. Аднаго разу я ў яго запыталася: «А цяпер не шкадуеш, што туды паехаў?» Галавой круціць — не. У сшытачку піша: «Памру, прадасі машыну, запасныя колы, а за Толіка (гэта ягоны брат) замуж не выходзь». Толіку я падабалася...

Я ведаю таямніцы... Сяджу каля яго... Ён спіць... У яго яшчэ былі прыгожыя валасы... Я ўзяла і ціхенька адрэзала пасму... Расплюшчыў вочы, паглядзеў, што ў мяне ў руках, усміхнуўся. У мяне застаўся ягоны гадзіннік, вайсковы білет і чарнобыльскі медаль... *(Доўга маўчыць.)*

Ах, якая я была шчаслівая! У радзільні, памятаю, днямі сяджу каля вакенца, чакаю яго, выглядваю.

Нічога толкам не разумела: што са мной, дзе я? Мне б на яго паглядзець…

Не магла наглядзецца, як адчувала, што гэта павінна неўзабаве скончыцца. Уранні кармлю і любуюся, як ён есць. Як ён голіцца. Як ідзе па вуліцы. Я — добрая бібліятэкарка, але я не разумею, як гэта можна жарсна любіць працу. Я любіла, кахала толькі яго. Аднаго. І я не магу без яго. Я крычу ўначы… У падушку крычу, каб дзеці не пачулі…

Ні на хвіліну не ўяўляла, што мы расстанемся… Што… Ужо ведала, але не ўяўляла. Мая мама… Ягоны брат… Яны мяне рыхтуюць, намякаюць, што дактары, маўляў, раяць, даюць накіраванне, адным словам, пад Мінскам ёсць спецыяльная бальніца, дзе раней пamíралі вось такія асуджаныя… Афганцы… Без рук, без ног… А цяпер туды чарнобыльцаў вязуць. Угаворваюць: там яму будзе лепей, дактары заўсёды побач. Не хацела, нават чуць пра гэта не хацела. Тады яны яго пераканалі, і ён пачаў мяне маліць: «Адвязі туды. Не мучайся». А я то бюлетэнь прашу, то на працы адпачынак за свой кошт выпрошваю. Па законе бюлетэнь даюць толькі на догляд за хворым дзіцем, а адпачынак за свой кошт не больш за месяц. Але ён увесь наш сшытак спісаў. Узяў з мяне слова, што я яго туды завязу. Я паехала на машыне з ягоным братам. На краі вёскі, называлася яна Грабёнка, стаяў вялікі драўляны дом, побач калодзеж развалены. Прыбіральня на вуліцы. Бабулькі нейкія ў чорным… Багамольныя… Нават з машыны не выйшла. Не паднялася. Уначы цалую яго: «Як ты мог мяне пра гэта прасіць? Ніколі гэтага не будзе! Ніколі!» Я яго ўсяго цалавала…

Самыя страшныя апошнія тыдні… Паўгадзіны сікалі ў паўлітровы слоік. Вачэй не падымае. Яму сорамна. «Ну як ты можаш так думаць?!» — цалую яго. У апошні

дзень здарылася такая хвіліна: ён расплюшчыў вочы, сеў, усміхнуўся і прамовіў: «Валечка!..» Мне мову заняло ад шчасця... Ад голасу ягонага...

З працы пазванілі: «Мы чырвоную грамату прынясём». Пытаюся ў яго: «Хочуць твае хлопцы прыйсці. Грамату ўручаць». Галавой круціць: не-не! Але яны прыехалі... Грошы нейкія прынеслі, грамату ў чырвонай папцы з фатаграфіяй Леніна. Узяла яе і думаю: «За што ж ён паміpae? У газетах пішуць, што гэта не толькі Чарнобыль, а камунізм узарваўся. Савецкае жыццё скончылася. А профіль на чырвонай папцы той самы...»

Хацелі хлопцы яму нейкія словы добрыя сказаць, але ён накрыўся коўдрай, адны валасы тырчалі. Пасталі над ім і пайшлі. Ужо баяўся людзей... Толькі мяне не баяўся. Але паміpae чалавек адзін... Я яго клікала, а ён ужо вачэй не расплюшчваў. Толькі дыхаў...

Калі хавалі, прыкрыла яму твар дзвюма хустачкамі-насоўкамі. Калі хто прасіў паказаць, я адкрывала... Адна жанчына ўпала... А калісьці яна яго кахала, я яго да яе раўнавала. «Дай апошні раз пагляджу». — «Глядзі». Я не расказала, што, калі ён памёр, ніхто не мог да яго падысці, усе баяліся. А сваякам самім нельга мыць, адзяваць. Па нашых славянскіх звычаях. Прывезлі з морга двух санітараў, яны папрасілі гарэлкі: «Мы бачылі, — прызналіся, — усё: разбітых, парэзаных, трупы дзяцей пасля пажару... Але такое ўпершыню...» *(Заціхае.)* Ён памёр і ляжаў гарачы-гарачы. Да яго нельга было дакрануцца... Я спыніла ў доме гадзіннік... Сем раніцы... І гадзіннік наш да сёння стаіць, не заводзіцца... Майстра выклікалі, ён рукамі развёў: «Тут не механіка і не фізіка, а метафізіка».

Першыя дні... Без яго... Спала два дні, не маглі разбудзіць, падымуся, пап'ю вады, нават не ела, і зноў на падушку ўпаду. Цяпер мне страшна: як гэта я магла заснуць? У сяброўкі муж паміраў, ён шпурляў у яе посудам.

Плакаў. Чаму яна такая маладая, прыгожая? А мой толькі глядзеў на мяне і глядзеў… У наш сшытачак напісаў: «Памру, спалі мой прах. Я хачу, каб ты не баялася». Чаму ён так вырашыў? Ну, чуткі розныя: чарнобыльцы і пасля смерці «свецяцца»… Уначы над магіламі падымаецца святло… Я сама чытала, што магілы чарнобыльскіх пажарнікаў, якія памерлі ў маскоўскіх шпіталях і пахаваныя пад Масквой у Міціне, людзі абыходзяць зводдаль, сваіх нябожчыкаў каля іх не кладуць. Мёртвыя мёртвых баяцца, не кажучы пра жывых. Таму што ніхто не ведае, што такое — Чарнобыль. Адны здагадкі. Прадчуванні. Ён прывёз з Чарнобыля белы касцюм, у якім там працаваў. Штаны, спяцоўка… Гэты касцюм ляжаў у нас на антрэсолях да яго смерці. Потым мама вырашыла: «Трэба выкінуць усе ягоныя рэчы». У яе быў страх… А я нават той яго касцюм берагла. Злачынніца! У мяне ж у доме дзеці. Дачка і сын… Адвезлі касцюм за горад і закапалі… Я шмат кніг прачытала, я жыву сярод кніг, але нічога не могуць яны растлумачыць. Прывезлі урначку… Не страшна… Я рукой дакранулася, а там штосьці дробнае, як ракавінкі на беразе мора, у пяску, гэта тазасцегнавыя костачкі. Дагэтуль да ягоных рэчаў дакраналася, не чую, не адчуваю, а тут — быццам абняла. Уначы, памятаю, ён — мёртвы, сяджу пры ім. І раптам нейкі дымок… Другі раз убачыла гэты дымок над ім у крэматорыі… Яго душа… Ніхто яе не бачыў, а я бачыла… У мяне пачуццё: яшчэ раз пабачыліся…

Ах, якая я была шчаслівая! Якая шчаслівая… Ён паедзе ў камандзіроўку… Я дні, гадзіны лічу да нашай сустрэчы. Секундачкі! Я фізічна без яго не магу… Не магу! *(Закрывае твар рукамі.)* Прыгадваю… Мы прыедзем з ім да ягонай сястры ў вёску, увечары яна паказвае: «Табе ў гэтым пакоі паслала, а яму ў тым». Зірнем адно на аднаго і засмяёмся. Не ўяўлялі, што можна спаць

паасобку, у розных пакоях. Толькі разам. Я не магу без яго… Не магу! Многія сваталіся… Брат ягоны сватаўся… Яны такія падобныя… Рост. Нават хада. Але мне здаецца, калі нехта іншы да мяне дакранецца, буду плакаць і плакаць. Ніколі не спынюся…

Хто яго ў мяне забраў? Па якім праве? Уручылі позву з чырвонай паласой дзевятнаццатага кастрычніка тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага года…

*(Прыносіць альбом. Паказвае вясельныя фатаграфіі. І — калі я ўжо хачу развітацца — спыняе.)*

Як мне далей жыць? Я вам не ўсё… Не да канца… Я была шчаслівая… Да вар'яцтва. Ёсць таямніцы… Можа, не трэба майго імя… Калі малітвы чытаюць — гэта таямніца. Пра сябе… *(Замаўкае.)* Не, назавіце імя! Богу нагадайце… Я хачу ведаць… Я хачу зразумець, навошта нам даюцца такія пакуты? За што? Напачатку здавалася, што пасля ўсяго ў мяне ў позірку нешта цёмнае з'явіцца. Чужое. Я не вытрымаю… Што мяне ўратавала? Выштурхнула да жыцця? Вярнула… Мой сын. У мяне ёсць яшчэ адзін сын… Наш з ім першы сын… Ён даўно хворы… Ён вырас, але бачыць свет дзіцячымі вачыма, вачыма пяцігадовага хлопчыка. Я хачу цяпер быць з ім… Мару памяняць кватэру бліжэй да Навінак, там у нас псіхіятрычная бальніца. Усё сваё жыццё ён жыве там. Гэта прысуд дактароў: каб ён жыў, ён павінен быць там. Я кожны дзень езджу туды. Сустракае мяне: «А дзе тата Міша? Калі прыедзе?» Хто яшчэ ў мяне пра гэта спытае? Ён яго чакае.

Мы будзем чакаць з ім разам. Я чытаць буду сваю чарнобыльскую малітву… Ён — глядзець на свет дзіцячымі вачыма…

*Валянціна Цімафееўна Апанасевіч,*
*жонка ліквідатара*

# ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

...Кіеўскае бюро падарожжаў прапануе турыстычныя паездкі ў Чарнобыль...

Распрацаваны маршрут, які пачынаецца з мёртвага горада Прыпяць: турысты аглядаюць шматпавярховыя пакінутыя дамы з пачарнелай бялізнай на балконах і дзіцячымі вазкамі. Былую міліцыю, бальніцу і гаркам партыі. Тут яшчэ захаваліся лозунгі камуністычных часоў — іх і радыяцыя не бярэ.

З горада Прыпяць маршрут працягваецца па мёртвых вёсках, дзе па хатах сярод белага дня шныраць ваўкі і дзікі. Расплодзіліся — процьма!

А кульмінацыяй паездкі, або, як пішуць у рэкламе, яе «разынкай», лічыцца агляд аб'екта «Укрытие», або прасцей — саркафага. Пабудаваны похапкам над падарваным чацвёртым энергаблокам, ён даўно пакрыўся расколінамі, скрозь якія «фаніць» смяротная начынка — рэшткі ядзернага паліва. Будзе пра што расказаць сваім сябрам, калі вернецеся дадому. Гэта вам не на Канарскіх астравах пабыць або ў Маямі... Завяршаецца экскурсія фатаграфаваннем на памяць каля стэлы ў гонар загінулых герояў Чарнобыля, каб вы адчулі сябе далучанымі да гісторыі.

Ну а пры канцы падарожжа аматарам экстрэмальнага турызму прапануюць пікнік — абед з экалагічна чыстых прадуктаў з чырвоным віном. І з гарэлкай. Вам абяцаюць, што за дзень, прабыты ў зоне, вы атрымаеце дозу меншую, чым ад рэнтгенаўскага абследавання. Але не раяць купацца, есці злоўленую рыбу або дзічыну.

Збіраць ягады, смажыць на вогнішчы сабраныя грыбы. Дарыць жанчынам палявыя кветкі.

Вы думаеце, гэта нейкае трызненне? Памыляецеся, ядзерны турызм карыстаецца вялікім попытам, асабліва ў заходніх турыстаў. Людзі едуць па новыя і моцныя ўражанні, якія ў свеце ўжо мала дзе сустрэнеш, занадта ён абжыты і даступны. Жыць робіцца сумна. А хочацца чагосьці вечнага…

Наведайце ядзерную Мекку… Цэны памяркоўныя…

*Паводле матэрыялаў беларускіх газет. 2005*

1986–2005

# ЗМЕСТ

Гістарычная даведка ............................................................. 6

Самотны чалавечы голас ....................................................... 12

Інтэрв'ю аўтаркі з самой сабой аб прапушчанай
гісторыі і аб тым, чаму Чарнобыль ставіць
пад сумнеў нашу карціну свету ........................................ 33

Раздел першы.
ЗЯМЛЯ МЁРТВЫХ | 45

Маналог пра тое, навошта людзі ўспамінаюць........... 47
Маналог пра тое, што можна паразмаўляць
і з жывымі, і з мёртвымі ....................................................... 49
Маналог пра цэлае жыццё, напісаны на дзвярах........ 56
Маналог адной вёскі пра тое, як клічуць душы
з неба, каб з імі паплакаць і паабедаць........................ 59
Маналог пра тое, што знойдзецца дажджавы
чарвяк — і курыца радуецца. А тое, што
ў чыгунку кіпіць, таксама не вечнае.............................. 71
Маналог пра песню без слоў ........................................... 75
Тры маналогі пра старажытны страх і пра тое, чаму
адзін мужчына маўчаў, калі жанчыны гаварылі......... 76
Маналог пра тое, што толькі ў зле чалавек
вынаходлівы і хітры, але ён адкрыты
і даступны ў простых словах любові ............................ 85
САЛДАЦКІ ХОР .................................................................... 89

Раздел другі.
## ВЯНЕЦ СТВАРЭННЯ | 109

Маналог пра старыя прароцтвы ........ 111
Маналог пра месяцавы краявід ........ 114
Маналог сведкі, у якога балеў зуб, калі ён бачыў, як Хрыстос упаў і пачаў крычаць ........ 116
Тры маналогі аб «праху хадзячым» і «зямлі гаварушчай» ........ 123
Маналог пра тое, чаму мы не ўмеем жыць без Чэхава і Талстога ........ 130
Маналог пра тое, што святы Францыск прапаведаваў птушкам ........ 136
Маналог без назвы — крык ........ 145
Маналог на два галасы — мужчынскі і жаночы ........ 147
Маналог пра тое, як зусім невядомая рэч запаўзае, залазіць у цябе ........ 155
Маналог пра картэзіянскую філасофію і пра тое, як ясі разам з іншым чалавекам забруджаны бутэрброд, каб не было сорамна ........ 162
Маналог пра тое, што мы даўно злезлі з дрэва і не прыдумалі такога, каб яно адразу расло, быццам кола ........ 178
Маналог каля закрытага калодзежа ........ 186
Маналог пра тугу па сюжэце і ролі ........ 194
НАРОДНЫ ХОР ........ 205

Раздел трэці.
## ЗАХАПЛЕННЕ СМУТКАМ | 217

Маналог пра тое, чаго мы не ведалі: смерць можа быць такой прыгожай ........ 219

Маналог пра тое, як лёгка стаць зямлёй .................. 222
Маналог пра сімвалы
і таямніцы вялікай краіны ....................................229
Маналог пра тое, што ў жыцці
страшнае адбываецца ціха і натуральна ..................232
Маналог пра тое, што рускі чалавек
заўсёды хоча ў што-небудзь верыць ........................238
Маналог пра тое, што маленькае жыццё
ў вялікі час — безабароннае........................................243
Маналог пра фізіку, у якую ўсе мы былі
калісьці закаханыя ...................................................247
Маналог пра тое, што далей за Калыму,
Асвенцім і Халакост ..................................................253
Маналог пра свабоду
і мару пра звычайную смерць ...................................257
Маналог пра пачварку,
якую ўсё адно будуць любіць ....................................262
Маналог пра тое, што да звычайнага жыцця
трэба нешта дадаць,
каб гэтае жыццё зразумець .......................................265
Маналог пра нямога салдата........................................270
Маналог пра вечнае і праклятае ................................276
Маналог абаронца савецкай улады.............................282
Маналог пра тое, як два анёлы сустрэлі
маленькую Волечку ...................................................284
Маналог пра бязмежную ўладу
аднаго чалавека над іншым чалавекам .....................289
Маналог пра ахвяр і жрацоў.......................................299
ДЗІЦЯЧЫ ХОР ...........................................................308

САМОТНЫ ЧАЛАВЕЧЫ ГОЛАС ....................................318

ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА........................................................331

12+

Алексіевіч Святлана Аляксандраўна

ГАЛАСЫ УТОПІІ | КНІГА ЧАЦВЁРТАЯ

ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА

Рэдактар Барыс Пятровіч
Карэктар Ліда Наліўка
Дызайн вокладкі Арцём Масюкевіч

Падпісана да друку 19.04.2018. Фармат 60×100/32.
Аб'ём 13,23 умоўн. друк. арк. Папера афсетная. Друк афсетны.
Гарнітура Charter ITC, Aeroport. Наклад 5300. Заказ 3428/18.

Выдавец Logvino literatūros namai
J. Savickio g. 4, LT-01108 Vilnius
lohvinau.by

Друк ООО «ИПК Парето-Принт»

ISBN 978-609-8213-32-4

Святлана Алексіевіч не раз тлумачыла, што яе героі гавораць на мове савецкай імперыі. Але ў гэтай кнізе, найперш у галасах жыхароў беларускай чарнобыльскай зоны — сялян, настаўнікаў, журналістаў, — праз рускамоўны тэкст зноў і зноў прабіваецца выразны беларускі акцэнт і сама жывая беларуская мова. Мне ўяўляецца, што менавіта на ёй героі пісьменніцы імкнуліся сказаць, як сусветная катастрофа перайначыла іх асабісты лёс. Добрая вясковая вядзьмарка ў адным з маналогаў прамаўляе амаль так, як мая незабыўная бабуля Аўгіння, якая таксама валодала незвычайнымі здольнасцямі.

Для мяне «Чарнобыльская малітва» — самая беларуская з пяцікніжжа Святланы Алексіевіч.

**УЛАДЗІМІР АРЛОЎ**


Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!
Логвінаў

ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ